ПОСТАНОВЛЕНИЕ МИНИСТЕРСТВА ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
27 июля 2017 г. № 93

Об утверждении учебных программ по учебным предметам для X–XI классов учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования

В соответствии с частью первой пункта 12 статьи 167 Кодекса Республики Беларусь об образовании Министерство образования Республики Беларусь ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Утвердить прилагаемые:

1.1. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень);

1.2. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень);

1.3. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для X класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания (базовый уровень);

1.4. Учебную программу по учебному предмету «Русская литература» для X класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания (базовый уровень);

1.5. Учебную программу по учебному предмету «Иностранный язык (английский, немецкий, французский, испанский, китайский)» («Замежная мова (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская)») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый и повышенный уровни);

1.6. Учебную программу по учебному предмету «Математика» («Матэматыка») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.7. Учебную программу по учебному предмету «Информатика» («Інфарматыка») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.8. Учебную программу по учебному предмету «Всемирная история» («Сусветная гісторыя») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.9. Учебную программу по учебному предмету «История Беларуси» («Гісторыя Беларусі») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.10. Учебную программу по учебному предмету «Обществоведение» («Грамадазнаўства») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.11. Учебную программу по учебному предмету «География» («Геаграфія») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.12. Учебную программу по учебному предмету «Биология» («Біялогія») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.13. Учебную программу по учебному предмету «Физика» («Фізіка») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.14. Учебную программу по учебному предмету «Химия» («Хімія») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.15. Учебную программу по учебному предмету «Физическая культура и здоровье» («Фізічная культура і здароўе») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.16. Учебную программу по учебному предмету «Допризывная и медицинская подготовка» («Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.17. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (павышаны ўзровень);

1.18. Учебную программу по учебному предмету «Математика» («Матэматыка») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень);

1.19. Учебную программу по учебному предмету «Обществоведение» («Грамадазнаўства») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень);

1.20. Учебную программу по учебному предмету «Биология» («Біялогія») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень);

1.21. Учебную программу по учебному предмету «Физика» («Фізіка») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень);

1.22. Учебную программу по учебному предмету «Химия» («Хімія») для X класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень).

1.23. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень);

1.24. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень);

1.25. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для XI класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания (базовый уровень);

1.26. Учебную программу по учебному предмету «Русская литература» для XI класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания (базовый уровень);

1.27. Учебную программу по учебному предмету «Иностранный язык (английский, немецкий, французский, испанский, китайский)» («Замежная мова (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская)») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый и повышенный уровни);

1.28. Учебную программу по учебному предмету «Математика» («Матэматыка») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.29. Учебную программу по учебному предмету «Информатика» («Інфарматыка») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.30. Учебную программу по учебному предмету «Всемирная история» («Сусветная гісторыя») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.31. Учебную программу по учебному предмету «История Беларуси» («Гісторыя Беларусі») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.32. Учебную программу по учебному предмету «Обществоведение» («Грамадазнаўства») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.33. Учебную программу по учебному предмету «География» («Геаграфія») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.34. Учебную программу по учебному предмету «Биология» («Біялогія») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.35. Учебную программу по учебному предмету «Физика» («Фізіка») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.36. Учебную программу по учебному предмету «Химия» («Хімія») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (базовый уровень);

1.37. Учебную программу по учебному предмету «Физическая культура и здоровье» («Фізічная культура і здароўе») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.38. Учебную программу по учебному предмету «Допризывная и медицинская подготовка» («Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.39. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (павышаны ўзровень);

1.40. Учебную программу по учебному предмету «Математика» («Матэматыка») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень);

1.41. Учебную программу по учебному предмету «Биология» («Біялогія») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень);

1.42. Учебную программу по учебному предмету «Физика» («Фізіка») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень);

1.43. Учебную программу по учебному предмету «Химия» («Хімія») для XI класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания (повышенный уровень).

2. Признать утратившими силу:

2.1. абзацы второй–двенадцатый, четырнадцатый – сорок первый, сорок четвертый, сорок седьмой, пятидесятый, пятьдесят второй – пятьдесят четвертый постановления Министерства образования Республики Беларусь от 15 июля 2015 г. № 83 «Об утверждении учебных программ по учебным предметам для учреждений общего среднего образования»;

2.2. абзацы второй–шестнадцатый, восемнадцатый–пятидесятый, пятьдесят второй – пятьдесят четвертый, пятьдесят шестой, пятьдесят девятый, шестьдесят четвертый – шестьдесят шестой постановления Министерства образования Республики Беларусь от 21 июня 2016 г. № 49 «Об утверждении учебных программ по учебным предметам для учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования».

3. Настоящее постановление вступает в силу через 15 рабочих дней после его подписания.

Министр **И.В.Карпенко**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова»
для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Адукацыйнае значэнне прадмета «Беларуская мова» на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі акрэсліваецца функцыямі мовы ў грамадстве. Мова выступае асноўным сродкам чалавечых зносін і пазнання рэчаіснасці. Карыстаючыся мовай, асоба засвойвае формы чалавечых узаемаадносін, спазнае маральныя і культурныя каштоўнасці свайго народа. Забяспечваючы моўную адукацыю навучэнцаў, установа адукацыі павінна ствараць умовы для іх інтэлектуальнага, эмацыянальнага і духоўнага развіцця, рыхтаваць да прафесійнай дзейнасці і актыўнага грамадскага жыцця.

Навучанне беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі **мае на мэце** фарміраванне асобы вучня як свядомага носьбіта мовы, развіццё яго інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Вучань асэнсоўвае мову як уласную, нацыянальную і агульначалавечую каштоўнасць і павінен мець такі ўзровень падрыхтоўкі, які забяспечыць паўнавартаснае выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах яе функцыянавання.

Задачы навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі на базавым узроўні наступныя:

сістэматызацыя і паглыбленне ведаў пра мову і маўленне, заканамернасці і правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормы беларускай літаратурнай мовы, удасканаленне культуры вуснага і пісьмовага маўлення (*моўная і маўленчая кампетэнцыі*);

развіццё звязнага маўлення – умення ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні, публічныя выступленні розных тыпаў, стыляў і жанраў (*камунікатыўна-рытарычная кампетэнцыя*);

авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры, як сродкам спасціжэння айчыннай і сусветнай культур; удасканаленне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін; сацыякультурнае развіццё вучняў на аснове засваення звычаяў, правіл, норм, якія рэгулююць узаемадзеянне людзей і іх паводзіны ў грамадстве, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў (*лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі*).

Змест навучання беларускай мове ў X класе ўключае наступныя раздзелы: «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства», «Маўленне», «Тэкст», «Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення», «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення», «Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Культура маўлення», «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення»; у XI класе: «Агульныя звесткі аб мове», «Маўленне», «Стылістыка», «Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення».

Асноўнай задачай навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (базавы ўзровень) становіцца практычнае засваенне ўсіх асноўных норм беларускай мовы (арфаэпічных, акцэнталагічных, лексічных, фразеалагічных, словаўтваральных, марфалагічных, сінтаксічных, арфаграфічных і пунктуацыйных). Валоданне нормамі сучаснай беларускай мовы павінна стаць арганічнай часткай агульнай маўленчай культуры, асноўным паказчыкам якой з'яўляецца правільнае маўленне.

Рэалізацыя гэтай задачы адбываецца праз шырокае выкарыстанне актыўных метадаў навучання (лекцыі, лекцыі-гутаркі, практыкумы, сюжэтна-тэматычныя ўрокі, прымяненне лінгвістычнага эксперымента); самастойную работу вучняў па аналізе тэкстаў; падрыхтоўку рэфератаў, паведамленняў, дакладаў, публічных выступленняў розных відаў; працу з даведачнай літаратурай; выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Асноўная частка праграмы складаецца з трох кампанентаў: ведавага (тэарэтычны матэрыял), аперацыйнага (спосабы дзейнасці) і практычнага (уменні і навыкі), што ў сукупнасці і складае змест навучання.

(35 гадзін на год, 1 гадзіна на тыдзень;
з іх 8 гадзін – на пісьмовыя работы)

Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства
(1 гадзіна)

Маўленне
(1 гадзіна)

Маўленне як працэс маўленчых зносін. Умовы маўленчых зносін.

Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне і пісьмо. Формы маўленчай камунікацыі: вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

Размяжоўваць вуснае і пісьмовае, маналагічнае і дыялагічнае маўленне; даваць характарыстыку маўленчай сітуацыі.

Адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне, валодаць навыкамі чытання тэкстаў розных стыляў услых і самому сабе, весці дыялог у сітуацыі афіцыйных і неафіцыйных маўленчых зносін.

Тэкст
(3 гадзіны, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць і тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту.

Апісанне, апавяданне, разважанне як функцыянальныя тыпы маўлення.

Кантрольны дыктант.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вызначаць адрасата і мэтанакіраванасць тэксту; выяўляць прыметы тэксту, вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, даваць загаловак, дзяліць тэкст на часткі (падтэмы і мікратэмы) і абзацы; вызначаць віды і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце, выдзяляць апорныя (ключавыя) словы, словазлучэнні, сказы.

Аналізаваць, рэдагаваць і ствараць тэксты розных тыпаў маўлення, складаць іх кампазіцыйныя схемы.

Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення
(11 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Гукавая абалонка слова. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні гукаў. Вымаўленне галосных і зычных гукаў, некаторых спалучэнняў зычных. Націск у беларускай мове.

Арфаэпічныя нормы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення. Акцэнталагічныя нормы.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Прынцыпы беларускай арфаграфіі. Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе; напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе; правапіс мяккага знака і апострафа, вялікай і малой літар; правілы напісання слоў разам, праз злучок і асобна.

Арфаграфічныя нормы: правапіс галосных ***о, э, а; е, ё, я****; спалучэнняў галосных у запазычаных словах, прыстаўных галосных, прыстаўных і ўстаўных зычных,* ***у*** *і* ***ў, д*** *і* ***дз, т*** *і* ***ц****, падоўжаных зычных, некаторых спалучэнняў зычных, мяккага знака і апострафа,* вялікай і малой літар, правапіс слоў разам, праз злучок і асобна.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

Ведаць арфаэпічныя, акцэнталагічныя і арфаграфічныя нормы.

Знаходзіць і выпраўляць вымаўленчыя і правапісныя парушэнні норм беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння норм.

Карыстацца стылістычнымі магчымасцямі фанетыкі.

Валодаць арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі і арфаграфічнымі нормамі. Карыстацца арфаграфічнымі слоўнікамі.

Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення
(3 гадзіны, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова. Амонімы. Сінонімы. Антонімы. Паронімы.

Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні.

Лексічныя і фразеалагічныя нормы: ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем, адрозненне мнагазначных слоў і амонімаў, правільнае выкарыстанне сінонімаў, антонімаў, паронімаў, правільнае ўжыванне фразеалагізмаў.

Пісьмовая творчая работа.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

Ведаць і захоўваць лексічныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні.

Вызначаць лексічнае значэнне слоў; размяжоўваць адназначныя і мнагазначныя словы, прамое і пераноснае значэнні слоў; падбіраць да слоў сінонімы, антонімы. Выяўляць у сказах, тэкстах фразеалагізмы, разумець іх значэнні, вызначаць сінтаксічную і сэнсава-стылістычную ролю.

Знаходзіць і выпраўляць лексічныя недахопы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння нормаў. Карыстацца стылістычнымі магчымасцямі лексікі і фразеалогіі; правільна выкарыстоўваць фразеалагізмы ў пэўным кантэксце.

Валодаць лексічнымі і фразеалагічнымі нормамі. Карыстацца тлумачальнымі слоўнікамі, слоўнікамі амонімаў, сінонімаў, антонімаў, паронімаў, фразеалагічнымі слоўнікамі.

Марфемная будова слова.
Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення
(3 гадзіны, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Склад слова. Марфема як мінімальная значымая адзінка мовы.

Правапіс прыставак. Правапіс **і**, **ы**, **й** пасля прыставак.

Спосабы ўтварэння слоў. Утварэнне і правапіс складаных і складанаскарочаных слоў.

Кантрольны дыктант.

Словаўтваральныя нормы: утварэнне слоў і іх ужыванне ў адпаведнасці з правіламі словаўтварэння.

Арфаграфічныя нормы: правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны, ***і, ы, й*** *пасля прыставак, складаных і складанаскарочаных слоў*.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

Ведаць віды асноў; спосабы ўтварэння слоў.

Вызначаць у словах марфемы; размяжоўваць вытворныя і невытворныя асновы; адрозніваць спосабы ўтварэння слоў.

Валодаць словаўтваральнымі нормамі. Карыстацца марфемнымі і словаўтваральнымі слоўнікамі.

Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення

(12 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Сістэма часцін мовы.

Назоўнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Лік і род назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў, правапіс склонавых канчаткаў.

Марфалагічныя нормы: *ужыванне назоўнікаў, лік, род якіх не супадае ў беларускай і рускай мовах, назоўнікаў, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку, назоўнікаў агульнага роду, нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур*.

Прыметнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыметнікаў паводле значэння. Утварэнне ступеняў параўнання якасных прыметнікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, формаў ступеняў параўнання якасных прыметнікаў, прыналежных прыметнікаў.

Лічэбнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады лічэбнікаў паводле будовы, значэння і граматычных прымет. Скланенне і правапіс лічэбнікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне парадкавых, колькасных (зборных і дробавых) лічэбнікаў; спалучальнасць зборных лічэбнікаў.

Займеннік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых займеннікаў, зваротнага займенніка ***сябе****, ужыванне прыназоўніка пры адмоўным займенніку, акцэнталагічныя нормы пры скланенні займеннікаў* ***сам****,* ***сама****,* ***самы****,* ***ніхто****,* ***нішто***.

Дзеяслоў: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Формы дзеяслова. Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў.

Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як асобыя формы дзеяслова. Утварэнне, ужыванне і правапіс дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых канчаткаў дзеясловаў, адрозненне канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу, акцэнталагічныя нормы пры ўтварэнні спрагальных формаў дзеясловаў; ужыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Прыслоўе: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыслоўяў па значэнні. Утварэнне формаў ступеняў параўнання якасных прыслоўяў. Утварэнне і правапіс прыслоўяў.

Марфалагічныя нормы: адрозненне вышэйшай ступені параўнання прыслоўя ад вышэйшай ступені параўнання прыметніка.

Прыназоўнік, злучнік, часціца як службовыя часціны мовы. Разрады прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Выклічнік. Правапіс прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц, выклічнікаў.

Ужыванне часціц **не** і **ні**. Правапіс **не (ня)**, **ні** з рознымі часцінамі мовы.

Марфалагічныя нормы: ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія адлюстроўваюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Кантрольная тэставая работа.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

Ведаць марфалагічныя прыметы часцін мовы, іх сінтаксічную ролю, вызначаць ролю розных часцін мовы ў арганізацыі маўлення, разгортванні і стварэнні тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Распазнаваць часціны мовы і іх формы ў сказах, тэкстах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; рабіць марфалагічны разбор часцін мовы. Вызначаць асаблівасці ўжывання часцін мовы ў тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Мэтанакіравана і свядома ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні моўныя адзінкі з улікам пэўнай камунікатыўнай задачы; ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з улікам сэнсава-стылістычнай ролі і тэкстаўтваральных магчымасцей слоў розных часцін мовы.

Валодаць марфалагічнымі нормамі.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага
(1 гадзіна)

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура»
для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацаваны ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Вучэбныя праграмы грунтуюцца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, арыентуюць на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, эстэтычны і

творчы характар навучання беларускай літаратуры, улічваюць ўзростава-інтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

Беларуская літаратура – дысцыпліна культуралагічнага цыкла, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі – сродак эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных норм і вартасцей. Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Вывучэнне літаратуры дапамагае вучням убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры – гэта найперш працэс жыццеспазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Змест літаратурнай адукацыі ў X–XI класах пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе працягнуць знаёмства вучняў, распачатае ў IX класе, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і спрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання ў вучняў інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. На III ступені навучання паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

Навучанне літаратуры ў X–XI класах можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях. Базавы ўзровень прадугледжвае знаёмства вучняў з агульнымі тэарэтычнымі асновамі курса, асноўнымі заканамернасцямі і асаблівасцямі развіцця беларускай літаратуры ў пэўны гістарычны перыяд, асэнсаванне знакавых твораў найбольш яркіх прадстаўнікоў мастацтва слова.

На заключным этапе літаратурнай адукацыі актуалізуюцца, паглыбляюцца і сістэматызуюцца веды і ўменні, атрыманыя ў папярэдніх класах, што вядзе да сінтэтычнага асэнсавання літаратуры і яе канкрэтных з'яў на светапоглядным, філасофскім, культуралагічным узроўнях, да ўсведамлення вучнем сябе як асобы і маральнага самавызначэння. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных формаў урока, шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г. д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад, пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем да ўсіх метадаў навучання з'яўляецца зарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і

эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў. Дзеля рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу да навучання літаратуры вучням з аналітычным тыпам мыслення мэтазгодна часцей прапаноўваць заданні творчага характару; вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей даваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэктаваць першапачатковае суб'ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і інш.

З мэтай развіцця пазнавальных інтарэсаў, выхавання мастацка-эстэтычнага густу і фарміравання цэласнага светапогляду вучняў пры навучанні беларускай літаратуры мэтазгодна прадугледжваць рэалізацыю міжпрадметных сувязей перш за ўсё з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Беларуская мова», «Руская літаратура», «Гісторыя Беларусі». Міжпрадметныя сувязі актуалізуюцца на ўсіх этапах навучання, іх рэалізацыя ў адукацыйным працэсе ўзбагачае дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (жывапіс, музыка, фотамастацтва, кіно, тэатр і інш.), эфектыўна ўздзейнічае на маральна-этычнае, інтэлектуальнае, эмацыянальнае, эстэтычнае развіццё асобы.

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з вучэбным дапаможнікам – усе гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейнасны характар, дыялагічнасць.

У адукацыйнай практыцы могуць выкарыстоўвацца як традыцыйныя, так і электронныя сродкі навучання, якія павінны быць скіраваны на дасягненне мэт і задач літаратурнай адукацыі.

Літаратуры ў працэсе адукацыі належыць асаблівая культуратворчая роля: яна здольная пераўтвараць унутраны свет асобы і ўплываць на духоўнае ўзбагачэнне жыцця, рабіць яго па-сапраўднаму цікавым, змястоўным, насычаным.3 гэтай прычыны неабходна імкнуцца ўключыць вучняў у працэс пазакласнай работы і выхавання.

Факультатыўныя заняткі, праца літаратурных гурткоў, сістэматычны выпуск насценных і радыёгазет, бюлетэняў, часопісаў і альбомаў; падрыхтоўка спецыяльных літаратурных стэндаў, тэматычных выставак, аглядаў сучаснай літаратуры; правядзенне літаратурных ранішнікаў, вечароў, віктарын, алімпіяд і святаў, сустрэч з пісьменнікамі, дзеячамі культуры і мастацтва – усё гэта спрыяе стварэнню ў класе атмасферы творчасці, духоўнасці, павагі да кнігі, да мастацкага слова.

Для арганізацыі факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры ў X–XI класах распрацавана адпаведнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне: вучэбныя праграмы, дапаможнікі для вучняў і настаўнікаў.

На вывучэнне літаратуры ў X–XI класах на базавым ўзроўні адводзіцца 53 гадзіны, з іх 48 гадзін – на вывучэнне твораў, 1 гадзіна – на ўрок па творах для дадатковага чытання, 4 гадзіны – на творчыя работы.

Прапанаваныя праграмай анатацыі да аглядавых і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік засяроджвае ўвагу на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, вывучэнне якіх ён лічыць больш дарэчным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе[1].

[1] Творы, прапанаваныя ў спісе для дадатковага чытання, можна знайсці ў кнігах серыі «Школьная бібліятэка», якія знаходзяцца ў бібліятэчным фондзе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Рэзерв вучэбнага часу настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарным планам.

(53 гадзіны)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX ст.

(14 гадзін)

Беларуская літаратура першай трэці XX ст. (1 гадзіна).

Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гг., пераемнасць у развіцці літаратуры з «нашаніўскім» перыядам.

Літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Творчыя здабыткі і пошукі 1920-х гг. і іх спад у 1930-я гг. пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця. Становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гг. Стварэнне Саюза савецкіх пісьменнікаў (ССП СССР) і яго падраздзялення – Саюза пісьменнікаў Беларусі (1934).

Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай.

Тэорыя літаратуры. Літаратурны працэс.

Мастацтва[3]**.** Музыка: *М. Равенскі.* Песні «Моладзь» (сл. М. Чарота), «Месячыку-Месяц» (сл. У. Жылкі); *А. Туранкоў.* Опера «Кветка шчасця» (п'еса М. Чарота «На Купалле»). Жывапіс: *В. Волкаў.* «Маладняковец»; *М. Гусеў.* «Партрэт М. Чарота»; *Я. Драздовіч.* Афармленне часопіса «Рунь»; *М. Шагал.* «Мір хацінам, вайна палацам».

[3] Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца ў першую чаргу з апорай на вядомае і на выбар настаўніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

Максім Гарэцкі. Апавяданне «Літоўскі хутарок» (2 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Літоўскі хутарок». Суровая праўда пра Першую сусветную вайну, выкрыццё яе антынароднай, антычалавечай сутнасці. Аўтабіяграфічнасць апавядання. Рэалістычная праўдзівасць адлюстравання трагедыйнасці народнага жыцця. Гуманістычная канцэпцыя пісьменніка. Вобраз Яна Шымкунаса – бескарыслівага, высакароднага, гуманнага чалавека.

Тэорыя літаратуры. Вобраз апавядальніка (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: *Э. Астаф'еў.* Рэльефны партрэт М. Гарэцкага для мемарыяльнай дошкі. Тэатральнае мастацтва: спектакль «Атрута» (рэж. *М. Стрыжоў*).

Змітрок Бядуля. Апавяданне «Бондар» (1 гадзіна).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Бондар». Вырашэнне тэмы мастака і мастацтва ў кантэксце сацыяльных праблем. Вобраз майстра-працаўніка. Асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці. Мастацкія адметнасці твора: сцісласць, драматызм, псіхалагізм, народная вобразнасць мовы.

Уладзімір Дубоўка. Вершы «Залатая асенняя раніца», «О Беларусь, мая шыпшына…», «Пальцы жоўтых кляновых лістоў», «Родная мова, цудоўная мова...» (2 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Асноўныя матывы лірыкі. Услаўленне сілы народа, духоўнасці, вольналюбства чалавека, паэтызацыя красы прыроды, кахання. Высокая культура верша, шчыры лірызм, асацыятыўная вобразнасць, багацце жанравых формаў. Сувязь лірыкі з традыцыямі фальклору, паэзіяй Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча.

Мастацтва. Музыка**:** *М. Шчаглоў (Куліковіч).* Рамансы «О Беларусь, мая шыпшына», «А вясна ідзе на Беларусі» (сл. У. Дубоўкі). Жывапіс: *Н. Шчасная.* «Пісьменнік У. М. Дубоўка»; *П. Драчоў.* Ілюстрацыі да кнігі «Выбраныя творы» У. Дубоўкі (Т. 1–2, 1965).

Кандрат Крапіва. Байкі «Дыпламаваны Баран», «Махальнік Іваноў»; камедыя «Хто смяецца апошнім» (4 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Байкі. Выкрыццё бескультур'я, амаральнасці, некампетэнтнасці, бяздушнага стаўлення да сумленных працаўнікоў, высмейванне самаўпэўненасці, нахабства, тупасці, падхалімства і іншых чалавечых заган.

«Хто смяецца апошнім». Час напісання твора. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Сюжэтная аснова камедыі. Канфлікт у п'есе. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі. Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Сродкі і прыёмы сатырычнай тыпізацыі і індывідуалізацыі. Мова персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў. Сцэнічнае жыццё камедыі. Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі.

Тэорыя літаратуры. Сатырычная камедыя. Канфлікт у драматычным творы (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектакль «Хто смяецца апошнім» (рэж. *А. Кірэеў*). Кінамастацтва: тэлефільм «Хто смяецца апошнім» (рэж. *У. Корж-Саблін*).

Міхась Зарэцкі. Апавяданне «Ворагі» (2 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Ворагі». Лёс Паўла Гуторскага, змагара за рэвалюцыйныя ідэалы, і Ніны Купрыянавай, дачкі памешчыка. Грамадскае і асабістае ў апавяданні. Тэма кахання. Міхась Зарэцкі – майстар вострага сюжэта, мастацкай дэталі, глыбокі псіхолаг.

Тэорыя літаратуры. Мастацкая дэталь (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектаклі «Сымон Карызна» (рэж. *У. Кумельскі*, паводле рамана М. Зарэцкага «Вязьмо»), «Ная» (рэж. *М. Кавязін*).

Кузьма Чорны. Апавяданне «Макаркавых Волька» (2 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Макаркавых Волька». Канкрэтна-гістарычны змест твора. Адлюстраванне характэрнай для 1930-х гг. атмасферы падазронасці, недаверу да чалавека. Супрацьпастаўленне гуманістычнай жыццёвай пазіцыі Волькі і агіднай паклёпніцкай дзейнасці Сафрона Дзядзюлі. Асуджэнне ў апавяданні праяў шальмоўства і прыніжэння чалавечай годнасці. Агульначалавечае значэнне праблем, узнятых у творы.

Тэорыя літаратуры. Псіхалагізм у літаратуры.

Мастацтва. Скульптура: *З. Азгур.* «Пісьменнік Кузьма Чорны»; *Э. Астаф'еў*. Рэльефны партрэт К. Чорнага для мемарыяльнай дошкі. Жывапіс: *І. Ахрэмчык.* «Партрэт К. Чорнага»; *Х. Ліўшыц.* «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Печышчах у 1942 годзе».

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА СЯРЭДЗІНЫ XX ст.
(1940-я – СЯРЭДЗІНА 1960-х гг.)
(32 гадзіны)

Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) (1 гадзіна).

Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай паэзіі і публіцыстыкі. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Выкрыццё ідэалогіі фашызму. Адлюстраванне трагедыі чалавека на вайне. Перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры.

Мастацтва. Музыка. *І. Лучанок*. Раманс-песня «Ёсць у горада слава гордая» (сл. А. Вярцінскага); *К. Цесакоў.* Раманс-песня «Было ў салдата два полі» (сл. А. Вярцінскага). Скульптура: *М. Кандрацьеў.* «Загінуўшых чакаюць вечна (удовы вайны)». Жывапіс. *В. Грамыка.* «Балада пра ваенную маладосць», «Салдаты», «Балада пра апошнюю кулю», «Жанчынам Вялікай Айчыннай прысвячаецца», «З вогненнай вёскі», «Боль вогненных гадоў. Год 41-ы»; *М. Савіцкі.* Серыя карцін «Лічбы на сэрцы»; *М. Тарасікаў.* «Брацкія магілы».

Пятрусь Броўка. Вершы «Будзем сеяць, беларусы!», «Надзя-Надзейка», «Родныя словы», «Александрына», «А ты ідзі» (2 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Патрыятычны, вызваленчы пафас твораў паэта перыяду Вялікай Айчыннай вайны, сцвярджэнне няскоранасці беларускага народа, выяўленне палымянай веры ў перамогу. Узмацненне ўвагі да маральна-этычных і агульначалавечых праблем у лірыцы 1960–1970-х гг. Народна-песенная аснова вершаў Петруся Броўкі, іх мілагучнасць.

Мастацтва. Музыка: *У. Мулявін.* Песня «Александрына» (сл. П. Броўкі). Жывапіс: *У. Гардзеенка.* «Думы пра былое (П. Броўка)»; *С. Герус.* «Партрэт Петруся Броўкі»; *І. Пратасеня.* «Партрэт П. Броўкі».

Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965) (1 гадзіна).

Умовы развіцця беларускай літаратуры ў пасляваеннае дзесяцігоддзе. Ваенная тэма як цэнтральная ў літаратуры.

Змены ў грамадскай атмасферы сярэдзіны 1950-х гг. і іх дабратворны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. Актыўнае і шматграннае развіццё мастацтва слова. Узвышэнне ў літаратуры народных ідэалаў праўды, сумленнасці, справядлівасці і гуманізму. Узмацненне крытычнага пачатку ў літаратурнай творчасці.

Аркадзь Куляшоў. Вершы «Мая Бесядзь», «Над брацкай магілай», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «Я хаце абавязаны прапіскаю...», «На паўмільярдным кіламетры…» (3 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Лірыка. Глыбіня лірычнага пачуцця паэта ў найлепшых творах даваеннага часу. Адметнасць вобразнасці і кампазіцыі верша «Мая Бесядзь». Ваенная лірыка Аркадзя Куляшова. Суровая праўда і гуманізм у паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае, фальклорныя матывы ў баладзе «Над брацкай магілай». Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай лірыцы. Зварот да тэм жыцця і смерці, кахання і вернасці, лёсу і абавязку. Услаўленне чалавека, яго духоўных каштоўнасцей. Развіццё і ўзбагачэнне паэтам класічных традыцый лірыкі. Паэтычнае майстэрства Аркадзя Куляшова.

Тэорыя літаратуры. Лірычны герой (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: *М. Савіцкі.* «Партызанская Мадонна (Мінская)»; *П. Гаўрыленка.* «Вясна», «Сяўба»; *М. Сяўрук.* «Жніво»; *У. Кожух.* «Новая дарога»; *М. Рагалевіч.* «Беларуская калыханка»; *А. Бараноўскі.* «Пара залатых бяроз»; *Г. Вашчанка.* «Крылы». Выяўленчае мастацтва: *Л. Талбузін.* Медаль «Аркадзь Куляшоў». Музыка: *Э. Наско.* Вакальная музыка «Рамансы на вершы А. Куляшова».

Максім Танк. Вершы: «Спатканне», «Родная мова», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Працягласць дня і ночы»; паэма «Люцыян Таполя» (4 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Лірыка. Тэмы і вобразы, наватарскі характар танкаўскай паэзіі. Сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы народа. Матыў адзінства пакаленняў. Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай паэзіі. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей. Свабодны верш у паэзіі Максіма Танка.

«Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. Спалучэнне эпічнага і лірычнага пачаткаў у творы. Выкарыстанне сродкаў паэтызацыі і гратэску ў паэме.

Тэорыя літаратуры. Верлібр (свабодны верш).

Мастацтва. Музыка: *Я. Глебаў.* Раманс «Нарач»; *У. Мулявін*. Раманс «Завушніцы»; *П. Падкавыраў.* Раманс «Не шкадуйце, хлопцы, пораху»; *Ю. Семяняка.* Рамансы «Нарач», «Ганна»; Д. *Смольскі.* Рамансы «Быць чалавекам я рад», «Ля гэтых сосен»; *Ю. Талеснік.* Раманс «Завушніцы»; *Э. Тырманд.* Рамансы «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы». Скульптура: *А. Бембель.* «Уз'яднанне Заходняй Беларусі». Жывапіс: *С. Вярсоцкі.* «Возера Нарач»; *С. Герус.* «Партрэт М. Танка»; *Я. Зайцаў.* «Партрэт М. Танка»; *Н. Шчасная.* «Партрэт М. Танка».

Янка Брыль. Апавяданне «Memento mori» (1 гадзіна).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Memento mori». Паказ вайны ў творы. Маральны подзвіг старога селяніна ў творы. Уменне аўтара ўбачыць гераічнае за рамкамі бытавых сцэн. Асуджэнне фашызму ў апавяданні. Глыбокае разуменне народнага гераізму. Урачыстая танальнасць аўтарскага маўлення.

Мастацтва. Скульптура: *С. Вакар*. «Пісьменнік Я. Брыль». Жывапіс: *М. Будавей.* «Партрэт Я. Брыля»; *В. Грамыка.* «Партрэт Я. Брыля».

Пімен Панчанка. Вершы: «Краіна мая», «Герой», «Толькі лісцем рабін шалахні...», «Родная мова», «Крык сойкі», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы» (3 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Лірыка. Патрыятычны пафас ваеннай паэзіі Пімена Панчанкі. Гераічнае і трагічнае ў вершах аб Радзіме і яе абаронцах. Роздум пра сэнс жыцця, гуманныя адносіны паміж людзьмі ў пасляваенных творах. Вернасць праўдзе жыцця. Спавядальны характар, адкрытасць, шчырасць лірычнага пачуцця. Бескампраміснасць паэтычнага слова. Публіцыстычная завостранасць верша, разнастайнасць рытміка-інтанацыйнага малюнка, багацце сродкаў мастацкага выяўлення.

Тэорыя літаратуры. Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Музыка: *П. Падкавыраў.* Фрагменты з вакальнага цыкла «Партызаны» (сл. Я. Купалы, М. Танка, П. Панчанкі); *В. Іваноў.* «Тапаліны звон» (сл. П. Панчанкі). Жывапіс: *Я. Батальёнак.* «Далягляды»; *М. Будавей.* «Партрэт Пімена Панчанкі».

Іван Мележ. Раман «Людзі на балоце» (6 гадзін).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Людзі на балоце». Творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка «Палескай хронікі». Шматгранныя нацыянальныя характары ў рамане. Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету галоўных герояў Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі. Настойлівае імкненне Васіля да самасцвярджэння і незалежнасці, яго сціпласць, цярплівасць, працавітасць, разгубленасць у складаных жыццёвых абставінах. Драматычны лёс Ганны.

Нетрадыцыйны падыход аўтара да раскрыцця псіхалогіі заможных сялян. Розныя адносіны да людзей, працы, будучыні ў старога Глушака і яго сыноў. Драматызм становішча Глушака ў час калектывізацыі. Вастрыня драматычнай калізіі.

Чалавек і прырода ў творы. Псіхалагічнае майстэрства Мележа-празаіка. Нацыянальная самабытнасць творчасці Івана Мележа і яе агульначалавечая значнасць.

Тэорыя літаратуры. Стыль пісьменніка (паглыбленне паняцця). Традыцыі і наватарства.

Мастацтва. Жывапіс: *Г. Вашчанка.* «Маё Палессе»; *А. Гараўскі.* «Пінскія балоты»; *Ю. Зайцаў.* «Людзі Палесся»; *Н. Шчасная.* «Партрэт Івана Мележа». Выяўленчае мастацтва: *Л. Талбузін.* Медаль «Іван Мележ». Кінамастацтва: кінафільм «Людзі на балоце» (рэж. *В. Тураў*). Тэатральнае мастацтва: спектакль «Людзі на балоце» (рэж. *А. Гарцуеў*).

Уладзімір Караткевіч. Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха»; раман «Каласы пад сярпом тваім» (кніга першая «Выйсце крыніц»; другая кніга «Сякера пры дрэве» – раздзелы I, II, VII, XII, XVII) (8 гадзін).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Дзікае паляванне караля Стаха». Канкрэтна-гістарычная аснова твора. Каларыт, атмасфера мінулай эпохі (80-я гады XIX ст.). Роздум аб прызначэнні чалавека на зямлі, аб лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох. Праблемы дабра і зла, кахання, мужнасці і гераізму. Вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай. Асаблівасці кампазіцыі твора.

«Каласы пад сярпом тваім». Гістарычная аснова рамана. Духоўны воблік галоўнага героя твора Алеся Загорскага. Прадстаўнікі дваранства ў рамане (Даніла Вежа-Загорскі, Хаданскія, Кроер). Харство кахання Алеся Загорскага і Майкі Раўбіч. Своеасаблівасць мастацкага стылю рамана. Дынамічнасць сюжэта. Месца і роля лірычных адступленняў і пейзажных малюнкаў. Вобразная сімволіка. Сувязь рамана з паэтыкай народных балад і легенд.

Тэорыя літаратуры. Рамантычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў літаратуры (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва. Музыка: *Я. Глебаў.* Раманс «Любы мой»; *Л. Мурашка.* Раманс «Дагарэў за брамай неба край»; *Д. Смольскі.* Опера «Сівая легенда»; *У. Солтан У.* Опера «Дзікае паляванне караля Стаха». Скульптура: *С. Вакар.* «Пісьменнік У. Караткевіч». Жывапіс: *У. Зінкевіч.* «Партрэт У. Караткевіча»; *М. Будавей.* «Партрэт У. Караткевіча». Кіна і тэлемастацтва: «Дзікае паляванне караля Стаха» (рэж. *В. Рубінчык*); «Кніганошы» (рэж. *У. Трацянкоў*); «Ладдзя роспачы» (рэж. *Л. Тарасаў*); «Лісце каштанаў» (рэж. *У. Забэла*); «Маці ўрагану» (рэж. *Ю. Марухін*); «Памяць каменя» (сцэн. *У. Караткевіч*); «Сведкі вечнасці» (сцэн. *У. Караткевіч*); «Сівая легенда» (рэж. *Б. Парэмта*); «Сіняя-сіняя» (рэж. *Н. Арцімовіч*); «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка» (рэж. *У. Бычкоў*); «Чорны замак Альшанскі» (рэж. *М. Пташук*).

Андрэй Макаёнак. «Зацюканы апостал» (3 гадзіны).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці драматурга.

«Зацюканы апостал». Жанравая адметнасць п’есы. Спалучэнне ў творы камічнага і трагічнага. Умоўнасць часу і месца дзеяння. Характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць. Маральна-этычны змест камедыі, сцвярджэнне аўтарам духоўных агульначалавечых каштоўнасцей. Майстэрства Андрэя Макаёнка ў абмалёўцы характараў.

Тэорыя літаратуры. Трагікамедыя. Моўная характарыстыка персанажаў (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: *М. Будавей.* «А. Макаёнак». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Зацюканы апостал» (рэж. *Б. Луцэнка*).

Рэзерв вучэбнага часу
(1 гадзіна)

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год
(1 гадзіна)

У с я г о: на вывучэнне твораў – 48 гадзін;
на ўрок па творах для дадатковага чытання – 1 гадзіна;
на творчыя работы – 4 гадзіны.

Спіс твораў для завучвання на памяць

Уладзімір Дубоўка. «Родная мова, цудоўная мова...».
Аркадзь Куляшоў. «На паўмільярдным кіламетры…».
Пімен Панчанка. «Герой».
Іван Мележ. Урывак з рамана «Людзі на балоце» (ад слоў «Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна...» і да слоў «... так і відаць – маладосць, сіла ў кожнай жылачцы!»).

Спіс твораў для дадатковага чытання

Янка Брыль. «Галя».
Максім Гарэцкі. «Роднае карэнне».
Зб. «Душа мая тужлівая» (уклад. Віктар Шніп).
Уладзімір Жылка. Вершы.
Міхась Зарэцкі. «Кветка пажоўклая».
Зб. «Іскры вечнага агню» (уклад. А. А. Васілевіч і інш.).
Уладзімір Караткевіч. «Чазенія».
Аркадзь Куляшоў. «Маналог».
Міхась Лынькоў. Апавяданні.
Андрэй Макаёнак. «Трыбунал».
Андрэ Маруа. «Пакаранне золатам».
Іван Мележ. «Подых навальніцы».
Андрэй Мрый. «Запіскі Самсона Самасуя».
Іван Навуменка. «Сасна пры дарозе».
Стэфан Цвэйг. «Нябачная калекцыя».
Міхась Чарот. Вершы.
Кузьма Чорны. «Пошукі будучыні».
Антуан дэ Сент-Экзюперы. «Планета людзей».

Асноўныя віды вусных і пісьмовых работ
па літаратуры ў X класе

Чытанне і паўнавартаснае ўспрыманне мастацкіх тэкстаў.

Выразнае чытанне мастацкіх твораў.

Складанне простага і разгорнутага плана ўласнага вуснага і пісьмовага паведамлення.

Вусны і пісьмовы пераказ урыўка з эпічнага твора з элементамі аналізу.

Вуснае і пісьмовае сачыненне-апісанне выгляду героя, карціны прыроды і інш. (на падставе вывучаных твораў), сачыненне-разважанне па праблеме, узнятай пісьменнікам.

Даклад або рэферат на літаратурную тэму па адной крыніцы.

Рэцэнзія, тэзісы, канспект літаратурна-крытычнага артыкула або лекцыі настаўніка.

Граматычны матэрыял, які падлягае вывучэнню, аднолькавы для ўсіх відаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Патрабаванні да валодання граматычным матэрыялам адрозніваюцца аб'ёмам яго прадуктыўнага засваення. Граматычныя з'явы для рэцэптыўнага засваення, адзначаныя зорачкай (*), прызначаны для прадуктыўнага засваення на павышаным узроўні.

Больш высокія патрабаванні да валодання моўным і маўленчым матэрыялам пры вывучэнні замежнай мовы на павышаным узроўні забяспечаць больш высокі ўзровень

фарміравання ў вучняў моўных навыкаў і маўленчых уменняў, што будзе праяўляцца ў іх здольнасці больш якасна вырашаць камунікатыўныя задачы.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

105/175 гадзін

ПРАДМЕТНА-ТЭМАТЫЧНЫ ЗМЕСТ ЗНОСІН

Сфера зносін	*Прадметна-тэматычны змест*	*Камунікатыўныя задачы* *У канцы года вучань павінен умець*
Сацыяльна-бытавая	*Віды жылля*	Расказаць пра віды жылля ў Рэспубліцы Беларусь; распытаць пра віды жылля ў краіне вывучаемай мовы; параўнаць віды жылля ў Рэспубліцы Беларусь і краіне вывучаемай мовы; апісаць свой дом/кватэру (сваёй мары); *параўнаць перавагі і недахопы пражывання ва ўласным і шматкватэрным доме;* *выказаць меркаванні аб перспектывах развіцця жылля ў будучыні*
Вучэбна-працоўная	*Адукацыя*	Расказаць пра сістэму адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь; распытаць пра сістэму адукацыі ў краіне вывучаемай мовы; параўнаць сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і ў краіне вывучаемай мовы; *абмеркаваць актуальныя праблемы сістэмы адукацыі;* *Выказаць меркаванні аб перспектывах развіцця адукацыі*
Сацыяльна-культурная	*Сродкі масавай інфармацыі*	Расказаць пра розныя крыніцы інфармацыі (друкаваныя выданні, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт) у Рэспубліцы Беларусь; распытаць пра розныя крыніцы інфармацыі (друкаваныя выданні, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт) у краіне вывучаемай мовы; абмеркаваць цікавы артыкул/тэлеперадачу; зрабіць кароткі агляд асноўных навін; *ацаніць вядомыя беларускія і іншамоўныя газеты і часопісы;* *выказаць меркаванне аб будучым сродкаў масавай інфармацыі*
	Мастацтва	Расказаць пра вядомага мастака, скульптара, фатографа і яго творы; парэкамендаваць наведаць выставу/музей; абмяняцца ўражаннямі аб выставе/музеі; расказаць пра вядомыя помнікі архітэктуры Рэспублікі Беларусь; распытаць пра вядомыя помнікі архітэктуры краін вывучаемай мовы; *расказаць пра віды мастацтва і свае перавагі;* *абмеркаваць ролю мастацтва ў жыцці чалавека*
	Моладзь і грамадства	Расказаць пра маладзёжныя арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь і іх дзейнасць; распытаць пра маладзёжныя арганізацыі ў краіне вывучаемай мовы і іх дзейнасць; расказаць аб асабістым ўдзеле ў працы маладзёжнай арганізацыі/саюза/аб'яднання;
Сацыяльна-пазнавальная		*выказаць меркаванне аб праблемах моладзі ў сучасным грамадстве;* *даказаць важнасць удзелу моладзі ў грамадскім жыцці;* *Пераканаць прыняць удзел у акцыі/валанцёрскім руху*
	Навука і тэхніка	Расказаць пра сучасныя навуковыя дасягненні/адкрыцці; абмеркаваць станоўчыя і адмоўныя бакі навуковага прагрэсу; расказаць пра знакамітых вучоных Рэспублікі Беларусь і краін вывучаемай мовы/свету; *абмеркаваць магчымасці супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з другімі краінамі ў сферы навукі і тэхнікі;* *выказаць меркаванне аб прыярытэтных напрамках развіцця навукі і тэхнікі ў XXI стагоддзі;* *даказаць важнасць развіцця навукі і тэхнікі для сучаснага грамадства*
	Знакамітыя людзі Рэспублікі Беларусь і краін	Расказаць пра знакамітых людзей Рэспублікі Беларусь; распытаць пра знакамітых людзей краіны вывучаемай мовы; апісаць уклад знакамітай асобы ў развіццё

	вывучаемай мовы	грамадства/навукі/культуры; *пракаменціраваць выказванні знакамітых людзей.* *Выказаць меркаванне наконт ролі асобы ў развіцці грамадства*

ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых пры непасрэдных зносінах і ў гуказапісе/відэазапісе:

асноўны змест аўдыя- і відэатэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 3–4 % незнаёмых слоў, значэнне якіх можна зразумець з дапамогай моўнай або кантэкстуальнай здагадкі;

адносна поўна разумець змест тэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 2–3 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца.

Віды тэкстаў: апавяданне, біяграфія, інтэрв'ю, аб'ява, размова па тэлефоне, фрагмент радыёпраграмы, відэафільма, тэленавіны.

Працягласць гучання тэксту – 2–2,5 мін.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

запытваць і паведамляць інфармацыю, вызначаную прадметна-тэматычным зместам зносін;

выказваць свае адносіны і даведвацца пра меркаванне субяседніка наконт атрыманай інфармацыі, даваць эмацыянальную ацэнку;

аргументаваць сваё меркаванне ў дыскусіі.

Віды дыялогу: дыялог-распытванне, дыялог – абмен думкамі, інтэрв'ю, дыялог-разважанне.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка – 7–8.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець рабіць падрыхтаваныя і непадрыхтаваныя паведамленні па тэме/праблеме/сітуацыі:

апісваць і параўноўваць прадметы, факты, з'явы;

расказваць аб пачутым/прачытаным/убачаным з выкарыстаннем эмацыянальна-ацэначных меркаванняў;

спалучаць апісанне і апавяданне з разважаннем і выказваннем асабістай ацэнкі.

Віды маналагічнага выказвання: апісанне, апавяданне, разважанне, ацэначнае меркаванне.

Аб'ём выказвання – 12–16 фраз.

Чытанне

Вучні павінны разумець тэксты з рознай паўнатой, дакладнасцю і глыбінёй пранікнення ў іх змест у залежнасці ад віду чытання:

разумець асноўны змест нескладаных аўтэнтычных мастацкіх, навукова-папулярных і публіцыстычных тэкстаў (азнаямленчае чытанне);

поўна і дакладна разумець змест нескладаных аўтэнтычных мастацкіх і навукова-папулярных тэкстаў (вывучальнае чытанне);

знаходзіць неабходную/значную інфармацыю ў тэкстах публіцыстычнага і прагматычнага характару (праглядальнае/пошукавае чытанне);

ацэньваць важнасць і навізну выбранай інфармацыі і выказваць свае адносіны да яе;

вызначаць галоўную ідэю і задуму аўтара.

Тэксты, прызначаныя для азнаямленчага чытання, могуць уключаць да 4–5 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца. Аб'ём тэксту – прыкладна 3000–4000 друкаваных знакаў з прабеламі.

Тэксты для вывучальнага чытання могуць уключаць да 3–4 % незнаёмых слоў, раскрыццё значэння якіх магчыма пры выкарыстанні двухмоўнага слоўніка. Аб'ём тэксту – прыкладна 2500–3500 друкаваных знакаў з прабеламі.

Для навучання праглядальнаму/пошукаваму чытанню мэтазгодна выкарыстоўваць адзін або некалькі разнажанравых тэкстаў.

Віды тэкстаў: апавяданне, артыкул у газеце/часопісе, праграма спектакля, аб'ява, рэклама.

Пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець прадуцыраваць нескладаныя віды тэкстаў у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краіне вывучаемай мовы:

пісаць віншаванні, запрашэнні, прыватныя пісьмы;

пісаць кароткую аўтабіяграфію, запаўняць анкету;

коратка выкладаць змест праслуханага/прачытанага тэксту;

пісаць міні-сачыненне па прапанаванай тэме/праблеме.

Аб'ём тэксту – 100–150 слоў.

МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

АНГЛІЙСКАЯ МОВА

Фанетыка

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага моўнага і маўленчага матэрыялу.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 230–280 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 200–280 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 1740–2020 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 1110–1640 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: складаныя прыметнікі і назоўнікі. Суфіксы назоўнікаў *-ment, -ist;* прыметнікаў – *-(ic)al, -ive;* дзеясловаў – *en, -fy*. Прыстаўкі *ir-, im-, il-*.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: сістэматызацыя ўтварэння множнага ліку.

Артыкль: ужыванне артыкля з назвамі газет, часопісаў, маладзёжных арганізацый; ужыванне/адсутнасць артыкля ва ўстойлівых словазлучэннях.

Дзеяслоў: спосабы выражэння дзеянняў у прошлым *(Past Simple, Past Continuous, Past Perfect).*

Герундый: ужыванне пасля дзеясловаў з прыназоўнікамі.

Сінтаксіс

Простая і ўскосная мова.

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

*Інфінітыў: аб'ектны інфінітыўны зварот (Complex Object).

Адваротны парадак слоў у сказе з *hardly/scarcely... when, no sooner... than.*

Сцвярджальныя, адмоўныя і пытальныя формы *Future Continuous, Past Perfect Continuous, Present Continuous Passive.*

*Умоўны лад.

НЯМЕЦКАЯ МОВА

Фанетыка

Дзяленне сказаў на сэнсавыя групы. Інтанацыя складаназлучаных сказаў, якія складаюцца з некалькіх меладычных груп.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 230–280 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 200–280 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 1740–2020 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 1110–1640 лексічных адзінак.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: скланенне ўласных імён. Асобыя выпадкі ўтварэння множнага ліку (сістэматызацыя): назоўнікі на *-um, -ion: das Datum – die Daten, das Zentrum – die Zentren; das Museum – die Museen; das Stadion – die Stadien, das Studium – die Studien*; змяненне слова: *der Kaufmann – die Kaufleute, der Rat – die Ratschläge, der Seemann – die Seeleute, das Unglück – die Unglücksfälle;* множны лік для размежавання назоўнікаў, розных па значэнні: *der Band (кніжны том) – die Bände, das Band (стужка) – die Bänder; die Bank (лаўка) – die Bänke, die Bank (банк) – die Banken; der Strauß (букет) – die Sträuße, der Strauß (страус) – die Sträuße; der Verdienst (заробак) – die Verdienste, das Verdienst (заслуга) – die Verdienste; das Wort* (слова як звязнае маўленне) *– die Worte, das Wort (слово) – die Wörter.*

Назоўнікі без формы множнага ліку: субстантываваныя інфінітывы; рэчыўныя невылічальныя, абстрактныя, зборныя назоўнікі; назоўнікі меры і вагі (выключэнне складаюць назоўнікі жаночага роду). Назоўнікі без формы адзіночнага ліку: некаторыя групы асоб: *die Leute, die Eltern, die Geschwister;* назоўнікі: *die Finanzen, die Ferien, die Kosten, die Makkaroni, die Möbel, die Papiere* (дакументы), *die Shorts, die Spagetti*.

Артыкль: ужыванне артыкля з геаграфічнымі назвамі.

Дзеяслоў: часавая форма дзеяслова *Plusquamperfekt Aktiv* для выражэння перадпрошлага часу.

Займеннік: адносныя займеннікі *der, die, das.*

Сінтаксіс

Складаназалежныя сказы з даданай часткай часу са злучнікамі *wenn, als, nachdem*. Даданыя азначальныя частка з адноснымі займеннікамі *der, die, das, die* ў назоўным і вінавальным склонах.

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

Назоўнік: скланенне геаграфічных назваў.

Субстантываваныя дзеепрыслоўі: Partizip I, Partizip II.

Дзеяслоў: часавыя формы дзеясловаў прошлага часу *Perfekt/ Plusquamperfekt Passiv*.

Складаназлучаныя сказы з *даданымі сказамі часу са злучнікамі während, bevor*; *даданыя азначальныя сказы* з адноснымі займеннікамі *der, die, das, die*. Складаназлучаныя сказы з злучнікам *je... desto*.

ФРАНЦУЗСКАЯ МОВА

Фанетыка

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага моўнага і маўленчага матэрыялу.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 230–280 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 200–280 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 1740–2020 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 1110–1640 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы прыметнікаў *-ible, -able*; адмоўныя прыстаўкі *in-, im-, il-, ir-*, *mé-, dé-;* прыстаўка сумеснага дзеяння *co-*. Сістэматызацыя спосабаў словаўтварэння. Прэфіксы назоўнікаў: *anti-, contre-, auto-, bio-, géo-, hydro-, mono-, poly-, néo-, philo-, télé-, extra-, archi-, hyper-, super-.* Абрэвіятуры.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Артыкль: сістэматызацыя ўжывання: артыкля (неазначальнага, азначальнага, частковага); назоўнікаў і прыметнікаў мужчынскага і жаночага роду ў адзіночным і множным ліку; асабовых займеннікаў.

Дзеяслоў: умоўны лад: *le subjonctif présent* у простым і даданым дапаўняльным і акалічнасных сказах; дапасаванне часоў (план прошлага часу).

Прыслоўе: прыслоўі часу aujourd'hui – ce jour-là, hier – la veille, demain – le lendemain.

Сінтаксіс

Складаназалежныя сказы з даданымі прычыны і мэты.

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

*Неасабовыя формы дзеяслова l'infinitif présent, l'infinitif passé.

**Аддзеяслоўны прыметнік: l'adjectif verbal*, *le participe présent, le participe passé.*

ІСПАНСКАЯ МОВА

Фанетыка

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага моўнага і маўленчага матэрыялу.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 230–280 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 200–280 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 1740–2020 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 1110–1640 лексічных адзінак.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Займеннік: прыналежныя займеннікі (поўная форма) у ролі прыметнікаў і назоўнікаў.

Дзеяслоў: сістэматызацыя ўсіх вывучаных трывальна-часавых форм *Modo Indicativo (Pretérito Perfecto, Pretérito Indefinido, Pretérito Imperfecto, Pretérito Pluscuamperfecto, Futuro Simple), Modo Subjuntivo (Presente de Subjuntivo, Imperfecto de Subjuntivo)* і *Modo Potencial (Simple)*. Дапасаванне часоў у *Modo Indicativo.* Простая і ўскосная мова.

Прыназоўнік: прыназоўнікавае кіраванне дзеясловаў.

Сінтаксіс

Складаназалежныя сказы з даданымі ўмовы I, II тыпаў.

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

*Словаўтварэнне: суфіксы дзеясловаў *-ificar, -ecer;* прыстаўка *pre-*.

**Дзеяслоў:* асаблівасці і ўжыванне дзеясловаў у *Futuro Compuesto de Indicativo, Potencial Compuesto*.

КІТАЙСКАЯ МОВА

ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Успрыманне і разумение маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых пры непасрэдных зносінах і ў гуказапісе:

асноўны змест аўдыя- і відэатэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 3–4 % незнаёмых слоў, значэнне якіх можна зразумець з дапамогай моўнай або кантэкстуальнай здагадкі;

адносна поўна разумець змест тэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 2–3 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца.

Віды тэкстаў: апавяданне, інтэрв'ю, аб'ява, размова па тэлефоне, радыёпраграма, відэафільм, тэленавіны.

Працягласць гучання тэксту – 2–2,5 мін.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

запытваць і паведамляць інфармацыю, вызначаную прадметна-тэматычным зместам зносін;

выказваць свае адносіны і даведвацца пра меркаванне субяседніка наконт атрыманай інфармацыі;

даваць эмацыянальную ацэнку атрыманай інфармацыі;

аргументаваць сваё меркаванне ў дыскусіі.

Віды дыялогу: дыялог-распытванне, дыялог – абмен думкамі, інтэрв'ю, дыялог-палеміка.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка – 7–8.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець рабіць падрыхтаваныя і непадрыхтаваныя паведамленні па тэме/праблеме/сітуацыі:

апісваць і параўноўваць предметы, факты, з'явы;

расказваць аб пачутым/прачытаным/убачаным з выкарыстаннем эмацыянальна-ацэначных меркаванняў;

спалучаць апісанне і апавяданне з разважаннем і выказваннем асабістай ацэнкі.

Віды маналагічнага выказвання: апісанне, апавяданне, разважанне.

Аб'ём выказвання – 12–16 фраз.

Чытанне

Вучні павінны разумець тэксты, якія напісаны з дапамогай іерогліфаў, з рознай паўнатой, дакладнасцю і глыбінёй пранікнення ў іх змест у залежнасці ад віду чытання:

разумець асноўны змест нескладаных аўтэнтычных мастацкіх, навукова-папулярных і публіцыстычных тэкстаў (азнаямленчае чытанне);

поўна і дакладна разумець змест нескладаных аўтэнтычных мастацкіх і навукова-папулярных тэкстаў (вывучальнае чытанне);

знаходзіць неабходную/значную інфармацыю ў тэкстах публіцыстычнага і прагматычнага характару (праглядальнае/ пошукавае чытанне);

ацэньваць важнасць і навізну выбранай інфармацыі і выказваць свае адносіны да яе;

вызначаць галоўную ідэю і задуму аўтара.

Тэксты, прызначаныя для азнаямленчага чытання, могуць уключаць да 4–5 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца. Аб'ём тэксту – 0,5–0,75 старонкі.

Тэксты для вывучальнага чытання могуць уключаць да 3–4 % незнаёмых слоў, раскрыццё значэння якіх магчыма пры выкарыстанні двухмоўнага слоўніка. Аб'ём тэксту – да 0,75 старонкі.

Для навучання праглядальнаму/пошукаваму чытанню мэтазгодна выкарыстоўваць адзін або некалькі разнажанравых тэкстаў.

Віды тэкстаў: апавяданне, артыкул у газеце/часопісе, навуковы артыкул, праграма спектакля, аб'ява.

Вучні павінны ўмець чытаць іерогліфы (250–1250 адзінак).

Пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець прадуцыраваць нескладаныя віды тэкстаў, якія напісаны з дапамогай іерогліфаў, у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краіне вывучаемай мовы:

пісаць віншаванні, запрашэнні, асабістыя пісьмы;

пісаць кароткую аўтабіяграфію, запаўняць анкету;

коратка выкладаць змест праслуханага/прачытанага тэксту;

пісаць міні-сачыненне па прапанаванай тэме/праблеме.

Аб'ём тэксту – 100–150 слоў (да 0,75 старонкі).

Вучні павінны ўмець пісаць іерогліфы (250–1250 адзінак).

МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

Фанетыка

Інтанацыя складаназлучаных сказаў.

Інтанацыя складаназалежных сказаў.

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага моўнага і маўленчага матэрыялу.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 230–280 лексічных адзінак. Рэцэптыўны мінімум: 200–280 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 1740–2020 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 1110–1640 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: складаныя прыметнікі і назоўнікі.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Лічэбнік: дробы, працэнты, разрады.

Займеннік: пытальныя займеннікі з неазначальным значэннем; пытальныя займеннікі з агульным значэннем.

Дзеяслоў: сістэматызацыя мадальных дзеясловаў.

Дапаўненне патэнцыяльнасці: 下, 了, 动.

Выніковае дапаўненне: 着, 住.

Сінтаксіс

Складаназлучаныя сказы.

Складаназалежныя сказы.

Сказы, якія выражаюць існаванне або з’яўленне.

Сказы з састаўным дзеяслоўным выказнікам ... 有... 要做.

Канструкцыі, прыназоўнікі, злучнікі (尽管…但/也… , 艮P使…也… ,

哪怕... 也... , 既然...就... , 不官...都/也 , 无论...都/也 , 只要... , 才 多(么)...啊 , 够...了, 连...也/都 , 也/都...没/不 , 就是...也 , 等...就/ 在/才 ,一...就... , ... 了...就... , 一...才... , 越...越... , 或者...或

者… , ...得很 , 先…接着... , 按... ; 由…).

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

Канструкцыі, прыназоўнікі, злучнікі 哪怕…也; 不管…都/也; 够…了; 也/都…没/不, 就是…也, 等…就/在/才.

Вучні павінны валодаць **сацыякультурнымі ведамі** і ўменнямі:

ведаць асаблівасці сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і краінах вывучаемай мовы;

ведаць асноўныя сродкі масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь і краін вывучаемай мовы;

ацэньваць уклад сваёй краіны і краін вывучаемай мовы ў развіццё сусветнай культуры, навукі і тэхнікі;

умець расказаць замежнаму равесніку пра жыццё моладзі ў Рэспубліцы Беларусь;

умець выкарыстоўваць клішэ і ўстойлівыя словазлучэнні, якія адлюстроўваюць асаблівасці культуры краін вывучаемай мовы, у межах вывучанай тэматыкі.

Вучні павінны валодаць **кампенсаторнымі ўменнямі** ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці:

успрыманне і разуменне маўлення на слых

выкарыстоўваць атрыманую перад праслухоўваннем аўдыятэксту інфармацыю (уводзіны ў сітуацыю, тлумачэнне, папярэднія пытанні і інш.);

прагназаваць змест аўдыятэксту па загалоўку, пачатку і канцоўцы тэксту, па апорных словах;

выкарыстоўваць моўную і кантэкстуальную здагадку для аднаўлення прабелаў у змесце аўдыятэксту/выказвання;

ігнараваць незнаёмыя словы, якія не ўплываюць на разуменне асноўнага зместу;

удакладняць змест выказвання субяседніка з дапамогай мімікі і жэстаў, пытанняў, перапытвання;

чытанне

прагназаваць змест па загалоўку, падзагалоўку тэксту, апорных словах, па сродках зрокавай нагляднасці;

выкарыстоўваць тэкставыя апоры розных відаў (табліцы, графікі, шрыфтавыя выдзяленні);

выкарыстоўваць моўную і кантэкстуальную здагадку;

ігнараваць незнаёмыя словы, якія не ўплываюць на разуменне асноўнага зместу тэксту;

выкарыстоўваць двухмоўныя слоўнікі;

выкарыстоўваць розныя каментарыі;

гаварэнне

звяртацца за дапамогай да субяседніка, выкарыстоўваючы перапытванне і сродкі зрокавай нагляднасці (карта, схема, расклад і інш.);

удакладняць змест выказвання з дапамогай мімікі і жэстаў;

выкарыстоўваць сінанімічныя сродкі з мэтай удакладнення, тлумачэння;

пісьмовае маўленне

выкарыстоўваць элементы тэксту ў якасці змястоўных і моўных апор;

выкарыстоўваць сінанімічныя сродкі для выказвання думкі.

Вучні павінны валодаць **вучэбна-пазнавальнымі ўменнямі:**

складаць план, фармуляваць тэзісы выказвання;

знаходзіць і абагульняць неабходную інфармацыю на замежнай мове;

выконваць самастойныя заданні рэпрадуктыўна-прадуктыўнага характару з выкарыстаннем друкаваных матэрыялаў і тэхнічных сродкаў навучання;

ажыццяўляць самакантроль і ўзаемакантроль у працэсе ўзаемадзеяння;

супастаўляць моўныя з'явы ў роднай і замежнай мовах;

выкарыстоўваць даведачны апарат вучэбнага дапаможніка, іншых вучэбных матэрыялаў і слоўнікі.

Вучні павінны выкарыстоўваць набыты моўны, **маўленчы і сацыякультурны вопыт для:**

зносін з прадстаўнікамі іншых краін, арыентацыі ў сучасным полікультурным свеце;

атрымання звестак, неабходных у адукацыйных і самаадукацыйных мэтах, з іншамоўных крыніц інфармацыі (у тым ліку праз інтэрнэт);

развіцця добразычлівых і паважлівых адносін да прадстаўнікоў іншых краін;

вывучэння каштоўнасцей сусветнай культуры, культурнай спадчыны і дасягненняў іншых краін і азнаямлення прадстаўнікоў замежных краін з культурай і дасягненнямі Рэспублікі Беларусь;

аказання дапамогі замежным гасцям у сітуацыях штодзённых зносін.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 93

Учебная программа по учебному предмету
«Математика»
для X класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания
(базовый уровень)

МАТЕМАТИКА

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Математика занимает одно из центральных мест в образовании как важное средство формирования общей культуры, интеллектуального развития современного человека. Математические знания необходимы для изучения явлений природы, без них невозможно достижение успехов в развитии производства и науки. Знания о количественных отношениях и пространственных формах окружающего мира необходимы практически во всех сферах деятельности человека.

Методы, применяемые в математике, необходимы для специалистов в любой сфере деятельности, особенно в сфере наукоемких технических производств. Поэтому развитие компетенций у учащихся средствами учебного предмета для продолжения образования на уровнях профессионально-технического, среднего специального и высшего образования является особо важным.

Содержание математики как учебного предмета базируется на теоретической основе трех подходов: знаниевого, личностно ориентированного, компетентностного.

Цели и **задачи** изучения математики на базовом уровне при освоении содержания образовательной программы среднего образования:

продолжение формирования представлений о математике как части общечеловеческой культуры, ее роли в познании явлений и процессов действительности;

формирование математических знаний и умений, необходимых для изучения естественно-научных учебных предметов на базовом и повышенном уровнях и для продолжения образования в областях, не требующих углубленной математической подготовки;

формирование репродуктивного, репродуктивно-продуктивного и творческого видов деятельности при решении учебных и прикладных задач;

развитие логического мышления, пространственного воображения, алгоритмической культуры и критического мышления на уровне, необходимом в повседневной жизни и будущей профессиональной деятельности;

воспитание культуры личности и личностных качеств (целеустремленность, самостоятельность, ответственность, самоконтроль и др.);

формирование мотивации к самостоятельному приобретению математических знаний и умений, развитию компетенций, востребованных в условиях непрерывного образования и профессиональной деятельности.

Содержание алгебраического компонента в X классе предусматривает изучение тригонометрических и степенных функций, уравнений, неравенств, а содержание геометрического компонента – взаимное расположение прямых и плоскостей в пространстве, свойства прямых и плоскостей, метрические соотношения, основные геометрические тела.

Содержание алгебраического компонента в XI классе предусматривает изучение показательных и логарифмических функций, их свойств, показательных и логарифмических уравнений, неравенств, а содержание геометрического компонента – многогранники и их свойства, объемы и площади их поверхностей; тела вращения их свойства, объемы и площади их поверхностей.

ОРГАНИЗАЦИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

Образовательный процесс осуществляется с учетом возрастных особенностей учащихся, специфики учебного предмета, его места и роли в системе общего среднего образования.

Организация образовательного процесса должна быть направлена на достижение учащимися результатов, определенных настоящей учебной программой. Вместе с тем образовательный процесс должен быть поставлен так, чтобы у учащихся была возможность реализовать свои образовательные запросы. При этом необходимо, чтобы учащиеся не только усвоили определенные теоретические знания, но и научились использовать их при решении учебных задач и задач прикладного характера.

Обучение математике должно способствовать дальнейшему развитию культуры устной и письменной речи учащегося, умению работать с различными источниками информации, ставить цели, планировать и искать пути их достижения, анализировать и оценивать результаты.

Организуя образовательный процесс, учитель математики имеет право самостоятельно выбирать методы, приемы и технологии обучения, обеспечивающие достижение целей обучения и воспитания. Логическая строгость изложения учебного материала должна сочетаться с высокой степенью наглядности и доступности.

Образовательный процесс при изучении математики должен способствовать развитию интереса к овладению знаниями, способами познания окружающего мира;

созданию положительного эмоционального состояния; формированию адекватной самооценки; эстетическому воспитанию учащихся.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА

140 ч (4 ч в неделю)
Алгебраический компонент – 84 ч
Геометрический компонент – 56 ч

ФУНКЦИЯ (15 ч)

Функция числового аргумента. Свойства функции (область определения, множество значений, нули функции, промежутки знакопостоянства функции, четность и нечетность, периодичность, возрастание и убывание, точки максимума и минимума, максимум и минимум, наибольшее и наименьшее значения функции на промежутке).

Построение графиков функций

$y = f(x \pm a)$, $y = f(x) \pm b$, $a, b \in R$;

$y = kf(x)$, $k > 0$, $k \in R$;

$y = -f(x)$

с помощью преобразования графика функции $y = f(x)$.

Бесконечно убывающая геометрическая прогрессия как функция натурального аргумента. Сумма членов бесконечно убывающей геометрической прогрессии.

Основные требования
к результатам учебной деятельности учащихся

Учащиеся должны:

иметь представление о понятиях: функция числового аргумента, бесконечно убывающая геометрическая прогрессия как функция натурального аргумента;

знать термины и правильно применять понятия: область определения, множество значений, нули функции, промежутки знакопостоянства, четность и нечетность, периодичность и наименьший положительный период, возрастание и убывание, точки максимума и минимума, максимум и минимум функции, наибольшее и наименьшее значения функции на промежутке, бесконечно убывающая геометрическая прогрессия;

уметь:

находить область определения и множество значений функции, нули функции, промежутки знакопостоянства, наименьший положительный период, промежутки возрастания и убывания, точки максимума и минимума, максимум и минимум функции, наибольшее и наименьшее значения функции на промежутке по аналитическому заданию функции и по графику функции;

находить сумму членов бесконечно убывающей геометрической прогрессии;

исследовать функцию на четность и нечетность по аналитическому заданию функции и по графику функции;

выполнять построение графиков функций

$y = f(x \pm a)$, $y = f(x) \pm b$, $a, b \in R$;

$y = kf(x)$, $k > 0$, $k \in R$;

$y = -f(x)$

с помощью преобразования графика функции $y = f(x)$.

ТРИГОНОМЕТРИЯ (40 ч)

Градусная и радианная мера произвольного угла. Единичная окружность. Определение синуса, косинуса, тангенса, котангенса произвольного угла.

Соотношения между синусом, косинусом, тангенсом и котангенсом одного и того же угла (тригонометрические тождества).

Тригонометрические функции числового аргумента. Их свойства и графики.

Арксинус, арккосинус, арктангенс и арккотангенс числа.

Простейшие тригонометрические уравнения $\sin x = a$, $\cos x = a$, $\operatorname{tg} x = a$, $\operatorname{ctg} x = a$ и уравнения, сводящиеся к простейшим.

Формулы приведения, суммы и разности аргументов, двойного аргумента, преобразования суммы и разности тригонометрических функций в произведение.

Основные требования
к результатам учебной деятельности учащихся

Учащиеся должны:

знать термины и правильно применять понятия: единичная окружность, синус, косинус, тангенс, котангенс произвольного угла; тригонометрические функции числового аргумента; арксинус, арккосинус, арктангенс и арккотангенс числа;

знать:

свойства тригонометрических функций числового аргумента;

тригонометрические тождества; формулы приведения, суммы и разности аргументов, двойного аргумента, преобразования суммы и разности тригонометрических функций в произведение;

числовые значения выражений $\sin\alpha$, $\cos\alpha$ при α, равном $0, \frac{\pi}{6}, \frac{\pi}{4}, \frac{\pi}{3}, \frac{\pi}{2}, \pi, \frac{3\pi}{2}, 2\pi$ и $\operatorname{tg}\alpha$, $\operatorname{ctg}\alpha$ для этих углов (в случае существования этих значений); значения выражений $\arcsin a$ и $\arccos a$ при a, равном $0, \pm\frac{1}{2}, \pm\frac{\sqrt{2}}{2}, \pm\frac{\sqrt{3}}{2}, \pm 1,$ и выражений $\operatorname{arctg} a$ и $\operatorname{arcctg} a$ при a, равном $0, \pm\frac{\sqrt{3}}{3}, \pm 1, \sqrt{3};$

формулы решения простейших тригонометрических уравнений;

уметь:

переводить градусную меру углов в радианную и наоборот;

строить углы по их заданной градусной или радианной мере; использовать единичную окружность для нахождения значений синуса и косинуса заданных углов; строить углы по заданному значению их синуса, косинуса, тангенса;

находить числовые значения тригонометрических выражений, используя значения тригонометрических функций и соответствующих формул;

выполнять тождественные преобразования тригонометрических выражений с помощью тригонометрических формул;

строить графики тригонометрических функций и применять свойства функций;

решать: простейшие тригонометрические уравнения и уравнения, сводящиеся к ним (методами разложения на множители, замены переменной), однородные тригонометрические уравнения.

СТЕПЕНЬ С РАЦИОНАЛЬНЫМ ПОКАЗАТЕЛЕМ. СТЕПЕННАЯ ФУНКЦИЯ (25 ч)

Корень n-й степени из числа a ($n \geq 2,\ n \in N$). Арифметический корень. Основные свойства корня n-й степени. Преобразование выражений, содержащих корни n-й степени.

Степень с рациональным показателем. Свойства степени с рациональным показателем. Степень с действительным показателем.

Степенная функция с рациональным показателем, свойства и график степенной функции.

Иррациональные уравнения.

Основные требования
к результатам учебной деятельности учащихся

Учащиеся должны:

иметь представление о степени с действительным показателем;

знать термины и правильно применять понятия: корень *n*-й степени из числа *a*, показатель степени корня, подкоренное выражение, степень с рациональным показателем, степенная функция, иррациональное уравнение;

знать:

основные свойства корня *n*-й степени, свойства степеней с рациональным показателем; свойства и график степенной функции; формулы, выражающие свойства степеней и корней *n*-й степени;

основные методы решения иррациональных уравнений;

уметь:

вычислять корень *n*-й степени из действительного числа, представляющего *n*-ю степень; выносить множитель из-под корня; оценивать значение корня; представлять корень *n*-й степени в виде степени с рациональным показателем и наоборот; упрощать выражения, содержащие корни и степени с рациональным показателем;

строить графики степенных функций $y = x^k$ для $k \in Z, k \neq 0$, $y = x^{\frac{1}{2}}$, $y = x^{\frac{1}{3}}$;

решать уравнения вида $x^n = a$, , где $n \in N$, $a \in R$; иррациональные уравнения.

ВВЕДЕНИЕ В СТЕРЕОМЕТРИЮ (10 ч)

Предмет стереометрии. Пространственные тела. Многогранники: куб, параллелепипед, призма, прямая призма, правильная призма, пирамида, правильная пирамида.

Основные понятия стереометрии. Аксиомы стереометрии. Следствия из аксиом. Построение сечений многогранника плоскостью на основании аксиом стереометрии и следствий из них.

Основные требования
к результатам учебной деятельности учащихся

Учащиеся должны:

иметь представление о пространственных телах стереометрии: куб, параллелепипед, призма, прямая призма, правильная призма, пирамида, правильная пирамида;

знать: аксиомы и следствия из них;

уметь:

применять аксиомы и следствия из них для решения задач;

строить простейшие сечения многогранников плоскостью на основании аксиом и следствий их них.

ПАРАЛЛЕЛЬНОСТЬ ПРЯМЫХ И ПЛОСКОСТЕЙ (20 ч)

Параллельные прямые в пространстве. Определение и признак параллельности прямых. Свойства параллельных прямых в пространстве.

Прямая, параллельная плоскости. Определение и признак параллельности прямой и плоскости. Свойство прямых, параллельных плоскости.

Скрещивающиеся прямые. Определение и признак скрещивающихся прямых.

Угол между прямыми.

Параллельные плоскости. Определение и признак параллельности плоскостей.

Свойства параллельных прямых и плоскостей в пространстве.

Основные требования
к результатам учебной деятельности учащихся

Учащиеся должны:

знать и правильно использовать определения: параллельные прямые; скрещивающиеся прямые; параллельные прямая и плоскость; параллельные плоскости;

знать:

признаки: параллельности прямых, скрещивающихся прямых, параллельности прямой и плоскости, параллельности плоскостей;

свойства: параллельных прямых, параллельных прямой и плоскости, параллельных плоскостей;

уметь:

строить сечения многогранников плоскостью на основании теорем о параллельности прямой и плоскости;

решать задачи, в том числе на доказательство параллельности прямых и плоскостей в пространстве.

ПЕРПЕНДИКУЛЯРНОСТЬ ПРЯМЫХ И ПЛОСКОСТЕЙ (23 ч)

Определение прямой, перпендикулярной плоскости. Признак перпендикулярности прямой и плоскости. Теорема о двух параллельных прямых, одна из которых перпендикулярна плоскости. Теорема о двух прямых, перпендикулярных плоскости.

Перпендикуляр и наклонная. Теоремы о длинах перпендикуляра, наклонных и проекций этих наклонных.

Теорема о трех перпендикулярах. Расстояние между фигурами. Расстояние от точки до плоскости. Расстояние между параллельными прямой и плоскостью. Расстояние между параллельными плоскостями.

Определение угла между прямой и плоскостью. Двугранный угол. Линейный угол двугранного угла. Мера двугранного угла. Угол между плоскостями.

Определение перпендикулярных плоскостей. Признак перпендикулярности плоскостей. Обратная теорема. Теоремы о связи между параллельностью и перпендикулярностью прямых и плоскостей.

Свойства перпендикулярных прямых и плоскостей.

Основные требования
к результатам учебной деятельности учащихся

Учащиеся должны:

знать и правильно использовать определения: перпендикулярные прямые, перпендикулярные прямая и плоскость, перпендикулярные плоскости; перпендикуляр к плоскости, наклонная к плоскости, расстояние между параллельными прямыми; расстояние между параллельными прямой и плоскостью, расстояние между параллельными плоскостями; двугранный угол, линейный угол двугранного угла, угол между плоскостями;

знать:

признаки: перпендикулярности прямой и плоскости, перпендикулярности плоскостей;

свойства: перпендикулярных прямых, перпендикулярных прямой и плоскости, перпендикулярных плоскостей;

теорему о трех перпендикулярах;

уметь:

находить расстояние между: двумя параллельными прямыми, параллельными прямой и плоскостью, параллельными плоскостями;

находить угол между: двумя прямыми, прямой и плоскостью, двумя плоскостями;

решать задачи, в том числе на доказательство.

Резерв: 7 ч ($4_а$ + $3_г$)

Контрольные работы – 6 к. р.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Матэматыка»
для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Матэматыка займае адно з цэнтральных месцаў у адукацыі як важны сродак фарміравання агульнай культуры, інтэлектуальнага развіцця сучаснага чалавека. Матэматычныя веды неабходны для вывучэння з'яў прыроды, без іх немагчыма дасягненне поспехаў у развіцці вытворчасці і навукі. Веды аб колькасных адносінах і прасторавых формах навакольнага свету неабходны практычна ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека.

Метады, якія прымяняюцца ў матэматыцы, неабходны для спецыялістаў у любой сферы дзейнасці, асабліва ў сферы навукаёмістых тэхнічных вытворчасцей. Таму развіццё кампетэнцый у вучняў сродкамі вучэбнага прадмета для працягу адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі з'яўляецца асабліва важным.

Змест матэматыкі як вучэбнага прадмета грунтуецца на тэарэтычнай аснове трох падыходаў: ведавага, асобасна арыентаванага, кампетэнтнаснага.

Мэты і задачы вывучэння матэматыкі на базавым узроўні пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі:

працяг фарміравання ўяўленняў аб матэматыцы як часткі агульначалавечай культуры, яе ролі ў пазнанні з'яў і працэсаў рэчаіснасці;

фарміраванне матэматычных ведаў і уменняў, неабходных для вывучэння прыродазнаўчанавуковых вучэбных прадметаў на базавым і павышаным узроўнях і для працягу адукацыі ў галінах, якія не патрабуюць паглыбленай матэматычнай падрыхтоўкі;

фарміраванне рэпрадуктыўнага, рэпрадуктыўна-прадуктыўнага і творчага відаў дзейнасці пры рашэнні вучэбных і пры кладных задач;

развіццё лагічнага мыслення, прасторавага ўяўлення, алгарытмічнай культуры і крытычнага мыслення на ўзроўні, неабходным у паўсядзённым жыцці і будучай прафесійнай дзейнасці;

выхаванне культуры асобы і асобасных якасцей (мэтанакіраванасць, самастойнасць, адказнасць, самакантроль і інш.).

Змест алгебраічнага кампанента ў X класе прадугледжвае вывучэнне трыганаметрычных і ступеневых функцый, ураўненняў, няроўнасцей, а змест геаметрычнага кампанента – узаемнае размяшчэнне прамых і плоскасцей у прасторы, уласцівасці прамых і плоскасцей, метрычныя суадносіны, асноўныя геаметрычныя целы.

Змест алгебраічнага кампанента ў XI класе прадугледжвае вывучэнне паказальных і лагарыфмічных функцый, іх уласцівасцей, паказальных і лагарыфмічных ураўненняў, няроўнасцей, а змест геаметрычнага кампанента – шматграннікі і іх уласцівасці, аб'ёмы і плошчы іх паверхняў; целы вярчэння, іх уласцівасці аб'ёмы і плошчы іх паверхняў.

АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Адукацыйны працэс ажыццяўляецца з улікам узроставых асаблівасцей вучняў, спецыфікі вучэбнага прадмета, яго месца і ролі ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу павінна быць накіравана на дасягненне вучнямі вынікаў, вызначаных вучэбнай праграмай. Разам з тым адукацыйны працэс павінен быць пастаўлены так, каб у вучняў была магчымасць рэалізаваць свае адукацыйныя запатрабаванні. Пры гэтым неабходна, каб вучні не толькі засвоілі пэўныя тэарэтычныя веды, але і навучыліся выкарыстоўваць іх пры рашэнні вучэбных задач і задач прыкладнога характару.

Навучанне матэматыцы павінна спрыяць далейшаму развіццю культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучня, уменню працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, ставіць мэты, планаваць і шукаць шляхі іх дасягнення, аналізаваць і ацэньваць вынікі.

Арганізуючы адукацыйны працэс, настаўнік матэматыкі мае права самастойна выбіраць метады, прыёмы і тэхналогіі навучання, якія забяспечваюць дасягненне мэт навучання і выхавання. Лагічная строгасць выкладання вучэбнага матэрыялу павінна спалучацца з высокай ступенню нагляднасці і даступнасці.

Адукацыйны працэс пры вывучэнні матэматыкі павінен спрыяць развіццю цікавасці да авалодання ведамі, спосабамі пазнання навакольнага свету; стварэнню станоўчага эмацыянальнага настрою; фарміраванню адэкватнай самаацэнкі; эстэтычнаму выхаванню вучняў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

X КЛАС

140 гадзін (4 гадзіны на тыдзень)
Алгебраічны кампанент – 84 гадзіны
Геаметрычны кампанент – 56 гадзін

ФУНКЦЫЯ (15 ГАДЗІН)

Функцыя лікавага аргумента. Уласцівасці функцый (абсяг вызначэння, мноства значэнняў, нулі функцыі, прамежкі знакапастаянства функцыі, цотнасць і няцотнасць, перыядычнасць, нарастанне і спаданне, пункты максімуму і мінімуму, максімум і мінімум, найбольшае і найменшае значэнні функцыі на прамежку).

Пабудова графікаў функцый

$$y = f(x \pm a),\ \ y = f(x) \pm b,\quad a, b \in R;$$

$$y = kf(x),\quad k > 0,\quad k \in R,$$

$$y = -f(x)$$

з дапамогай пераўтварэння графіка функцыі $y = f(x)$.

Бясконца спадальная геаметрычная прагрэсія як функцыя натуральнага аргумента. Сума членаў бясконца спадальнай геаметрычнай прагрэсіі.

**АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ**

Вучань павінен:

мець уяўленне аб паняццях: функцыя лікавага аргумента, бясконца спадальная геаметрычная прагрэсія як функцыя натуральнага аргумента;

ведаць тэрміны і правільна ўжываць паняцці: абсяг вызначэння, мноства значэнняў, нулі функцыі, прамежкі знакапастаянства, цотнасць і няцотнасць, перыядычнасць і найменшы дадатны перыяд, нарастанне і спаданне, пункты максімуму і мінімуму, максімум і мінімум функцыі, найбольшае і найменшае значэнні функцыі на прамежку, бясконца спадальная геаметрычная прагрэсія; умець:

знаходзіць абсяг вызначэння і мноства значэнняў функцыі, нулі функцыі, прамежкі знакапастаянства, найменшы дадатны перыяд, прамежкі нарастання і спадання, пункты максімуму і мінімуму, максімум і мінімум функцыі, найбольшае і найменшае значэнні функцыі на прамежку па аналітычным заданні функцыі і па графіку функцыі;

знаходзіць суму членаў бясконца спадальнай геаметрычнай прагрэсіі;

даследаваць функцыю на цотнасць і няцотнасць па аналітычным заданні функцыі і па графіку функцыі;

будаваць графікі функцый

$$y = f(x \pm a),\ \ y = f(x) \pm b,\quad a, b \in R;$$
$$y = kf(x),\quad k > 0,\quad k \in R,$$
$$y = -f(x)$$

з дапамогай пераўтварэнняў графіка функцыі $y = f(x)$.

ТРЫГАНАМЕТРЫЯ (40 ГАДЗІН)

Градусная і радыянная мера адвольнага вугла. Адзінкавая акружнасць. Азначэнне сінуса, косінуса, тангенса, катангенса адвольнага вугла.

Суадносіны паміж сінусам, косінусам, тангенсам і катангенсам аднаго і таго ж вугла (трыганаметрычныя тоеснасці).

Трыганаметрычныя функцыі лікавага аргумента. Іх уласцівасці і графікі.

Арксінус, арккосінус, арктангенс і арккатангенс ліку.

Найпрасцейшыя трыганаметрычныя ўраўненні sin x = a, cos x = a, tg x = a, ctg x = a і ўраўненні, якія прыводзяцца да найпрас цейшых.

Формулы прывядзення, сумы і рознасці аргументаў, двайнога аргумента; пераўтварэнне сумы і рознасці трыганаметрычных функцый у здабытак.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць тэрміны і правільна ўжываць паняцці: адзінкавая акружнасць, сінус, косінус, тангенс, катангенс адвольнага вугла; трыганаметрычныя функцыі лікавага аргумента; арксінус, арккосінус, арктангенс і арккатангенс ліку;

ведаць:

уласцівасці трыганаметрычных функцый лікавага аргумента;

трыганаметрычныя тоеснасці; формулы прывядзення, сумы і рознасці аргументаў, двайнога аргумента; пераўтварэнні сумы і рознасці трыганаметрычных функцый у здабытак;

лікавыя значэнні выразаў sinα, cosα пры α, роўны $0, \frac{\pi}{6}, \frac{\pi}{4}, \frac{\pi}{3}, \frac{\pi}{2}, \pi, \frac{3\pi}{2}, 2\pi$ і tgα, ctgα для гэтых вуглоў (у выпадку існавання гэтых значэнняў); значэнні выразаў arcsin *a* і

arccos *a* пры *a*, роўным $0, \pm\frac{1}{2}, \pm\frac{\sqrt{2}}{2}, \pm\frac{\sqrt{3}}{2}, \pm 1$ і выразаў arctg *a* і arcctg *a* пры *a*, роўным $0, \pm\frac{\sqrt{3}}{3}, \pm 1, \pm\sqrt{3};$

формулы рашэння найпрасцейшых трыганаметрычных ураўненняў;

умець:

пераўтвараць градусную меру вуглоў у радыянную і наадварот;

будаваць вуглы па іх зададзенай градуснай або радыяннай меры; выкарыстоўваць адзінкавую акружнасць для знаходжання значэнняў сінуса і косінуса зададзеных вуглоў; будаваць вуглы па зададзеным значэнні іх сінуса, косінуса, тангенса;

знаходзіць лікавыя значэнні трыганаметрычных выразаў, выкарыстоўваючы значэнні трыганаметрычных функцый і адпаведныя формулы;

выконваць тоесныя пераўтварэнні трыганаметрычных выразаў з дапамогай трыганаметрычных формул;

будаваць графікі трыганаметрычных функцый і выкарыстоўваць уласцівасці функцый;

рашаць: найпрасцейшыя трыганаметрычныя ўраўненні і ўраўненні, якія прыводзяцца да іх (метадамі раскладання на множнікі, замены зменнай), аднародныя трыганаметрычныя ўраўненні.

СТУПЕНЬ З РАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПАКАЗЧЫКАМ.

СТУПЕНЕВАЯ ФУНКЦЫЯ (25 ГАДЗІН)

Корань *n*-й ступені з ліку a *(n ≥ 2, n ∈ N).* Арыфметычны корань. Асноўныя ўласцівасці кораня *n*-й ступені. Пераўтварэнне выразаў, якія змяшчаюць карані *n*-й ступені.

Ступень з рацыянальным паказчыкам. Уласцівасці ступені з рацыянальным паказчыкам. Ступень з рэчаісным паказчыкам.

Ступеневая функцыя з рацыянальным паказчыкам, уласцівасці і графік ступеневай функцыі.

Ірацыянальныя ўраўненні.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

мець уяўленне аб ступені з рэчаісным паказчыкам;

ведаць тэрміны і правільна ўжываць паняцці: корань *n*-й ступені з ліку *a*, паказчык ступені кораня, падкарэнны выраз, ступень з рацыянальным паказчыкам, ступеневая функцыя, ірацыянальнае ўраўненне;

ведаць:

асноўныя ўласцівасці кораня *n*-й ступені, уласцівасці ступеней з рацыянальным паказчыкам; уласцівасці і графік ступеневай функцыі; формулы, што выражаюць уласцівасці ступеней і каранёў *n*-й ступені;

асноўныя метады рашэння ірацыянальных ураўненняў;

умець:

вылічваць корань *n*-й ступені з рэчаіснага ліку, які ўяўляе *n*-ю ступень; выносіць множнік з-пад кораня; ацэньваць значэнне кораня; паказваць корань *n*-й ступені ў выглядзе ступені з рацыянальным паказчыкам і наадварот; спрашчаць выразы, якія змяшчаюць карані і ступені з рацыянальным паказчыкам;

будаваць графікі ступеневых функцый $y = x^k$ для $k \in Z$, $k \neq 0$, $y = x^{\frac{1}{2}}$, $y = x^{\frac{1}{3}}$;

рашаць ураўненні выгляду $x^n = a$, где $n \in N$, $a \in R$; ірацыянальныя ўраўненні.

УВОДЗІНЫ Ў СТЭРЭАМЕТРЫЮ (10 ГАДЗІН)

Прадмет стэрэаметрыі. Прасторавыя целы. Мнагагранікі: куб, паралелепіпед, прызма, прамая прызма, правільная прызма, піраміда, правільная піраміда.

Асноўныя паняцці стэрэаметрыі. Аксіёмы стэрэаметрыі. Вынікі з аксіём. Пабудова сячэнняў мнагагранніка плоскасцю на падставе аксіём стэрэаметрыі і вынікаў з іх.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

мець уяўленне аб прасторавых целах стэрэаметрыі: куб, паралелепіпед, прызма, прамая прызма, правільная прызма, піраміда, правільная піраміда;

ведаць: аксіёмы і вынікі з іх;

умець:

ужываць аксіёмы і вынікі з іх для рашэння задач;

будаваць найпрасцейшыя сячэнні мнагагранніка плоскасцю на падставе аксіём і вынікаў з іх.

ПАРАЛЕЛЬНАСЦЬ ПРАМЫХ І ПЛОСКАСЦЕЙ (20 ГАДЗІН)

Паралельныя прамыя ў прасторы. Азначэнне і прымета паралельнасці прамых. Уласцівасці паралельных прамых у прасторы.

Прамая, паралельная плоскасці. Азначэнне і прымета паралельнасці прамой і плоскасці. Уласцівасць прамых, паралельных плоскасці.

Скрыжаваныя прамыя. Азначэнне і прымета скрыжаваных прамых.

Вугал паміж прамымі.

Паралельныя плоскасці. Азначэнне і прымета паралельнасці плоскасцей.

Уласцівасці паралельных прамых і плоскасцей у прасторы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць і правільна выкарыстоўваць азначэнні: паралельныя прамыя; скрыжаваныя прамыя; паралельныя прамая і плоскасць; паралельныя плоскасці;

ведаць:

прыметы: паралельнасці прамых, скрыжаваных прамых, паралельнасці прамой і плоскасці, паралельнасці плоскасцей;

уласцівасці: паралельных прамых, паралельных прамой і плоскасці, паралельных плоскасцей;

умець:

будаваць сячэнні мнагагранніка плоскасцю на падставе тэарэм аб паралельнасці прамой і плоскасці;

рашаць задачы, у тым ліку на доказ паралельнасці прамых і плоскасцей у прасторы.

ПЕРПЕНДЫКУЛЯРНАСЦЬ ПРАМЫХ І ПЛОСКАСЦЕЙ (23 ГАДЗІНЫ)

Азначэнне прамой, перпендыкулярнай плоскасці. Прымета перпендыкулярнасці прамой і плоскасці. Тэарэма аб двух паралельных прамых, адна з якіх перпендыкулярная плоскасці. Тэарэма аб двух прамых, перпендыкулярных плоскасці.

Перпендыкуляр і нахіленая. Тэарэмы аб даўжынях перпендыкуляра, нахіленых і праекцый гэтых нахіленых.

Тэарэма аб трох перпендыкулярах. Адлегласць паміж фігурамі. Адлегласць ад пункта да плоскасці. Адлегласць паміж паралельнымі прамой і плоскасцю. Адлегласць паміж паралельнымі плоскасцямі.

Азначэнне вугла паміж прамой і плоскасцю. Двухгранны вугал. Лінейны вугал двухграннага вугла. Мера двухграннага вугла. Вугал паміж плоскасцямі.

Азначэнне перпендыкулярных плоскасцей. Прымета перпендыкулярнасці плоскасцей. Адваротная тэарэма. Тэарэмы аб сувязі паміж паралельнасцю і перпендыкулярнасцю прамых і плоскасцей.

Уласцівасці перпендыкулярных прамых і плоскасцей.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць і правільна выкарыстоўваць азначэнні: перпендыкулярныя прамыя, перпендыкулярныя прамая і плоскасць, перпендыкулярныя плоскасці; перпендыкуляр да плоскасці, нахіленая да плоскасці, адлегласць паміж паралельнымі прамымі, адлегласць паміж паралельнымі прамой і плоскасцю, адлегласць паміж паралельнымі плоскасцямі; двухгранны вугал; лінейны вугал двухграннага вугла; вугал паміж плоскасцямі;

ведаць:

прыметы: перпендыкулярнасці прамой і плоскасці, перпендыкулярнасці плоскасцей;

уласцівасці: перпендыкулярных прамых, перпендыкулярных прамой і плоскасці, перпендыкулярных плоскасцей;

тэарэму аб трох перпендыкулярах;

умець:

знаходзіць адлегласць паміж дзвюма паралельнымі прамымі, паралельнымі прамой і плоскасцю, паралельнымі плоскасцямі;

Вучэбныя праграмы прызначаны для арганізацыі навучання сусветнай гісторыі ў X класе (сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг.) і XI класе (сусветная гісторыя Навейшага часу, 1945–2015) на базавым узроўні, які прадугледжвае ўзровень засваення вучнямі абавязковага мінімуму зместу адукацыі па гісторыі, што спрыяе развіццю агульнай культуры, светапогляду, каштоўнасна-сэнсавых установак, гатоўнасці і здольнасці да самаразвіцця і асобаснага самавызначэння, а таксама для ўсвядомленага і эфектыўнага вырашэння адукацыйных і жыццёвых (сацыякультурных) задач.

Неабходна ўлічваць тое, што разам з захаваннем важнасці атрымання вучнямі ведаў аб навейшым перыядзе гісторыі асаблівая ўвага павінна надавацца ўдасканаленню спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для далейшага самастойнага выкарыстання пры аналізе сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці. Таму базавы ўзровень вывучэння гісторыі прадугледжвае значную практычную арыентаванасць атрыманых гістарычных ведаў. З мэтай выпрацоўкі асобасных адносін вучняў да вывучаемых падзей і працэсаў важна звязваць вывучаемы матэрыял з сучасным жыццём.

Мэта і задачы вывучэння вучэбнага прадмета

Мэта вывучэння гісторыі:

авалоданне вучнямі сістэматызаванымі ведамі аб сусветным гістарычным працэсе з 1918 па 1945 г., неабходнымі для фарміравання грамадзянскага патрыятызму і паспяховай сацыялізацыі ў сучасным сацыякультурным асяроддзі, і развіццё на гэтай аснове гістарычнага мыслення.

Асноўныя задачы:

засвоіць найважнейшыя факты, якія характарызуюць перыяд Навейшай гісторыі ад заканчэння Першай сусветнай вайны да заканчэння Другой сусветнай вайны, з раскрыццём найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей;

засвоіць асноўныя гістарычныя паняцці ў іх сістэме і ўзаемасувязі;

выпрацоўваць каштоўнасныя арыентацыі, фарміраваць ацэначныя пазіцыі;

асвоіць асноўныя спосабы аперыравання ведамі;

фарміраваць уменні, неабходныя для ажыццяўлення пераўтваральнай, пазнавальнай і творчай дзейнасці і прымянення атрыманых ведаў у грамадскім і асабістым жыцці.

Асобасныя, метапрадметныя і прадметныя вынікі засваення вучэбнага прадмета

Вывучэнне гісторыі на базавым узроўні ажыццяўляецца з улікам магчымасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу, які ўлічвае фарміраванне асобасных, метапрадметных, прадметных кампетэнцый. Кампетэнцыі разглядаюцца як асобасная якасць, якая фарміруецца ў адукацыйным працэсе ў ходзе засваення ведаў, набыцця ўменняў, навыкаў, вопыту дзейнасці, неабходных для працягу адукацыі, працоўнай дзейнасці, паспяховай сацыялізацыі ў грамадстве.

Асобасныя вынікі вывучэння гісторыі на базавым узроўні адлюстроўваюць:

усведамленне ўласнай ідэнтычнасці як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

фарміраванне базавай сістэмы каштоўнасцей (сям'я, сябры і знаёмыя, вольны час, палітыка, праца, рэлігія);

далучэнне да культурнай разнастайнасці сучаснага грамадства;

развіццё светапогляду, самасвядомасці, адносін да рэчаіснасці, характару, здольнасцей, псіхічных працэсаў, назапашванне вопыту.

Метапрадметныя вынікі вывучэння гісторыі на базавым узроўні адлюстроўваюць уменні:

самастойна вызначаць мэты свайго навучання і пазнавальнай дзейнасці, а таксама шляхі іх дасягнення;

аналізаваць сваю дзейнасць і карэкціраваць яе;

вызначаць паняцці і падводзіць пад паняцці;

абагульняць, сістэматызаваць, класіфікаваць факты, устанаўліваць асноўныя прычынна-выніковыя сувязі, рабіць высновы;

выкарыстоўваць знакава-сімвальную інфармацыю;

працаваць з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі;

арганізоўваць і прадстаўляць вынікі сваёй дзейнасці;

узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, працаваць у групе, камандзе, калектыве.

Прадметныя вынікі вывучэння гісторыі Навейшага часу з 1918 г. па 2015 г. на базавым узроўні накіраваны на засваенне прадметнага зместу і асваенне спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Яны прадстаўлены ў раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

Пашырыць праблематыку зместу гістарычнага курса, стварыць умовы для арганізацыі засваення адпаведных спосабаў дзейнасці, адпрацаваць навыкі даследчай працы з гістарычнымі крыніцамі, удасканальваць уменне фармуляваць і аргументаваць уласны пункт гледжання магчыма на аснове вывучэння шырокага спектра гістарычных крыніц.

Вучэбная праграма прадугледжвае правядзенне *абагульняльных урокаў*, якія садзейнічаюць сістэматызацыі ведаў вучняў, устанаўленню сувязей паміж рознымі часткамі, выведу заканамернасцей і тэндэнцый, удасканаленню спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Павышэнню якасці навучання таксама будзе садзейнічаць выкарыстанне ў адукацыйным працэсе міжпрадметных сувязей і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Матэрыял, адзначаны *курсівам*, прызначаны для азнаямленчага вывучэння.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне сусветнай гісторыі ў X класе адводзіцца 1 вучэбная гадзіна на тыдзень, 35 вучэбных гадзін на год, для XI класа – 1 вучэбная гадзіна на тыдзень, 35 вучэбных гадзін на год.

Настаўнік, зыходзячы з педагагічнай мэтазгоднасці і ўлічваючы асаблівасці навучання ў канкрэтных умовах, можа змяніць рэкамендаваную праграмай колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных тэм і парадак іх вывучэння, не выходзячы за агульную колькасць вучэбнага часу па раздзелах.

X клас
СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ, 1918–1945 гг.

(35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны – рэзервовы час)

Уводзіны. Пачатак крызісу індустрыяльнага грамадства (1 г)

Паняцце «Навейшая гісторыя», перыядызацыя гісторыі Навейшага часу. Асноўныя тэндэнцыі сусветна-гістарычнага развіцця ў 1918–1945 гг. Уплыў Першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. на ход сусветнай гісторыі.

Асноўныя паняцці: Навейшая гісторыя (гісторыя Навейшага часу).

РАЗДЗЕЛ I
КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША Ў 1918–1939 гг. (9 г)

Усталяванне асноў пасляваеннага свету. Парыжская мірная канферэнцыя. Стварэнне Лігі Нацый. *Мірныя дагаворы 1919–1923 гг.** Вашынгтонская канферэнцыя. Супярэчнасці Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін.

Заходняя Еўропа ў 1918–1923 гг. Лістападаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Германіі. Рэвалюцыйна-дэмакратычны пад'ём у іншых краінах. Утварэнне Камінтэрна і Рабочага сацыялістычнага інтэрнацыянала. Узнікненне фашысцкай партыі ў Германіі. Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі. Б. Мусаліні.

Заходняя Еўропа і ЗША ў 1924–1929 гг. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Унутрыпалітычнае развіццё. Міжнародныя адносіны.

Сусветны эканамічны крызіс і краіны Заходняй Еўропы і ЗША ў 1929–1933 гг. Пачатак крызісу. Асаблівасці яго праяўлення ў розных краінах. «Новы курс» у ЗША. Ф. Д. Рузвельт. Сацыяльна-палітычнае развіццё краін Заходняй Еўропы. Прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі. Напрамкі выхаду з крызісу.

Заходні свет напярэдадні Другой сусветнай вайны. Устанаўленне фашысцкага рэжыму ў Германіі. Народны фронт у Францыі. Народны фронт і грамадзянская вайна ў Іспаніі. Ф. Франка. Антыфашысцкі рух.

Міжнародныя адносіны ў 1930-я гг. Крызіс і крах Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Агрэсіўная палітыка фашысцкіх дзяржаў у 1935–1939 гг. Мюнхенская канферэнцыя. Праблема стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні.

Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Утварэнне незалежных дзяржаў. Устанаўленне аўтарытарных рэжымаў. Акупацыя Чэхаславакіі. Польшча перад пагрозай германскай агрэсіі.

Навука і культура Заходняй Еўропы і ЗША ў міжваенны перыяд (1919–1939 гг.). Прыродазнаўчыя навукі і навукова-тэхнічны прагрэс. А. Эйнштэйн. Грамадскія навукі. О. Шпэнглер. Працяг традыцый рэалізму ў літаратуры. Э. Хемінгуэй, Э. М. Рэмарк. Пошукі новых форм у выяўленчым мастацтве. Кіно. Ч. Чаплін. Архітэктура.

Падагульненне да раздзела I.

Асноўныя паняцці: III (Камуністычны) Інтэрнацыянал, рэпарацыі, дэмілітарызацыя, Ліга Нацый, Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, дэмакратызацыя палітычнай сістэмы, сусветны эканамічны крызіс, «новы курс» Рузвельта, фашызм, нацызм, расізм, таталітарны палітычны рэжым, генацыд, гета, Народны фронт, палітыка «супакойвання» агрэсара, аншлюс, Мюнхенскі дагавор, сістэма калектыўнай бяспекі, савецка-германскі дагавор аб ненападзенні, аўтарытарны палітычны рэжым, масавая культура, мадэрнізм,

РАЗДЗЕЛ II
ГІСТОРЫЯ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ: 1917–1939 гг. (8 г)

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Расіі. Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне. Перамога паўстання ў Петраградзе і Маскве. II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Утварэнне Савета Народных Камісараў (СНК). У. І. Ленін, устанаўленне савецкай улады ў рэгіёнах Расіі. Брэсцкі мір.

Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя. Асноўныя прычыны і этапы Грамадзянскай вайны ў Расіі. Асноўныя сілы і ўдзельнікі Грамадзянскай вайны. Белы рух. А. В. Калчак. Чырвоны рух. Л. Д. Троцкі, М. В. Фрунзэ. Палітыка «ваеннага камунізму». Разгром армій А. І. Дзянікіна, М. М. Юдзеніча і П. М. Урангеля. Завяршальны этап Грамадзянскай вайны. Вынікі Грамадзянскай вайны.

Новая эканамічная палітыка. Утварэнне СССР. Эканамічны і палітычны крызіс у краіне. Сутнасць і значэнне нэпа. Уздым народнай гаспадаркі. Пераадоленне Савецкай

краінай палітычнай ізаляцыі на міжнароднай арэне. Утварэнне СССР і яго прызнанне. Праекты аб'яднання савецкіх рэспублік. І. В. Сталін. Канстытуцыя СССР 1924 г. Гістарычнае значэнне ўтварэння СССР.

Курс на пабудову сацыялізму ў СССР. Індустрыялізацыя і калектывізацыя. Згортванне нэпа. Індустрыялізацыя. Сацыялістычнае спаборніцтва. А. Р. Стаханаў. Ажыццяўленне суцэльнай калектывізацыі. Змяненне сацыяльнага аблічча савецкага грамадства.

Унутраная і знешняя палітыка СССР у 1930-я гг. Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы. Канстытуцыя СССР 1936 г. Знешняя палітыка СССР у 1930-я гг. Англа-франка-савецкія перамовы 1939 г. Германа-савецкі пакт аб ненападзенні (жнівень 1939 г.).

Культурныя пераўтварэнні ў СССР. Ліквідацыя масавай непісьменнасці і фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі. Навуковыя адкрыцці. Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва. Сацыялістычны рэалізм. Сацыялістычная дзяржава і царква.

Падагульненне да раздзела II.

Асноўныя паняцці: Кастрычніцкая рэвалюцыя, сепаратны мір, бальшавізм, рэвалюцыйная дыктатура, Савет Народных Камісараў (СНК), Грамадзянская вайна, палітыка «ваеннага камунізму», культ асобы, новая эканамічная палітыка (нэп), Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР), аўтаномія, федэрацыя, індустрыялізацыя, пяцігодка, стаханаўскі рух, ударніцтва, калектывізацыя, метад сацыялістычнага рэалізму.

РАЗДЗЕЛ III
КРАІНЫ УСХОДУ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ ПАМІЖ СУСВЕТНЫМІ ВОЙНАМІ (7 г)

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё краін Усходу і Лацінскай Амерыкі. Тэрытарыяльны перадзел свету. Сацыяльныя працэсы на Усходзе. Нацыянальна-вызваленчы рух за незалежнасць і мадэрнізацыю. Лацінская Амерыка.

Кітай. Кітайская рэспубліка ў пачатку XX стагоддзя. Уздым нацыянальнага руху ў 1919–1924 гг. «Рух 4 мая». Чан Кайшы. Нацыянальная рэвалюцыя 1925–1927 гг. Грамадзянская вайна 1927–1937 гг. Агрэсія Японіі ў Кітаі. Развіццё культуры. *Новыя з'явы ў ладзе жыцця**.

Індыя. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў 1918–1922 гг. Рэформы англійскай адміністрацыі. Ідэалогія гандзізму. Саляны паход. Індыя ў гады Другой сусветнай вайны. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры. *Лад жыцця**.

Японія. Эканамічнае і палітычнае развіццё ў 1920–1930-я гг. Мілітарызацыя Японіі ў 1930-х гг. Знешняя палітыка. Культура Японіі. *Лад жыцця і духоўныя каштоўнасці**.

Мусульманскі свет. Сацыяльна-палітычнае становішча мусульманскага свету ў 1918–1939 гг. Нацыянальная рэвалюцыя ў Турцыі 1918–1923 гг. М. Кемаль Атацюрк. Іран. Дасягненне незалежнасці Афганістанам. Барацьба егіпецкага народа за незалежнасць. Асаблівасці культурнага развіцця мусульманскіх краін. *Лад жыцця**.

Лацінская Амерыка. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Палітыка ЗША ў дачыненні да краін Лацінскай Амерыкі. Унутраная палітыка краін рэгіёну (Аргенціна, Бразілія, Мексіка). Культура Лацінскай Амерыкі.

Падагульненне да раздзела III.

Асноўныя паняцці: нацыянальна-вызваленчы рух, японізм (ніпанізм), гандзізм, «саляны паход», кемалізм, фундаменталізм і рэфармізм у ісламе, шарыят, хадж, сацыяграха, палітыка «добрага суседа».

РАЗДЗЕЛ IV
ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (8 г)

Пачатак Другой сусветнай вайны. Прычыны, характар вайны. Нападзенне Германіі на Польшчу. Уступленне ў вайну з Германіяй Вялікабрытаніі і Францыі, пазіцыя ЗША. Захоп Германіяй Даніі і Нарвегіі. Паражэнне Францыі. «Бітва за Брытанію». Палітыка СССР напярэдадні вайны з Германіяй. Акупацыя Югаславіі і Грэцыі фашысцкай Германіяй.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Нападзенне Германіі на Савецкі Саюз. Правал стратэгіі «маланкавай вайны» супраць СССР. Бітва пад Масквой і яе гістарычнае значэнне. Г. К. Жукаў. Уступленне ЗША ў вайну. Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Баі на савецка-германскім фронце летам – восенню 1942 г.

Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Вырашальныя перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе, іх міжнароднае значэнне. Ваенныя дзеянні армій ЗША і Вялікабрытаніі ў канцы 1942–1943 г. Капітуляцыя Італіі. Вайна на Ціхім і Атлантычным акіянах. Пашырэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя.

Барацьба з захопнікамі на акупаванай тэрыторыі. Устанаўленне «новага парадку». Рух Супраціўлення ў акупаваных краінах Еўропы. Барацьба савецкага народа ў тыле ворага. Партызанскі рух і падпольная барацьба.

Савецкі тыл у час вайны. Перавод эканомікі на ваенны лад. Абаронная прамысловасць. Навука і культура. Працоўны гераізм савецкага народа. Уклад тылу ў перамогу ў вайне. Царква ў гады вайны. *Паўсядзённае жыццё савецкіх людзей у тыле**. Становішча ў блакадным Ленінградзе.

Заключны этап Другой сусветнай вайны. Разгром фашысцкага блока (1944–1945 гг.). Вызваленне Чырвонай Арміяй акупаваных тэрыторый СССР і еўрапейскіх краін у 1944–1945 гг. Адкрыццё другога фронту. Д. Эйзенхаўэр. Крымская канферэнцыя. Капітуляцыя Германіі. Патсдамская канферэнцыя. Паражэнне Японіі. Заснаванне Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (ААН). Цана і значэнне перамогі.

Падагульненне да раздзела IV.

Асноўныя паняцці: Другая сусветная вайна, «дзіўная вайна», Вялікая Айчынная вайна, антыгітлераўская кааліцыя, ленд-ліз, карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, «новы парадак», Халакост, партызанскі і падпольны рух, рух Супраціўлення, другі фронт, безагаворачная капітуляцыя, Арганізацыя Аб’яднаных Нацый (ААН), Нюрнбергскі трыбунал.

Выніковае падагульненне (1 г).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення вучэбнай праграмы на базавым узроўні вучні будуць: *ведаць*:

асноўныя падзеі сусветнай гісторыі Навейшага часу з 1918 па 1945 г., іх даты, удзельнікаў і вынікі;

значэнне асноўных паняццяў і іх азначэнні;

асноўныя факты жыцця і дзейнасці найбольш значных гістарычных асоб і дзеячаў культуры;

прыведзеныя ў вучэбнай літаратуры ацэнкі асноўных падзей, гістарычных асоб, дасягненняў і вынікаў развіцця навукі і тэхнікі;

умець:

лакалізоўваць падзеі сусветнай і айчыннай гісторыі ў 1918–1945 гг. у часе і прасторы;

апісваць: а) ключавыя падзеі першага перыяду Навейшай гісторыі; б) помнікі культуры першага перыяду Навейшай гісторыі;

тлумачыць значэнне асноўных паняццяў і правільна іх выкарыстоўваць пры характарыстыцы гістарычнай і сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці;

суадносіць гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

характарызаваць асноўныя перыяды Навейшай гісторыі, важныя гістарычныя падзеі; палітычныя рэжымы, якія існавалі ў першай палове XX стагоддзя: дэмакратычныя, аўтарытарныя, таталітарныя; палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё прадстаўленых у праграме краін свету ў 1918–1945 гг.; нацыянальна-вызваленчы рух; дзейнасць палітычных і дзяржаўных асоб і дзеячаў культуры; найбольш значныя з'явы культуры ў 1918–1945 гг.; асаблівасці палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця прыведзеных у праграме краін свету ў вывучаемы перыяд;

даваць ацэнку гістарычным падзеям, дзейнасці ўрадаў, палітычных і дзяржаўных дзеячаў першага перыяду Навейшай гісторыі; ацэньваць уклад дзеячаў культуры і навукі ў гістарычнае развіццё чалавечага грамадства;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць гістарычныя факты і рабіць на аснове гэтага аргументаваныя высновы;

параўноўваць гістарычныя факты па самастойна вызначаных крытэрыях;

праводзіць аналіз зместу гістарычных дакументаў;

пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

тлумачыць розныя пункты гледжання на адны і тыя ж гістарычныя факты;

выказваць і аргументаваць сваё стаўленне да гістарычных падзей і асоб;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:

для вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з'яў і асоб, а таксама да падзей сучаснага жыцця;

аналізу падчас працы з сучаснай сацыяльнай інфармацыяй;

усвядомленых паводзін як прадстаўніка гістарычна складзенага грамадзянскага, этнакультурнага, канфесійнага згуртавання, грамадзяніна Беларусі;

беражлівых адносін да помнікаў гісторыі і культуры.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 93

Учебная программа по учебному предмету
«История Беларуси (История Беларуси, 1917–1945 гг.)»
для X класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания
(базовый уровень)

ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ, 1917–1945 гг.

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Общая характеристика учебного предмета, его специфика в системе общего среднего образования

Учебная программа имеет переходный характер в условиях постепенного обеспечения концентрического принципа структурирования учебных исторических знаний и последовательности их усвоения. Она составлена с учетом возможности реализации компетентностного подхода к подготовке учащихся по истории, который

ориентирован на формирование личностных, метапредметных и предметных результатов обучения, что обеспечивает персональное развитие и успешную социализацию личности.

На базовом уровне изучение истории Беларуси на III ступени общего среднего образования организуется преимущественно на событийно-хронологическом уровне. Усвоение содержания истории Беларуси 1917 г. – начала XXI в. имеет особое значение с точки зрения социализации личности учащихся и формирования у них следующих социально значимых знаний:

об (о) основных этапах оформления белорусской государственности, в том числе становления и конституционного оформления государственного суверенитета Республики Беларусь, а также государственной символики БССР и Республики Беларусь;

особенностях функционирования советского общественно-политического и социально-экономического строя в БССР в период модернизации, связанных со строительством социализма и утверждением индустриального общества;

тенденциях социально-экономической жизни современной белорусской нации в условиях глобализации и интеграции, разработки модели экономического развития и ее реализации в Республике Беларусь;

достижениях уроженцев Беларуси и представителей белорусской советской и современной науки и культуры, литературы и искусства, олимпийского спорта;

геополитическом положении БССР и многовекторном направлении внешнеполитической деятельности Республики Беларусь.

Место учебного предмета в учебном плане

Учебные программы предназначены для организации обучения истории Беларуси в X–XI классах на базовом уровне, который предусматривает степень усвоения учащимися обязательного минимума содержания образования по истории, что способствует развитию общей культуры, мировоззрения, ценностно-смысловых установок, готовности и способности к саморазвитию и личностному самоопределению, а также для осознанного и эффективного решения образовательных и жизненных (социокультурных) задач.

Необходимо учитывать то, что наряду с сохранением важности получения учащимися знаний о новейшем периоде истории особое внимание должно уделяться совершенствованию способов учебно-познавательной деятельности, необходимых для дальнейшего самостоятельного использования при анализе современной социальной действительности. В силу этого базовый уровень изучения истории предполагает значительную практическую ориентированность полученных исторических знаний.

Цель и задачи изучения учебного предмета

Цель изучения предмета – овладение учащимися основами систематизированных теоретических и фактологических знаний о важнейших событиях и процессах истории Беларуси во взаимосвязи с советской историей, необходимыми для формирования гражданского патриотизма и успешной социализации личности при ее интеграции в современное социокультурное окружение.

Основные задачи:

усвоить важнейшие понятия и факты, характеризующие период развития Беларуси от вызревания предпосылок Октябрьской революции 1917 г. к завершающему этапу Великой Отечественной и Второй мировой войн и период развития Беларуси от восстановления после Великой Отечественной войны и до становления суверенной Республики Беларусь с объяснением наиболее существенных причинно-следственных связей;

вырабатывать ценностные ориентации и позицию личности на основании осознания учащимися коллективной исторической памяти и формирования национальной

идентичности, чувства гордости за культурно-историческое наследие Беларуси, в частности за достижения белорусских советских и современных науки, культуры, спорта;

формировать опыт преобразующей и творческой познавательной деятельности, умения анализа современной социальной действительности и прогнозирования собственной жизнедеятельности, связанных с применением учащимися приобретенных знаний в условиях информационного коммуникативного пространства, в личном общении и собственной жизнедеятельности.

Личностные, метапредметные и предметные результаты освоения учебного предмета

Изучение истории на базовом уровне осуществляется с учетом возможности реализации компетентностного подхода, учитывающего формирование личностных, метапредметных, предметных компетенций.

В соответствии с личностными результатами обучения компетенции рассматриваются как готовность учащихся использовать усвоенные ими знания и умения для собственной успешной интеграции в современном белорусском обществе при опоре на коллективную историческую память. При реализации компетентностного подхода изучение истории Беларуси ориентировано на формирование мировоззрения и качеств личности, необходимых для выполнения общих для всех граждан Республики Беларусь социальных функций, обусловленных системой ценностей, общепринятых в белорусском обществе. На базовом уровне изучения предусматривается осознание учащимися своей идентичности как граждан Республики Беларусь и их приобщение к культурному разнообразию белорусского общества.

В соответствии с метапредметными результатами обучения на базовом уровне предусматривается формирование у учащихся умения самостоятельно определять цели своего обучения, представлять, анализировать и корректировать результаты в условиях индивидуальной и коллективно-распределительной форм деятельности; систематизировать и обобщать содержание учебного материала и делать на этой основе аргументированные выводы; овладевать способами поиска, сбора, обработки, использования разнообразных источников социально-исторической информации с возможностью ее перевода из визуального в вербальный вид и наоборот.

В соответствии с предметными результатами обучения на базовом уровне учащимся необходимо усвоить наиболее важные факты, которые характеризуют исторический процесс в целом и разные стороны общественного развития с объяснением наиболее существенных причинно-следственных связей, а также основные исторические понятия в их системе и взаимосвязи. Вместе с усвоением содержания исторического материала у учащихся вырабатываются общеучебные и специальные исторические способы деятельности. Предметные результаты обучения представлены в подразделах «Основные требования к результатам учебно-познавательной деятельности учащихся». При усвоении содержания учебного материала особое значение придается формированию умений характеризовать и сравнивать исторические события общественно-политического, социально-экономического, национально-культурного развития БССР и Республики Беларусь в их причинно-следственных связях через конкретизацию с помощью понятий, с проведением анализа содержания исторических документов.

Материал, отмеченный в программе курсивом, имеет ознакомительный для учащихся характер и предназначен для формирования у них общих представлений о содержании изучаемых событий и процессов.

Следует учесть, что резервное время может быть использовано для проведения уроков контроля сформированности знаний и умений по каждому из разделов программы или для предэкзаменационного повторения.

Программа предусматривает усвоение на уроках «Наш край» местного материала, что позволит учесть особенности исторического развития своего региона, в том числе с помощью историко-документальной хроники городов и районов Беларуси «Памяць».

В соответствии с Учебными планами на изучение истории Беларуси в X классе (история Беларуси, 1917–1945 гг.) отводится 1 учебный час в неделю, 35 учебных часов в год, в XI классе (история Беларуси, вторая половина 1940-х гг. – начало XXI в.) – 1 учебный час в неделю, 35 учебных часов в год.

Учитель, исходя из педагогической целесообразности и учитывая особенности обучения в конкретных условиях, может изменить рекомендуемое программой количество учебных часов на изучение отдельных тем и порядок их изучения, не выходя за общее количество учебного времени по разделам.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА

(35 ч, из них 5 ч – резервное время)

Раздел I. ОКТЯБРЬСКАЯ РЕВОЛЮЦИЯ В РОССИИ И СТАНОВЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ НАЦИОНАЛЬНОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ (8 ч)

События Октябрьской революции в Беларуси (1 ч). Переход власти в руки Советов в Беларуси и на Западном фронте. Формирование и деятельность Областного исполнительного комитета Западной области и фронта (Облисполкомзапа). Первые преобразования в общественно-политической и социально-экономической сферах. *Политика «военного коммунизма» и особенности ее проведения в Беларуси*.

Беларусь в условиях германской оккупации (1 ч). Наступление войск кайзеровской Германии и захват Минска. Сопротивление населения Беларуси оккупантам. Брестский мир.

Попытки государственного самоопределения Беларуси после Октябрьской революции (2 ч). I Всебелорусский съезд и его решения. Провозглашение Белорусской Народной Республики (БНР). Деятельность Рады БНР. Провозглашение Советской Социалистической Республики Беларуси (ССРБ). Д. Жилунович. I Всебелорусский съезд Советов и его решения. *Конституция ССРБ 1919 г.* Образование Социалистической Советской Республики Литвы и Беларуси (Литбел).

Польско-советская война 1919–1921 гг. и второе провозглашение Советской Социалистической Республики Беларуси (2 ч). Наступление польских войск в Беларуси. Военные действия на польско-советском фронте. Оккупационный режим. Развертывание партизанского движения. Наступление Красной Армии на территории Беларуси. Декларация о провозглашении независимости ССРБ 31 июля 1920 г. Очередное наступление польских войск в Беларуси. Рижский мирный договор и его итоги для Беларуси.

Наш край (1 ч)

Обобщение по разделу I (1 ч)

Основные понятия: Областной исполнительный комитет Западной области и фронта (Облисполкомзап), I Всебелорусский съезд, Белорусская Народная Республика (БНР), Советская Социалистическая Республика Беларуси (ССРБ), Социалистическая Советская Республика Литвы и Беларуси (Литбел), революция, национализация, аграрный вопрос, белорусская национальная государственность, политика «военного коммунизма», интервенция, оккупация, буферное государство, польско-советская война, Брестский мирный договор, Рижский мирный договор.

Раздел II. БЕЛАРУСЬ В УСЛОВИЯХ СТАНОВЛЕНИЯ СОВЕТСКОГО СООБЩЕСТВА. ЗАПАДНАЯ БЕЛАРУСЬ ПОД ВЛАСТЬЮ ПОЛЬШИ (12 ч)

БССР в годы новой экономической политики (1 ч). Социально-экономическое положение Беларуси. Восстановление народного хозяйства. Переход к новой экономической политике. Влияние нэпа на развитие сельского хозяйства, промышленности, транспорта, торговли.

Общественно-политическая жизнь БССР в 1920-е гг. (1 ч). Роль КП(б)Б и Советов рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов в политической системе. Участие БССР в образовании Союза Советских Социалистических Республик. А. Червяков. Значение образования СССР для Беларуси. Укрупнение территории БССР в 1924 и 1926 гг. *Конституция БССР 1927 г.*

Политика белорусизации (1 ч). Белорусизация как составная часть советской национальной политики. Основные мероприятия, противоречия и итоги белорусизации. Институт белорусской культуры. В. Игнатовский. Результаты и значение политики белорусизации.

Проведение индустриализации в БССР (1 ч). Причины и особенности индустриализации в БССР. *Формы трудовой активности рабочего класса.* Итоги индустриализации в республике.

Коллективизация сельского хозяйства в БССР (1 ч). Причины и особенности проведения коллективизации в БССР. Переход ко всеобщей коллективизации сельского хозяйства и форсирование ее темпов. Результаты колхозного строительства.

Общественно-политическая жизнь в конце 1920-х – 1930-е гг. (1 ч). Роль КП(б)Б и Советов в общественно-политической жизни республики. Формирование советской общественно-политической системы. Политические репрессии. *Конституция БССР 1937 г.*

Развитие образования, науки и культуры в БССР в 1920–1930-е гг. (2 ч). Становление и развитие системы образования и науки БССР. В. Пичета. Состояние белорусской советской литературы. Я. Купала, Я. Колас, Д. Жилунович, М. Горецкий. Становление белорусского советского театра. Е. Мирович, В. Голубок. Зарождение белорусского кино. Ю. Тарич. Развитие изобразительного искусства. М. Филиппович, В. Волков. Памятники архитектуры и скульптуры. И. Ахремчик, И. Давидович.

Западная Беларусь под властью Польши (1 ч). Политические и социально-экономические условия жизни белорусского населения. *Основные направления национально-освободительного движения в Западной Беларуси.* Деятельность политических партий и организаций. И. Логинович, В. Хоружая. Белорусская крестьянско-рабочая громада. Б. Тарашкевич.

Белорусская культура в Западной Беларуси (1 ч). Образование. Товарищество белорусской школы. Литература: Ф. Пестрак, М. Танк. Живопись: Я. Дроздович, П. Сергиевич. Музыкальное искусство: Г. Ширма, М. Забейда-Сумицкий.

Наш край (1 ч)

Обобщение по разделу II (1 ч)

Основные понятия: белорусизация, коренизация, индустриализация, коллективизация сельского хозяйства, раскулачивание, национал-демократизм, политические репрессии, культурная революция, осадники, полонизация.

Раздел III. БССР В ГОДЫ ВТОРОЙ МИРОВОЙ И ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙН (10 ч)

Начало Второй мировой войны. Воссоединение Западной Беларуси с БССР (1 ч). Поход Красной Армии в Западную Беларусь. *Образование органов советской власти в Западной Беларуси*. Решения Народного собрания. С. Притыцкий.

Хозяйственные и культурные преобразования в Западной Беларуси после объединения с БССР. Историческая значимость воссоединения белорусского народа.

Начало Великой Отечественной войны (1 ч). Нападение нацистской Германии на СССР. Приграничные бои. Оборона Минска и Могилева. Героизм и патриотизм советских людей.

Германский оккупационный режим (1 ч). План «Ост». Германский «новый порядок». Политика геноцида населения Беларуси. Белорусские остарбайтеры.

Развертывание борьбы против оккупантов (1 ч). Роль КП(б)Б в организации борьбы народных масс с оккупантами. Создание первых партизанских отрядов. Подпольные антифашистские организации. Сопротивление мирного населения оккупационному режиму.

Расширение движения Сопротивления (1 ч). Образование ЦШПД и БШПД. Боевая деятельность партизанских формирований. Партизанские зоны. «Рельсовая война». Взаимодействие местного населения, партизан и подпольщиков.

Освобождение БССР от германских захватчиков (1 ч). Начало освобождения Беларуси. Белорусская наступательная операция «Багратион». Взаимодействие партизанских формирований и войск Красной Армии. Окружение и разгром германских группировок. Освобождение Минска. Подвиги советских воинов.

Вклад белорусского народа в победу над нацистской Германией (1 ч). Уроженцы Беларуси на фронтах Великой Отечественной войны. Участие в европейском движении Сопротивления. Трудовой героизм в советском тылу.

БССР – участница основания ООН *(1 ч). Окончание Второй мировой войны. Включение БССР в состав стран – основательниц ООН. Выход Беларуси на международную арену.*

Наш край (1 ч)

Обобщение по разделу III (1 ч)

Основные понятия: Суражские (Витебские) «ворота», план «Ост», геноцид, остарбайтеры, партизанское движение, партизанские зоны, подпольная борьба, «рельсовая война», операция «Багратион».

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

В процессе освоения содержания учебного материала учащиеся должны:

знать определение данных в программе понятий и терминов с конкретизацией их содержания; хронологию основных событий истории Беларуси 1917–1945 гг., их результаты и локализацию на исторической карте; результаты деятельности выдающихся исторических личностей и примеры творчества деятелей культуры; приведенные в учебной литературе оценки основных событий и характеристики исторических личностей и деятелей культуры;

уметь локализовать события истории Беларуси 1917–1945 гг. во времени и геополитическом пространстве с опорой на хронологические и синхронистические таблицы, историческую карту и атлас; характеризовать основные периоды и события истории Беларуси 1917–1945 гг.; соотносить события истории Беларуси и советской истории; объяснять причинно-следственные связи между историческими событиями; сравнивать по предлагаемым или самостоятельно определенным признакам, систематизировать и обобщать исторические факты и делать на основании этого аргументированные выводы; выражать и аргументировать собственное отношение к изучаемым историческим событиям и их участникам; конкретизировать содержание понятий с помощью исторических фактов; проводить анализ содержания исторических документов в процессе поиска необходимой информации; характеризовать условия и образ жизни людей; готовить и презентовать сообщения о деятельности исторических личностей с оценкой их результатов, о творчестве деятелей культуры с характеристикой

исторической тематики в их творчестве; характеризовать памятники культуры Беларуси периода 1917–1945 гг.;

использовать приобретенные знания и умения для определения собственного отношения к значимости исторических событий и результатам деятельности их участников; проведения анализа содержания социально значимой информации; идентификации своего социального поведения как гражданина Республики Беларусь; осуществления коммуникации в многоконфессиональном и поликультурном обществе; бережного отношения к памятникам истории и культуры.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Гісторыя Беларусі (Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.)»
для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета, яго спецыфіка ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі

Вучэбная праграма мае пераходны характар ва ўмовах паступовага забеспячэння канцэнтрычнага прынцыпу структуравання вучэбных гістарычных ведаў і паслядоўнасці іх засваення. Яна складзена з улікам магчымасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі вучняў па гісторыі, які арыентаваны на фарміраванне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання, якія забяспечваюць асабістае развіццё і паспяховую сацыялізацыю асобы.

На базавым узроўні вывучэнне гісторыі Беларусі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца пераважна на падзейна-храналагічным узроўні. Засваенне зместу гісторыі Беларусі 1917 – пачатку XXI ст. мае асаблівае значэнне з пункту гледжання сацыялізацыі асобы вучняў і фарміравання ў іх наступных сацыяльна значных ведаў:

пра асноўныя этапы афармлення беларускай дзяржаўнасці, у тым ліку станаўлення і канстытуцыйнага афармлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, а таксама дзяржаўную сімволіку БССР і Рэспублікі Беларусь;

асаблівасці функцыянавання савецкага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу ў БССР у перыяд мадэрнізацыі, звязаныя з пабудовай сацыялізму і ўсталяваннем індустрыяльнага грамадства ў БССР;

тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага жыцця сучаснай беларускай нацыі ва ўмовах глабалізацыі і інтэграцыі, распрацоўкі мадэлі эканамічнага развіцця і яе рэалізацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

дасягненні ўраджэнцаў Беларусі і прадстаўнікоў беларускай савецкай і сучаснай навукі і культуры, літаратуры і мастацтва, алімпійскага спорту;

геапалітычнае становішча БССР і шматвектарны напрамак знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.

Месца вучэбнага прадмета ў вучэбным плане

Вучэбныя праграмы прызначаны для арганізацыі навучання гісторыі Беларусі ў X–XI класах на базавым узроўні, які прадугледжвае засваенне вучнямі абавязковага мінімуму зместу адукацыі па гісторыі, што спрыяе развіццю агульнай культуры, светапогляду, каштоўнасна-сэнсавых установак, гатоўнасці і здольнасці да самаразвіцця і асобаснага самавызначэння, а таксама для ўсвядомленага і эфектыўнага рашэння адукацыйных і жыццёвых (сацыякультурных) задач.

Неабходна ўлічваць тое, што разам з захаваннем важнасці атрымання вучнямі ведаў аб навейшым перыядзе гісторыі асаблівая ўвага павінна надавацца ўдасканаленню спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для далейшага самастойнага выкарыстання пры аналізе сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці. Таму базавы ўзровень вывучэння гісторыі прадугледжвае значную практычную арыентаванасць атрыманых гістарычных ведаў.

Мэта і задачы вывучэння вучэбнага прадмета

Мэта вывучэння прадмета: авалоданне вучнямі асновамі сістэматызаваных тэарэтычных і факталагічных ведаў пра найважнейшыя падзеі і працэсы гісторыі Беларусі ва ўзаемасувязі з савецкай гісторыяй, неабходнымі для фарміравання грамадзянскага патрыятызму і паспяховай сацыялізацыі асобы пры яе інтэграцыі ў сучаснае сацыякультурнае асяроддзе.

Задачы вывучэння прадмета:

засвоіць важнейшыя паняцці і факты, якія характарызуюць перыяд развіцця Беларусі ад выспявання перадумоў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. да завяршальнага этапу Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў і перыяд развіцця Беларусі ад аднаўлення пасля Вялікай Айчыннай вайны і да станаўлення суверэннай Рэспублікі Беларусь з тлумачэннем найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей;

выпрацоўваць каштоўнасныя арыентацыі і пазіцыю асобы на падставе ўсведамлення вучнямі калектыўнай гістарычнай памяці і фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці, пачуцця гонару за культурна-гістарычную спадчыну Беларусі, у прыватнасці за дасягненні беларускай савецкай і сучаснай навукі, культуры, спорту;

фарміраваць вопыт пераўтваральнай і творчай пазнавальнай дзейнасці, уменні аналізу сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці і прагназавання ўласнай жыццядзейнасці, звязаныя з выкарыстаннем набытых вучнямі ведаў ва ўмовах інфармацыйнай камунікатыўнай прасторы, у асабістых зносінах і ва ўласнай жыццядзейнасці.

Асобасныя, метапрадметныя і прадметныя вынікі засваення вучэбнага прадмета

Вывучэнне гісторыі на базавым узроўні ажыццяўляецца з улікам магчымасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу, які ўлічвае фарміраванне асобасных, метапрадметных, прадметных кампетэнцый.

У адпаведнасці з *асобаснымі* вынікамі навучання кампетэнцыі разглядаюцца як гатоўнасць вучняў выкарыстоўваць засвоеныя імі веды і ўменні для ўласнай паспяховай інтэграцыі ў сучасным беларускім грамадстве пры апоры на калектыўную гістарычную памяць. Пры рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу вывучэнне гісторыі Беларусі арыентавана на фарміраванне светапогляду і якасцей асобы, неабходных для выканання агульных для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь сацыяльных функцый, абумоўленых сістэмай каштоўнасцей, агульнапрынятых у беларускім грамадстве. На базавым узроўні навучання прадугледжваецца ўсведамленне вучнямі сваёй ідэнтычнасці як грамадзян Рэспублікі Беларусь і іх далучэнне да культурнай разнастайнасці беларускага грамадства.

У адпаведнасці з *метапрадметнымі* вынікамі навучання на базавым узроўні прадугледжваецца фарміраванне ў вучняў уменняў самастойна вызначаць мэты свайго навучання, прадстаўляць, аналізаваць і карэктаваць вынікі ва ўмовах індывідуальнай і калектыўна-размеркавальнай форм дзейнасці; сістэматызаваць і абагульняць змест вучэбнага матэрыялу і рабіць на гэтай падставе аргументаваныя высновы; авалоданне спосабамі пошуку, збору, апрацоўкі, выкарыстання разнастайных крыніц сацыяльна-гістарычнай інфармацыі з магчымасцю яе пераводу з візуальнага ў вербальны від і наадварот.

У адпаведнасці з *прадметнымі* вынікамі навучання на базавым узроўні вучням неабходна засвоіць найбольш важныя факты, якія характарызуюць гістарычны працэс у цэлым і розныя бакі грамадскага развіцця з тлумачэннем найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей, а таксама асноўныя гістарычныя паняцці ў іх сістэме і ўзаемасувязі. Разам з засваеннем зместу гістарычнага матэрыялу ў вучняў выпрацоўваюцца агульнавучэбныя і спецыяльныя гістарычныя спосабы дзейнасці. Прадметныя вынікі навучання прадстаўлены ў праграме ў раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў». Пры засваенні зместу вучэбнага матэрыялу асаблівае значэнне надаецца фарміраванню ўменняў характарызаваць і параўноўваць гістарычныя падзеі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага развіцця БССР і Рэспублікі Беларусь у іх прычынна-выніковых сувязях, праз канкрэтызацыю з дапамогай паняццяў, з правядзеннем аналізу зместу гістарычных дакументаў.

Матэрыял, пазначаны ў праграме *курсівам*, мае азнаямленчы для вучняў характар і прызначаны для фарміравання ў іх агульных уяўленняў пра змест вывучаемых падзей і працэсаў.

Варта ўлічыць, што рэзервовы час можа быць выкарыстаны для правядзення ўрокаў кантролю сфарміраванасці ведаў і ўменняў па кожным з раздзелаў праграмы або для перадэкзаменацыйнага паўтарэння.

Праграма прадугледжвае засваенне на ўроках «Наш край» мясцовага матэрыялу, што дазволіць улічыць асаблівасці гістарычнага развіцця свайго рэгіёна, у тым ліку з дапамогай гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць».

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне гісторыі Беларусі ў X класе (гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.) адводзіцца 1 вучэбная гадзіна на тыдзень, 35 вучэбных гадзін на год, у XI класе (гісторыя Беларусі, другая палова 40-х гг. XX ст. – пачатку XXI ст.) – 1 вучэбная гадзіна на тыдзень, 35 вучэбных гадзін на год.

Настаўнік, зыходзячы з педагагічнай мэтазгоднасці і ўлічваючы асаблівасці навучання ў канкрэтных умовах, можа змяніць рэкамендуемую праграмай колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных тэм і парадак іх вывучэння, не выходзячы за агульную колькасць вучэбнага часу па раздзелах.

X КЛАС
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ, 1917–1945 гг.

(35 гадзін, у тым ліку 5 гадзін – рэзервовы час)

РАЗДЗЕЛ I
КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў РАСІІ І СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (8 г)

Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі (1 г). Пераход улады ў рукі Саветаў у Беларусі і на Заходнім фронце. Фарміраванне і дзейнасць Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзаха). Першыя пераўтварэнні ў грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах. *Палітыка «ваеннага камунізму» і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.*

Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі (1 г). Наступленне войск кайзераўскай Германіі і захоп Мінска. Супраціўленне насельніцтва Беларусі акупантам. Брэсцкі мір.

Спробы дзяржаўнага самавызначэння Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі (2 г). І Усебеларускі з'езд і яго рашэнні. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Дзейнасць Рады БНР. Утварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). Д. Жылуновіч. І Усебеларускі з'езд Саветаў і яго рашэнні. *Канстытуцыя ССРБ 1919 г.* Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (Літбел).

Польска-савецкая вайна 1919–1921 гг. і другое абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (2 г). Наступленне польскіх войск у Беларусі. Ваенныя дзеянні на польска-савецкім фронце. Акупацыйны рэжым. Разгортванне партызанскага руху. Наступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ 31 ліпеня 1920 г. Чарговае наступленне польскіх войск у Беларусі. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі.

Наш край (1 г)

Абагульненне да раздзела I (1 г)

***Асноўныя паняцці*:** Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах), І Усебеларускі з'езд. Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі (ССРБ), Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі (Літбел), рэвалюцыя, нацыяналізацыя, аграрнае пытанне, беларуская нацыянальная дзяржаўнасць, палітыка «ваеннага камунізму», інтэрвенцыя, акупацыя, буферная дзяржава, польска-савецкая вайна, Брэсцкі мірны дагавор, Рыжскі мірны дагавор.

РАЗДЗЕЛ II
БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ (12 г)

БССР у гады новай эканамічнай палітыкі (1 г). Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі. Аднаўленне народнай гаспадаркі. Пераход да новай эканамічнай палітыкі. Уплыў нэпа на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарту, гандлю.

Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920-я гг. (1 г). Роля КП(б)Б і Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў у палітычнай сістэме. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. А. Чарвякоў. Значэнне ўтварэння СССР для Беларусі. Узбуйненне тэрыторыі БССР у 1924 і 1926 гг. *Канстытуцыя БССР 1927 г.*

Палітыка беларусізацыі (1 г). Беларусізацыя як састаўная частка савецкай нацыянальнай палітыкі. Асноўныя мерапрыемствы, супярэчнасці і вынікі беларусізацыі. Інстытут беларускай культуры. У. Ігнатоўскі. Вынікі і значэнне палітыкі беларусізацыі.

Правядзенне індустрыялізацыі ў БССР (1 г). Прычыны і асаблівасці індустрыялізацыі ў БССР. *Формы працоўнай актыўнасці рабочага класа.* Вынікі індустрыялізацыі ў рэспубліцы.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР (1 г). Прычыны і асаблівасці правядзення калектывізацыі ў БССР. Пераход да суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і фарсіраванне яе тэмпаў. Вынікі калгаснага будаўніцтва.

Грамадска-палітычнае жыццё ў канцы 1920-х–1930-я гг. (1 г). Роля КП(б)Б і Саветаў у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Фарміраванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. Палітычныя рэпрэсіі. *Канстытуцыя БССР 1937 г.*

Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920-1930-я гг. (2 г). Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі і навукі ў БССР. У. Пічэта. Стан беларускай савецкай літаратуры. Я. Купала. Я. Колас. Д. Жылуновіч. М. Гарэцкі. Станаўленне беларускага савецкага тэатра. Я. Міровіч, У. Галубок. Зараджэнне беларускага кіно.

Ю. Тарыч. Развіццё выяўленчага мастацтва. М. Філіповіч, В. Волкаў. Помнікі архітэктуры і скульптуры. І. Ахрэмчык, І. Давідовіч.

Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (1 г). Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця беларускага насельніцтва. *Асноўныя напрамкі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.* Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. І. Лагіновіч. В. Харужая. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Б. Тарашкевіч.

Беларуская культура ў Заходняй Беларусі (1 г). Адукацыя. Таварыства беларускай школы. Літаратура: П. Пестрак. М. Танк. Жывапіс: Я. Драздовіч, П. Сергіевіч. Музычнае мастацтва: Р. Шырма, М. Забэйда-Суміцкі.

Наш край (1 г.)

Абагульненне да раздзела II (1 г).

Асноўныя паняцці: беларусізацыя, карэнізацыя, індустрыялізацыя, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, раскулачванне, нацыянал-дэмакратызм, палітычныя рэпрэсіі, культурная рэвалюцыя, асаднікі, паланізацыя.

РАЗДЗЕЛ III
БССР У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ (10 г)

Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР (1 г). Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. *Стварэнне органаў савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Рашэнні Народнага сходу.* С. Прытыцкі. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі пасля аб'яднання з БССР. Гістарычнае значэнне ўз'яднання беларускага народа.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны (1 г). Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР. Прыгранічныя баі. Абарона Мінска і Магілёва. Гераізм і патрыятызм савецкіх людзей.

Германскі акупацыйны рэжым (1 г). План «Ост». Германскі «новы парадак». Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі. Беларускія остарбайтары.

Разгортванне барацьбы супраць акупантаў (1 г). Роля КП(б)Б у арганізацыі барацьбы народных мас з акупантамі. Стварэнне першых партызанскіх атрадаў. Падпольныя антыфашысцкія арганізацыі. Супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму.

Пашырэнне руху Супраціўлення (1 г). Утварэнне ЦШПР і БШПР. Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Партызанскія зоны. «Рэйкавая вайна». Узаемадзеянне мясцовага насельніцтва, партызан і падпольшчыкаў.

Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў (1 г). Пачатак вызвалення Беларусі. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Узаемадзеянне партызанскіх фарміраванняў і войск Чырвонай Арміі. Акружэнне і разгром германскіх груповак. Вызваленне Мінска. Подзвігі савецкіх воінаў.

Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй (1 г). Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Удзел у еўрапейскім руху Супраціўлення. Працоўны гераізм у савецкім тыле.

БССР – удзельніца заснавання ААН (1 г). Заканчэнне Другой сусветнай вайны. Уключэнне БССР у склад краін – заснавальніц ААН. Выхад Беларусі на міжнародную арэну.

Наш край (1 г).

Абагульненне да раздзела III (1 г).

Асноўныя паняцці: «Суражскія (Віцебскія) вароты», план «Ост», генацыд, остарбайтары, партызанскі рух, партызанскія зоны, падпольная барацьба, «рэйкавая вайна», аперацыя «Баграціён».

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У працэсе засваення зместу вучэбнага матэрыялу вучні павінны: *ведаць*:

вызначэнне дадзеных у праграме паняццяў і тэрмінаў з канкрэтызацыяй іх зместу;

храналогію асноўных падзей гісторыі Беларусі **1917–1945 гг.,** іх вынікі і лакалізацыю на гістарычнай карце;

Место географии Беларуси в развитии географических знаний о Земле. Центральное положение Беларуси в Европе.

Тема 1. Географическое положение и исследования Беларуси (5 ч)

Физико- и экономико-географическое положение Республики Беларусь. Государственные границы.

Формирование территории Беларуси. Современное административно-территориальное деление.

Географические исследования на дореволюционном этапе (до 1918 г.). Картографическое отражение территории. Экспедиционное изучение Беларуси. Описание отдельных регионов в трудах А. Киркора.

Развитие географических исследований на довоенном этапе (1919–1941 гг.). Труды А. Смолича и их значение для развития географии.

Географические названия Беларуси. Группировка названий рек и озер, населенных пунктов и других географических объектов.

Практическая работа

1. Оценка географического положения Республики Беларусь.

Основные понятия: *физико-географическое, глубина территории, географический центр.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

знать: особенности географического положения Беларуси; площадь, протяженность территории Беларуси с севера на юг и с запада на восток; основные этапы развития географии в Беларуси, важнейшие направления географических исследований на современном этапе, имена ученых – исследователей страны;

уметь:

показывать страны, с которыми граничит Беларусь; области и административные районы Беларуси; районы экспедиционных исследований;

характеризовать особенности государственных границ с соседними странами; вклад в географические исследования ученых Беларуси;

владеть умением:

объяснять и *оценивать* значение и возможности использования географического положения Беларуси для социально-экономического развития страны.

Тема 2. Природные условия и ресурсы Беларуси (17 ч)

Геологическое строение. Расположение территории Беларуси на Восточно-Европейской платформе. Крупнейшие тектонические структуры.

Формирование территории. Материковые оледенения и межледниковья. Основные генетические типы отложений. Моренные и водно-ледниковые отложения, современные аллювиальные и болотные отложения. Озерно-ледниковые, озерно-аллювиальные отложения.

Полезные ископаемые. Минеральные ресурсы. Горючие полезные ископаемые. Металлические полезные ископаемые. Горно-химическое сырье и сырье для строительных материалов. Жидкие полезные ископаемые. Подземные воды.

Рельеф. Факторы формирования рельефа. Типы рельефа. Основные возвышенности, равнины и низины, их размещение, характеристика. Влияние деятельности человека на изменение рельефа.

Климат и климатические ресурсы. Общие черты климата Беларуси. Солнечная радиация. Воздушные массы и атмосферная циркуляция. Тепловой режим. Влажность воздуха, облачность и осадки.

Сезоны года и их особенности. Климатические ресурсы. Современные изменения климата.

Поверхностные и подземные воды. Речная сеть. Бассейны главных рек. Типы питания рек. Гидрологическая характеристика крупнейших рек, их хозяйственное значение. Каналы.

Озера и водохранилища, их размещение. Типы озерных котловин по происхождению. Болота и их типы.

Почвы. Факторы и процессы почвообразования. Типы почв, их распространение. Антропогенные почвы. Земельные ресурсы, их структура и использование. Мелиорация почв.

Растительность. Современный состав флоры. Основные типы растительности. Зональная и азональная растительность. Лесная растительность. Типы леса. Лесистость территории и ее изменение.

Луговая растительность. Пойменные луга, их размещение и хозяйственное значение. Болотная растительность. Хозяйственное использование и охрана растительного мира.

Животный мир. Основные фаунистические комплексы. Животный мир лесов, полей и лугов, болот, водоемов и их побережий, поселений человека. Хозяйственное использование животного мира.

Обобщающее повторение (1 ч)

Практические работы

2. Установление взаимосвязи между геологическим строением, полезными ископаемыми и рельефом.

3. Построение гипсометрического профиля.

4*. Построение климатических диаграмм, графиков, розы ветров для ближайшей к вашему населенному пункту метеорологической станции и их анализ.

Основные понятия: *антеклиза, синеклиза, прогиб, впадина, геохронологическая шкала, межледниковье, генетический тип рельефа, морена, прямая, рассеянная и суммарная солнечная радиация, агроклиматические ресурсы, густота речной сети, пруд, материнская порода, процесс эрозии, сельскохозяйственное угодье, тип растительности, интродуцированное растение, лесистость, пойменный и внепойменный луг, суходольный луг, верховое, низинное и переходное болото.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** особенности тектонического и геологического строения Беларуси; генетические типы четвертичных отложений и рельефа; общие черты климата; типы питания рек; типы озерных котловин и озер; основные факторы и процессы почвообразования, типы почв; основные типы растительности и особенности их размещения на территории Беларуси;

уметь:

показывать:

тектонические структуры: Русская плита, Волыно-Азовская плита, Украинский щит, Белорусская антеклиза, Воронежская антеклиза, Оршанская впадина, Припятский прогиб, Латвийская седловина, Жлобинская седловина, Брагинско-Лоевская седловина, Полесская седловина, Микашевичско-Житковичский выступ;

месторождения полезных ископаемых: нефти – Речицкое; бурого угля – Житковичское; железных руд – Околовское; калийных солей – Старобинское, Петриковское; каменной соли – Мозырское, Давыдовское, Старобинское; доломитов –

Руба; мела и мергеля – Коммунарское; глин – Гайдуковка; строительного камня – Микашевичское;

элементы рельефа: Белорусская, Браславские, Свенцянские; Оршанская, Ошмянская, Минская, Новогрудская возвышенности; Оршанско-Могилевская, Центральноберезинская, Нарочано-Вилейская равнины; Неманская, Полесская низменности;

реки: Днепр, Березина, Западная Двина, Западный Буг, Неман, Припять, Сож, Вилия, Птичь, Щара, Ясельда, Свислочь;

озера: Нарочь, Освейское, Червоное, Лукомское, Долгое;

водохранилища: Вилейское, Заславское, Любанское;

каналы: Днепро-Бугский, Огинский, Августовский;

Вилейско-Минскую водную систему;

характеризовать особенности формирования кристаллического фундамента и платформенного чехла; генетические типы рельефа; распределение климатических показателей и особенности сезонов года; особенности распределения и использования поверхностных и подземных вод; свойства основных типов почв, структуру земельных ресурсов; современный состав флоры и фауны, размещение и хозяйственное значение основных типов растительности;

владеть умением:

объяснять зависимость формирования платформенного чехла от тектонического строения; связь полезных ископаемых с геологическим и тектоническим строением; изменение основных климатических элементов в зависимости от географических факторов; зависимость гидрологических показателей от климата и рельефа;

определять обеспеченность территории природными ресурсами: минеральными, агроклиматическими, водными, земельными, биологическими;

рассчитывать коэффициент увлажнения, годовую амплитуду температур, уклон реки, относительные высоты;

строить графики хода основных климатических показателей.

Тема 3. Географические ландшафты. Экологические проблемы (5 ч)

Географические ландшафты. Распространение основных природных ландшафтов. Основные роды ландшафтов Беларуси. Антропогенные ландшафты: сельскохозяйственные, лесохозяйственные, водохозяйственные, горнопромышленные, рекреационные.

Освоение территории и его виды: промышленное, сельскохозяйственное, транспортное, рекреационное. Природно-ресурсный потенциал.

Охрана природы. Основные природоохранные территории. Заповедники, национальные парки, заказники и памятники природы республиканского и местного значения.

Рекреационные ресурсы и их оценка. Зоны отдыха и курорты. Туристские комплексы и маршруты.

Антропогенное воздействие на окружающую среду. Загрязнение территории радионуклидами в результате аварии на Чернобыльской АЭС. Проблемы Полесья, Солигорского горнопромышленного района. Локальные проблемы загрязнения атмосферного воздуха, поверхностных и подземных вод, почв в результате хозяйственной деятельности.

Практическая работа

5*. Сравнительная характеристика особо охраняемых природных территорий Беларуси (на примере 2–3).

Основные понятия: *памятник природы, зона отдыха, туристский комплекс, тип, подтип, род ландшафта, антропогенный ландшафт, экономически активная территория.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** типы природоохранных территорий и объектов; основные геоэкологические проблемы; типы и роды ландшафтов, виды освоения территории; рекреационные объекты территории;

***уметь*:**

показывать:

заповедники: Березинский биосферный, Полесский радиационно-экологический;

национальные парки: Беловежская пуща, Браславские озера, Нарочанский, Припятский;

заказники: Освейский, Ельня, Козьянский, Налибокский, Выгонощанское, Свитязянский;

характеризовать основные экологические проблемы; особо охраняемые природные территории;

владеть умением:

объяснять суть геоэкологических проблем и перспективы расширения сети природоохранных объектов; взаимосвязи природных компонентов.

Обобщающее повторение (1 ч).

Тема 4. Природное районирование Беларуси (4 ч)

Сущность природного районирования и его виды: геоморфологическое, агроклиматическое, гидрологическое, геоботаническое, почвенно-географическое. Физико-географическое районирование Беларуси.

Белорусская Поозерская провинция. Географическое положение и особенности природы. Влияние последнего ледника на формирование природных комплексов провинции. Озерность территории.

Западно-Белорусская провинция. Восточно-Белорусская провинция. Географическое положение и особенности природы. Особенности климата, почв и растительности.

Предполесская провинция. Полесская провинция. Географическое положение и особенности природы. Характер поверхности. Экологические проблемы.

Практическая работа

6*. Физико-географическая характеристика природы своей местности.

Основные понятия: *природное районирование, физико-географическое районирование, провинция, округ, физико-географический район.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** виды природного районирования и основные единицы физико-географического районирования;

***уметь*:**

показывать провинции: Белорусская Поозерская, Западно-Белорусская, Восточно-Белорусская, Предполесская, Полесская;

характеризовать особенности природы физико-географических провинций и округов по плану, пользуясь картографическим материалом, текстом учебного пособия и дополнительным материалом;

владеть умением:

объяснять сущность природного районирования;

определять критерии, положенные в основу выделения физико-географических единиц разного ранга.

Тема 5. Население (5 ч)

Динамика численности населения и его возрастно-половая структура.

Естественное движение населения. Особенности этнического и религиозного состава населения.

Трудовые ресурсы. Занятость населения. Проблемы занятости трудовых ресурсов.

Размещение населения по территории страны. Плотность населения. Типы поселений: городские и сельские. Географические особенности городского расселения страны. Функциональные типы городских поселений. Города-спутники.

Сельское расселение. Современные категории сельских поселений и их трансформация. Влияние аварии на Чернобыльской АЭС на расселение населения.

Практическая работа

7. Построение диаграммы (пирамиды) возрастно-половой структуры населения Беларуси и ее анализ.

Основные понятия: *город-спутник, агрогородок.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** основные элементы материальной и духовной культуры;

***уметь*:**

показывать Брест, Барановичи, Пинск, Кобрин, Витебск, Новополоцк, Полоцк, Оршу, Гомель, Мозырь, Жлобин, Речицу, Светлогорск, Гродно, Лиду, Слоним, Могилев, Бобруйск, Минск, Борисов, Солигорск, Жодино, Молодечно, Слуцк;

характеризовать особенности размещения населения, естественного и механического движения, возрастно-половую структуру, типы расселения;

владеть умением:

рассчитывать по статистическим данным среднюю плотность населения;

определять проблемы малых и средних городов, перспективы развития крупных городов;

прогнозировать основные направления демографического развития страны.

Тема 6. Общая характеристика хозяйства (2 ч)

Факторы размещения производства (территория, природно-ресурсный потенциал, экономико-географическое положение, население и трудовые ресурсы, транспортная деятельность, складирование, информация и связь, научная и техническая деятельность, экологические условия, государственная политика). Современная структура хозяйства страны. Сфера производства. Структура промышленности. Сфера услуг. Специализация хозяйства Беларуси.

Территориальная структура хозяйства. Вид экономической деятельности. Структура хозяйства по видам экономической деятельности. Административные области и г. Минск как крупнейшие территориальные части хозяйства Беларуси (экономические районы).

Основные понятия: *вид экономической деятельности, специализация, экономический район.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** основные факторы и условия размещения производства, различные формы собственности;

***уметь*:**

характеризовать основные проблемы и направления развития хозяйства;

владеть умением:
строить диаграмму структуры хозяйства и анализировать ее;
рассчитывать основные экономические показатели;
объяснять уровень современного социально-экономического развития страны.

Тема 7. География сферы производства (13 ч)

Промышленность. Горнодобывающая промышленность, ее состав, роль в структуре хозяйства и показатели развития. Добыча нефти и попутного газа, торфа. География добычи полезных ископаемых для химического производства и производства минеральных удобрений. Добыча и производство соли. Добыча полезных ископаемых для производства строительных материалов и строительства.

Производство и распределение электроэнергии. Факторы размещения, условия развития и география производства и распределения электроэнергии. Тепловые и гидравлические электростанции. Линии электропередачи. Нетрадиционные и альтернативные источники электроэнергии, проблемы и перспективы их использования в белорусской энергетике. Развитие атомной электроэнергетики.

Распределение газообразного топлива. Крупнейшие газопроводы Беларуси.

Обрабатывающая промышленность, ее состав, особенности развития и размещения. Факторы размещения и сырьевая база металлургического производства и производства готовых металлических изделий. География предприятий металлургического производства и производства металлических изделий.

Производство транспортных средств (автомобилей и автомобильной техники, судов, железнодорожного подвижного состава, авиационной техники, мотоциклов и велосипедов). Факторы и условия размещения и география предприятий. Производство машин и оборудования для сельского и лесного хозяйства. Факторы и условия размещения, география производства. Факторы размещения и география производства электрооборудования, электронного и оптического оборудования.

Факторы размещения производства нефтепродуктов. Центры нефтепереработки. Химическое производство, его состав, сырьевая база, факторы размещения. Характеристика развития и размещения производства минеральных удобрений, искусственных и синтетических волокон, пластмасс, синтетического каучука, красок и лаков, мыла, моющих, чистящих и полирующих средств, парфюмерных и косметических средств. География производства фармацевтической продукции. Факторы и условия размещения, география производства резиновых и пластмассовых изделий.

Факторы размещения и география производства стекла и изделий из стекла, керамических изделий, цемента, извести и гипса, изделий из бетона.

Строительство. География промышленного и гражданского строительства. Крупнейшие новостройки Беларуси.

Обработка древесины и производство изделий из дерева. Крупнейшие центры деревообработки и производства фанеры, деревянных строительных конструкций и столярных изделий. Факторы размещения и география производства мебели. Факторы размещения и основные центры целлюлозно-бумажного производства и издательской деятельности.

Текстильное и швейное производство. Структура, сырьевая база. География производства тканей, одежды, трикотажных и чулочно-носочных изделий. Сырьевая база и факторы размещения производства кожи, изделий из кожи и обуви. Крупнейшие центры кожевенного и обувного производства.

Производство пищевых продуктов. Факторы размещения и география производства мяса и мясопродуктов, молочных продуктов, рыбы и рыбных продуктов, растительных масел и жиров, продуктов мукомольно-крупяной промышленности, сахара.

Сельское хозяйство, охота и лесное хозяйство. Роль сельского хозяйства в экономике страны. Структура и размещение земельных угодий. География

растениеводства (зернового хозяйства, картофелеводства, овощеводства, садоводства, выращивания технических культур).

География животноводства (скотоводства, свиноводства, овцеводства, коневодства, птицеводства, звероводства, пчеловодства).

Рыболовство и рыбоводство. Крупнейшие рыбные хозяйства на территории Беларуси.

Структура и роль лесного хозяйства в экономике страны (лесоводство и лесозаготовки, сбор дикорастущих грибов, ягод и лекарственных трав). География лесозаготовок. Охота и разведение дичи. География крупнейших охотничьих угодий страны.

Практические работы

8. Построение картосхемы «Факторы размещения и география промышленного производства» и ее анализ (на выбор по одному из видов экономической деятельности).

9. Нанесение на контурную карту районов выращивания льна и сахарной свеклы и анализ размещения производства льноволокна и сахара.

Основные понятия: *горнодобывающая промышленность, обрабатывающая промышленность, топливно-энергетический баланс, малотоннажная химия, структура земельных угодий.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** факторы размещения видов экономической деятельности сферы производства;

***уметь*:**

показывать на карте крупнейшие промышленные центры;

характеризовать размещение производства на территории страны;

владеть умением:

объяснять причины возникновения проблем развития и размещения предприятий сферы производства;

прогнозировать изменения в размещении предприятий сферы производства.

Обобщающее повторение (1 ч).

Тема 8. География сферы услуг (2 ч)

Структура сферы услуг, ее роль в экономике. Уровень развития сферы услуг как индикатор экономического развития страны.

Развитие и факторы размещения отдельных видов экономической деятельности, образующих сферу услуг: транспорта и связи, финансовой деятельности, торговли, образования, здравоохранения, туризма.

Основные понятия: *транспортная сеть, транспортный узел, продуктопровод, связь, финансовая деятельность, торговля, образование, здравоохранение.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***уметь*:**

показывать на карте города, являющиеся крупнейшими транспортными узлами, финансовыми центрами, а также города, в которых находятся учреждения высшего образования (университеты, академии, институты);

характеризовать работу отдельных видов экономической деятельности сферы услуг;

владеть умением:

определять показатели и особенности развития и размещения важнейших видов экономической деятельности сферы услуг;

объяснять причины территориальных различий по уровню развития сферы услуг.

Тема 9. Беларусь в мировом сообществе (3 ч)

Беларусь на политической и экономической карте мира. Участие Беларуси в международных политических, экономических организациях и интеграционных объединениях.

Место страны в международном разделении труда. География внешней торговли.

Иностранные инвестиции и их роль в развитии страны. Свободные экономические зоны, совместные и иностранные предприятия на территории Беларуси.

Практическая работа

10. Нанесение на контурную карту: а) свободных экономических зон; б) трансъевропейских транспортных коммуникаций (железные дороги, шоссе, нефте- и газопроводы, линии электро-передачи).

Основные понятия: *единое экономическое пространство (ЕЭП), инвестиция, международное разделение труда, свободная экономическая зона, совместное предприятие.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** важнейшие международные организации, в работе которых участвует Беларусь;

***уметь*:**

показывать свободные экономические зоны Беларуси: «Минск», «Гомель-Ратон», «Витебск», «Могилев», «Гродно-Инвест», «Брест»; страны СНГ;

характеризовать возможные перспективы белорусско-российских хозяйственных программ;

владеть умением:

определять главные направления внешней торговли.

Тема 10. Области и город Минск (7 ч)

Брестская область. Природные условия и ресурсы. Население и его национальный состав. Освоенность территории. Структура промышленности и сельского хозяйства, особенности их размещения. Специализация хозяйства. Крупнейшие промышленные и культурные центры области: Брест, Барановичи, Пинск, Кобрин, Лунинец.

Витебская область. Природные условия и ресурсы. Население и его расселение. Структура промышленности и сельского хозяйства, особенности их размещения. Специализация хозяйства. Рекреационный потенциал области. Крупнейшие промышленные и культурные центры области: Витебск, Орша, Новополоцк, Полоцк, Поставы.

Гомельская область. Размещение территории в пределах Полесской низменности и особенности природы. Минеральные и лесные ресурсы области. Население и особенности расселения. Экологические проблемы в связи с аварией на Чернобыльской АЭС, мелиорацией земель, добычей полезных ископаемых. Структура промышленности и сельского хозяйства, особенности их размещения. Специализация хозяйства. Крупнейшие промышленные и культурные центры области: Гомель, Мозырь, Жлобин, Речица, Светлогорск, Калинковичи, Рогачев.

Гродненская область. Природные условия и ресурсы. Население и его национальный состав. Структура промышленности и сельского хозяйства, особенности их размещения. Специализация хозяйства. Развитие атомной энергетики. Крупнейшие промышленные и культурные центры области: Гродно, Лида, Слоним, Волковыск, Сморгонь, Новогрудок.

Могилевская область. Природные условия и ресурсы. Особенности природных условий. Население. Структура промышленности и сельского хозяйства, особенности их

размещения. Специализация хозяйства. Крупнейшие промышленные и культурные центры области: Могилев, Бобруйск, Осиповичи, Кричев, Быхов, Горки.

Минская область. Природные условия и ресурсы. Население и особенности его расселения. Структура промышленности и сельского хозяйства, особенности их размещения. Специализация хозяйства. Крупнейшие промышленные и культурные центры области: Борисов, Солигорск, Молодечно, Слуцк, Жодино, Вилейка.

Минск – столица Беларуси. Географическое положение. Специализация хозяйства. Крупнейшие промышленные предприятия. Формирование и проблемы развития Минской агломерации.

Характеристика своего района, города. Особенности географического положения. Природные условия и ресурсы. Население и освоенность территории. Хозяйство района (города). Достопримечательности населенных пунктов или местностей.

Практическая работа

11*. Характеристика своего административного района (населенного пункта) (выполняется на уроке изучения своей области).

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

***знать*:** отличительные особенности каждой области;

***уметь*:**

показывать главные географические объекты области;

характеризовать области по основной схеме, свой район (город) в соответствии с планом;

владеть умением:

определять специализацию хозяйства;

описывать отличительные и уникальные объекты.

Обобщающее повторение (1 ч).

Резервное время (2 ч).

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Геаграфія»
для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

X клас (базавы ўзровень)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэта вучэбнага прадмета «Геаграфія» – фарміраваць у навучэнцаў геаграфічную культуру і сістэму ведаў аб прыродных і сацыяльна-эканамічных працэсах у свеце, асобных рэгіёнах, краінах, Рэспубліцы Беларусь; навучыць іх ужываць геаграфічныя веды ў паўсядзённым жыцці; развіваць кампетэнцыі навучэнцаў: вучэбна-пазнавальную, прыярытэту геаграфічнай інфармацыі, каштоўнасна-сэнсавую, геаграфічных дзеянняў, прасторавага арыентавання і камунікатыўную.

Задачы навучання вучэбнаму прадмету «Геаграфія»:

– фарміраванне ў вучняў ведаў аб геаграфічнай абалонцы Зямлі, тэрытарыяльнай арганізацыі эканамічнага жыцця грамадства, узаемадзеянні паміж чалавечым грамадствам і прыродным асяроддзем (вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя);

– фарміраванне ўменняў характарызаваць фізіка-геаграфічныя асаблівасці прыроды мацерыкоў і акіянаў, вылучаць агульныя і адметныя тэрытарыяльныя асаблівасці, эканоміка-геаграфічныя паказчыкі асобных краін, асаблівасці геаграфічнага і геапалітычнага становішча тэрыторый, стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь (кампетэнцыя прыярытэту геаграфічнай інфармацыі);

– развіццё здольнасцяў вучняў бачыць і разумець геаграфічную карціну свету, усведамляць сваю ролю і прызначэнне ў свеце, умець выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў і ўчынкаў, прымаць рашэнні (каштоўнасна-сэнсавая кампетэнцыя);

– фарміраванне ўменняў працаваць з картаграфічнымі крыніцамі інфармацыі: авалоданне практычнымі прыёмамі работы з картай, асэнсаванне зместу карты, развіццё прасторавага ўяўлення; выкарыстанне інфармацыі аб геаграфічных працэсах і з'явах (графічнай, статыстычнай, даведачнай, краязнаўчай) і ажыццяўленне прасторава-тэрытарыяльнай прывязкі (кампетэнцыя прасторавага арыентавання);

– развіццё здольнасцяў вучняў да камунікатыўнай дзейнасці: ўменні геаграфічна аргументаваць вынікі назіранняў працэсаў, якія адбываюцца ў прыродзе і грамадстве, выказваць іх рознымі спосабамі; уменні выкарыстоўваць міжасобасныя формы ўзаемадзеяння і зносін у працэсе навучання (камунікатыўная кампетэнцыя).

У цяперашні час прыярытэтнымі **напрамкамі**, якія маюць прынцыповае тэарэтычнае і практычнае значэнне, з'яўляюцца наступныя: прыродазнаўча-навуковае, аксіялагічнае, прасторава-арыентацыйнае, прыкладное.

Аптымальнымі і эфектыўнымі падыходамі, якія вызначаюць тэарэтычную і метадычную базу вывучэння вучэбнага прадмета «Геаграфія», з'яўляюцца комплексны геаграфічны падыход, прасторавы, сістэмна-дзейнасны, дэтэрмінісцкі, прафесійна-кампетэнтнасны, культуралагічны, даследчы і каштоўнасны.

Базавы **комплексны геаграфічны падыход** прадугледжвае лагічную ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць прыродных з'яў, сацыяльных структур, эканамічных і палітычных працэсаў.

Прасторавы падыход разглядае развіццё краін і міжнародных адносін з пункту гледжання прасторавага фактару.

Сістэмна-дзейнасны падыход вызначае неабходнасць паслядоўнага прадстаўлення зместу вучэбнага матэрыялу і вучэбных задач і прадугледжвае арганізацыю вучэбнага супрацоўніцтва розных узроўняў (настаўнік – навучэнец, навучэнец – навучэнец, навучэнец – група).

Прафесійна-кампетэнтнасны падыход накіраваны на фарміраванне ў вучняў асноўных геаграфічных ведаў і развіццё ўменняў і навыкаў, якія маюць практычную і прыкладную значнасць у іх жыцці і будучай прафесійнай дзейнасці.

Культуралагічны падыход дазваляе разгледзець геаграфічнае асяроддзе праз прызму дасягненняў агульначалавечай культуры і накіраваны на развіццё духоўнасці, маралі і гуманістычных якасцяў асобы навучэнца.

У аснову **дэтэрмінісцкага падыходу** пакладзена адназначная адпавед-насць прычыны і наступства прыродных з'яў і працэсаў.

Даследчы падыход мае на ўвазе пошук, даследаванне і творчасць на вучэбных занятках.

У аснове **каштоўнаснага падыходу** ляжыць арыентацыя на комплекс каштоўнасцей, якія прадстаўлены агульначалавечымі каштоўнасцямі, а таксама паняццямі: Чалавек (абсалютная каштоўнасць), Веды, Айчына, Зямля, Свет.

Кампетэнтнасны падыход інтэгруе названыя падыходы і забяспечвае комплекснае авалоданне вучнямі прадметнымі і метапрадметнымі ведамі і ўменнямі. Кожная з

кампетэнцый характарызуецца сваім навучальным зместам (тэарэтычным і практычным), а таксама асноўнымі відамі дзейнасці:

вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя прадугледжвае валоданне ведамі пра аб'екты вывучэння фізічнай і сацыяльна-эканамічнай геаграфіі і адпаведнымі ўменнямі, навыкамі і спосабамі дзейнасці;

кампетэнцыя прыярытэту геаграфічнай інфармацыі прадугледжвае фарміраванне ўменняў характарызаваць фізіка-геаграфічныя асаблівасці прыроды мацерыкоў і акіянаў, вылучаць агульныя і адметныя тэрытарыяльныя асаблівасці, эканоміка-геаграфічныя паказчыкі асобных краін, асаблівасці геаграфічнага і геапалітычнага стану тэрыторый, стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь;

каштоўнасна-сэнсавая кампетэнцыя прадугледжвае развіццё ўменняў выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў і ўчынкаў, прымаць рашэнні; здольнасцяў навучэнцаў бачыць і разумець навакольны свет, усведамляць сваю ролю і прызначэнне;

кампетэнцыя геаграфічных дзеянняў забяспечвае фарміраванне вопыту дзейнасці па ўжыванні геаграфічных ведаў і ўменняў у жыццёвых сітуацыях;

кампетэнцыя прасторавага арыентавання забяспечвае фарміраванне ўменняў працаваць з картаграфічнымі крыніцамі інфармацыі, выкарыстоўваць інфармацыю аб геаграфічных працэсах і з'явах і ажыццяўляць прасторава-тэрытарыяльную прывязку;

камунікатыўная кампетэнцыя рэалізуецца пры дапамозе развіцця здольнасцяў вучняў да камунікатыўнай дзейнасці: уменні геаграфічна аргументаваць вынікі назіранняў працэсаў, што адбываюцца ў прыродзе і грамадстве, выказваць іх рознымі спосабамі; уменні выкарыстоўваць міжасобасныя формы ўзаемадзеяння і зносін у працэсе навучання.

Прынцыпамі адбору зместу навучання з'яўляюцца:

– прынцып развіцця прыродазнаўча-навуковага мыслення;

– прынцып цэласнага ўяўлення пра свет;

– прынцып сувязі тэорыі з практыкай і рэалізацыі праз практычную дзейнасць;

– прынцып мінімізацыі тэарэтычных звестак з улікам іх значнасці ў паўсядзённым жыцці;

– прынцып узаемасувязі пачуццёвага і лагічнага, рацыянальнага і ірацыянальнага ў працэсе пазнання свету.

Змест вучэбнага матэрыялу для падагульняльнага паўтарэння плануе настаўнік на аснове ўліку засвоеных на працягу года ведаў, уменняў і навыкаў і сістэматызаванага тэарэтычнага і практычнага матэрыялу, выкладзенага ў рубрыцы «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

Практычныя працы без зорачкі з'яўляюцца навучальнымі. Выніковыя практычныя работы пазначаны зорачкай і могуць быць выкананы ў рамках тэматычнага кантролю.

X клас
ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(2 гадзіны ў тыдзень, усяго 70 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Месца геаграфіі Беларусі ў развіцці геаграфічных ведаў аб Зямлі. Цэнтральнае становішча Беларусі ў Еўропе.

Тэма 1. Геаграфічнае становішча і даследаванні Беларусі (5 гадзін)

Фізіка- і эканоміка-геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўныя межы. Фарміраванне тэрыторыі Беларусі. Сучаснае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне.

Геаграфічныя даследаванні на дарэвалюцыйным этапе (да 1918 г.). Картаграфічнае адлюстраванне тэрыторыі. Экспедыцыйнае вывучэнне Беларусі. Апісанне асобных рэгіёнаў у працах А. Кіркора.

Развіццё геаграфічных даследаванняў на даваенным этапе (1919–1941 гг.). Працы А. Смоліча і іх значэнне ў развіцці геаграфіі.

Геаграфічныя назвы Беларусі. Групоўка назваў рэк і азёр, населеных пунктаў і іншых геаграфічных аб'ектаў.

Практычная работа

1. Ацэнка геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь.

Асноўныя паняцці: *фізіка-геаграфічнае становішча, глыбіня тэрыторыі, геаграфічны цэнтр.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць*:** асаблівасці геаграфічнага становішча Беларусі; плошчу, працягласць тэрыторыі Беларусі з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход; асноўныя этапы развіцця геаграфіі ў Беларусі, найважнейшыя напрамкі геаграфічных даследаванняў на сучасным этапе, імёны вучоных – даследчыкаў краіны;

умець:

паказваць краіны, з якімі мяжуе Беларусь; вобласці і адміністратыўныя раёны Беларусі; раёны экспедыцыйных даследаванняў;

характарызаваць асаблівасці дзяржаўных межаў з суседнімі краінамі; уклад у геаграфічныя даследаванні вядучых вучоных Беларусі;

валодаць уменнем:

тлумачыць і ацэньваць значэнне і магчымасці выкарыстання геаграфічнага становішча Беларусі для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Тэма 2. Прыродныя ўмовы і рэсурсы Беларусі (17 гадзін)

Геалагічная будова. Размяшчэнне тэрыторыі Беларусі на Усходне-Еўрапейскай платформе. Буйнейшыя тэктанічныя структуры.

Фарміраванне тэрыторыі. Мацерыковыя зледзяненні і межледавікоўі. Асноўныя генетычныя тыпы адкладаў. Марэнныя і водна-ледавіковыя адклады, сучасныя алювіяльныя і балотныя адклады. Азёрна-ледавіковыя, азёрна-алювіяльныя адклады.

Карысныя выкапні. Мінеральныя рэсурсы. Гаручыя карысныя выкапні. Металічныя карысныя выкапні. Горна-хімічная сыравіна і сыравіна для будаўнічых матэрыялаў. Вадкія карысныя выкапні. Падземныя воды.

Рэльеф. Фактары фарміравання рэльефу. Тыпы рэльефу. Асноўныя ўзвышшы, раўніны і нізіны, іх размяшчэнне, характарыстыка. Уплыў дзейнасці чалавека на змяненне рэльефу.

Клімат і кліматычныя **рэсурсы.** Агульныя рысы клімату Беларусі. Сонечная радыяцыя. Паветраныя масы і атмасферная цыркуляцыя. Цеплавы рэжым. Вільготнасць паветра, воблачнасць і ападкі.

Поры года і іх асаблівасці. Кліматычныя рэсурсы. Сучасныя змяненні клімату.

Паверхневыя і падземныя воды. Рачная сетка. Басейны галоўных рэк. Тыпы жыўлення рэк. Гідралагічная характарыстыка буйнейшых рэк, іх гаспадарчае значэнне. Каналы.

Азёры і вадасховішчы, іх размяшчэнне. Тыпы азёрных катлавін па паходжанні. Балоты і іх тыпы.

Глебы. Фактары і працэсы глебаўтварэння. Тыпы глеб, іх распаўсюджанне. Антрапагенныя глебы.

Зямельныя рэсурсы, іх структура і выкарыстанне. Меліярацыя глеб.

Расліннасць. Сучасны склад флоры. Асноўныя тыпы расліннасці. Занальная і азанальная расліннасць.

Лясная расліннасць. Тыпы лесу. Лясістасць тэрыторыі і яе змяненне.

Лугавая расліннасць. Поймавыя лугі, іх размяшчэнне і гаспадарчае значэнне. Балотная расліннасць. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова расліннага свету.

Жывёльны свет. Асноўныя фаўністычныя комплексы. Жывёльны свет лясоў, палёў і лугоў, балот, вадаёмаў і іх узбярэжжаў, паселішчаў чалавека. Гас-падарчае выкарыстанне жывёльнага свету.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна)

Практычныя работы

2. Устанаўленне ўзаемасувязі паміж геалагічнай будовай, карыснымі выкапнямі і рэльефам.

3. Пабудова гіпсаметрычнага профілю.

4*. Пабудова кліматычных дыяграм, графікаў, ружы вятроў для бліжэйшай да вашага населенага пункта метэаралагічнай станцыі і іх аналіз.

Асноўныя паняцці: *антэкліза, сінекліза, прагін, упадзіна, геахраналагічная шкала, міжледавікоўе, генетычны тып рэльефу, марэна, прамая, рассеяная і сумарная сонечная радыяцыя, агракліматычныя рэсурсы, гушчыня рачной сеткі, сажалка, мацярынская парода, працэс эрозіі, сельскагаспадарчае ўгоддзе, тып расліннасці, інтрадуцыраваная расліна, лясістасць, поймавы і пазапоймавы луг, сухадольны луг, верхавое, нізіннае і пераходнае балота.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць*:** асаблівасці тэктанічнай і геалагічнай будовы Беларусі; генетычныя тыпы чацвярцічных адкладаў і рэльефу; агульныя рысы клімату; тыпы жыўлення рэк; тыпы азёрных катлавін і азёр; асноўныя фактары і працэсы глебаўтварэння, тыпы глеб; асноўныя тыпы расліннасці і асаблівасці іх размяшчэння на тэрыторыі Беларусі;

умець:

паказваць:

тэктанічныя структуры: Рускую пліту, Валына-Азоўскую пліту, Украінскі шчыт, Беларускую антэклізу, Варонежскую антэклізу, Аршанскую ўпадзіну, Прыпяцкі прагін, Латвійскую седлавіну, Жлобінскую седлавіну, Брагінска-Лоеўскую седлавіну, Палескую седлавіну, Мікашэвіцка-Жыткавіцкі выступ;

радовішчы карысных выкапняў: нафты – Рэчыцкае; бурага вугалю – Жыткавіцкае; жалезных руд – Акалоўскае; калійных солей – Старобінскае, Петрыкаўскае; каменных солей – Мазырскае, Давыдаўскае, Старобінскае; даламітаў – Руба; мелу і мергелю – Камунарскае; глін – Гайдукоўка; будаўнічага каменю – Мікашэвіцкае;

элементы рэльефу: Беларуская, Браслаўскія, Свянцянскія грады; Аршанскае, Ашмянскае, Мінскае, Навагрудскае ўзвышшы; Аршанска-Магілеўская, Цэнтральнабярэзінская, Нарачана-Вілейская раўніны; Нёманская, Палеская нізіны;

рэкі: Дняпро, Бярэзіна, Заходняя Дзвіна, Заходні Буг, Неман, Прыпяць, Сож, Вілія, Пціч, Шчара, Ясельда, Свіслач;

азёры: Нарач, Асвейскае, Чырвонае, Лукомскае, Доўгае;

вадасховішчы: Вілейскае, Заслаўскае, Любанскае;

каналы: Дняпроўска-Бугскі, Агінскі, Аўгустоўскі;

Вілейска-Мінскую водную сістэму

характарызаваць асаблівасці фарміравання крышталічнага падмурка і платформеннага чахла; генетычныя тыпы рэльефу; размеркаванне кліматычных паказчыкаў і асаблівасці сезонаў года; асаблівасці размеркавання і выкарыстання паверхневых і падземных вод; уласцівасці асноўных тыпаў глеб, структуру зямельных рэсурсаў; сучасны склад флоры і фаўны, размяшчэнне і гаспадарчае значэнне асноўных тыпаў расліннасці;

валодаць уменнем:

тлумачыць залежнасць фарміравання платформеннага чахла ад тэктанічнай будовы; сувязь карысных выкапняў з геалагічнай і тэктанічнай будовай; змяненне асноўных кліматычных элементаў у залежнасці ад геаграфічных фактараў; залежнасць гідралагічных паказчыкаў ад клімату і рэльефу;

вызначаць забяспечанасць тэрыторыі прыроднымі рэсурсамі: мінеральнымі, агракліматычнымі, воднымі, зямельнымі, біялагічнымі;

разлічваць каэфіцыент увільгатнення, гадавую амплітуду тэмператур, ухіл ракі, адносныя вышыні;

будаваць графікі ходу асноўных кліматычных паказчыкаў.

Тэма 3. Геаграфічныя ландшафты. Экалагічныя праблемы (5 гадзін)

Геаграфічныя ландшафты. Распаўсюджанне асноўных прыродных ландшафтаў. Асноўныя роды ландшафтаў Беларусі. Антрапагенныя ландшафты: сельскагаспадарчыя, лесагаспадарчыя, водагаспадарчыя, горнапрамысловыя, рэкрэацыйныя.

Асваенне тэрыторыі і яго віды: прамысловае, сельскагаспадарчае, транспартнае, рэкрэацыйнае. Прыродна-рэсурсны патэнцыял.

Ахова прыроды. Асноўныя прыродаахоўныя тэрыторыі. Запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі і помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Рэкрэацыйныя рэсурсы і іх ацэнка. Зоны адпачынку і курорты. Турысцкія комплексы і маршруты.

Антрапагеннае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Забруджанне тэрыторыі радыенуклідамі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Праблемы Палесся, Салігорскага горнапрамысловага раёна. Лакальныя праблемы забруджвання атмасфернага паветра, паверхневых і надземных вод, глеб у выніку гаспадарчай дзейнасці.

Практычная работа

5*. Параўнальная характарыстыка асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Беларусі (на прыкладзе 2–3).

Асноўныя паняцці: *помнік прыроды, зона адпачынку, турысцкі комплекс, тып, падтып, род ландшафту, антрапагенны ландшафт, эканамічна актыўная тэрыторыя.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць*:** тыпы прыродаахоўных тэрыторый і аб’ектаў; асноўныя геаэкалагічныя праблемы; тыпы і роды ландшафтаў, віды асваення тэрыторыі; рэкрэацыйныя аб’екты тэрыторыі;

умець:

паказваць:

запаведнікі: Бярэзінскі біясферны, Палескі радыяцыйна-экалагічны; нацыянальныя паркі: Белавежская пушча, Браслаўскія азёры, Нарачанскі, Прыпяцкі;

заказнікі: Асвейскі, Ельня, Казьянскі, Налібоцкі, Выганашчанскае, Свіцязянскі;

характарызаваць асноўныя экалагічныя праблемы; асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі;

валодаць уменнем:

тлумачыць сутнасць геаэкалагічных праблем і перспектывы пашырэння сеткі прыродаахоўных аб’ектаў; узаемасувязі прыродных кампанентаў.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна).

Тэма 4. Прыроднае раяніраванне Беларусі (4 гадзіны)

Сутнасць прыроднага раяніравання і яго віды: геамарфалагічнае, агракліматычнае, гідралагічнае, геабатанічнае, глебава-геаграфічнае. Фізіка-геаграфічнае раяніраванне Беларусі.

Беларуская Паазерская правінцыя. Геаграфічнае становішча і асаблівасці прыроды. Уплыў апошняга ледавіка на фарміраванне прыродных комплексаў правінцыі. Азёрнасць тэрыторыі.

Заходне-Беларуская правінцыя. Усходне-Беларуская правінцыя. Геаграфічнае становішча і асаблівасці прыроды. Асаблівасці клімату, глеб і расліннасці.

Перадпалеская правінцыя. Палеская правінцыя. Геаграфічнае становішча і асаблівасці прыроды. Характар паверхні. Экалагічныя праблемы.

Практычная работа

6*. Фізіка-геаграфічная характарыстыка прыроды сваёй мясцовасці.

Асноўныя паняцці: *прыроднае раяніраванне, фізіка-геаграфічнае раяніраванне, правінцыя, акруга, фізіка-геаграфічны раён.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць*:** віды прыроднага раяніравання і асноўныя адзінкі фізіка-геаграфічнага раяніравання;

умець:

паказваць правінцыі: Беларуская Паазерская, Заходне-Беларуская, Усходне-Беларуская, Перадпалеская, Палеская;

характарызаваць асаблівасці прыроды фізіка-геаграфічных правінцый і акруг па плане, карыстаючыся картаграфічным матэрыялам, тэкстам вучэбнага дапаможніка і дадатковым матэрыялам;

валодаць уменнем:

тлумачыць сутнасць прыроднага раяніравання;

вызначаць крытэрыі, пакладзеныя ў аснову выдзялення фізіка-геаграфічных адзінак рознага рангу.

Тэма 5. Насельніцтва (5 гадзін)

Дынаміка колькасці насельніцтва і яго ўзростава-палавая структура.

Натуральны рух насельніцтва. Асаблівасці этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва.

Працоўныя рэсурсы. Занятасць насельніцтва. Праблемы занятасці працоўных рэсурсаў.

Размяшчэнне насельніцтва па тэрыторыі краіны. Шчыльнасць насельніцтва. Тыпы паселішчаў: гарадскія і вясковыя. Геаграфічныя асаблівасці гарадскога рассялення краіны. Функцыянальныя тыпы гарадскіх паселішчаў. Гарады-спадарожнікі.

Сельскае рассяленне. Сучасныя катэгорыі сельскіх паселішчаў і іх трансфармацыя. Уплыў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на рассяленне насельніцтва.

Практычная работа

7. Пабудова дыяграмы (піраміды) узростава-палавой структуры насельніцтва Беларусі і яе аналіз.

Асноўныя паняцці: *горад-спадарожнік, аграгарадок.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

ведаць: асноўныя элементы матэрыяльнай і духоўнай культуры;

умець:

паказваць гарады: Брэст, Баранавічы, Пінск, Кобрын, Віцебск, Наваполацк, Полацк, Оршу, Гомель, Мазыр, Жлобін, Рэчыцу, Светлагорск, Гродна, Ліду, Слонім, Магілёў, Бабруйск, Мінск, Барысаў, Салігорск, Жодзіна, Маладзечна, Слуцк;

характарызаваць асаблівасці размяшчэння насельніцтва, натуральнага і механічнага руху, узростава-палавую структуру, тыпы рассялення;

валодаць уменнем:

разлічваць па статыстычных даных сярэднюю шчыльнасць насельніцтва;

вызначаць праблемы малых і сярэдніх гарадоў, перспектывы развіцця буйных гарадоў;

прагназаваць асноўныя напрамкі дэмаграфічнага развіцця краіны.

Тэма 6. Агульная характарыстыка гаспадаркі (2 гадзіны)

Фактары размяшчэння вытворчасці (тэрыторыя, прыродна-рэсурсны патэнцыял, эканоміка-геаграфічнае становішча, насельніцтва і працоўныя рэсурсы, транспартная дзейнасць, складзіраванне, інфармацыя і сувязь, навуковая і тэхнічная дзейнасць,

экалагічныя ўмовы, дзяржаўная палітыка). Сучасная структура гаспадаркі краіны. Сфера вытворчасці. Структура прамысловасці. Сфера паслуг. Спецыялізацыя гаспадаркі Беларусі.

Тэрытарыяльная структура гаспадаркі. Від эканамічнай дзейнасці. Структура гаспадаркі па відах эканамічнай дзейнасці. Адміністратыўныя вобласці і г. Мінск як буйнейшыя тэрытарыяльныя часткі гаспадаркі Беларусі (эканамічныя раёны).

Асноўныя паняцці: *від эканамічнай дзейнасці, спецыялізацыя, эканамічны раён.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць*:** асноўныя фактары і ўмовы размяшчэння вытворчасці, разнастайныя формы ўласнасці;

умець:

характарызаваць асноўныя праблемы і напрамкі развіцця гаспадаркі;

валодаць уменнем:

будаваць дыяграму структуры гаспадаркі і аналізаваць яе;

разлічваць асноўныя эканамічныя паказчыкі;

тлумачыць узровень сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Тэма 7. Геаграфія сферы вытворчасці (13 гадзін)

Прамысловасць. Горназдабываючая прамысловасць, яе склад, роля ў структуры гаспадаркі і паказчыкі развіцця. Здабыча нафты і спадарожнага газу, торфу. Геаграфія здабычы карысных выкапняў для хімічнай прамысловасці і вытворчасці мінеральных угнаенняў. Здабыча і вытворчасць солі. Здабыча карысных выкапняў для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і будаўніцтва.

Вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі. Фактары размяшчэння, умовы развіцця і геаграфія вытворчасці і размеркавання электраэнергіі. Цеплавыя і гідраўлічныя электрастанцыі. Лініі электраперадачы. Нетрадыцыйныя і альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі, праблемы і перспектывы іх выкарыстання ў беларускай энергетыцы. Развіццё атамнай электраэнергетыкі.

Размеркаванне газападобнага паліва. Буйнейшыя газаправоды Беларусі.

Апрацоўчая прамысловасць. Склад, асаблівасці развіцця і размяшчэння. Фактары размяшчэння і сыравінная база металургічнай вытворчасці і вытворчасці гатовых металічных вырабаў. Геаграфія прадпрыемстваў металургічнай вытворчасці і вытворчасці металічных вырабаў.

Вытворчасць транспартных сродкаў (аўтамабіляў і аўтамабільнай тэхнікі, судоў, чыгуначнага рухомага саставу, авіяцыйнай тэхнікі, матацыклаў і веласіпедаў). Фактары і ўмовы размяшчэння і геаграфія прадпрыемстваў. Вытворчасць машын і абсталявання для сельскай і лясной гаспадаркі. Фактары і ўмовы рамяшчэння, геаграфія вытворчасці. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці электраабсталявання, электроннага і аптычнага абсталявання.

Фактары размяшчэння вытворчасці нафтапрадуктаў. Цэнтры нафтаперапрацоўкі. Хімічная вытворчасць, яе склад, сыравінная база, фактары размяшчэння. Характарыстыка развіцця і размяшчэння вытворчасці мінеральных угнаенняў, штучных і сінтэтычных валокнаў, пластмас, сінтэтычнага каўчуку, фарбаў і лакаў, мыла, сродкаў для мыцця, чысткі і паліроўкі, парфумерных і касметычных сродкаў. Геаграфія вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі. Фактары і ўмовы размяшчэння, геаграфія вытворчасці гумавых і пластмасавых вырабаў.

Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў, цэменту, вапны і гіпсу, вырабаў з бетону.

Будаўніцтва. Геаграфія прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва. Буйнейшыя новабудоўлі Беларусі.

Апрацоўка драўніны і вытворчасць вырабаў з дрэва. Буйнейшыя цэнтры дрэваапрацоўкі і вытворчасці фанеры, драўляных будаўнічых канструкцый і сталярных

вырабаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мэблі. Фактары размяшчэння і асноўныя цэнтры цэлюлозна-папяровай вытворчасці і выдавецкай дзейнасці.

Тэкстыльная і швейная вытворчасць. Структура, сыравінная база. Геаграфія вытворчасці тканіны, адзення, трыкатажных і панчошна-шкарпэтачных вырабаў. Сыравінная база і фактары размяшчэння вытворчасці скуры, вырабаў са скуры і абутку. Буйнейшыя цэнтры скураной і абутковай вытворчасці.

Вытворчасць харчовых прадуктаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мяса і мясапрадуктаў, малочных прадуктаў, рыбы і рыбных прадуктаў, раслiннага алею і тлушчаў, прадуктаў мукамольна-крупяной прамысловасці, цукру.

Сельская гаспадарка, паляванне і лясная гаспадарка. Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Структура і размяшчэнне зямельных угоддзяў. Геаграфія раслінаводства (збожжавай гаспадаркі, бульбаводства, агародніцтва, садоўніцтва, вырошчвання тэхнічных культур).

Геаграфія жывёлагадоўлі (буйной рагатай жывёлы, свінагадоўлі, авечкагадоўлі, конегадоўлі, птушкагадоўлі, зверагадоўлі, пчалярства).

Рыбалоўства і рыбаводства. Буйнейшыя рыбныя гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі.

Структура і роля лясной гаспадаркі ў эканоміцы краіны (лесаводства і лесанарыхтоўкі, збор дзікарослых грыбоў, ягад і лекавых траў). Геаграфія лесанарыхтовак. Паляванне і развядзенне дзічыны. Геаграфія буйнейшых паляўнічых угоддзяў краіны.

Практычныя работы

8. Пабудова картасхемы «Фактары размяшчэння і геаграфія прамысловай вытворчасці» і яе аналіз (на выбар па аднаму з відаў эканамічнай дзейнасці).

9. Нанясенне на контурную карту раёнаў вырошчвання лёну і цукровых буракоў і аналіз размяшчэння вытворчасці льновалакна і цукру.

Асноўныя паняцці: *горназдабываючая прамысловасць, апрацоўчая прамысловасць, паліўна-энергетычны баланс, малатанажная хімія, структура зямельных угоддзяў.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць*:** фактары размяшчэння відаў эканамічнай дзейнасці, сферы вытворчасці;

умець:

паказваць на карце буйнейшыя прамысловыя цэнтры;

характарызаваць размяшчэнне вытворчасці на тэрыторыі краіны;

валодаць уменнем:

тлумачыць прычыны ўзнікнення праблем развіцця і размяшчэння прадпрыемстваў сферы вытворчасці;

прагназаваць змены ў размяшчэнні прадпрыемстваў сферы вытворчасці.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна).

Тэма 8. Геаграфія сферы паслуг (2 гадзіны)

Структура сферы паслуг, яе роля ў эканоміцы. Узровень развіцця сферы паслуг як індыкатар эканамічнага развіцця краіны.

Развіцце і фактары размяшчэння асобных відаў эканамічнай дзейнасці, якія складаюць сферу паслуг: транспарту і сувязі, фінансавай дзейнасці, гандлю, адукацыі, аховы здароўя, турызму.

Асноўныя паняцці: *транспартная сетка, транспартны вузел, прадуктаправод, сувязь, фінансавая дзейнасць, гандаль, адукацыя, ахова здароўя.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

умець:

паказваць на карце гарады, якія з’яўляюцца буйнейшымі транспартнымі вузламі, фінансавымі цэнтрамі, а таксама гарады, у якіх знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі (універсітэты, акадэміі, інстытуты);

характарызаваць работу асобных відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг;

валодаць уменнем:

вызначаць паказчыкі і асаблівасці развіцця і размяшчэння важнейшых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг;

тлумачыць прычыны тэрытарыяльных адрозненняў ва ўзроўні развіцця сферы паслуг.

Тэма 9. Беларусь у сусветнай супольнасці (3 гадзіны)

Пры засваенні зместу вучэбнай праграмы вучні набываюць кампетэнцыі, якія маюць сацыяльную і асабістую значнасць. Асобасныя і прадметныя кампетэнцыі навучэнцаў, якія заканчваюць X і XI класы ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, канкрэтызаваны ў чатырох кірунках:

вучні павінны ведаць і разумець;

вучні павінны ведаць і выконваць;

вучні павінны ведаць і ўмець;

вучні павінны ўмець выкарыстоўваць набытыя кампетэнцыі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці.

Змест асобасных і прадметных кампетэнцый сфармуляваны ў патрабаваннях да навучэнцаў, якія заканчваюць X і XI класы установы агульнай сярэдняй адукацыі.

Вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў і ступень засваення зместу вучэбнай праграмы «Фізічная культура і здароўе» ацэньваюцца па крытэрыях і ў адпаведнасці з правіламі правядзення атэстацыі вучняў, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» падаецца ў дадатку 1.

Умовы выканання тэставых практыкаванняў для ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных якасцяў вучняў выкладзены ў дадатку 2.

Вучэбная праграма «Фізічная культура і здароўе» змяшчае навучальны матэрыял па спартыўных гульнях (баскетбол, валейбол, гандбол, футбол), для X – XI класаў рэкамендаваны для вывучэння ў аб'ёме 35 гадзін на вучэбных занятках «Гадзіна здароўя і спорту» (дадатак 3).

X КЛАС (юнакі і дзяўчаты)
Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу

Табліца 1

Кампаненты, раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу	Колькасць гадзін
ІНВАРЫЯНТНЫ КАМПАНЕНТ	**45**
Асновы фізкультурных ведаў	**2**
Правілы бяспечных паводзінаў на фізкультурных і спартыўных занятках	0,5
Рухальныя здольнасці чалавека	0,25
Методыка самастойных заняткаў, самакантроль	0,5
Здаровы лад жыцця	0,5
Алімпізм и алімпійскі рух	0,25
Асновы відаў спорту	**37**
Легкая атлетыка	9
Легкая атлетыка – кросавая подрыхтоўка[9]	0 (8)
Аэробіка спартыўная, акрабатыка (д) Гімнастыка атлетычная, акрабатыка (ю)	8
Лыжныя гонкі[10]	8 (0)
Спартыўныя гульні[11]	10
Тэсціраванне	**6**
Дамашнія заданні[12]	+
ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ	**25**
Плаванне[13]	да 24
Аэробіка спартыўная (д)	+
Гімнастыка атлетычная (ю)	+
Баскетбол	+
Валейбол	+

Гандбол	+
Футбол	+
Тэніс настольны	+
Легкая атлетика	+
Усяго	**70**

[9] Ва ўмовах бясснежнай зімы замест лыжных гонак.
[10] При адсутнасці снега магчымая замена іншымі тэмамі вучэбнага матэрыялу.
[11] Вывучаецца адна з чатыроз спартыўных гульняў.
[12] Колькасцю гадзін не рэгламентуюцца.
[13] Пры наяўнасці ўмоў для вучэбных заняткаў па плаванню.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
ІНВАРЫЯНТНЫ КАМПАНЕНТ
Асновы фізкультурных ведаў

Правілы бяспечных паводзін на фізкультурных і спартыўных занятках.

Папярэджанне траўманебяспечных сітуацый на гульнявой пляцоўцы, стадыёне, каля вадаёма, у лесапаркавай зоне. Правілы бяспечных паводзін на вучэбных занятках, падчас самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі, на спартыўных спаборніцтвах.

Рухальныя здольнасці чалавека.

Сілавыя здольнасці. Мышачная сіла. Прыкладное значэнне мышачнай сілы для дзяўчат і юнакоў. Значэнне сілавых здольнасцяў для дзяўчат і юнакоў. Спосабы вымярэння.

Хуткасныя здольнасці. Прыкладное значэнне хуткасных здольнасцяў для дзяўчат і юнакоў у сучасных умовах. Паказчыкі і разнавіднасці хуткасных здольнасцяў дзяўчат і юнакоў. Час рухальнай рэакцыі.

Хуткасна-сілавыя здольнасці. Віды хуткасна-сілавых здольнасцяў. Здольнасць максімальна хутка праяўляць максімальную сілу. Здольнасць набіраць хуткасць. Прыкладное значэнне хуткасна-сілавых здольнасцяў для дзяўчат і юнакоў. Фактары, якія ўплываюць на хуткасна-сілавыя здольнасці. Спосабы вымярэння.

Трываласць. Трываласць, яе разнавіднасці і значэнне ў жыцці дзяўчыны і юнака. Сілавая, хуткасная, хуткасна-сілавая і агульная трываласць і іх паказчыкі. Значэнне трываласці для дзяўчын і юнакоў. Фактары, якія ўплываюць на развіццё трываласці.

Гнуткасць. Эстэтычнае і прыкладное значэнне гнуткасці для дзяўчыны і юнака. Віды гнуткасці. Фактары, якія ўплываюць на гнуткасць. Паказчыкі гнуткасці.

Каардынацыйныя здольнасці. Эстэтычнае і прыкладное значэнне каардынацыйных здольнасцяў для дзяўчыны і юнака. Віды каардынацыйных здольнасцяў, іх паказчыкі і тэсты для ацэнкі. Фактары, якія ўплываюць на развіццё каардынацыйных здольнасцяў.

Методыка самастойных заняткаў, самакантроль (дз). Вызначэнне задач самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі (аздараўленне, рэабілітацыя, рэкрэацыя, развіццё рухальных здольнасцяў і да т.п.). Правілы адбору сродкаў для рашэння задач самастойных заняткаў з улікам цыклічнасці фізіялагічных функцый жаночага арганізма. Выбар метадаў, рэкамендаваных для выкарыстання гэтых сродкаў. Агульныя правілы індывідуальнага нарміравання нагрузкі ў працэсе самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі. Метадычныя рэкамендацыі па папярэднім, прамежкавым, выніковым самакантролі.

Методыка самастойных заняткаў, самакантроль (ю). Формы самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі ў рэжыме дня. Фізічныя практыкаванні для захавання і паляпшэння здароўя: хадзьба, бег трушком, плаванне, веславанне, праходкі на лыжах, спартыўныя і рухавыя гульні. Асаблівасці дыхання пры выкананні практыкаванняў для развіцця сілы і фарміравання рэльефу мышцаў. Практыкаванні для актыўнага адпачынку і аднаўлення. Агульныя правілы індывідуальнага нарміравання

нагрузкі ў працэсе самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі. Метадычныя рэкамендацыі па папярэднім, прамежкавым, выніковым самакантролі.

Здаровы лад жыцця. Уплыў ужывання нікатыну, алкаголю, наркатычных рэчываў, пераядання і іншых негатыўных фактараў на стан здароўя і генетычны код дзяўчыны і юнака. Станоўчае ўздзеянне фізічных практыкаванняў на здароўе юнака, дзяўчыны і будучага патомства. Патрабаванні да фарміравання здаровага ладу жыцця сродкамі фізічнай культуры. Сродкі фізічнай культуры ў здаровым ладзе жыцця дзяўчыны і юнака. Аптымальны рухальны рэжым у вучэбныя і выхадныя дні, у розныя поры года.

Алімпізм і алімпійскі рух. Функцыі Нацыянальнага алімпійскага камітэта (НАК) Рэспублікі Беларусь. Міжнародныя сувязі. Уплыў НАК Рэспублікі Беларусь на развіццё «спорту для ўсіх» у краіне. Навейшая алімпійская гісторыя Беларусі (з 1994 г.).

Асновы відаў спорту
Лёгкая атлетыка

Хадзьба. Разнавіднасці хадзьбы з чаргаваннем нізкага, сярэдняга і высокага тэмпаў на розных адрэзках дыстанцыі, аздараўленчая хадзьба, скандынаўская хадзьба. Хадзьба 2000 м (д), 3000 м (ю).

Бег. З зададзенай хуткасцю на зададзены час, чаўночны бег 4 х 9 м, эстафетны бег па крузе, з нізкага і высокага старту 100 м на хуткасць*[14], раўнамерны і пераменны бег 2, 4, 6 мін, кросавы бег.

[14] Тут і далей зорачкай (*) пазначаны практыкаванні, абавязковыя для вывучэння і ацэнкі тэхнікі выканання.

Скачкі. З месца штуршком дзвюма нагамі на далёкасць, у вышыню з даставаннем рукой прадмета; мнагаскокі на дзвюх нагах з максімальным выскокваннем уверх, на адной назе на далёкасць з зададзенай колькасцю скачкоў; скачкі ў даўжыню з разбегу на далёкасць*, скачкі ў вышыню з разбегу вывучаным спосабам*.

Кіданне (дз). Мяча 150 г на далёкасць з месца, з чатырох кідальных крокаў і з поўнага разбегу па калідоры 10 м на далёкасць* і на зададзеную адлегласць, у гарызантальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 20–25 м.

Кіданне (ю). Мяча 150 г з чатырох кідальных крокаў і з поўнага разбегу па калідоры 10 м на далёкасць; гранаты 700 г з месца і чатырох крокаў, з поўнага разбегу па калідоры 10 м на далёкасць*; у гарызантальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 20–25 м.

Лёгкая атлетыка – кросавая падрыхтоўка

Чаргаванне хадзьбы і бегу па перасечанай мясцовасці, раўнамернага бегу і паскарэнняў. Пераадоленне вертыкальных* (з апорай і без апоры) і гарызантальных* перашкод у скачку з прызямленнем на адну нагу без парушэння рытму бегу. Фінішнае паскарэнне. Тактыка размеркавання сіл на кросавай дыстанцыі да 2 км (дз) і да 3 км (ю).

Аэробіка спартыўная (дзяўчаты)

Разнавіднасці крокаў. Разнавіднасці прыстаўнога кроку ўбок, асноўнага кроку, скрыжаванага кроку, крокаў ногі паасобку – ногі разам. Камбінацыі з засвоеных крокаў у спалучэнні з рухамі рук (рукі ў бакі, уверх, уперад, управа, улева, кругі рукамі, кругі перадплеччамі, кругі плячамі, згінанні і разгінанні рук).

Разнавіднасці бегу. Бег з прасоўваннем наперад з разнастайнымі рухамі рук (згінаючы і разгінаючы рукі ўверх, у бакі, папераменна ўправа – улева, з кругамі рукамі, з кругамі перадплеччамі).

Падскокі. Падскокі згінаючы і разгінаючы нагу наперад, убок, назад, з нагі на нагу. Варыянты выканання базавых рухаў з падскокамі. Падскокі ногі паасобку – ногі разам. Падскокі у спалучэнні з рознымі сіметрычнымі і асіметрычнымі рухамі рук; папераменна на левай, правай і на дзвюх нагах у спалучэнні з рознымі рухамі рук.

Спалучэнне падскокаў ногі паасобку – ногі разам з розным становішчам рук.

Пад'ёмы калена. Пачарговае і шматразовае выкананне пад'ёму калена. Пад'ём калена з падскокам.

Выпады. Выпады ўперад, убок, з падскокамі.

Махі. Уперад, у бакі, уперад і ўбок з падскокамі.

Элементы гнуткасці. Паўшпагат на правую нагу, на левую нагу, папярочны паўшпагат і шпагат. Хвалі з зыходных становішчаў «стоячы», «седзячы на пятках на падлозе». Махі ў вертыкальны шпагат. Махі наперад і ўбок з прыскокамі. Чатыры махі наперад пачаргова правай і левай нагой з паваротам на 360°.

Практыкаванні ў раўнавазе. Павароты на 360° стоячы на адной назе, другая прыціснута да галенастопа. Раўнавага стоячы на насках, рукі ўверх. Раўнавага стоячы на адной назе, другую нагу ўбок, рукі ўверх або ў бакі. Затрыманне раўнавагі пасля скачкоў або падскокаў.

Комплексы практыкаванняў для развіцця сілы і сілавой трываласці мышцаў тулава, рук і ног у зыходным становішчы «седзячы» і «лежачы».

Комплексы практыкаванняў для развіцця гнуткасці (стрэтчынг). Звязкі базавых рухаў на 8 лікаў у злучэнні з элементамі гнуткасці і раўнавагі (чатыры звязкі з чатырма элементамі)

Комплекс, які ўключае не менш як восем вывучаных практыкаванняў*.

Акрабатыка (д)

Стойка на лапатках з папераменным згінаннем ног, раўнавага «ластаўка». У групоўцы два кулькі наперад разам, два кулькі назад разам, паўшпагат і шпагат, пераварот бокам («кола»).

Камбінацыя, якая ўключае не менш як шэсць вывучаных элементаў*.

Гімнастыка атлетычная (ю)

Практыкаванні для развіцця сілы і сілавой трываласці двухгаловай мышцы пляча, мышцаў шыі, трапецападобнай мышцы, дэльтападобнай мышцы, вялікай грудной мышцы, мышцаў перадплечча, прамой мышцы жывата, чатырохгаловай мышцы сцягна, ікраножнай мышцы, мышцаў задняй паверхні сцягна, знешняй касой мышцы жывата, доўгіх мышцаў спіны, найшырэйшай мышцы спіны, трохгаловай мышцы пляча. Практыкаванні з рознымі абцяжараннямі (вагой цела, вагой гантэлей, штангі, гіры, грузу і да т.п.); з пераадоленнем пругкіх уласцівасцяў прадметаў (эластычны бінт, эспандар, пругкая спружына і да т.п.). Комплексы практыкаванняў для фарміравання і нарошчванні мышачнай масы.

Акрабатыка (ю)

У групоўцы два-тры кулькі наперад разам; у групоўцы два-тры кулькі назад разам; доўгі кулёк наперад штуршком дзвюма нагамі; раўнавага «ластаўка», два пераваротa бокам («кола») разам; стойка на галаве і руках, на руках (з дапамогай).

Камбінацыя, якая ўключае не менш як пяць вывучаных элементаў*

Лыжныя гонкі

Рух адначасовымі бяскрокавым, аднакрокавым, двухкрокавым хадамі, папераменным двухкрокавым ходам, каньковым ходам; пераход ад адначасовых хадоў да папераменных і назад*. Пад'ём «лесвічкай», «паўелачкай», «елачкай»; спускі ў высокай, сярэдняй стойках; павароты ў руху. Тармажэнне «паўплугам», «плугам». Выкарыстанне пералічаных спосабаў перамяшчэння пры праходжанні дыстанцыі* да 3 км (дз) і да 5 км (ю).

Спартыўныя гульні

(вывучаецца адна з чатырох гульняў на выбар)

Баскетбол. Перадачы мяча рознымі спосабамі на месцы, падчас руху ў адным напрамку і пры сустрэчным руху. Вядзенне мяча правай і левай рукой, папераменна правай і левай рукой, без зрокавага кантролю, са зменай хуткасці і напрамку руху; перахопы мяча падчас вядзення. Кідкі мяча па кальцы з месца адной рукой ад галавы*, штрафныя кідкі*, кідкі пасля вядзення і двух крокаў. Тактычныя ўзаемадзеянні ў нападзенні. Дзеянні гульца пры персанальнай і зоннай абароне. Гульня на адно кальцо «Стрытбол». Двухбаковая гульня.

Валейбол. Прыём мяча знізу*. Перадача мяча зверху*. Ніжняя і верхняя падачы* з трапленнем у зоны 1, 6 і 5*. Другая перадача ў зоны 4 і 2. Нападальны ўдар. Блакіраванне нападальнага ўдару. Страхоўка пры прыёме мяча пасля падачы і пры нападальным удары. Двухбаковая гульня.

Гандбол. Перадачы мяча адной рукой на кароткую, сярэднюю і доўгую адлегласць ад пляча, збоку, знізу і над галавой*. Перадачы і лоўля мяча ў тройках, з адскокам ад падлогі, пры сустрэчным руху*. Лоўля мяча дзвюма рукамі стоячы на месцы і ў руху. Вядзенне мяча ў спалучэнні са змяненнем хуткасці перамяшчэння, абводкай праціўніка, перадачамі і кідкамі па варотах*. Індывідуальныя дзеянні ў нападзенні, якія адцягваюць увагу. Штрафны кідок*. Кідок з апорнага становішча*. Гульня варатара: адбіванне і лоўля мяча*. Двухбаковая гульня.

Футбол. Удары правай і левай нагой па мячы, які не рухаецца, і па мячы, які коціцца, сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні*, знешняй часткай пад'ёму, наском, удары па мячы, які ляціць. Вядзенне мяча разнастайнымі спосабамі. Жангліраванне мячом адной і дзвюма нагамі. Тэхніка-тактычныя звязкі: вядзенне – перадача, прыём – перадача, прыём – вядзенне – перадача*. Тактычныя дзеянні ў абароне і нападзенні пры гульні 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 гульцоў.

Рухавыя гульні і эстафеты на развіццё каардынацыйных здольнасцяў, гнуткасці, хуткасці (з вядзеннем мяча, абвядзеннем стоек, прыёмам і спыненнем мяча, ударамі па варотах), гульні з двума і трыма нападаючымі на пляцоўцы для міні-футбола, з абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара).

Гульня ў міні-футбол і футбол па спрошчаных правілах.

Тэсціраванне ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці вучняў

Выкананне тэставых практыкаванняў плануецца настаўнікам на пачатак і заканчэнне навучальнага года. На працягу аднаго ўрока не рэкамендуецца выконваць больш за два тэставыя практыкаванні.

Вынікі тэставых практыкаванняў (табліца 2) выкарыстоўваюцца як для вызначэння ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці вучняў, так і для карэкціроўкі паўрочнага каляндарна-тэматычнага плана, зместу планаў-канспектаў урокаў.

Умовы выканання тэставых практыкаванняў падаюцца ў дадатку 2.

Пералік і рэкамендаваная паслядоўнасць выканання тэставых практыкаванняў:

бег 30 м;

чаўночны бег 4 х 9 м *або* скокі праз кароткую скакалку за 1 мін.;

скачок у даўжыню з месца ***або*** трайны скачок з месца штуршком дзвюма нагамі (ю), кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі з зыходнага становішча седзячы ногі паасобку (дз);

падцягванне ў вісе на перакладзіне ***або*** згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на брусах (ю); падыманне тулава са становішча лежачы на спіне за 1 мін ***або*** падыманне і апусканне прамых ног за 1 мін (дз);

нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе ***або*** нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы;

бег 1500 м, *або* хадзьба 3000 м, *або* 6-хвілінны бег (ю);

бег 1000 м, *або* хадзьба 2000 м, *або* 6-хвілінны бег (д).

10-БАЛЬНЫЯ ШКАЛЫ АЦЭНКІ ЎЗРОЎНЮ РАЗВІЦЦЯ РУХАЛЬНЫХ ЯКАСЦЯЎ ВУЧНЯЎ X КЛАСА

Табліца 2

Тэставыя практыкаванні	Балы									
	10	9	8	7	6	5	4	3	2	1
	Узроўні фізічнай падрыхтаванасці									
	высокі		вышэй за сярэдні		сярэдні		ніжэй за сярэдні		нізкі	
Юнакі										
Бег 30 м (с)	4,3	4,4	4,5	4,6	4,7	4,9	5,1	5,3	5,5	5,7 і больш
Чаўночны бег 4 × 9 м (с) *або*	8,8	8,9	9,0	9,2	9,3	9,6	9,8	10,1	10,3	10,6 і больш
Скачкі праз кароткую скакалку за 1 хв. (разоў)	135	125	118	110	104	96	90	83	75	60 і менш
Скачок ў даўжыню з месца (см) *або*	247	242	236	231	225	215	204	193	182	171 і менш
Трайны скачок з месца штуршком дзьвюма нагамі (см)	750	740	715	685	665	635	615	590	555	520 і менш
Падцягванне ў вісе на перакладзіне (разоў)	13	12	11	10	9	7	4	2	1	–
або Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на брусах (разоў)	15	13	12	10	9	7	5	3	2	1
Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе (см)	17	16	14	12	10	6	3	–1	–5	–8 і менш
або Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы (см)	14	12	10	9	7	4	2	0	–2	– 4 и менш
Бег 1500 м (хв, с) *або*	5.25	5.39	5.52	6.06	6.19	6.46	7.13	7.40	8.07	8.34 і больш
Хадзьба 3000 м (хв, с) *або*	21.50	22.30	23.10	24.00	24.40	25.30	26.10	27.00	27.50	28.40 і больш
6-хвілінны бег (м)	1430	1400	1380	1350	1320	1300	1280	1250	1210	1170 і менш
Дзяўчаты										
Бег 30 м (с)	4,9	5,0	5,1	5,2	5,3	5,5	5,7	6,0	6,2	6,4 и больш
Чаўночны бег 4 × 9 м (с) *або*	9,8	10,0	10,1	10,3	10,5	10,8	11,2	11,5	11,9	12,2 и больш
Скачкі праз кароткую скакалку за 1 хв. (разоў)	139	133	126	120	114	110	104	92	85	76 і менш
Скачок ў даўжыню з месца (см) *або*	196	191	187	182	177	168	159	149	140	131 і менш
Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі з зыходнага становішча «седзячы,	625	600	550	510	475	440	410	380	320	300 і менш

ногі паасобку» (см)										
Падыманне тулава са становішча «лежачы на спіне» за 1 хв (разоў) *або* Падыманне і апусканне прамых ног за 1 хв (разоў)	58	56	54	52	50	46	42	38	34	30 і менш
	37	34	30	27	25	22	20	15	10	7 і менш
Нахіл наперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе» (см) *або* Нахіл наперад з зыходнага становішча «стоячы на гімнастычнай лаўцы» (см)	21	20	18	16	15	12	8	5	2	–2 і менш
	22	20	18	16	14	11	9	6	3	2 і менш
Бег 1000 м (хв, с) *або* Хадзьба 2000 м (хв, с) *або* 6-хвілінны бег (м)	4.38	4.50	5.03	5.15	5.27	5.52	6.16	6.41	7.07	7.30 і больш
	16.0	16.35	17.05	17.40	18.0	18.25	18.50	19.10	19.20	20.0 і больш
	1285	1250	1200	1170	1130	1110	1090	1040	980	910 і менш

10-БАЛЬНЫЯ ШКАЛЫ АЦЭНКИ ВУЧЭБНЫХ НАРМАТЫВАЎ ПА ЗАСВАЕННІ ЎМЕНЯЎ, НАВЫКАЎ, РАЗВІЦЦЮ РУХАЛЬНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ ВУЧНЯЎ X КЛАСА

Табліца 3

Кантрольныя практыкаванні	**Балы**									
	10	**9**	**8**	**7**	**6**	**5**	**4**	**3**	**2**	**1**
Юнакі										
Бег 100 м (с)	13,9	14,2	14,5	14,7	14,9	15,1	15,3	15,5	15,7	15,8 і больш
Бег 3000 м (хв, с)	13.20	14.05	14.45	15.25	16.05	16.50	17.40	18.30	19.20	19.21 і больш
Крос 2000 м (хв, с)	8.35	9.10	9.45	10.20	10.35	10.50	11.15	11.40	12.10	12.11 і больш
Крос 3000 м (хв, с)	13.30	14.15	14.55	15.35	16.15	17.05	17.55	18.50	19.45	19.46 і больш
Скачок ў даўжыню (см)	463	450	436	423	410	382	356	330	304	303 і менш
Скачок ў вышыню (см)	130	125	120	–	115	110	105	100	95	90 і менш
Кіданне мяча 150 г з разбегу (м)	47	45	43	41	40	37	34	31	28	27 і менш
Кіданне гранаты 700 з с разбегу (м)	34	32	30	28	26	24	23	22	21	20 і менш
Затрыманне ног у становішчы вугла ва ўпоры на брусах (с)	6	5	–	–	4	–	–	3	2	1 і менш
Пад'ём пераваротам на перакладзіне (разоў)	4	3	–	–	2	–	–	1	–	–
Пад'ём сілай на перакладзіне (разоў)	4	3	–	–	2	–	–	1	–	–
Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на брусах (разоў)	12	11	10	9	8	7	6	5	4	3 і менш
Лыжныя гонкі 3 км (хв, с)	14.50	15.10	15.25	15.50	16.05	16.30	18.50	17.10	17.30	17.31 і больш
Лыжныя гонкі 5 км (хв, с)	26.10	27.00	27.50	28.40	29.30	30.00	30.30	31.00	31.30	31.31

										і больш
Плаванне 50 м (хв, с); 50, 25 м – без уліку часу	1.05	1.10	1.13	1.17	1.20	1.25	1.30	50 м	–	25 м і менш
Дзяўчаты										
Бег 3000 м (хв, с)	15,7	16,0	16,3	16,5	16,7	17	17,2	17,4	17,6	17,7 і больш
Крос 2000 м (хв, с)	10.32	11.00	11.28	11.54	12.20	12.40	13.00	13.20	13.40	13.41 і больш
Скачок ў даўжыню (см)	370	360	350	340	330	317	303	290	277	276 і менш
Скачок ў вышыню (см)	115	110	105	-	100	95	-	90	85	80 і менш
Кіданне мяча 150 г з разгону	30	28	26	24	23	21	19	18	16	15 і менш
Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы (разоў)	16	15	10	8	6	5	4	3	2	1
Падцягванне на нізкай перакладзіне (разоў)	24	21	19	18	17	15	12	11	10	9 і менш
Лыжныя гонкі 3 км (хв, с)	16.00	16.30	17.05	17.50	18.15	18.55	19.20	19.50	20.30	20.31 і больш
Плаванне 50 м (хв, с); 25, 10 м – без уліку часу	1.05	1.10	1.13	1.16	1.20	1.25	1.30	25 м	–	10 м і менш

Патрабаванні да вучняў якія заканчваюць Х клас установы агульнай сярэдняй адукацыі

Патрабаванні да навучэнцаў, што заканчваюць Х клас установы агульнай сярэдняй адукацыі, якія забяспечваюць да іх кампетэнтнасны падыход і з'яўляюцца крытэрыямі засваення вучэбнага матэрыялу вучэбнай праграмы.

Вучні павінны ведаць і разумець:

тэрміны «алімпізм», «алімпійскі рух», «спорт», «фізічная культура», «Алімпійскія гульні» і «Паралімпійскія гульні»;

ролю і значэнне Нацыянальнага алімпійскага камітэту ў развіцці алімпійскага руху ў Рэспубліцы Беларусь;

сацыяльную і асобасную значнасць фізічнай культуры і спорту ў сучасным грамадстве;

назвы зімовых і летніх алімпійскіх і неалімпійскіх відаў спорту;

змест здаровага ладу жыцця;

уплыў заняткаў фізічнай культурай і спортам на арганізм чалавека;

віды самакантролю ў працэсе заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

спосабы рэгулявання фізічных нагрузак у працэсе самастойных заняткаў; прыкладное і аздараўленчае значэнне відаў спорту, якія вывучаюцца;

прыкладное і аздараўленчае значэнне відаў спорту, якія вывучаюцца;

правілы спаборніцтваў вывучанага гульнявога віду спорту.

Вучні павінны ведаць і выконваць:

правілы бяспечных паводзін і папярэджання траўманебяспечных сітуацый падчас вучэбных заняткаў, наведвання спартыўных і іншых масавых мерапрыемстваў;

правілы падрыхтоўкі месцаў заняткаў, страхоўкі, самастрахоўки, узаемадапамогі;

правілы асабістай і грамадскай гігіены пры занятках фізічнай культурай і спортам;

патрабаванні да рухальнага рэжыму ў вучэбныя і выхадныя дні ў розныя перыяды года;

патрабаванні да захавання і фарміравання правільнай паставы;

правілы вымярэння і ацэнкі ўзроўню свайго фізічнага развіцця і фізічнай падрыхтаванасці;

правілы складання і выканання комплексу практыкаванняў для падтрымкі разумовай працаздольнасці на працягу вучэбнага дня, тыдня, месяца, чвэрці;

правілы вывучаных спартыўных і рухавых гульняў.

Вучні павінны ведаць і ўмець правільна выконваць:

Комплексы практыкаванняў ранішняй гімнастыкі;

Практыкаванні для захавання правільнай паставы і прафілактыкі захавання зроку;

тэставыя практыкаванні для вызначэння ўзроўню развіцця рухальных якасцяў;

кантрольныя практыкаванні для ацэнкі вучэбных нарматываў па засваенні ўменняў, навыкаў, развіццю рухальных якасцяў.

Вучні павінны ўмець выкарыстоўваць набытыя кампетэнцыі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

для захавання здаровага, фізічна актыўнага ладу жыцця;

для аказання першай даўрачэбнай дапамогі пры розных траўмах;

для пастаяннай падтрымкі правільнай паставы;

для выканання індывідуальнага рухальнага рэжыму вучэбнага і выхаднога дня;

для ацэнкі свайго ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці;

для вымярэння і ацэнкі свайго ўзроўню фізічнага развіцця;

для заняткаў плаваннем (праплываць не менш за 25 м любым спартыўным спосабам плавання);

для ўдзелу ў спартыўных і рухавых гульнях, фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах;

для ўдзелу ў судзействе спартыўных спаборніцтваў;

для дасягнення індывідуальна максімальнага выніку ў тэставых і кантрольных практыкаваннях.

Варыятыўны кампанент

(X–XI классы)

Плаванне

Практыкаванні на сушы. Актыўныя і пасіўныя практыкаванні для развіцця рухомасці ступні, плечавых, тазасцёгнавых і галёнкаступнёвых суставаў. Практыкаванні сілавога характару для развіцця сілавой трываласці мышцаў рук, ног, брушнога прэса, спіны. Імітацыйныя практыкаванні для развіцця каардынацыі рухаў рук і ног. Спецыяльныя практыкаванні для адпрацоўкі павароту на сушы.

Практыкаванні ў вадзе. Плаванне спосабам «кроль на грудзях». Плаванне з дошкай на нагах, плаванне на руках, узгадненне рухаў рук, ног і дыхання; з зыходнага становішча «лежачы на грудзях, рукі ўверсе» праплыванне адрэзкаў да 25 м з выкананнем грабка толькі левай рукой, потым толькі правай рукой, адначасова дзвюма рукамі, выкарыстоўваючы для падтрымкі ног дошкі, надзіманыя кругі і да т.п.; тое ж самае, але ўключаючы работу ног, з увагай да дыхання; плаванне спосабам «кроль на грудзях» у поўнай каардынацыі. Пераадоленне дыстанцыі 25–50 м без уліку часу.

Плаванне спосабам «кроль на спіне»: з зыходнага становішча «лежачы на грудзях, рукі ўверсе» праплыванне адрэзкаў да 25 м, выконваючы грабок толькі левай рукой, затым толькі правай рукой, адначасова дзвюма рукамі з выкарыстаннем для падтрымкі ног дошак, надзіманых кругоў і да т.п.; плаванне спосабам «кроль на спіне» ў поўнай каардынацыі. Пераадоленне дыстанцыі 25–50 м без уліку часу.

Скачкі ў ваду. Скачкі ў ваду з борціка нагамі ўніз. Спад галавой уніз з зыходных становішчаў седзячы на борціку і седзячы на тумбачцы. Стартавы скачок у ваду з тумбачкі.

Аэробіка спартыўная (дзяўчаты)

Базавыя рухі, уменні і навыкі

Разнавіднасці хады. Прыстаўны крок у бок, наперад і назад, скрыжаваны крок, варыянты крокаў ногі паасобку – ногі разам наперад, назад, у спалучэнні з паваротамі.

Разнавіднасці бегу. Бег на месцы, з рухам наперад і назад. Выкананне базавых крокаў у форме бегу. Спалучэнні розных форм бегу з воплескамі, згінаннямі і разгінаннямі рук, падыманнем і апусканнем рук і з кругамі.

Падскокі. З разгінаннем нагі наперад, убок, назад.

Падскокі ногі паасобку – ногі разам. З сіметрычнымі і асіметрычнымі рухамі рукамі.

Пад'ём калена. Пад'ём калена з кругам рукой. Спалучэнні з бегу, падскокаў і пад'ёмаў калена.

Выпады. Спалучэнні разнавіднасцей бегу, падскокаў, пад'ёму калена, падскокаў ногі паасобку – ногі разам з выпадамі.

Махі. Спалучэнні з махаў і пад'ёмаў калена з рухамі рук. Спалучэнні і звязкі разнавіднасцей бегу, падскокаў, выпадаў, пад'ёму калена і махаў з рухамі рук.

Элементы цяжкасці

Элементы дынамічнай сілы. Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы з апорай на калені, ва ўпоры лежачы, ногі паасобку, ва ўпоры лежачы з апорай на адну нагу і (або) на адну руку. Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы з апусканнем ва ўпор на перадплеччах.

Кругавыя рухі папераменна правай і левай нагой з зыходнага становішча «упор прысед на адной, другая – убок на насок».

Элементы статычнай сілы. З зыходнага становішча «лежачы на спіне, рукі ўверх або за галаву» падыманне і апусканне тулава. Упор вуглом з апорай (прыпадыманне ног над падлогай ва ўпоры седзячы або падыманне таза над падлогай у тым жа зыходным становішчы). Упор вуглом (сілавое затрыманне ног ва ўпоры): вугал, ногі паасобку, з апорай на адну руку; упор вуглом, ногі паасобку, упоры вуглом; ногі паасобку на гімнастычнай лаўцы.

Скачкі. Скачкі прагнуўшыся, скачкі з падкіднога мосціка, скачкі ў глыбіню (з гімнастычнай лаўкі) з прызямленнем у паўпрысед, рукі ў бакі. Скачкі з паваротам на 180° і на 360°. З апорай рукамі на гімнастычную сценку скачкі ўверх з развядзеннем ног у бакі (на вугал, не меншы за 90°). Скачкі «нажніцы» (з пачарговым узмахам ног уперад).

Элементы гнуткасці і раўнавагі. Шпагаты і паўшпагаты. Мах у вертыкальны шпагат. Па чарзе чатыры махі. Па чарзе чатыры махі з паваротам на 360°. Раўнавага з затрыманнем нагі назад, убок, наперад. Павароты на 360° і 720° стоячы на адной назе, другая прыціснута да галенастопу.

Спецыяльная фізічная падрыхтоўка

Спецыяльная сілавая падрыхтоўка. Утрыманне: упору лежачы на сагнутых руках, ног пад прамым вуглом у вісе на гімнастычнай сценцы; тулава прагнуўшыся ва ўпоры лежачы на сцёгнах, ног пад прамым вуглом ва ўпоры седзячы на гімнастычнай лаўцы.

Спецыяльная хуткасна-сілавая падрыхтоўка. Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы на каленях з воплескамі; з зыходнага становішча «лежачы на спіне, рукі ўверсе», пераход у сед у групоўцы і вяртанне ў зыходнае становішча, павароты кругом з упору лежачы ў правы і левы бок; скачковыя практыкаванні з выкарыстаннем падкіднога мосціка і гімнастычнай лаўкі.

Аэробіка спартыўная. Развучванне і ўдасканаленне звязак і кампазіцый аэробікі спартыўнай, якія змяшчаюць базавыя рухі, элементы цяжкасці, складзеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі правіл спаборніцтваў. Спаборніцтвы ў выкананні вывучаных звязак і кампазіцый.

Гімнастыка атлетычная (юнакі)

Фарміраванне правільнай паставы. Хадзьба з прадметам на галаве па лініі на падлозе, па гімнастычнай лаўцы; хадзьба з гімнастычнай палкай за спінай, за галавой, над галавой, прыстаўнымі крокамі па гімнастычнай лаўцы; па гімнастычнай лаўцы з паваротамі, прысяданнямі з захаваннем правільнай паставы.

Практыкаванні для розных груп мышцаў:

для мышцаў галёнкі: пад'ёмы на наскі з абцяжараннем;

для мышцаў спіны: нахілы ўперад са штангай за галавой; цяга штангі да грудзей у становішчы «лежачы», цяга Т-падобнай штангі да грудзей у нахіле, падцягванні на перакладзіне;

для мышцаў грудзей: жым гантэлей на нахіленай лаўцы галавой уніз, жым штангі вузкім хопам, развядзенне рук з гантэлямі ў становішчы «лежачы на нахіленай лаўцы галавой уніз»;

для мышцаў плечавога пояса: жым гантэлей стоячы, цяга блочнай прылады адной рукой, у нахіле, развядзенне рук з гантэлямі на нахіленай лаўцы, падыманне гантэлі адной рукой у становішчы «лежачы на нахіленай лаўцы пад вуглом 45°»;

для мышцаў рук: згінанне рук на лаўцы пад вуглом 45°, седзячы, хопам зверху, разгінанне рук са штангай з-за галавы, з-за галавы стоячы; у становішчы «лежачы на нахіленай лаўцы»;

для мышцаў брушнога прэса: падцягванне каленяў да грудзей седзячы, нахілы тулава ў бакі;

для мышцаў сцягна: частковыя прысяданні (практыкаванне выконваецца на чвэрць, палавіну або тры чвэрці амплітуды).

Практыкаванні, комплексы і гульні для развіцця каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцяў вучняў

Кросавы бег працягласцю ад 15–20 да 30–40 мін з частатой пульсу 120–140 уд./мін; пераменны, паўторны бег; гульня ў футбол, баскетбол, гандбол.

Агульнаразвіццёвыя практыкаванні з абцяжараннем вагой уласнага цела, з пераадоленнем супраціўлення пругкіх уласцівасцяў прадметаў (экспандары). Практыкаванні на гімнастычных снарадах, трэнажорах, з інвентаром, якія выконваюцца ў комплексах кругавой трэніроўкі і ўключаюць да 8–12 станцый.

Выпады ўперад са штангай на плячах у паўпрыседзе. Прысяданні са штангай на грудзях. Прысяданні з апорай на падстаўку за спінай, тулава адхілена назад, пад пяткі падкладзены брусок. Падыманне на наскі ў становішчы седзячы са штангай на каленях. Цяга штангі да грудзей шырокім хопам у нахіле, у становішчы «лежачы», падцягванне на перакладзіне шырокім хопам. Нахілы ўперад са штангай за галавой. Жым штангі на гарызантальнай і нахіленай лаўцы. Жым штангі вузкім хопам. Жым гантэлей у становішчы «седзячы». Цяга блока адной рукой. Згінанне і разгінанне рук з гантэлямі, са штангай у локцевых суставах. Разгінанне рук у локцевых суставах з гантэлямі, са штангай з-за галавы. Падыманне каленяў да грудзей у становішчы «седзячы». Нахілы тулава ў бакі. Цяга блока ўніз у становішчы «стоячы на каленях». Частковыя прысяданні ў становішчы стоячы са штангай на плячах, ногі на шырыні плячэй, пад пяткі падкладсці брусок вышынёй 3–5 см. Развядзенне рук з гантэлямі ў становішчы лежачы на лаўцы. Развядзенне прамых рук з гантэлямі ў становішчы «лежачы тварам уніз на нахіленай лаўцы» да 45°. Пад'ём гантэлі адной рукой у становішчы «лежачы бокам на гарызантальнай лаўцы хопам зверху». Выпрамленне рук з гантэлямі ў становішчы «нахіл ўперад». Разгінанне рук у локцевых суставах з гантэлямі ў становішчы «лежачы на лаўцы».

Баскетбол

Скачкі штуршком адной і дзвюма нагамі. Спыненне крокам і скачком. Павароты ў становішчы стоячы на месцы, развароты.

Перадачы мяча дзвюма рукамі ад грудзей, дзвюма рукамі зверху, адной рукой ад пляча ў становішчы «стоячы на месцы» і ў руху.

Лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей, адной і дзвюма рукамі пры паралельным і сустрэчным руху, у скачку. Лоўля мяча ў спалучэнні са спыненнямі і паваротамі.

Спалучэнне прыёмаў «лоўля – перадача – паварот».

Вядзенне мяча са змяненнем вышыні адскоку і напрамку, з абвядзеннем перашкод, па крузе; са спыненнем, паваротамі, перадачамі па сігнале.

Кідкі мяча па кальцы дзвюма рукамі ад грудзей, адной ад пляча, з адскокам і без адскоку ад шчыта, пад вуглом да шчыта ў руху, пасля вядзення і двух крокаў, штрафныя кідкі.

Спалучэнне прыёмаў «перадача – лоўля – вядзенне – кідок».

Захоп мяча – вырыванне. Вырыванне і выбіванне мяча ў гульца, які спыніўся пасля вядзення. Накрыванне мяча. Перахопліванне мяча ў становішчы стоячы збоку, з-за спіны пры перадачы, выкананай упоперак поля. Перахопліванне перадачы, выкананай уздоўж пляцоўкі.

Тактычныя дзеянні гульца без мяча: выхад на свабоднае месца для атрымання мяча насустрач партнёру з мячом, убок ад партнёра з мячом.

Вызначэнне гульнявой сітуацыі, мэтазгоднай для прымянення вядзення, перадачы, кідка па кальцы. Выбар спосабу вядзення мяча і кідка па кальцы.

Індывідуальныя дзеянні пры нападзенні: кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку і спосабу перадачы з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці суперніка, выбар і прымяненне падманных дзеянняў супраць абаронцы; узаемадзеянне гульцоў нападзення і абароны паміж сабой для завяршэння атакі. Камандныя дзеянні: нападзенне з выхадам у адрыў. Зонная абарона.

Прымяненне спалучэнняў вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў баскетбол.

Валейбол

Перамяшчэнне прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад, з выскокваннем і прызямленнем на абедзве нагі. Скачок уверх штуршком адной і дзвюма нагамі. Падзенне ў правы і левы бок на сцягно і тулава з месца і з кроку. Падзенне назад з перакатам на спіну.

Шматразовыя перадачы мяча зверху і знізу дзвюма рукамі над сабой, з адскокам ад сценкі, у парах і тройках, з пераменай месцаў, праз сетку ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем уздоўж сеткі. Перадача мяча дзвюма рукамі зверху ў скачку.

Прыём мяча знізу дзвюма рукамі пасля падачы, знізу ў падзенні ўправа і ўлева, знізу адной рукой у падзенні ўперад з апорай на другую руку. Прыём мяча, які адскочыў ад сеткі. Гульня нагой і іншымі часткамі цела.

Атакавальны ўдар у скачку штуршком адной і дзвюма нагамі з другой, трэцяй і чацвёртай зоны, атакавальны ўдар з другой лініі. Падманны атакавальны ўдар. Блакіраванне атакавальнага ўдару.

Ніжняя і верхняя прамая падача з пападаннем у 1, 5 і 6-ю зоны.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, падманныя перадачы і ўдары, выбар напрамку перадачы і атакавальнага ўдару з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці супернікаў, выбар і прымяненне падманных дзеянняў супраць канкрэтнага абаронцы; узаемадзеянне гульцоў першай і другой лініі паміж сабой для завяршэння атакі.

Тактыка абароны: блакіраванне атакавальнага ўдару, узаемастрахоўка свабодных зон, атака «іншым тэмпам», выкарыстанне ў гульні «лібера».

Выкарыстанне развучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў валейбол.

Гандбол

Перамяшчэнне скрыжаваным, прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад. Спыненне адной і дзвюма нагамі. Бег з паскарэннем на кароткіх адрэзках, бег з выскокваннем і прызямленнем на адну і абедзве нагі. Скачок убок штуршком адной нагі. Падзенне на рукі, на сцягно і тулава з месца і з разбегу.

Лоўля мяча дзвюма рукамі збоку (без павароту тулава) у становішчы «стоячы на месцы», у руху, у скачку. Лоўля мяча адной рукой з захопам і без захопу. Лоўля мяча на вялікай хуткасці перамяшчэння, у скачку пры непасрэднай блізкасці абаронцы.

Перадачы мяча адной рукой (хлёстам, штуршком, кісцевая) на кароткую адлегласць ва ўсіх напрамках з месца, з разбегу ў адзін, два і тры крокі, у скачку, пасля спынення, пасля лоўлі мяча з паўадскоку, пасля лоўлі ў непасрэднай блізкасці абаронцы, у барацьбе з абаронцам. Перадача мяча адной і дзвюма рукамі «ў адзін дотык». Перадача мяча на далёкасць адной рукой хлёстам партнёру ў руху.

Вядзенне мяча аднаўдарнае без зрокавага кантролю, шматударнае на высокай хуткасці перамяшчэння з пераследам. Вядзенне на вялікай хуткасці, з рэзкім спыненнем і змяненнем напрамку руху, з паваротам кругом.

Кідкі мяча па варотах адной рукой хлёстам зверху і збоку, з нахілам тулава ўлева і ўправа, у апорным становішчы, у скачку ў вышыню і ў даўжыню, з рознымі спосабамі бегу, рознай траекторыяй (гарызантальнай, зыходзячай, узыходзячай, навеснай) палёту мяча, з далёкай і блізкай адлегласці. Кідок мяча адной рукой у падзенні з прызямленнем на руку і сцягно.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку кідка з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці варатара, выбар і прымяненне фінта супраць канкрэтнага абаронцы; узаемадзеянне гульцоў другой лініі паміж сабой для завяршэння атакі, узаемадзеянне з лінейным гульцом, крайнім гульцом, узаемадзеянне крайняга гульца з лінейным. Камандныя дзеянні: пазіцыйнае нападзенне па сістэме расстаноўкі 4:2, нападзенне 6:0 з выхадам.

Тактыка абароны: зонная абарона па сістэме расстаноўкі 3:3, абарона ў меншасці 5:6 і 4:6.

Тактыка гульні варатара: выбар пазіцыі ў варотах і ў зоне варатара, стойкі варатара, узаемадзеянне варатара з абаронцамі і нападальнікамі.

Выкарыстанне вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў гандбол.

Футбол

Гульні і эстафеты з футбольным мячом, рухавыя гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гнуткасці, хуткасці. Гульні з вядзеннем мяча, абвядзеннем стоек, прыёмам і затрымкай мяча, з ударамі па варотах, на збліжэнне з суперніка, з двума і трыма нападаючымі на пляцоўцы для міні-футбола, абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара), гульні ў «лабірынт» (з мячом і без мяча), шматпланавыя гульні. Гульня ў футбол па спрошчаных правілах.

Разнастайныя спосабы вядзення мяча, перадачы; удары і прыёмы мяча нагой і галавой, жангліраванне мячом; гульні і эстафеты на развіццё спрыту, трываласці падчас гульні, дакладнасці ўдараў па варотах і перадач мяча, фарміраванне навыкаў тактычных дзеянняў у абароне і нападзенні, спрошчаныя гульні 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 гульцоў, гульні для каманд з 7 чалавек, тэсты на гульнявыя здольнасці, гульні ў футбол камандай з 8 чалавек з улікам раздзялення поля на ўчасткі.

Удары правай і левай нагой па нерухомым мячы, па мячы, які коціцца, сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском, удары па мячы, які ляціць. Практыкаванні ў парах, тройках, чацвёрках з выкарыстаннем тэхніка-тактычных звязак: вядзенне – перадача, прыём – перадача, прыём – вядзенне – перадача і да т.п.

Удары на далёкасць і дакладнасць, абвядзенне – адбіранне мяча, абвядзенне – адбіранне – удар па варотах, перахопліванне мяча, гульня галавой, камбінацыі ў тройках з мячом, дзеянні без мяча (адкрыванне, адцягванне ўвагі, стварэнне колькаснай перавагі), узаемадзеянне двух нападальнікаў супраць аднаго абаронцы, двух абаронцаў супраць аднаго нападальніка, гульнявыя практыкаванні ў крузе, квадраце, прамавугольніку і да т.п.

Практыкаванні з мячом і без мяча, накіраваныя на развіццё каардынацыйных здольнасцяў, хуткасці, спрытнасці, дакладнасці рухаў, гульні з бегам, скачкамі, перадачамі і лоўляй мяча.

Практыкаванні пераменнай інтэнсіўнасці для развіцця гульнявой трываласці (бег з вядзеннем мяча на дыстанцыі да 1 км з паскарэннем, рыўкамі, скачкамі і іншымі практыкаваннямі, набліжанымі па сваім характары да гульні ў футбол), хуткасна-сілавых якасцяў, сілы (практыкаванні з нязначнымі абцяжараннямі).

Выкарыстанне развучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у вучэбнай гульні.

Тэніс настольны

Бег 10, 30, 60 м, бег з паскарэннем, чаўночны бег 4 х 9 м, 6 х 20 м, 10 х 5 м. Чаўночны бег з вар'іраваннем звычайнага бегу з бегам спінай уперад. Бег з максімальнай хуткасцю 5 х 30 м, 10 х 30 м з інтэрваламі адпачынку да 1 мін.

Скачкі трайныя і пяцярныя з месца штуршком дзвюма нагамі. Выскокванне ўверх з нізкага прыседу. Прысяданні па чарзе на правай і левай назе. Скачкі на адной назе з паваротамі на 180°. Паскарэнне пасля скачкоў з паваротамі на 180° і 360°. Скачкі з боку ў бок са спружыністымі прысяданнямі. Пераскокванне праз гімнастычную лаўку правым і левым бокам. Выскокванне ўверх з высокім падыманнем сцёгнаў.

Выкруты рук назад з гімнастычнай палкай з паступовым памяншэннем шырыні хопу.

Набіванне тэніснага мяча на ракетцы ў гульнявой стойцы і ў перамяшчэнні высока-нізка, па чарзе тыльным і далоневым бокам, рабром ракеткі, ручкай ракеткі, аб сценку, аб сценку з паваротам на 360° (з прысяданнем, перакладваннем ракеткі ў другую руку) у момант адскоку мяча.

Імітацыя ўдараў з ракеткай і без ракеткі з уцяжарвальнікам у руцэ. Імітацыя адзіночных, серыйных удараў, удараў з перамяшчэннем управа і ўлева, наперад і назад. Імітацыя падач з падманным рухам корпуса і рукі з ракеткай. Імітацыя ўдараў у розным тэмпе перад люстэркам. Імітацыя ўдараў у зададзеным тэмпе з вар'іраваннем ад павольнага да максімальнага ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем.

Кідкі мяча ў сценку і лоўля рознымі спосабамі (правай, левай рукой, з дадатковымі скачкамі, прысяданнямі, паваротамі).

Кіданне тэніснага мяча на далёкасць і ў цэль адной кісцю, кісцю і перадплеччам, усёй рукой і корпусам.

Гульня дзвюма ракеткамі, гульня «негульнявой» рукой. Гульня двума мячамі. Гульня аднаго супраць двух чалавек.

Падача з элементамі вывучанага ўдару. Удар на стале па дыяганалі. Змена напрамку палёту мяча па шырыні стала. Змена траекторыі і вышыні палёту мяча над сеткай. Змяненне даўжыні палёту мяча. Удар па зменным прыходным кручэнні.

Змена тэмпу гульні. Спаборніцтва ў працяглым утрыманні мяча ў гульні. Гульня «трохвугольнікам» з аднаго пункта ў два пункты процілеглага боку. Гульня вывучаемым ударам з двух пунктаў, трох пунктаў, з адной трэці стала, з паловы стала, дзвюх трацей стала.

Гульня вывучаным ударам па кароткім і доўгім прыходных мячах. Гульня і спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў абазначаныя на стале зоны. Гульня «васьмёркай» па чарзе па прамой і па дыяганалі.

Удар па мячы штуршком злева ў перамяшчэнні ўправа-ўлева, наперад-назад. Гульня штуршком злева доўга-каротка. Гульня па ўзыходзячым, сыходзячым мячы, у вышэйшым пункце адскоку мяча.

Падача штуршком злева ў абазначаныя на стале зоны.

Удар накатам справа. Перамяшчэнне пры ўдары накатам справа. Хуткая падача накатам справа ў абазначаныя на стале зоны.

Спалучэнне накату справа і штуршка злева. Перамяшчэнне ў левай стойцы пры накаце злева. Павароты пры ўдарах накатамі справа і злева.

Падрэзка злева. Падача зрэзкай злева. Спалучэнне зрэзкі злева і накату.

Зрэзка справа. Падача зрэзкай управа ў абазначаныя на стале зоны. Спалучэнне зрэзкі справа і зрэзкі злева, зрэзкі і накату.

Падача плоская і з нязначным кручэннем. Прыём падачы.

Прымяненне вывучаных тэхнічных і тактычных элементаў у вучэбнай гульні.

Лёгкая атлетыка

Паўторны бег з паскарэннем 60–80 м, з ходу на адрэзках 20–60 м, з высокага і нізкага старту на адрэзках 20–80 м.

Прабяганне адрэзкаў 20–60 м з зададзенай інтэнсіўнасцю, адрэзкаў 80–300 м – з фіксаваным часам адпачынку.

Выбяганне па камандзе з розных зыходных становішчаў 10 х 20 м.

Бег на адрэзках 80–150 м па віражы і па прамой.

Бег на адрэзках 100 + 150 + 200 + 100 м.

Скачок у даўжыню: 1) адштурхоўванне ў спалучэнні з палётам у кроку; 2) тэхніка прызямлення; 3) пераход ад разбегу да штуршка і рытм апошніх крокаў; 4) дакладнае трапленне на брусок з поўнага разбегу; 5) палётная фаза адным са спосабаў скачка.

Скачкі ў даўжыню з няпоўнага разбегу з прымяненнем розных дапаможных сродкаў (мосціка, бар'ераў і інш.).

Скачок у вышыню: 1) тэхніка адштурхоўвання; 2) дугападобны і хуткі разбег; 3) пераход праз планку.

Скачкі ў вышыню з прамога і дугападобнага разбегу з прымяненнем дапаможных сродкаў. Скачкі з няпоўнага і поўнага разбегу з прымяненнем мосціка для адштурхоўвання.

Кіданне і штурханне набіўнога мяча рознымі спосабамі адной і дзвюма рукамі.

Кіданне мяча вагой 150 г з поўнага разбегу.

Кіданне гранаты вагой 700 г з разбегу па калідоры 10 м.

Эстафеты і рухавыя гульні з бегам, скачкамі, кіданнем.

Прыкладныя дамашнія заданні для вучняў X–XI класаў

Комплексы ранішняй гімнастыкі з 12–14 практыкаванняў з гімнастычнай палкай, скакалкай, гантэлямі, эспандарамі. Падцягванні ў вісе са становішча «стоячы» на нізкай перакладзіне (дз.). Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры седзячы ззаду і ва ўпоры лежачы. Падыманне тулава са становішча «лежачы на спіне, рукі за галавой». Падыманне і апусканне прамых ног са становішча «лежачы на спіне» з дакрананнем да падлогі за галавой. Падыманне і апусканне, развядзенне і звядзенне рук з гантэлямі 1-3 кг. З зыходнага становішча «стоячы» ўпор прысеўшы, упор лежачы, упор прысеўшы, устаць у зыходнае становішча. Пачарговыя прысяданні на правай і левай назе з гантэлямі ў руках. Глыбокія прысяданні з выскокваннем уверх. Раўнавага на адной назе (стойка «Фламінга»).

Раўнамерны бег да 3 км (дз.) і да 5 км (юн.). Паўторны бег з высокім падыманнем сцягна і максімальнай частатой рухаў. Скачкі праз кароткую скакалку.

Язда на веласіпедзе да 8–10 км.

Хадзьба на лыжах да 3–5 км.

Падрыхтоўка і ўдзел у фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах і спартыўных спаборніцтвах.

Дадатак 1

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЁ»

Перечень и нормы обеспечения спортивным инвентарем и оборудованием, необходимыми для организации физического воспитания обучающихся при получении ими общего среднего, специального, профессионально-технического и среднего специального образования, проведения с ними физкультурно-оздоровительных и спортивно-массовых мероприятий[15]

Спортивный инвентарь и оборудование для гимнастики, акробатики, аэробики и атлетической гимнастики							
№ п/п	**Наименование**	**Единица измерения**	**Количество в учреждении образования с числом учащихся (чел.):**				**Примечания**
			до 220	**до 440**	**до 880**	**свыше 880**	
1	Аптечка	штука	1 штука в каждом спортивном зале и помещении, приспособленном для занятий физической культурой и спортом				–
2	Бревно гимнастическое	штука	–	1	1	1	–
3	Брусья гимнастические универсальные	штука	1	1	1	2	–
4	Гантели переменной массы (0,5–5 кг)	пара	10	20	40	40	–
5	Гриф для штанги	штука	1	1	2	2	масса до 10 кг
6	Гиря	штука	2	4	4	6	16 кг, 24 кг
7	Диски для штанги	пара	8	8	16	16	от 1 до 15 кг каждого веса
8	Жерди для гимнастических брусьев	штука	1	2	3	4	–
9	Канат для лазания диаметром 30 мм	штука	1	1	2	3	–
10	Канат для перетягивания	штука	1	1	1	1	–
11	Кегли	штука	6	8	10	12	–
12	Козел гимнастический	штука	1	1	1	2	–
13	Конь гимнастический	штука	1	1	1	2	–
14	Коврик туристский	штука	12	12	24	24	для занятий спецмедгрупп
15	Мат гимнастический	штука	10	20	30	40	–
16	Мостик гимнастический	штука	2	2	2	4	–
17	Мяч малый резиновый	штука	10	16	16	20	–
18	Обруч гимнастический	штука	15	20	30	40	–
19	Палка гимнастическая	штука	10	20	40	40	–
20	Перекладина гимнастическая	штука	1	1	1	2	–
21	Перекладина навесная	штука	5	10	10	10	–
22	Скакалка гимнастическая	штука	20	20	40	40	–
23	Скакалка гимнастическая	штука	2	2	3	3	длина 5 м
24	Скамейка гимнастическая	штука	6	8	10	15	–
25	Стенка гимнастическая	штука	6	10	10	16	–
26	Флажок	штука	10	15	20	20	–
27	Эспандер	штука	6	10	10	20	–
Легкоатлетический спортивный инвентарь							

28	Брусок деревянный 5 х 5 х 10 см	пара	4	8	10	16	–
29	Канат оградительный с флажками	метр	100	100	100	200	–
30	Колодки стартовые	пара	2	4	6	8	–
31	Комплект нагрудных номеров	комплект	1	1	1	2	от 1 до 100
32	Комплект указателей метража	комплект	1	1	1	2	от 10 до 60 м
33	Мяч:						
33.1	набивной медбол 1 кг	штука	5	10	15	20	–
33.2	набивной медбол 2 кг	штука	5	10	15	20	–
33.3	набивной медбол 3 кг	штука	5	8	10	15	–
33.4	набивной медбол 5 кг	штука	5	8	8	10	–
33.5	для метания (150 г)	штука	12	15	20	30	–
34	Планка:						
34.1	для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
34.2	измерительная для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
35	Рулетка измерительная	штука	1	1	2	4	–
36	Секундомер	штука	2	3	5	10	–
37	Стойки для прыжков в высоту	пара	1	1	2	3	–
38	Транспарант «Старт», «Финиш»	штука	1	1	2	2	–
39	Туфли беговые с шипами	пара	10	20	30	60	–
40	Эстафетная палочка	штука	8	10	16	20	–
Спортивный инвентарь для зимних видов спорта							
41	Ботинки лыжные	пара	30	60	100	150	–
42	Коньки	пара	10	20	30	50	разных размеров
43	Клюшка хоккейная	штука	12	20	30	50	–
44	Лыжи беговые	пара	30	60	100	150	–
45	Лыжные крепления	пара	30	60	100	150	–
46	Мазь лыжная	комплект	–	–	–	–	приобретается по мере необходимости
47	Палки лыжные	пара	30	60	100	150	–
48	Санки	штука	10	10	10	10	–
49	Шайба хоккейная	штука	8	12	12	18	–
Инвентарь для спортивных, подвижных и народных игр							
50	Бита для городков	штука	4	4	8	8	–
51	Волан	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
52	Ворота:						
52.1	гандбольные	пара	1	1	1	2	–
52.2	футбольные	пара	1	1	1	2	–
53	Городки	комплект	2	3	4	6	–
54	Кольцо баскетбольное	пара	4	6	8	14	–
55	Комплект для настольного тенниса	комплект	2	4	6	6	–
56	Мяч:						
56.1	баскетбольный	штука	10	20	30	60	–
56.2	волейбольный	штука	10	20	30	60	–
56.3	гандбольный	штука	4	6	10	20	–
56.4	малый резиновый	штука	10	20	30	60	–
56.5	настольного тенниса	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.6	теннисный	штука	–	–	–		приобретаются по мере необходимости
56.7	футбольный	штука	5	10	15	30	–
57	Насос	штука	1	2	2	4	–
58	Ракетка:						

58.1	бадминтонная	пара	10	15	20	30	–
58.2	настольного тенниса	пара	6	12	18	24	–
58.3	теннисная	пара	5	10	15	20	–
59	Свисток судейский	штука	2	3	4	6	–
60	Сетка:						
60.1	для бадминтона	штука	1	1	2	3	–
60.2	для баскетбольных колец	пара	6	10	15	30	–
60.3	волейбольная	пара	1	2	3	4	–
60.4	для гандбольных ворот	пара	1	1	1	2	–
60.5	теннисная	штука	2	2	3	4	–
60.6	футбольная	пара	1	1	1	2	–
61	Стойки:						
61.1	баскетбольные	пара	1	1	2	3	–
61.2	волейбольные	пара	1	1	2	3	–
61.3	для обводки	штука	8	10	15	20	–
62	Стол для настольного тенниса	штука	2	3	4	6	–
63	Флажок судейский	штука	6	6	8	8	–
64	Часы шахматные	штука	2	4	4	6	–
65	Шашки	комплект	6	8	12	20	–
66	Шахматы	комплект	6	8	12	20	–
67	Щит баскетбольный	пара	2	4	6	10	–
Спортивный туристский инвентарь							
68	Аптечка походная	штука	2	2	4	4	–
69	Карабин туристский	штука	10	15	20	30	–
70	Компас	штука	6	8	12	20	–
71	Коврик туристский	штука	20	30	40	60	–
72	Комплект:						
72.1	костровых принадлежностей	штука	2	4	6	10	–
72.2	посуды для приготовления пищи	штука	2	4	6	10	–
73	Мешок спальный	штука	20	30	40	60	–
74	Палатка туристская	штука	6	10	10	20	–
75	Рюкзак туристский	штука	20	30	40	60	–
76	Топорик туристский	штука	2	4	6	10	–
77	Фал капроновый:						
77.1	диаметром 8–10 мм	метр	40	80	100	150	–
77.2	диаметром 12–14 мм	метр	40	40	50	50	–
Спортивный инвентарь для многоборий Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь							
85	Винтовка пневматическая	штука	2	4	6	10	
86	Патроны для винтовки пневматической	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
Агульныя прынцыпы аказання першай дапамогі. Непрытомнасць. Прычыны страты прытомнасці. Алгарытм аказання першай дапамогі пры раптоўнай страце прытомнасці. Прыкметы жыцця і смерці. Паняцце рэанімацыі. Паказанні да рэанімацыі. Тэхніка правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх спосабам з рота ў рот, з рота ў нос. Методыка правядзення непрамога масажу сэрца.

Іншароднае цела ў дыхальных шляхах: сімптомы, алгарытм аказання першай дапамогі. Транспарціроўка пацярпелых.

Практычная работа № 1

Вывучэнне методыкі правядзення правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх і непрамога масажу сэрца.

Адкрытыя пашкоджанні, крывацёкі. Паняцце пра рану, Папярэджанне магчымых ускладненняў пасля раненняў. Алгарытм аказання першай дапамогі пры ранениях.

Крывацёкі. Віды крывацёкаў: наружнае і ўнутранае, капілярнае, артэрыяльнае, вянознае, змешанае. Насавы крывацёк. Спосабы часовага спынення крывацёку: пальцавае прыціскание, накладанне ўціскальнай павязкі, згінанне канечнасцей, накладанне медыцынскага жгута і закруткі з дапаможных сродкаў. Алгарытм аказання першай дапамогі пры насавым крывацёку.

Практычная работа № 2

Вывучэнне правілаў накладання медыцынскага жгута, які спыняе крывацёк (закруткі), на сцягно і плячо.

Перавязачны матэрыял. Агульныя правілы накладання мяккай бінтавой павязкі. Тэхніка накладання мяккіх бінтавых павязак на розныя часткі цела. Правілы выкарыстання падручнага матэрыялу для накладання павязак.

Практычная работа № 3

Ускрыццё індывідуальнага перавязачнага пакета. Накладанне першаснай асептычнай павязкі на розныя часткі цела.

Пашкоджанні мяккіх тканак, суставаў і касцей. Віды і характарыстыка пашкоджанняў. Удары мяккіх тканак. Расцяжэнні і разрывы звязак, сухажылляў і мышцаў. Вывіхі. Алгарытм аказання першай дапамогі.

Траўматычны таксікоз (сіндром працяглага сціскання), Алгарытм аказання першай дапамогі на месцы здарэння. Правілы выцягвання пацярпелага з завалаў.

Пераломы. Віды і прыкметы пераломаў касцей канечнасцей. Траўматычны шок. Асаблівасці пераломаў у дзяцей і дарослых. Траўмы пазваночніка. з пашкоджаннем і без пашкоджання спіннога мозга. Транспартная імабілізацыя (накладанне шын, фіксавальнай павязкі) пры разнастайных пераломах касцей канечнасцей. Правілы транспарціроўкі паражоных з пашкоджаннем галавы і пазваночніка на шчыце і насілках.

Практычная работа № 4

Вывучэнне правілаў імабілізацыі верхняй і ніжняй канечнасцей з дапамогай шын і падручных сродкаў пры пераломах, ударах, расцяжэннях, вывіхах.

Апёкі і адмаражэнні. Апёкі па фактару пашкоджання (тэрмічныя і хімічныя) і глыбіні пашкоджання і (I–IV ступені). Вызначэне плошчы апёку. Прыкметы апёкавага шоку. Апёкавая хвароба. Прафілактыка ўзнікнення апёкавага шоку.

Алгарытм аказання першай дапамогі пры тэрмічных і хімічных апёках. Правілы накладання павязак на абпаленую паверхню. Асаблівасці аказання першай дапамогі пры апёках слізістай абалонкі вачэй, рота, стрававода.

Адмарожанні. Фактары, спрыяльныя адмаражэнню. Класіфікацыя адмаражэння па глыбіні пашкоджання (I–IV ступені). Замярзанне. Аказанне першай дапамогі ў палявых і хатніх умовах.

Утапленне. Віды ўтаплення (сапраўднае, асфіксічнае, сінкапальнае). Алгарытм аказання першай дапамогі пры розных відах утапленняў. Прафілактыка ўтапленняў.

Электратраўмы і паражэнне маланкай. Прыметы паражэння. Мясцовыя і агульныя з’явы пры паражэнні электрычным токам. Алгарытм аказання першай дапамогі пры электратраўме.

Сонечныя і цеплавыя ўдары. Прычыны сонечнага і цеплавога ўдараў. Асноўныя прыкметы. Алгарытм аказання першай дапамогі пры сонечных і цеплавых ўдарах. Прафілактыка цеплавых і сонечных удараў.

Укусы жывёл (насякомых, ядавітых змей). Асноўныя прыкметы і асаблівасці аказання першай дапамогі пры паражэннях ядамі жывёл. Асаблівасці ўскладненняў раны пры ўкусах.

Атручэнне. Атручэнне хімічнымі рэчывамі. Асноўныя прыкметы атручэння. Алгарытм аказання першай дапамогі пры вострым атручэнні угарным газам, прэпаратамі бытавой хіміі, алкаголем і яго сурагатамі, моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі (МДАР) і іншымі хімічнымі рэчывамі. Прафілактыка атручэння.

Харчовае атручэнне. Асноўныя прыкметы атручэння. Алгарытм аказання першай дапамогі. Прафілактыка харчовага атручэння.

Атручэнне ядавітымі раслінамі і грыбамі. Асаблівасці паражэння, асноўныя прыкметы. Алгарытм аказання першай дапамогі пры атручэнні ядавітымі грыбамі і ядавітымі раслінамі. Прафілактыка.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзеёнасці

Навучэнцы павіны:

ведаць;

прынцыпы аказання першай дапамогі пацярпелым;

прыкметы клінічнай смерці: спыненне дыхання і сардэчнай дзейнасці;

віды крывацёкаў: наружнае і ўнутранае, капілярнае, артэрыяльнае, вянознае, змешанае;

віды і асаблівасці пашкоджання мяккіх тканак, суставаў і касцей: удар, расцяжэнне, разрыў, вывіх;

віды пераломаў (адкрытыя і адкрытыя) і іх прыкметы;

віды апёкаў па фактару пашкоджання (тэрмічныя і хімічныя) і глыбіні пашкоджання (I–IV ступені);

віды адмаражэння па глыбіні пашкоджання (I–IV ступені);

віды ўтапленняў: сапраўднае, асфіксічнае, сінкапальнае) і іх прыкметы;

прыкметы паражэння чалавека электрычным токам і маланкай;

прычыны сонечнага і цеплавога ўдараў, іх прыкметы;

асноўныя прыкметы пры паражэнні чалавека ядамі жывёл;

прыкметы харчовага атручэння, атручэння ўгарным газам, прэпаратамі бытавой хіміі, алкаголем і яго сурагатамі, моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі, ядавітымі раслінамі і грыбамі;

умець:

ацэньваць характар пашкоджання і ступень цяжкасці стану паражонага;

аказваць першую дапамогу пры траўмах, пераломах, крывацёках, ударах, расцяжэннях, вывіхах, раптоўнай страце свядомасці, апёках, адмаражэнні, паражэнні электрычным токам і маланкай, цеплавым і сонечным ўдары, утапленні, укусах жывёл, розных відах атручэння;

карыстацца рознымі відамі шын, перавязачным матэрыялам (бінты, марля, гіграскапічная вата, баваўняная ці трыкатажная тканіна), жгутам;

тлумачыць значэне ведаў, уменняў і навыкаў па аказанні першай дапамогі ў штодзённым жыцці;

валодаць:

тэхнікай правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх спосабам з рота ў рот, з рота ў нос;

методыкай правядзення непрамога масажу сэрца;

методыкай даставання іншародных целаў з поласці рота, глоткі;

спосабамі часовага спынення крывацёка: пальцавае прыціскання, накладанне ўціскальнай павязкі, згінанне канечнасцей, накладанне медыцынскага жгута і закруткі з дапаможных сродкаў;

тэхнікай накладання мяккіх бінтавых павязак на розныя часткі цела;

навыкамі даставання пацярпелага з завалаў;

асновамі самакантролю і самаацэнкі, прыняцця рашэння і ажыццяўлення свядомага выбару ў экстрэмальных сітуацыях;

тэхнікай імабілізацыі верхніх і ніжніх канечнасцей з дапамогай шын і падручных сродкаў пры пераломах, ударах, расцяжэннях, вывіхах.

Лекавыя прэпараты і расліны (4 гадзіны)

Паняцце пра лекавыя прэпараты. Лекавыя формы. Асноўныя групы лекавых прэпаратаў: антысептычныя і дэзынфекцыйныя, супрацьмікробныя, сардэчна-сасудзістыя. абязбольвальныя, антыалергічныя, гарачкапаніжальныя, супрацькашлевыя, і адхарквальныя.

Уплыў знешніх і ўнутраных фактараў уздзеяння лекаў на арганізм. Магчымыя рэакцыі арганізма на лекі, ускладненні. Алгарытм аказання першай дапамогі ў выпадках алергічнай рэакцыі на лекавыя сродкі.

Змесціва хатняй аптэчкі і дарожнай аптэчкі вадзіцеля. Аказанне першай дапамогі пацярпелым з дапамогай дарожнай аптэчкі вадзіцеля. Правілы захоўвання лекавых сродкаў у хатніх умовах.

Паняцце пра лекавыя расліны. Выкарыстанне лекавых раслін пры аказанні першай дапамогі ў палявых умовах: маліна звычайная, чарніцы, шыпшына карычная, трыпутнік вялікі, рамонак аптэчны, валяр'ян лекавы, зверабой прадзіраўлены, адуванчык лекавы, дзівасіл высокі, мята перачная, ліпа драбналістая, крапіва двухдомная. Правілы бяспечнага абыходжання з лекавымі раслінамі.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці

Навучэнцы павіны:

ведаць;

лекавыя формы і асноўныя групы лекавых прэпаратаў;

змест хатняй аптэчкі і дарожнай аптэчкі вадзіцеля;

правілы захоўвання і бяспечнага абыходжання з лекавымі раслінамі ў хатніх умовах;

умець:

тлумачыць асаблівасці ўплыву знешніх і ўнутраных фактараў уздзеяння лекаў на арганізм;

прыводзіць прыклады выкарыстання лекавых раслін пры аказанні першай дапамогі;

валодаць навыкамі аказання першай дапамогі ў выпадках алергічнай рэакцыі на лекавы сродак.

Медыка-біялагічныя аспекты палавога выхавання (7 гадзін)

Праблемы ўзаемаадносін юнакоў і дзяўчат. Паняцце аб рэпрадуктыўным здароўі.

Гігіена і культура палавых адносін. Віды кантрацэпцыі.

Цяжарнасць. Найбольш спрыяльны ўзрост для шлюбу і цяжарнасці. Фізіялагічныя і псіхалагічныя асаблівасці праходжання цяжарнасці. Гігіена цяжарнай жанчыны. Уплыў алкаголю, нікаціну і таксічных рэчываў на развіццё плода.

Аборт і яго вынікі для маладога арганізма. Магчымыя ўскладненні.

Захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам (ЗППП); ганарэя, сіфіліс, трыхаманоз. Паняцце пра ВІЧ/СНІД. Крыніцы заражэння, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Прафілактыка.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзеёнасці

Навучэнцы павіны:

ведаць;

наступствы для рэпрадуктыўнага здароўя ранняга пачатку палавога жыцця і абортаў;

фізіялагічныя і псіхалагічныя асаблівасці праходжання цяжарнасці;

прыкметы захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам;

правілы гігіены і меры прафілактыкі захворванняў рэпрадуктыўных органаў;

умець;

тлумачыць негатыўнае ўздзеянне алкаголю, нікаціну і таксічных рэчываў на развіццё плода;

выконваць асабістую прафілактыку ЗППП;

тлумачыць сэнс асабістых адносін у прафілактыцы ВІЧ/СНІД;

выкарыстоўваць дадатковыя крыніцы інфармацыі і самастойна рыхтаваць вусныя паведамленні па тэме ўрока;

валодаць:

навыкамі назірання за станам здароўя ўласнага арганізма і своечасовага звароту па медыцынскую дапамогу.

МЕДЫЦЫНСКАЯ ПРАКТЫКА

(5 дзён па 6 гадзін; усяго 30 гадзін)

Першая дапамога пры траўмах і няшчасных выпадках (24 гадзіны)

Тэхніка правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў: штучная вентыляцыя лёгкіх, непрамы масаж сэрца. Правілы транспарціроўкі паражоных на насілках і з дапамогай падручных сродкаў.

Асаблівасці аказання першай дапамогі пры пашкоджаннях пазваночніка і спіннога мозга, траўме грудной клеткі і галавы. Алгарытм дзеянняў.

Аказанне дапамогі пры страце свядомасці, калапсе, пападанні іншароднага цела ў дыхальныя шляхі. Алгарытм дзеянняў.

Аказанне першай дапамогі пры раненнях. Адпрацоўка методыкі абыходжання з перавязачным матэрыялам.

Адпрацоўка спосабаў спынення крывацёку: пальцавае прыціскання сасуда да касці, максімальнае згінанне канечнасцей, накладанне гумавага жгута, накладанне жгута-закруткі, накладанне ўціскальнай павязкі. Алгарытм дзеянняў пры насавым крывацёку.

Адпрацоўка правілаў накладання першаснай асептычнай павязкі. Тэхніка накладання мяккіх бінтавых павязак: бінтавыя павязкі на галаву і павязкі на вобласць грудной клеткі. Алгарытм дзеянняў.

Аказанне першай дапамогі пры закрытых пашкоджаннях: ударах, расцяжэннях, вывіхах, разрывах сухажылляў, звязак і мышцаў; траўматычным таксікозе (сіндроме працяглага сціскання). Алгарытм дзеянняў.

Аказанне першай дапамогі пры пераломах. Адпрацоўка правілаў імабілізацыі верхняй і ніжняй канечнасцей з дапамогай шын і падручных сродкаў. Алгарытм дзеянняў.

Асаблівасці аказання першай дапамогі паражоным пры ўзрывах, абвальванні будынкаў, на месцы дарожна-транспартнага здарэння.

Асаблівасці аказання першай дапамогі пацярпелым пры стыхійных бедствах: навадненнях, лясных пажарах. Алгарытм дзеянняў.

Аказанне першай дапамогі пры паражэннях электрычным токам, апёках і адмаражэннях. Алгарытм дзеянняў.

Аказанне першай дапамогі пры сонечных і цеплавых ударах, утапленні. Адпрацоўка правілаў выратавання тапельца.

Аказанне першай дапамогі пры атручэннях: угарным газам, прэпаратамі бытавой хіміі, алкаголем і яго сурагатамі, моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі (МДАР). Алгарытм дзеянняў пры аказанні першай дапамогі пры харчовых атручэннях, атручэннях ядавітымі раслінамі і грыбамі.

Лекавыя прэпараты і расліны (2 гадзіны)

Камплектацыя разнастайных відаў медыцынскіх аптэчак: хатняй, першай дапамогі, маці і дзіця, турыстычнай, дарожнай аптэчкі вадзіцеля. Аказанне першай дапамогі пры магчымых ускладненнях на лекавыя сродкі (адпрацоўка практычных навыкаў). Алгарытм дзеянняў.

Выкарыстанне лекавых раслін пры аказанні першай дапамогі ў палявых умовах.

Агульны догляд за хворымі і паражонымі (4 гадзіны)

Вывучэнне прызначэння і асноўных правілаў выкарыстання прадметаў догляду за хворымі. Вымярэнне тэмпературы цела. Вывучэнне тэхнікі падліку пульса, частаты дыхання, артэрыяльнага ціску. Алгарытм дзеянняў.

Вывучэнне будовы аднаразовага шпрыца. Набор у шпрыц лекавага раствору з ампулы і флакона. Адпрацоўка практычных навыкаў па падскурным і ўнутрымышачным увядзенні лекавых сродкаў. Алгарытм дзеянняў.

Вывучэне тэхнікі накладання гарчычнікаў, кампрэсаў, грэлкі, пузыра з лёдам, прымочак. Адпрацоўка практычных навыкаў. Алгарытм дзеянняў.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура»
для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання
(павышаны ўзровень)

Тлумачальная запіска

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацавана ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Вучэбная праграма грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, арыентуецца на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, на эстэтычны і творчы характар навучання беларускай літаратуры, улічвае ўзростава-інтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

Беларуская літаратура – дысцыпліна культуралагічнага цыкла, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі – сродак эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных нормаў і вартасцей. Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, адносіны і стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Вывучэнне літаратуры дапамагае вучням убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры – гэта найперш працэс жыццеспазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Змест літаратурнай адукацыі ў X–XI класах пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе працягнуць знаёмства вучняў, распачатае ў IX класе, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і паспрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з’яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання ў вучняў інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты

характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. На III ступені навучання паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

Навучанне літаратуры ў X–XI класах можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях. Павышаны ўзровень навучання літаратуры закліканы садзейнічаць паспяховай падрыхтоўцы вучняў да прафесійнай дзейнасці ў гуманітарнай галіне і накіраваны на авалоданне вучнямі даследчымі і творчымі спосабамі дзейнасці ў межах вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Пры гэтым акцэнт робіцца на фарміраванне агульнай літаратуразнаўчай культуры, уменні аналізаваць мастацкі тэкст з выкарыстаннем ведаў па гісторыі і тэорыі літаратуры, рабіць абагульненні на літаратурна-мастацкім матэрыяле, супастаўляць творы розных эпох, суадносіць асаблівасці развіцця роднай літаратуры з агульнаеўрапейскім літаратурным кантэкстам.

Вывучэнне літаратуры на павышаным узроўні дае больш шырокія магчымасці для рэалізацыі міжпрадметных сувязей, у першую чаргу з вучэбным прадметам «Беларуская мова». Еднасць гэтых дысцыплін грунтуецца на агульным прадмеце вывучэння – слове як адзінцы мовы і маўлення ў яго функцыянальным значэнні – і прадугледжвае спасціжэнне мовы і літаратуры як нацыянальна-культурных каштоўнасцей. Дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (тэатр, кіно, музыка, жывапіс і інш.), будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў уяўленняў пра заканамернасці эстэтычнага і мастацкага асваення свету чалавекам, выпрацоўцы крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі твораў. Разам з гісторыяй і грамадазнаўствам літаратура звяртаецца да праблем, непасрэдна звязаных з грамадскай сутнасцю чалавека, фарміруе гістарызм мыслення, узбагачае культурна-гістарычную памяць вучняў, выхоўвае ў іх актыўныя адносіны да рэчаіснасці, прыроды, усяго навакольнага свету.

На заключным этапе літаратурнай адукацыі актуалізуюцца, паглыбляюцца і сістэматызуюцца веды і ўменні, атрыманыя ў папярэдніх класах, што вядзе да сінтэтычнага асэнсавання літаратуры і яе канкрэтных з'яў на светапоглядным, філасофскім, культуралагічным узроўнях, да ўсведамлення вучнем сябе як асобы і да маральнага самавызначэння. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных формаў урока, шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г. д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем да ўсіх метадаў навучання з'яўляецца зарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў. Дзеля рэалізацыі дыферэнцаванага падыходу да навучання літаратуры вучням з аналітычным тыпам мыслення мэтазгодна часцей прапаноўваць заданні творчага

характару; а вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей даваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэктаваць першапачатковае суб'ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і інш.

З мэтай развіцця пазнавальных інтарэсаў, выхавання мастацка-эстэтычнага густу і фарміравання цэласнага светапогляду вучняў пры навучанні беларускай літаратуры мэтазгодна прадугледжваць рэалізацыю міжпрадметных сувязей перш за ўсё з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Беларуская мова», «Руская літаратура», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)», «Гісторыя Беларусі». Міжпрадметныя сувязі актуалізуюцца на ўсіх этапах навучання, іх рэалізацыя ў адукацыйным працэсе ўзбагачае дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (жывапіс, музыка, фотамастацтва, кіно, тэатр і інш.), эфектыўна ўздзейнічае на маральна-этычнае, інтэлектуальнае, эмацыянальнае, эстэтычнае развіццё асобы.

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з вучэбным дапаможнікам – усе гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейнасны характар, дыялагічнасць.

У адукацыйнай практыцы могуць выкарыстоўвацца як традыцыйныя, так і электронныя сродкі навучання, якія павінны быць скіраваны на дасягненне мэт і задач літаратурнай адукацыі.

Літаратуры ў сістэме адукацыі і выхавання належыць асаблівая культуратворчая роля: яна здольная пераўтвараць унутраны свет асобы і ўплываць на духоўнае ўзбагачэнне жыцця, рабіць яго па-сапраўднаму цікавым, змястоўным, насычаным. З гэтай прычыны неабходна імкнуцца ўключаць вучняў у працэс пазакласнай работы і выхавання.

Факультатыўныя заняткі, работа літаратурных гурткоў, сістэматычны выпуск насценных і радыёгазет, бюлетэняў, часопісаў і альбомаў; падрыхтоўка спецыяльных літаратурных стэндаў, тэматычных выставак, аглядаў сучаснай літаратуры; правядзенне літаратурных ранішнікаў, вечароў, віктарын, алімпіяд, свят, сустрэч з пісьменнікамі, дзеячамі культуры і мастацтва – усё гэта спрыяе стварэнню ў класе атмасферы творчасці, духоўнасці, павагі да кнігі, да мастацкага слова.

Для арганізацыі факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры ў X–XI класах распрацавана адпаведнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне: вучэбныя праграмы, дапаможнікі для вучняў і дапаможнікі для настаўнікаў.

На вывучэнне літаратуры ў X і XI класах на павышаным узроўні адводзіцца па 105 гадзін. У X класе 93 гадзіны – на вывучэнне твораў, 10 гадзін – на творчыя работы, 2 гадзіны – на ўрокі па творах для дадатковага чытання. У XI класе 89 гадзін – на вывучэнне твораў, 12 гадзін – на творчыя работы, 4 гадзіны – на ўрокі па творах для дадатковага чытання.

Прапанаваныя праграмай анатацыі да аглядавых і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік засяроджвае ўвагу на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, вывучэнне якіх ён лічыць больш дарэчным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе*.

---

* Творы, прапанаваныя ў спісе для дадатковага чытання, можна знайсці ў кнігах серыі «Школьная бібліятэка», якія знаходзяцца ў бібліятэчным фондзе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Рэзерв вучэбнага часу настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарным планам.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

X клас
(105 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ
(41 гадзіна)

Беларуская літаратура першай трэці XX ст. на фоне гістарычных падзей і развіцця сусветнай літаратуры *(1 гадзіна).*

Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гады, пераемнасць у развіцці літаратуры з «нашаніўскім» перыядам.

Літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Творчасць пісьменнікаў старэйшага пакалення – Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі. Прыход у літаратуру творчай моладзі – Міхася Чарота, Уладзіміра Дубоўкі, Міхася Лынькова, Кандрата Крапівы, Міхася Зарэцкага, Кузьмы Чорнага, Язэпа Пушчы, Лукаша Калюгі, Петруся Броўкі і інш. Творчыя здабыткі і пошукі 1920-х гадоў і іх спад у 1930-я гады пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця. Ліквідацыя літаратурных аб'яднанняў, абвяшчэнне сацыялістычнага рэалізму адзіным творчым метадам. Становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гады. Стварэнне Саюза савецкіх пісьменнікаў (ССП СССР) і яго падраздзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі (1934), іх роля ў развіцці літаратуры.

Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай (Уладзімір Жылка, Максім Танк, Міхась Машара, Валянцін Таўлай, Міхась Васілёк і інш.).

Тэорыя літаратуры. Літаратурны працэс. Рэалізм, мадэрнізм і яго плыні (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва*. Музыка: *М. Равенскі.* Песня «Моладзь» (сл. М. Чарота); *А. Туранкоў.* Опера «Кветка шчасця» (п'еса М. Чарота «На Купалле»).

* Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца ў першую чаргу з апорай на вядомае і на выбар настаўніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

Жывапіс: *А. Лісіцкі*. Плакат «Клінам чырвоным бі белых»; *В. Волкаў.* «Маладняковец»; *М. Гусеў.* «Партрэт М. Чарота»; *Я. Драздовіч.* Афармленне часопіса «Рунь»; *М. Станюта.* «Смутак», «Будаўніцтва Універсітэцкага гарадка»; *М. Філіповіч.* «Супрэматычнае кола», «Супрэматызм»; *Т. Ціхаў.* «Вогненны анёл»; *М. Шагал.* «Мір хацінам, вайна палацам».

Літаратура

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. Т. 2: 1921–1941 / [І. Э. Багдановіч і інш.; навуковыя рэдактары: У. В. Гніламёдаў, В. А. Каваленка]. – Мінск: Беларус. навука, 2002.

Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе: 20–50-я гг. / пад. агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 2-е выд. – Мінск: Выш. шк., 2000.

Лявонава, Е. Плыні і постаці: з гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX–XX стагоддзя / Е. Лявонава. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998.

Максімовіч, В. А. Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя: вучэб. дапам / В. А. Максімовіч. – Мінск: Беларус. навука, 2006.

Мішчанчук, М. І. Беларуская літаратура XX ст. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. – Мінск, 2001.

Максім Гарэцкі. Апавяданні **«Роднае карэнне», «Літоўскі хутарок»,** аповесць **«Дзве душы»** *(6 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Роднае карэнне». Тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу. Вобраз Архіпа Лінкевіча – вясковага інтэлігента з абуджаным сумленнем, пачуццём абавязку перад людзьмі, які імкнецца пазнаць жыццё, знайсці «першапрычыну ўсякае істоты». Жыццёвая мудрасць дзеда Яхіма, яго запавет маладому пакаленню.

«Літоўскі хутарок». Суровая праўда пра Першую сусветную вайну, выкрыццё яе антынароднай, антычалавечай сутнасці. Аўтабіяграфічнасць апавядання. Рэалістычная праўдзівасць адлюстравання трагедыйнасці народнага жыцця. Гуманістычная канцэпцыя пісьменніка. Вобраз Яна Шымкунаса – бескарыслівага, высакароднага, гуманнага чалавека.

«Дзве душы». Глыбокі аналіз рэчаіснасці ў спалучэнні з раскрыццём унутранага свету асобы. Станаўленне нацыянальнага характару на пераломным этапе існаванння беларускай нацыі. Вобраз Ігната Абдзіраловіча. Ігнат Абдзіраловіч і Васіль. Героі-адраджэнцы Ірына Сакавічанка, Мікола Канцавы, Сухавей. Адсутнасць маральных арыенціраў у Гаршка і Гарэліка. Жанравыя адметнасці аповесці. Сінтэтычны вобраз часу ў аповесці.

Тэорыя літаратуры. Вобраз апавядальніка (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: *Э. Астаф'еў*. Рэльефны партрэт М. Гарэцкага для мемарыяльнай дошкі.

Тэатральнае мастацтва: спектакль «Атрута» (рэж. *М. Стрыжоў*).

Літаратура

Лявонава, Е. А. Беларускае мастацтва слова XX ст. у еўрапейскім літаратурным кантэксце: тыпалогія, рэцэпцыя, пераклад / Е. А. Лявонава. – Мінск: БДУ, 2014.

Мушынскі, М. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі. – Мінск: Беларус. навука, 2013.

Слова пра літаратуру і літаратараў: літ. -крытыч. арт. па бел. літ. У 2-х кн. Кн. 1. XIX – пач. XX ст. : для ст. шк. узросту / Уклад. В. В. Ашмян і інш. – Мінск: Маст. літ., 2001.

Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым: проза Максіма Гарэцкага / І. П. Чыгрын. – 2-е выд. – Мінск, 2003.

Вацлаў Ластоўскі. Аповесць **«Лабірынты»** *(2 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Лабірынты». «Археалогія культуры» – галоўны лейтматыў твора. Мастацкае ўвасабленне нацыянальнай канцэпцыі быцця. Наватарскія здабыткі Вацлава Ластоўскага ў мастацкім вырашэнні задумы, у раскрыцці лабірынтаў як вобразаў-сімвалаў. Жанрава-стылёвая адметнасць твора.

Тэорыя літаратуры. Прыгодніцка-фантастычная аповесць.

Змітрок Бядуля. Абразкі, лірычныя мініяцюры **«Плач пралескаў», «Нібы рупны араты…»;** апавяданне **«Бондар»** *(3 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Абразкі і лірычныя мініяцюры. Рамантычная настраёвасць твораў, захапленне прыгажосцю роднага краю, спалучаныя з рэалістычным адлюстраваннем жыцця. Лірычны герой-рамантык – асоба ўзвышаная, духоўна багатая. Пошукі сэнсу жыцця, прызначэння чалавека; паяднанасць чалавека з прыродай, роднай зямлёй. Адметнасці жанру: вобразная асацыятыўнасць, метафарычнасць, маналагічнасць формы, рытміка-інтанацыйны лад.

«Бондар». Вырашэнне тэмы мастака і мастацтва ў кантэксце сацыяльных праблем. Вобраз майстра-працаўніка. Асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці. Мастацкія адметнасці твора: сцісласць, драматызм, псіхалагізм, народная вобразнасць мовы.

Тэорыя літаратуры. Абразок, лірычная мініяцюра як жанры малой прозы.

Літаратура

Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

Уладзімір Дубоўка. Вершы «**Залатая асенняя раніца», «О Беларусь, мая шыпшына…», «Пальцы жоўтых кляновых лістоў», «Родная мова, цудоўная мова...», «Кармазынам асмужаны», «Ніколі праўда не ўмірае»** *(3 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Асноўныя матывы лірыкі. Услаўленне сілы народа, духоўнасці, вальналюбства чалавека, паэтызацыя красы прыроды, кахання. Высокая культура верша, шчыры лірызм, асацыятыўная вобразнасць, багацце жанравых формаў. Сувязь лірыкі з традыцыямі фальклору, паэзіяй Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі.

Мастацтва. Музыка: *М. Равенскі.* Опера «Браніслава» (лібр. У. Дубоўкі, 1930); песні: «На прасторах сініх», «Нас спавівалі», «Ліпнёвы гімн» (сл. У. Дубоўкі), «Месячыку-Месяц» (сл. У. Жылкі); *М. Шчаглоў (Куліковіч).* Рамансы: «О Беларусь, мая шыпшына», «А вясна ідзе на Беларусі» (сл. У. Дубоўкі).

Жывапіс: жывапіс імпрэсіяністаў; *П. Драчоў.* Ілюстрацыі да кнігі «Выбраныя творы» У. Дубоўкі (Т. 1–2, 1965); *Н. Шчасная.* «Пісьменнік У. М. Дубоўка».

Літаратура

Багдановіч, І. Авангард і традыцыя: беларус. паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001.

Бугаёў, Д. Уладзімір Дубоўка: кніга пра паэта / Д. Бугаёў. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

Райнер Марыя Рыльке. Вершы **«Паэт», «Сёмая элегія»** *(1 гадзіна).*

Сутнасць мастацкага ўніверсалізму Рыльке (спалучэнне элементаў неарамантызму, імпрэсіянізму, сімвалізму, экспрэсіянізму). Філасофска-эстэтычная эвалюцыя паэта. Жанрава-стылёвая разнастайнасць паэзіі.

Літаратура

Лявонава, Е. А. Плыні і постаці: з гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX–XX ст.: дапам. для настаўнікаў. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998.

Уладзімір Жылка. Вершы **«Меч», «Палімпсест», «Мы любім дзіўныя паданні», «Беларусь», «Максім Багдановіч»** (2 гадзіны).

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Адраджэнне традыцый еўрапейскага рамантызму ў паэзіі Уладзіміра Жылкі. Грамадзянскія і патрыятычныя матывы лірыкі. Карціны гістарычнага мінулага і заклік да абуджэння народа. Вобраз лірычнага героя – рамантыка-максімаліста, змагара за свабоду Радзімы. Сімволіка твораў. Арыентацыя паэзіі Уладзіміра Жылкі на традыцыі філасофскай лірыкі Максіма Багдановіча. Багацце і дасканаласць жанравых форм.

Літаратура

Багдановіч, І. Авангард і традыцыя: беларус. паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001.

Максімовіч, В. Шыпшынавы край: старонкі бел. літ. 20–30-х гг. XX ст. : дапам. для настаўнікаў / В. Максімовіч. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2002.

Язэп Пушча. Вершы **«Раніцу шчэбет пільнуе…», «Светлых дзён харaство», «Каплі вады», «Лісты да сабакі», «Лета»** *(2 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Агульная ідэйна-пафасная эвалюцыя лірыкі паэта: ад радаснага захаплення жыццём да адчування яго трагічнага надлому і вяртанне да ўраўнаважана-светлага адчування прыгажосці, гармоніі рэчаіснасці. Язэп Пушча – майстар пейзажнай лірыкі. Тэма паэта і паэзіі і яе трагедыйная інтэрпрэтацыя. Сімволіка і яе змест у творчасці паэта.

Тэорыя літаратуры. Мадэрнізм, сімвалізм, імажынізм (паглыбленне паняццяў).

Літаратура

Максімовіч, В. Шыпшынавы край: старонкі бел. літ. 20–30-х гг. XX ст. : дапам. для настаўнікаў / В. Максімовіч. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2002.

Кандрат Крапіва. Байкі **«Дыпламаваны Баран», «Махальнік Іваноў», «Дзед і баба», «Саманадзейны конь»**; камедыя **«Хто смяецца апошнім»** *(5 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Байкі. Выкрыццё бескультур'я, амаральнасці, некампетэнтнасці, бяздушнага стаўлення да сумленных працаўнікоў, высмейванне самаўпэўненасці, нахабства, тупасці, падхалімства і іншых чалавечых заган.

«Хто смяецца апошнім». Час напісання твора. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Сюжэтная аснова камедыі. Канфлікт у п'есе. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі. Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Сродкі і прыёмы сатырычнай тыпізацыі і індывідуалізацыі. Мова персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў. Сцэнічнае жыццё камедыі. Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Жанрава-тэматычная разнастайнасць байкі. Камічнае ў мастацкай літаратуры. Сатырычная камедыя. Канфлікт у драматычным творы (паглыбленне паняцця).

Літаратура

Бугаёў, Д. Зброяй сатыры, зброяй праўды / Д. Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2004.

Лаўшук, С. С. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2002.

Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Кандрата Крапівы ў школе: дапаможнік для настаўнікаў / В. Я. Ляшук, М. І. Яніцкі. – Мінск: Аверсэв, 2007.

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектакль «Хто смяецца апошнім» (рэж. *А. Кірэеў*).

Кінамастацтва: тэлефільм «Хто смяецца апошнім» (рэж. У. Корж-Саблін).

Андрэй Мрый. Раман «Запіскі Самсона Самасуя» *(4 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Раман **«Запіскі Самсона Самасуя»** – твор пра анамаліі грамадскага жыцця сярэдзіны 1920-х гадоў. Рэальная аснова твора. Галоўны герой рамана Самсон Самасуй. Увасабленне ў вобразе тыповых рыс кар'ерызму, эгаізму, бюракратызму, падхалімства, прыстасавальніцтва. Сатырыка-гумарыстычныя сродкі выкрыцця самасуеўшчыны. Выкарыстанне аўтарам прыёму самаацэнкі і самахарактарыстыкі героя (пераказы і каментарыі ўласных і чужых дзеянняў). Сатырычная характарыстыка і маральная ацэнка дзейнасці шапялёўскай інтэлігенцыі (філосаф Торба, Сом, Лін, Мамон, паэт Гарачы). Жанравая адметнасць твора.

Тэорыя літаратуры. Сатырычны раман.

Мастацтва. Кінамастацтва: тэлефільм «Пратарачка жыцця, або Запіскі Самсона Самасуя» (рэж. У. Арлоў).

Міхась Зарэцкі. Апавяданні **«Ворагі», «Кветка пажоўклая»** *(3 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Ворагі». Лёс Паўла Гуторскага – змагара за рэвалюцыйныя ідэалы, і Ніны Купрыянавай – дачкі памешчыка. Грамадскае і асабістае ў апавяданні. Тэма кахання.

«Кветка пажоўклая». Паказ маральнай дэградацыі Марыны Гарновай – чалавека складанай біяграфіі, бязлітаснай да родных і блізкіх. Трагічны фінал апавядання. Псіхалагізм, вастрыня канфлікту ў творы.

Міхась Зарэцкі – майстар вострага сюжэта, мастацкай дэталі, глыбокі псіхолаг.

Тэорыя літаратуры. Мастацкая дэталь. Стыль пісьменніка (развіццё паняцця).

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектаклі «Сымон Карызна» (рэж. *У. Кумельскі*, паводле рамана М. Зарэцкага «Вязьмо»), «Ная» (рэж. *М. Кавязін*).

Літаратура

Мушынскі, М. Нескароны талент: праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага / М. Мушынскі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

Стэфан Цвэйг. Навела **«Нябачная калекцыя»** *(1 гадзіна).*

Творчая спадчына сусветна вядомага аўстрыйскага пісьменніка.

Рэалістычныя традыцыі ў навеле «Нябачная калекцыя». Сутыкненне жорсткіх жыццёвых рэалій і высокага мастацтва. Праблема сапраўдных і ўяўных каштоўнасцей. «Выратавальны падман» героя-апавядальніка. Псіхалагізм у абмалёўцы герояў твора. Майстэрства Цвэйга-навеліста.

Літаратура

Лявонава, Е. А. Плыні і постаці: з гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX–XX ст.: дапам. для настаўнікаў. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998.

Кузьма Чорны. Апавяданне **«Макаркавых Волька»**; раман **«Пошукі будучыні»** *(7 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Макаркавых Волька». Канкрэтна-гістарычны змест твора. Адлюстраванне характэрнай для 30-х гадоў атмасферы падазронасці, недаверу да чалавека. Супрацьпастаўленне гуманістычнай жыццёвай пазіцыі Волькі і агіднай паклёпніцкай дзейнасці Сафрона Дзядзюлі. Асуджэнне ў апавяданні праяў шальмоўства і прыніжэння чалавечай годнасці. Агульначалавечае значэнне праблем, узнятых у творы.

«Пошукі будучыні» – буйны эпічны твор часу вайны. Сацыяльна-філасофскі змест рамана. Асаблівасць яго сюжэтна-кампазіцыйнай асновы. Драматызм канфлікту. Аўтарская канцэпцыя гістарычнай будучыні беларускага народа. Драматычны лёс ахвяр Першай і Другой сусветных войнаў. Няздзейсненыя мары старэйшага пакалення (Нявады, Сымона Ракуцькі) аб шчасці. Паказ трагізму вайны і цяжкіх жыццёвых выпрабаванняў у часы фашысцкай акупацыі. Глыбокі маральна-этычны сэнс тэмы «ўкрадзенага дзяцінства». Выкрыццё фашызму як вялікай пагрозы чалавецтву. Асуджэнне авантурысцкіх імкненняў новых прэтэндэнтаў на панаванне ва ўмовах акупацыі. Ганебная смерць графа Паліводскага і Густава Шрэдэра. Антываенны пафас рамана.

Кузьма Чорны – майстар мастацкай дэталі, партрэтнай і моўнай характарыстыкі, пейзажных і бытавых замалёвак, разгалінаванага сюжэта, адлюстравання плыні жыцця і плыні свядомасці.

Значэнне творчасці Кузьмы Чорнага ў развіцці беларускай псіхалагічнай прозы, яе буйных жанраў.

Тэорыя літаратуры. Псіхалагізм у літаратуры. Жанравыя разнавіднасці рамана.

Мастацтва. Скульптура: *З. Азгур.* «Пісьменнік Кузьма Чорны»; *Э. Астаф'еў*. Рэльефны партрэт К. Чорнага для мемарыяльнай дошкі.

Жывапіс: *І. Ахрэмчык.* «Партрэт К. Чорнага»; *М. Гуцееў.* Ілюстрацыі да кнігі К. Чорнага «Люба Лук'янская»; *Х. Ліўшыц.* «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Печышчах у 1942 годзе»; *М. Савіцкі.* «Партызаны».

Літаратура

Тычына, М. Кузьма Чорны: эвалюцыя мастацкага мыслення / М. Тычына. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

Андрэ Маруа. Навела **«Пакаранне золатам»** *(1 гадзіна).*

Паказ згубнай улады золата ў навеле. Трагікамічнае становішча багатага ранцье Борака і яго жонкі, запалоханых магчымасцю страціць свой капітал. Псіхалагічная матывіроўка паводзін герояў навелы.

Літаратура

Лявонава, Е. А. Плыні і постаці: з гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX–XX ст.: дапам. для настаўнікаў. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998.

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА СЯРЭДЗІНЫ XX СТАГОДДЗЯ (1940-я – СЯРЭДЗІНА 1960-х ГАДОЎ) (50 гадзін)

Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) ***(1 гадзіна).***

Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай паэзіі і публіцыстыкі. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Выкрыццё ідэалогіі фашызму. Адлюстраванне трагедыі чалавека на вайне. Перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры.

Пісьменнікі-франтавікі: Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Максім Танк, Міхась Лынькоў, Янка Брыль, Кастусь Кірэенка, Анатоль Вялюгін, Мікола Аўрамчык, Алесь Бачыла, Максім Лужанін, Міхась Калачынскі, Мікола Лобан і інш. Удзел беларускіх пісьменнікаў у падпольным і партызанскім руху: Анатоль Астрэйка, Антон Бялевіч, Уладзімір Карпаў, Рыгор Мурашка, Валянцін Таўлай, Ніна Тарас, Анатоль Іверс і інш. Пісьменнікі, якія загінулі ў гады вайны: Мікола Сурначоў, Леанід Гаўрылаў, Аркадзь Гейнэ, Алесь Дубровіч, Рыгор Жалязняк, Алесь Жаўрук, Аляксей Коршак, Сяргей Крывец, Алесь Мілюць, Мікола Нікановіч, Алесь Прудзнікаў, Рыгор Суніца, Андрэй Ушакоў, Хвядос Шынклер і інш.

Мастацтва. Музыка. *І. Лучанок.* Раманс-песня «Ёсць у горада слава гордая» (сл. А. Вярцінскага); *К.* Цесакоў. Раманс-песня «Было ў салдата два полі» (сл. А. Вярцінскага).

Скульптура: М. Кандрацьеў. «Загінуўшых чакаюць вечна (удовы вайны)».

Жывапіс. *В.* Грамыка. «Балада пра ваенную маладосць», «Салдаты», «Балада пра апошнюю кулю», «Жанчынам Вялікай Айчыннай прысвячаецца»; «З вогненнай вёскі», «Боль вогненных гадоў. Год 41-ы», «Беларуская восень», «Поры года»; *М. Савіцкі.* Серыі карцін «Лічбы на сэрцы»; *М. Тарасікаў.* «Брацкія магілы».

Беларуская літаратура пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955) *(1 гадзіна).*

Патрыятычны і жыццялюбны пафас творчасці, абумоўлены заканчэннем вайны, мірным будаўніцтвам. Ваенная тэма як цэнтральная ў літаратуры.

Вызначальныя творы пасляваеннага дзесяцігоддзя на маральна-этычныя тэмы: апавяданні Івана Мележа, Янкі Брыля, Аляксея Кулакоўскага, раманы Івана Шамякіна, паэмы Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі.

Беларуская літаратура ў гады абнаўлення грамадства (1956–1965) (1 гадзіна).

Змены ў грамадскай атмасферы сярэдзіны 50-х гадоў і іх дабратворны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. Рэабілітацыя беларускіх пісьменнікаў: Цішкі Гартнага, Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Жылкі, Міхася Зарэцкага (пасмяротна) і інш. Актыўнае і шматграннае развіццё мастацтва слова. Узвышэнне ў літаратуры народных ідэалаў праўды, сумленнасці і справядлівасці, гуманізму. Узмацненне крытычнага пачатку ў літаратурнай творчасці, адмаўленне ад схематызму, тэорыі бесканфліктнасці.

Прыход у беларускую літаратуру Васіля Быкава, Івана Пташнікава, Івана Навуменкі. Алеся Адамовіча, Івана Мележа, Уладзіміра Караткевіча, Вячаслава Адамчыка, Івана Чыгрынава, Аляксея Пысіна, Міхася Стральцова, Анатоля Вярцінскага, Анатоля Кудраўца, Васіля Зуёнка і інш.

Рамантычная хваля ў мастацтве і яе праявы ў літаратуры, жывапісе, музыцы, тэатры (1956–1965 гг.). Вяртанне да класічных традыцый рэалістычнага мастацтва (проза Івана Мележа, Васіля Быкава, Янкі Брыля, Аляксея Кулакоўскага, паэзія Анатоля Вялюгіна, Аляксея Пысіна, Міколы Аўрамчыка, Аляксея Русецкага, Кастуся Кірэенкі, Анатоля Вярцінскага, драматургія Кастуся Губарэвіча, Андрэя Макаёнка).

Літаратура

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. Т. 3: 1941–1965 / [Г. П. Твараповіч і інш.; навуковыя рэдактары: У. В. Гніламёдаў, В. П. Жураўлёў]. – Мінск: Беларус. навука, 2002.

Пятрусь Броўка. Вершы **«Будзем сеяць, беларусы!»**, **«Надзя-Надзейка», «Родныя словы», «Александрына», «Вось і лета сышло…», «А ты ідзі»;** паэма **«Голас сэрца»** *(4 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Лірыка. Агляд творчасці Петруся Броўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Патрыятычны, вызваленчы пафас твораў паэта, сцвярджэнне няскоранасці беларускага народа, выяўленне палымянай веры ў перамогу. Пашырэнне ідэйна-тэматычнага і жанравага дыяпазону паэзіі Петруся Броўкі ў 1960–1970-я гады, узмацненне яе гуманістычнага пафасу, увагі да маральна-этычных і агульначалавечых праблем. Роздум пра чалавека, яго прызначэнне і месца ў жыцці. Тэма паэта і паэзіі. Паэтызацыя красы прыроды. Народна-песенная аснова вершаў, іх мілагучнасць.

«Голас сэрца». Матывы сыноўняга болю і бяды ў паэме. Спалучэнне лірычнага і публіцыстычнага пачаткаў. Вобраз маці-паланянкі. Антываенны і гуманістычны пафас твора.

Мастацтва. Музыка: *У. Мулявін.* Песня «Александрына» (сл. П. Броўкі).

Жывапіс: *У. Гардзеенка.* «Думы пра былое (П. Броўка)»; *С. Герус.* «Партрэт Петруся Броўкі»; *І. Пратасеня.* «Партрэт П. Броўкі».

Аркадзь Куляшоў. Вершы: **«Мая Бесядзь», «Над брацкай магілай», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «Я хаце абавязаны прапіскаю...»; «На паўмільярдным кіламетры…»**, вершаваны цыкл **«Маналог»**; паэма **«Сцяг брыгады»** *(6 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Лірыка. Глыбіня лірычнага пачуцця паэта ў лепшых творах даваеннага часу. Адметнасць вобразнасці і кампазіцыі верша «Мая Бесядзь». Ваенная лірыка А. Куляшова. Суровая праўда і гуманізм у паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае, фальклорныя матывы ў баладзе «Над брацкай магілай». Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай лірыцы. Зварот да тэм жыцця і смерці, кахання і вернасці, лёсу і абавязку. Услаўленне чалавека, яго духоўных каштоўнасцей. Развіццё і ўзбагачэнне паэтам класічных традыцый лірыкі. Вершаваны цыкл «Маналог»: матывы памяці, вернасці сяброўству, ідэалам маладосці. Паэтычнае майстэрства Аркадзя Куляшова.

«Сцяг брыгады». Адлюстраванне падзей пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў творы. Мастацкае ўвасабленне тэмы вернасці воінскаму сцягу. Вобразы Алеся Рыбкі, Мікіты Ворчака і камісара Заруднага. Патрыятычны пафас твора. Жанрава-стылёвая адметнасць паэмы.

Тэорыя літаратуры. Лірычны герой (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: *М. Савіцкі.* «Партызанская Мадонна (Мінская)»; *П. Гаўрыленка.* «Вясна», «Сяўба»; *М. Сяўрук.* «Жніво»; *У. Кожух.* «Новая дарога»; *М. Рагалевіч.* «Беларуская калыханка»; *А. Бараноўскі.* «Пара залатых бяроз»; *Г. Вашчанка.* «Крылы»; *Я. Драздовіч.* «Космас», «Артаполіс», «Трывеж», «Панарама месячнага горада».

Выяўленчае мастацтва: *Л. Талбузін.* Медаль «Аркадзь Куляшоў».

Музыка: *Э.* Наско. Вакальная музыка «Рамансы на вершы А. Куляшова».

Літаратура

Голуб, Т. Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова / Т. Голуб; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2014.

Куляшова, В. А. Аркадзь Куляшоў. Лясному рэху праўду раскажу...: аповесць-эсэ / В. Куляшова. – Мінск: Маст. літ., 2014.

Максім Танк. Вершы: **«Спатканне», «Родная мова», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ты яшчэ намёк на чалавека…», «Працягласць дня і ночы», «Голас», «Перакройванне шыняля», «Гравюры Скарыны», «Чытаючы Багдановіча»;** паэма **«Люцыян Таполя»** *(6 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Лірыка. Тэмы і вобразы, наватарскі характар танкаўскай паэзіі. Сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы народа. Матыў адзінства пакаленняў. Адметнасць лірыкі

перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай паэзіі. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей. Свабодны верш у паэзіі Максіма Танка. Інверсія, кантраст, метафара ў яго творах.

«Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. Спалучэнне эпічнага і лірычнага пачаткаў у творы. Выкарыстанне сродкаў паэтызацыі і гратэску ў паэме. Блізкасць героя паэмы Максіма Танка да купалаўскага Гусляра.

Тэорыя літаратуры. Сілаба-танічная сістэма вершаскладання. Верлібр, вобраз асацыятыўны (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва. Музыка: *У. Алоўнікаў.* Рамансы «Дуб», «Партызанскія акопы»; *А. Багатыроў.* Рамансы «Вяселле», «Калісьці бура на Карпатах», «Клубамі чорнымі дым віўся», «Нарач»; *Г. Вагнер.* Рамансы «Два арлы», «Плача хмара без жалю»; *Я. Глебаў.* Раманс «Нарач»; *І. Лучанок.* Раманс «Два арлы»; *У. Мулявін*. Раманс «Завушніцы»; *П. Падкавыраў.* Раманс «Не шкадуйце, хлопцы, пораху»; *Ю. Семяняка.* Рамансы «Нарач», «Ганна», «Ну і вечар вясновы!»; *Д. Смольскі.* Рамансы «Быць чалавекам я рад», «Ля гэтых сосен», «Плача хмара без жалю»; *Ю. Талеснік.* Раманс «Завушніцы»; *А. Туранкоў.* Рамансы «Вясновая навальніца», «Грай жа, музыка», «У навальніцу»; *Э. Тырманд.* Рамансы «А што гэта за даліна», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Сасна», «Ва ўсім, вядома, вінават», «Памяць».

Скульптура: *А. Бембель.* «Уз'яднанне Заходняй Беларусі».

Жывапіс: *С. Вярсоцкі.* «Возера Нарач»; *С. Герус.* «Партрэт М. Танка»; *Я. Зайцаў.* «Партрэт М. Танка»; *Н.* Шчасная. «Партрэт М. Танка».

Літаратура

Бугаёў, Д. Паэзія Максіма Танка / Д. Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2003.

Мікуліч, М. У. Максім Танк. Талент, заручаны з небам / М. Мікуліч. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2012.

Янка Брыль. Апавяданні **«Галя», «Memento mori»;** лірычныя мініяцюры **«Трохі пра вечнае», «Загадка»** *(4 гадзіны).*

Жыццё і творчасць пісьменніка.

«Галя». Праблема чалавечага шчасця і сэнсу жыцця. Спалучэнне лірычнай усхваляванасці з глыбокім пранікненнем у псіхалогію чалавека. Гісторыя кахання гераіні. Праблема маральнага выбару і адказнасці чалавека за свае ўчынкі. Духоўныя каштоўнасці і іх значэнне для чалавека. Пейзаж у творы. Мастацкая дэталь. Асаблівасці кампазіцыі апавядання.

«Memento mori». Паказ вайны ў творы. Маральны подзвіг старога селяніна ў творы. Уменне аўтара ўбачыць гераічнае за рамкамі бытавых сцэн. Асуджэнне фашызму ў апавяданні. Глыбокае разуменне народнага гераізму. Урачыстая танальнасць аўтарскага маўлення.

Лірычныя мініяцюры. Паэзія «імгнення жыцця». Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў «малой прозе». Ідэя разнастайнасці жыцця і яго праяў у творчасці пісьменніка.

Тэорыя літаратуры. Стыль пісьменніка (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: *С. Вакар*. «Пісьменнік Я. Брыль».

Жывапіс: *М. Будавей.* «Партрэт Я. Брыля»; *В. Грамыка.* «Партрэт Я. Брыля».

Літаратура

Кісліцына, Г. Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры / Г. Кісліцына. – Мінск: Беларус. навука, 2000.

віды гібрыдызацыі атамных арбіталей; правіла Маркоўнікова; алкільныя групы; якасныя рэакцыі на вывучаныя арганічныя рэчывы; агульныя формулы вывучаных вуглевадародаў; азначэнні класаў вывучаных вуглевадародаў; вывучаныя вуглевадароды па наменклатуры ІЮПАК і трывіяльнымі назвамі; вобласці практычнага выкарыстання вуглевадародаў і вырабаў з іх; складатаў і будову вывучаных вуглевадародаў, спосабы атрымання вуглевадародаў, пластмас, каўчук; тып хімічнай рэакцыі; умовы працякання рэакцый; характар змены фізічных уласцівасцяў рэчываў у гамалагічным радзе і прычыну іх змянення; хімічныя ўласцівасці індывідуальнага рэчывы вывучанага класа вуглевадародаў;

вызначаць:

прыналежнасць вуглевадароду да вызначанага класа па структурнай формуле; прасторавую будову малекул вывучаных вуглевадародаў з пазіцыі гібрыдызацыі атамных арбіталей; тыпы хімічных рэакцый вуглевадародаў па ўраўнаннях; этылен, ацэтылен (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

тыпы хімічных рэакцый вуглевадародаў па раўнаннях і схемах;

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

формулу вуглевадароду (малекулярную, структурную, шкілетную, скарочаны структурную, электронную); мадэлі малекул вуглевадародаў; структурныя формулы вуглевадародаў па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць ўзаемасувязь паміж арганічнымі вуглевадародамі розных класаў; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць хімічныя ўласцівасці вуглевадародаў і спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

спосабы атрымання вуглевадародаў; будова вуглевадародаў; тып хімічнай сувязі ў вуглевадародах; фізічныя ўласцівасці вуглевадародаў; хімічныя ўласцівасці вуглевадародаў;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі вуглевадародаў; узаемасувязь вуглевадародаў розных класаў; прычыны разнастайнасці вуглевадародаў; прычыны падабенства хімічных уласцівасцяў вуглевадародаў аднаго класа; прасторавае будову малекул вуглевадародаў з пазіцыі гібрыдызацыі атамных арбіталей; хімічныя ўласцівасці вуглевадародаў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

аналізаваць:

вынікі лабараторных доследаў, практычных работ; вучэбную інфармацыю;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей вуглевадародаў, хімічных рэакцый з удзелам вуглевадародаў, спосабаў атрымання вуглевадародаў, вырашэнні разліковых задач; правілы бяспечных паводзін пры абыходжанні з рэчывамі, хімічнай посудам, лабараторным абсталяваннем і прыборамі;

абыходзіцца:

з рэчывамі, хімічнай посудам, лабараторным абсталяваннем, прыборамі;

праводзіць:

матэматычныя вылічэнні пры рашэнні разліковых задач; хімічны эксперымент; мадэляванне малекул арганічных злучэнняў.

Т э м а 3. Спірты і фенолы (22 гадзіны)

Спірты. Функцыянальная група спіртоў, яе электронная будова. Класіфікацыя спіртоў: аднаатамныя і мнагаатамныя; насычаныя, ненасычаныя, аліцыклічныя і араматычныя; першасныя, другасныя, трацічныя.

Насычаныя аднаатамныя спірты. Азначэнне класа, агульная формула, састаў, будова, малекулярныя, структурныя і электронныя формулы насычаных аднаатамных спіртоў. Метанол і этанол як прадстаўнікі насычаных аднаатамных спіртоў.

Ізамерыя насычаных аднаатамных спіртоў: структурная (вугляроднага шкілета і становішча функцыянальнай групы), міжкласавая (з простымі эфірамі). Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы спіртоў.

Фізічныя ўласцівасці. Вадародная сувязь і яе ўплыў на тэмпературы кіпення і растваральнасць спіртоў.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, арганічнымі і мінеральнымі кіслотамі, галагенавадародамі, дэгідратацыя (унутрымалекулярная і міжмалекулярная); акісленне: поўнае і частковае.

Атрыманне спіртоў гідролізам галагеналканаў, гідратацыяй алкенаў. Атрыманне метанолу і этанолу ў прамысловасці. Прымяненне спіртоў. Таксічнасць спіртоў, іх уздзеянне на арганізм чалавека.

Выхад прадукту рэакцыі.

Мнагаатамныя спірты. Этыленгліколь (этандыёл-1,2) і гліцэрына (прапантрыёл-1,2,3) як прадстаўнікі мнагаатамных спіртоў, іх састаў, будова і структурныя формулы.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, арганічнымі і мінеральнымі кіслотамі, галагенавадародамі, гідраксідам медзі (II) (якасная рэакцыя на мнагаатамныя спірты). Прымяненне этыленгліколю і гліцэрыны.

Узаемасувязь паміж насычанымі, ненасычанымі вуглевадародамі і спіртамі.

Фенолы. Паняцце аб фенолах, азначэнне класа. Састаў і будова фенолу: малекулярная і структурная формулы. Фізічныя ўласцівасці фенолу.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, растворамі шчолачаў, браміраванне і нітраванне па араматычным ядры. Якасныя рэакцыі на фенол з бромнай вадой і растворамі солей жалеза (Ш). Узаемны ўплыў груп атамаў у малекуле фенолу.

Атрыманне фенолу з прадуктаў каксавання каменнага вугалю і хлорбензолу. Кумольны спосаб. Прымяненне фенолу.

Разліковыя задачы

5. Разлікі па хімічных ураўненнях, калі адно з рэагуючых рэчываў узята з лішкам.

6. Вызначэнне выхаду прадукту рэакцыі.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул метанолу, этанолу, этыленгліколю, гліцэрыны.

2. Параўнанне растваральнасці ў вадзе насычаных аднаатамных спіртоў.

3. Узаемадзеянне этанолу з натрыем.

4. Гарэнне этанолу.

Лабараторныя доследы

2. Акісленне этанолу аксідам медзі (II).

3. Узаемадзеянне гліцэрыны з гідраксідам медзі (II).

Па выніках вывучэння тэмы вучні павінны

даваць азначэнні паняццяў:

вадародная сувязь; кіслародзмяшчальныя арганічныя злучэнні; спірты, фенолы; складаныя эфіры; гідраксільная група; намеэнклатура ІЮПАК спіртоў, трывіяльныя назвы спіртоў; хімічныя рэакцыі арганічных злучэнняў (закісання, этэрыфікацыі).

умець:

называць:

якасныя рэакцыі на мнагаатомныя спірты і фенол; агульную формулу насычаных аднаатамнага спіртоў; азначэнне класаў адна-, мнагаатомных спіртоў і фенолов; спірты па наменклатуры ІЮПАК і трывіяльнымі назвамі, фенол; вобласці практычнага выкарыстання спіртоў і фенолу; састаў і будову адна-, мнагаатомных спіртоў і фенолу, спосабы атрымання насычаных аднаатамнага спіртоў і фенолу; характар змянення фізічных уласцівасцей насычаных аднаатамнага спірту ў гамалагічным радзе і прычыну іх змянення; хімічныя ўласцівасці насычаных аднаатамнага спіртоў, этыленгліколю, гліцэрыны і фенолу;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да класа спіртоў і фенолов па структурнай формуле; прасторавую будову малекул; этыленгліколь, гліцэрына і фенол (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

тыпы хімічных рэакцый спіртоў і фенолу па ўраўнаннях і схемах;

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

формулу насычанага аднаатамнага спірту, этыленгліколю, гліцэрыны, фенолу (малекулярную, структурную); мадэлі малекул спіртоў і фенолу; структурныя формулы спіртоў і фенолу па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць узаемасувязь паміж вуглевадародамі, насычанымі аднаатамнага спіртамі, фенолам; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць вывучаныя хімічныя ўласцівасці спіртоў і фенолу, спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

спосабы атрымання спіртоў і фенолу; будова спіртоў і фенолу; фізічныя ўласцівасці спіртоў і фенолу; вывучаныя хімічныя ўласцівасці спіртоў і фенолу;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі насычаных аднаатамнага спіртоў, фенолу; узаемасувязь вуглевадародаў, насычаных аднаатамнага спіртоў, фенолу; прычыны падабенства хімічных уласцівасцей гамолагаў насычаных аднаатамнага спіртоў; хімічныя ўласцівасці вывучаных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей спіртоў, фенолу; хімічных уласцівасцяў насычаных аднаатамнага і мнагаатомных спіртоў, фенолу; спосабаў атрымання насычаных аднаатамнага спіртоў і фенолу.

праводзіць:

матэматычныя вылічэнні пры рашэнні разліковых задач; хімічны эксперымент.

Тэма 4. Альдэгіды (8 гадзін)

Альдэгіды. Функцыянальная карбанільная група, яе электронная і прасторавая будова. Паняцце аб кетонах як разнавіднасці карбанільных злучэнняў. Функцыянальная альдэгідная група, яе электронная і прасторавая будова.

Азначэнне класа альдэгідаў. Метаналь і этаналь як прадстаўнікі альдэгідаў, іх састаў, будова, малекулярныя, структурныя і электронныя формулы.

Насычаныя альдэгіды: агульная формула; структурная ізамерыя вугляроднага шкілета і міжкласавая ізамерыя з кетонамі.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы альдэгідаў. Фізічныя ўласцівасці альдэгідаў.

Хімічныя ўласцівасці: аднаўленне да спіртоў, акісленне да карбонавых кіслот, далучэнне метанолу. Якасныя рэакцыі на альдэгідную групу: «сярэбранага люстэрка» і з гідраксідам медзі (II).

Атрыманне альдэгідаў акісленнем першасных спіртоў. Атрыманне этаналю каталітычным акісленнем этылену і гідратацыяй ацэтылену. Прымяненне метаналю і этаналю.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул альдэгідаў.

2. Акісленне альдэгіду (рэакцыя «сярэбранага люстэрка»).

Лабараторныя доследы

4. Акісленне альдэгіду гідраксідам медзі (II).

Па выніках вывучэння тэмы вучні павінны

даваць азначэнні паняццяў:

альдэгіды, альдэгідная група наменклатура ІЮПАК альдэгідаў, трывіяльныя назвы альдэгідаў; рэакцыя полікандэнсацыі;

умець:

называць:

якасныя рэакцыі на альдэгідную групу; агульную формулу альдэгідаў; азначэнне класа альдэгідаў; альдэгіды па наменклатуры ІЮПАК і трывіяльнымі назвамі; вобласці практычнага выкарыстання альдэгідаў; састаў і будову арганічных альдэгідаў, спосабы атрымання альдэгідаў; умовы працякання вывучаных рэакцый; функцыянальную альдэгідную групу; характар з фімянення фзічных уласцівасцей альдэгідаў ў гамалагічным радзе і прычыну іх змянення; вывучаныя хімічныя ўласцівасці альдэгідаў;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да класа альдэгідаў па структурнай формуле; прасторавую будову малекул альдэгідаў; тыпы хімічных рэакцый альдэгідаў; альдэгіды (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

гамолагі; малекулярныя, структурныя, і шкілетныя формулы альдэгідаў; тыпы хімічных рэакцый альдэгідаў злучэнняў па ўраўнаннях і схемах;

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

формулу альдэгіду (малекулярную, структурную); мадэлі малекул фармальдэгіду і этаналя; структурныя формулы альдэгідаў па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць узаемасувязь паміж вуглевадародамі, насычанымі аднаатамнага спіртамі і альдэгіды; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць вывучаныя хімічныя ўласцівасці альдэгідаў, спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

спосабы атрымання фармальдэгіду і этаналю; будова фармальдэгіду і этаналю; фізічныя ўласцівасці альдэгідаў; вывучаныя хімічныя ўласцівасці альдэгідаў;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж складам, будовай і ўласцівасцямі альдэгідаў; узаемасувязь вуглевадародаў, насычаных аднаатамнага спіртоў, альдгідов; прычыны падабенства хімічных уласцівасцяў гамолагаў альдэгідаў; хімічныя ўласцівасці вывучаных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей альдэгідаў; хімічных уласцівасцяў альдэгідаў; спосабаў атрымання альдэгідаў.

Т э м а 5. Карбонавыя кіслоты (14 гадзін)

Карбонавыя кіслоты. Функцыянальная карбаксільная група, яе электронная і прасторавая будова. Азначэнне класа карбонавых кіслот. Класіфікацыя карбонавых кіслот: насычаныя, ненасычаныя, араматычныя; аднаасноўныя, двухасноўныя.

Насычаныя аднаасноўныя карбонавыя кіслоты: састаў, будова; агульная, малекулярныя, структурныя і электронныя формулы. Ізамерыя: структурная (вугляроднага шкілета) і міжкласавая (са складанымі эфірамі).

Мурашыная і воцатная кіслоты як прадстаўнікі насычаных аднаасноўных карбонавых кіслот. Пальміцынавая і стэарынавая кіслоты як прадстаўнікі вышэйшых насычаных карбонавых кіслот.

Намеклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы карбонавых кіслот. Фізічныя ўласцівасці карбонавых кіслот. Уплыў вадароднай сувязі на фізічныя ўласцівасці кіслот.

Хімічныя ўласцівасці: змяненне афарбоўкі індыкатараў; узаемадзеянне з металамі; з асноўнымі, амфатэрнымі аксідамі і гідраксідамі; солямі больш слабых кіслот. Рэакцыя замяшчэння гідраксільнай групы: са спіртамі з утварэннем складаных эфіраў (этэрыфікацыі); аміякам і амінамі з утварэннем амідаў; замяшчэнне атама вадароду ў α-вугляроднага атама на атам галагену. Паняцце аб ангідрыдах карбонавых кіслот. Асаблівасці акіслення мурашынай кіслаты. Атрыманне карбонавых кіслот акісленнем алканаў, першасных спіртоў і альдэгідаў. Атрыманне мурашынай кіслаты з аксіду вугляроду (II).

Ненасычаныя аднаасноўныя карбонавыя кіслоты. Акрылавая і алеінавая кіслоты: састаў, будова. Хімічныя ўласцівасці: далучэнне вадароду, галагенаў па двайной сувязі вуглевадароднай групы.

Прымяненне карбонавых кіслот.

Узаемасувязь паміж вуглевадародамі, спіртамі, альдэгідамі, карбонавымі кіслотамі.

Разліковыя задачы

Вылічэнні па ўраўненнях рэакцый, якія адбываюцца ў растворах.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул карбонавых кіслот.

2. Растваральнасць карбонавых кіслот у вадзе, уздзеянне на індыкатары.

3. Адносіны алеінавай кіслаты да раствору перманганату калію і брому; узаемадзеянне са шчолаччу.

Практычныя работы

2. Атрыманне воцатнай кіслаты і даследаванне яе ўласцівасцей (1 гадзіна).

Па выніках вывучэння тэмы вучні павінны

даваць азначэнні паняццяў:

карбонавыя кіслоты, складаныя эфіры; карбаксільная група; наменклатура ІЮПАК карбонавых кіслот, трывіяльныя назвы карбонавых кіслот;

умець:

называць:

якасныя рэакцыі на карбонавыя кіслоты; агульную формулу карбонавых кіслот; азначэнне класа карбонавых кіслот; карбонавыя кіслоты па наменклатуры ІЮПАК і трывіяльнымі назвамі; вобласці практычнага выкарыстання карбонавых кіслот; састаў і будову карбонавых кіслот, спосабы атрымання карбонавых кіслот; тыпы хімічных рэакцый карбонавых кіслот; умовы працякання вывучаных рэакцый з удзелам карбонавых кіслот; функцыянальную карбаксільныя групу; фізічныя ўласцівасці карбонавых кіслот; вывучаныя хімічныя ўласцівасці карбонавых кіслот;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да класа карбонавых кіслот па структурнай формуле; тыпы вывучаных хімічных рэакцый карбонавых кіслот па ўраўнаннях; карбонавыя кіслоты (эксперыментальна па якаснай рэакцыі);

адрозніваць:

малекулярныя, структурныя, і шкілетныя формулы карбонавых кіслот; тыпы вывучаных хімічных рэакцый карбонавых кіслот па ўраўнаннях і схемах.

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

формулу карбоновой кіслаты (малекулярную, структурную); мадэлі малекул метанавай і этановой кіслот; структурныя формулы карбонавых кіслот па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць узаемасувязь паміж вуглевадародамі, насычанымі аднаатамнага спіртамі, альдэгідамі і карбонавымі кіслотамі; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць вывучаныя хімічныя ўласцівасці карбонавых кіслот, спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

спосабы атрымання метанавай і этановой кіслот; будову метанавай і этановой кіслот; фізічныя ўласцівасці карбонавых кіслот; вывучаныя хімічныя ўласцівасці карбонавых кіслот;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж складам, будовай і ўласцівасцямі карбонавых кіслот; уўзаемасувязь вуглевадародаў, насычаных аднаатамнага спіртоў, альдгидов, карбонавых кіслот; прычыны падабенства хімічных уласцівасцяў гамолагі карбонавых кіслот; хімічныя ўласцівасці вывучаных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей карбонавых кіслот; хімічных уласцівасцяў альдэгідаў; спосабаў атрымання карбонавых кіслот.

праводзіць:

матэматычныя вылічэнні пры рашэнні разліковых задач; хімічны эксперымент.

Тэма 6. Складаныя эфіры. Тлушчы (10 гадзін)

Складаныя эфіры. Азначэнне класа. Агульная формула, састаў, будова, малекулярныя і структурныя формулы. Этылавы эфір воцатнай кіслаты як прадстаўнік складаных эфіраў.

Ізамерыя: структурная і міжкласавая (з карбонавымі кіслотамі). Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы складаных эфіраў. Фізічныя ўласцівасці. Атрыманне складаных эфіраў: рэакцыя этэрыфікацыі, яе абарачальнасць.

Хімічныя ўласцівасці: гідроліз (кіслотны і шчолачны).

Складаныя эфіры ў прыродзе. Прымяненне. Поліэфірныя валокны (лаўсан).

Тлушчы. Састаў і будова трыгліцэрыдаў. Фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: гідроліз, гідрыраванне, акісленне. Біялагічная роля тлушчаў.

Мылы. Сінтэтычныя мыйныя сродкі (СМС).

Дэманстрацыі

1. Атрыманне складанага эфіру воцатнай кіслаты.

2. Узоры складаных эфіраў, поліэфірных валокнаў і палімераў.

Лабараторныя доследы

5. Даследаванне ўласцівасцей тлушчаў (растваральнасць, доказ ненасычанага характару рэшткаў карбонавых кіслот).

6. Параўнанне ўласцівасцей мыла і сінтэтычных мыйных сродкаў.

Па выніках вывучэння тэмы вучні павінны

даваць азначэнні паняццяў:

тлушчы; наменклятура складаных эфіраў і тлушчаў;

умець:

называць:

агульную формулу складаных эфіраў; азначэнне класаў складаных эфіраў і тлушчаў; складаныя эфіры па наменклатуры ІЮПАК, складаныя эфіры і тлушчы трывіяльнымі назвамі; вобласці практычнага выкарыстання складаных эфіраў і тлушчаў; састаў і будову складаных эфіраў і тлушчаў, спосаб атрымання складаных эфіраў і тлушчаў, тыпы вывучаных хімічных рэакцыі складаных эфіраў і тлушчаў; умовы працякання вывучаных рэакцый складаных эфіраў і тлушчаў; фізічныя ўласцівасці складаных эфіраў і тлушчаў; вывучаныя хімічныя ўласцівасці складаных эфіраў і тлушчаў;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да класа складаных эфіраў і тлушчаў па структурнай формуле; тыпы вывучаных хімічных рэакцый складаных эфіраў і тлушчаў па ўраўнаннях;

адрозніваць:

малекулярныя, структурныя, і шкілетныя формулы складаных эфіраў і тлушчаў; тыпы вывучаных хімічных рэакцый складаных эфіраў і тлушчаў па ўраўнаннях і схемах.

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

формулу складанага эфіру (малекулярную, структурную); структурныя формулы складаных эфіраў па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць узаемасувязь паміж насычанымі аднаатамнага спіртамі, карбонавымі кіслотамі, складанымі эфірамі; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць вывучаныя хімічныя ўласцівасці складаных эфіраў, спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

спосабы атрымання складаных эфіраў; фізічныя ўласцівасці складаных эфіраў; вывучаныя хімічныя ўласцівасці складаных эфіраў;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей складаных эфіраў; хімічных уласцівасцяў і спосабаў атрымання складаных эфіраў.

праводзіць:

матэматычныя вылічэнні пры рашэнні разліковых задач; хімічны эксперымент.

Т э м а 7. Вугляводы (18 гадзін)

Вугляводы. Азначэнне класа. Агульная формула, састаў, будова, класіфікацыя вугляводаў.

Монацукрыды. Глюкоза: састаў, будова, функцыянальныя групы, будова малекулы. Лінейная і цыклічныя α- і β-формы малекулы глюкозы. Фруктоза – ізамер глюкозы. Фізічныя ўласцівасці глюкозы і фруктозы.

Прадстаўнікі пентоз – рыбоза і дэзоксірыбоза. Будова і біялагічнае значэнне.

Хімічныя ўласцівасці глюкозы: акісленне да глюконавай кіслаты, аднаўленне да шасціатамнага спірту сарбіту; браджэнне (спіртавое, малочнакіслае, маслянакіслае).

Якасныя рэакцыі на глюкозу: «сярэбранага люстэрка» і з гідраксідам медзі (II). Знаходжанне ў прыродзе, атрыманне і прымяненне глюкозы.

Дыцукрыды. Цукроза як прадстаўнік дыцукрыдаў, яе састаў. Малекулярная формула. Фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: гідроліз. Атрыманне і прымяненне цукрозы.

Прадпрыемствы па вытворчасці цукру ў Рэспубліцы Беларусь.

Поліцукрыды. Крухмал – прыродны поліцукрыд. Састаў і будова макрамалекул крухмалу (рэшткі α-глюкозы). Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці крухмалу: гідроліз (ферментатыўны, кіслотны); рэакцыя з ёдам (якасная рэакцыя на крухмал).

Значэнне вугляводаў як пажыўных рэчываў.

Цэлюлоза – прыродны поліцукрыд. Састаў і будова макрамалекул цэлюлозы (рэшткі β-глюкозы). Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці цэлюлозы: гарэнне, гідроліз, узаемадзеянне з неарганічнымі і арганічнымі кіслотамі з утварэннем складаных эфіраў. Натуральныя і штучныя валокны. Прымяненне цэлюлозы і яе вытворных.

Прадпрыемствы па вытворчасці хімічных валокнаў у Рэспубліцы Беларусь.

Дэманстрацыі

1. Акісленне глюкозы (рэакцыя «сярэбранага люстэрка»).
2. Гідроліз цукрозы.
3. Узоры штучных валокнаў і тканін.

Лабараторныя доследы

7. Узаемадзеянне глюкозы з гідраксідам медзі (II).
8. Вывучэнне фізічных уласцівасцей крухмалу. Узаемадзеянне крухмалу з ёдам.

Практычныя работы

3. Гідроліз крухмалу і цэлюлозы (1 гадзіна).
4. Рашэнне эксперыментальных задач (1 гадзіна).

Па выніках вывучэння тэмы вучні павінны

даваць азначэнні паняццяў:

вугляводы; трывіяльныя назвы вугляводаў;

умець:

называць:

якасныя рэакцыі на вывучаныя вугляводы; агульную формулу вугляводаў; азначэнне класа вугляводаў; вывучаныя вугляводы трывіяльнымі назвамі; вобласці практычнага выкарыстання вывучаных вугляводаў; састаў і будову вывучаных вугляводаў, тыпы вывучаных хімічнай рэакцый вугляводаў; фізічныя ўласцівасці вугляводаў; вывучаныя хімічныя ўласцівасці вугляводаў;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да класа вугляводаў па структурнай формуле; будову малекул вугляводаў; глюкозу (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

малекулярныя і структурныя формулы вугляводаў; тыпы вывучаных хімічных рэакцый вугляводаў па ўраўнаннях і схемах.

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

формулы вывучаных вугляводаў (малекулярныя, структурныя: глюкозы, фруктозы, крухмалу, цэлюлозы); ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць вывучаныя хімічныя ўласцівасці вугляводаў;

характарызаваць:

будова глюкозы, фруктозы, крухмалу, цэлюлозы; фізічныя вугляводаў; вывучаныя хімічныя ўласцівасці вугляводаў;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей вугляводаў; хімічных уласцівасцяў вугляводаў.

Тэма 8. Азотзмяшчальныя арганічныя злучэнні (16 гадзін)

Аміны. Азначэнне класа. Класіфікацыя амінаў. Структурная ізамерыя і наменклатура амінаў.

Першасныя насычаныя аміны, агульная формула. Функцыянальная група першасных амінаў, яе электронная будова. Малекулярныя, структурныя і электронныя формулы. Фізічныя ўласцівасці першасных насычаных амінаў. Хімічныя ўласцівасці: асноўныя ўласцівасці амінаў (рэакцыі з вадой і неарганічнымі кіслотамі), поўнае акісленне.

Анілін як прадстаўнік араматычных амінаў, яго састаў і будова. Малекулярная, структурная і электронная формулы. Фізічныя ўласцівасці. Узаемны ўплыў атамаў у малекуле аніліну. Хімічныя ўласцівасці: рэакцыі аніліну па амінагрупе (з кіслотамі) і араматычным ядры (з бромнай вадой).

Атрыманне насычаных амінаў з галагеналканаў і спіртоў, аніліну з нітрабензолу. Прымяненне аніліну і яго вытворных.

Параўнальная характарыстыка будовы і ўласцівасцей амінаў і аміяку.

Амінакіслоты. Азначэнне класа. Функцыянальныя групы амінакіслот. Класіфікацыя. Ізамерыя і наменклатура: трывіяльная і ІЮПАК.

α-Амінакіслоты. Амінавоцатная кіслата як прадстаўнік амінакіслот, яе састаў, будова малекулы.

Фізічныя ўласцівасці α-амінакіслот. Хімічныя ўласцівасці α-амінакіслот: узаемадзеянне з асновамі і кіслотамі (амфатэрныя ўласцівасці); узаемадзеянне з амінакіслотамі (утварэнне пептыдаў). Пептыдная сувязь. Атрыманне α-амінакіслот з α-галагензамешчаных карбонавых кіслот.

Прымяненне і біялагічная роля амінакіслот. Амінакіслоты заменныя і незаменныя.

Сінтэтычныя поліамідныя валокны: капрон.

Бялкі. Бялкі – прыродныя высокамалекулярныя злучэнні. Састаў і будова бялковых макрамалекул. Першасная, другасная, трацічная і чацвярцічная структуры бялкоў.

Хімічныя ўласцівасці бялкоў: гідроліз, дэнатурацыя, каляровыя рэакцыі.

Прымяненне і біялагічная роля бялкоў.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул метыламіну і этыламіну.
2. Дэнатурацыя бялкоў.

Лабараторныя доследы

9. Уласцівасці бялкоў: дэнатурацыя, каляровыя рэакцыі.

Практычныя работы

5. Рашэнне эксперыментальных задач (1 гадзіна).

Па выніках вывучэння тэмы вучні павінны

даваць азначэнні паняццяў:

аміны, амінакіслоты, бялкі; наменклатура амінаў і амінакіслот; рэакцыя пептызацыі;

умець:

называць:

вывучаныя якасныя рэакцыі на бялкі; агульную формулу першасных амінаў; азначэнні класаў першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў; вывучаныя першасныя аміны α-амінакіслоты; вобласці практычнага выкарыстання α-амінакіслот і бялкоў; склад і будова першасных амінаў, амінакіслот і бялкоў, вывучаныя спосабы атрымання першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў; тыпы хімічных рэакцый першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў; функцыянальныя групы першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў;

фізічныя ўласцівасці рэчываў першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў; хімічныя ўласцівасці першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да першасных амінаў, амінакіслотам і бялкоў па структурнай формуле; тыпы хімічных рэакцый першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў па ўраўнаннях; бялкі (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

структурныя, і шкілетныя формулы першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў; тыпы вывучаных хімічных рэакцый першасных амінаў, α-амінакіслот і бялкоў па ўраўнаннях і схемах.

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

формулы першасных амінаў, α-амінакіслот (структурныя), бялкоў (першасная структура); схемы, якія адлюстроўваюць ўзаемасувязь паміж вуглевадародамі і першаснымі насычанымі амінамі; паміж карбонавымі кіслотамі і α-амінакіслотамі; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць вывучаныя хімічныя ўласцівасці першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот; вывучаныя спосабы атрымання першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот;

характарызаваць:

спосабы атрымання першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот; фізічныя ўласцівасці першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот; вывучаныя хімічныя ўласцівасці першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот; узаемасувязь вуглевадародаў, першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот; прычыны падабенства хімічных уласцівасцяў гамолагаў першасных насычаных амінаў; хімічныя ўласцівасці вывучаных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот; хімічных уласцівасцей першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот; спосабаў атрымання першасных насычаных амінаў і α-амінакіслот.

Тэма 9. Абагульненне і сістэматызацыя ведаў па арганічнай хіміі (6 гадзін)

Разнастайнасць арганічных злучэнняў.

Класіфікацыя арганічных рэчываў.

Узаемасувязь паміж арганічнымі злучэннямі розных класаў.

Класіфікацыя хімічных рэакцый, заканамернасці іх працякання.

Залежнасць уласцівасцей рэчываў ад будовы іх малекул. Асаблівасці будовы і ўласцівасцей высокамалекулярных злучэнняў.

Арганічныя злучэнні вакол нас. Уплыў сінтэтычных арганічных рэчываў на навакольнае асяроддзе.

Практычныя работы

6. Распазнаванне і вывучэнне ўласцівасцей пластмас і валокнаў (1 гадзіна).

Па выніках вывучэння тэмы вучні павінны

даваць азначэнні паняццяў:

класіфікацыя арганічных злучэнняў;

умець:

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да вызначанага класа па структурнай формуле; прасторавую будову малекул; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўнаннях; арганічныя злучэнні (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

гамолагі; ізамеры; малекулярныя, структурныя, і шкілетныя формулы арганічных злучэнняў; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўнаннях і схемах.

ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:

састаўляць:

схемы, якія адлюстроўваюць ўзаемасувязь паміж арганічнымі рэчывамі розных класаў; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць хімічныя ўласцівасці вывучаных рэчываў і спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

спосабы атрымання арганічных рэчываў; будову рэчыва; тып хімічнай сувязі; фізічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; уплыў сінтэтычных арганічных рэчываў на навакольнае асяроддзе;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі арганічных рэчываў; узаемасувязь арганічных злучэнняў розных класаў; прычыны разнастайнасці арганічных рэчываў; прычыны праявы арганічнымі злучэннямі амфатэрных уласцівасцяў; прычыны падабенства хімічных уласцівасцяў арганічных злучэнняў аднаго класа; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей рэчываў, хімічных рэакцый, спосабаў атрымання рэчываў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні п а в і н н ы:

даваць азначэнні паняццям:

атам, малекула, атамная арбіталь, энергетычны ўзровень і энергетычны падузровень, *s-, p-, d*-арбіталі, электронная канфігурацыя атама; кавалентная сувязь: палярная і непалярная, адзінарная і кратная (двайная, трайная), σ-сувязь, π-сувязь, спалучаная, пептыдная, вадародная; даўжыня сувязі, валентны вугал; хімічная формула (агульная класа, малекулярная, структурная, эмпірычная); ізамер, ізамерыя (прасторавая, структурная); арганічная хімія, арганічныя злучэнні (азотзмяшчальныя: аміны, амінакіслоты, бялкі; высокамалекулярныя: натуральныя, штучныя, сінтэтычныя; кіслародзмяшчальныя: альдэгіды, тлушчы, кетоны, карбонавыя кіслоты, складаныя эфіры, спірты, вугляводы, фенолы; вуглевадароды: насычаныя, ненасычаныя, цыклічныя, араматычныя); гамалогія (гамолаг, гамалагічная рознасць); група: альдэгідная, алкільная, амінагрупа, гідраксільная, кетагрупа, карбаксільная, нітрагрупа, пептыдная, вуглевадародная; малекула: састаў, будова (хімічная, электронная і прасторавая); наменклатура ІЮПАК, трывіяльныя назвы арганічных злучэнняў; пептыд; палімер, манамер, ступень полімерызацыі, структурнае звяно; хімічныя рэакцыі арганічных злучэнняў (браджэння, галагенавання, гідрагалагенавання, гідратацыі, гідрыравання, гідролізу, дэгідратацыі, дэгідрыравання, дэгідрагалагенавання, замяшчэння, ізамерызацыі, каталітычныя, якасныя, нітравання, акіслення, адшчаплення, полімерызацыі, полікандэнсацыі, далучэння, радыкальныя, фотахімічныя, этэрыфікацыі).

Вучні павінны ў м е ц ь:

называць:

асноўныя палажэнні тэорыі хімічнай будовы арганічных рэчываў, віды гібрыдызацыі атамных арбіталей; правіла Маркоўнікава; алкільныя групы; якасныя рэакцыі на вывучаныя арганічныя рэчывы; агульныя формулы злучэнняў розных класаў; азначэнні класаў арганічных злучэнняў; арганічныя злучэнні па наменклатуры ІЮПАК і трывіяльных назвах; вобласці практычнага выкарыстання арганічных рэчываў і вырабаў з іх; прыметы класіфікацыі хімічных рэакцый; састаў і будову арганічных злучэнняў розных класаў, спосабы атрымання арганічных рэчываў розных класаў, валокнаў, пластмас, каўчукоў; від ізамерыі; тып хімічнай рэакцыі; умовы працякання рэакцый; фізічныя ўласцівасці арганічных рэчываў; функцыянальныя групы; характар змянення фізічных уласцівасцей рэчываў у гамалагічным радзе і прычыну іх змянення; хімічныя ўласцівасці індывідуальнага рэчыва пэўнага класа;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да пэўнага класа па структурнай формуле; прасторавую будову малекул з пазіцыі гібрыдызацыі атамных арбіталей; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўненнях; арганічныя злучэнні (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

гамолагі; ізамеры; малекулярныя, структурныя, шкілетныя і электронныя формулы арганічных злучэнняў; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўненнях і схемах.

Вучні п а в і н н ы ажыццяўляць наступныя спосабы дзейнасці:

састаўляць:

формулы электронных канфігурацый і схемы запаўнення электронамі атамных арбіталей атамаў элементаў першых трох перыядаў; формулу арганічнага злучэння (малекулярную, структурную, шкілетную, скарочаную структурную, электронную); мадэлі малекул; структурныя формулы арганічных злучэнняў па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць узаемасувязь паміж арганічнымі рэчывамі розных класаў; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць хімічныя ўласцівасці вывучаных рэчываў і спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

асаблівасці электроннай будовы атама вугляроду; спосабы атрымання арганічных рэчываў; будову рэчываў; тып хімічнай сувязі; фізічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; утварэнне адзінарнай, двайной, трайной хімічнай сувязі;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі арганічных рэчываў; узаемасувязь арганічных злучэнняў розных класаў; прычыны разнастайнасці арганічных рэчываў; прычыны ўзаемнага ўплыву атамаў у малекулах арганічных злучэнняў; прычыны праяўлення арганічнымі злучэннямі амфатэрных уласцівасцей; прычыны падабенства хімічных уласцівасцей арганічных злучэнняў аднаго класа; прасторавую будову малекул арганічных злучэнняў; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

аналізаваць:

вынікі лабараторных доследаў, практычных работ; вучэбную інфармацыю;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей рэчываў, хімічных рэакцый, спосабаў атрымання рэчываў; правілы бяспечных паводзін пры абыходжанні з рэчывамі, хімічным посудам, лабараторным абсталяваннем і прыборамі;

абыходзіцца:

з арганічнымі рэчывамі, хімічным посудам, лабараторным абсталяваннем, прыборамі;

праводзіць:

матэматычныя вылічэнні пры рашэнні разліковых задач; хімічны эксперымент; мадэліраванне малекул арганічных злучэнняў;

карыстацца:

падручнікам; інструкцыяй па правілах бяспечных паводзін у хімічным кабінеце; інструкцыяй пры выкананні хімічнага эксперымента.

Колькасць пісьмовых кантрольных работ – 6 тэматычных работ (6 гадзін).

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова»
для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Адукацыйнае значэнне прадмета «Беларуская мова» на Ш ступені агульнай сярэдняй адукацыі акрэсліваецца функцыямі мовы ў грамадстве. Мова выступае асноўным сродкам чалавечых зносін і пазнання рэчаіснасці. Карыстаючыся мовай, асоба засвойвае формы чалавечых узаемаадносін, спазнае маральныя і культурныя каштоўнасці свайго народа. Забяспечваючы моўную адукацыю навучэнцаў, установа адукацыі павінна ствараць умовы для іх інтэлектуальнага, эмацыянальнага і духоўнага развіцця, рыхтаваць да прафесійнай дзейнасці і актыўнага грамадскага жыцця.

Навучанне беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі **мае на мэце** фарміраванне асобы вучня як свядомага носьбіта мовы, развіццё яго інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Вучань асэнсоўвае мову як уласную, нацыянальную і агульначалавечую каштоўнасць і павінен мець такі ўзровень падрыхтоўкі, які забяспечыць паўнавартаснае выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах яе функцыянавання.

Задачы навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі на базавым узроўні наступныя:

сістэматызацыя і паглыбленне ведаў пра мову і маўленне, заканамернасці і правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормы беларускай літаратурнай мовы, удасканаленне культуры вуснага і пісьмовага маўлення (*моўная і маўленчая кампетэнцыі*);

развіццё звязнага маўлення – умення ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні, публічныя выступленні розных тыпаў, стыляў і жанраў (*камунікатыўна-рытарычная кампетэнцыя*);

авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры, як сродкам спасціжэння айчыннай і сусветнай культур; удасканаленне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін; сацыякультурнае развіццё вучняў на аснове засваення звычаяў, правіл, норм, якія рэгулююць узаемадзеянне людзей і іх паводзіны ў грамадстве, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў (*лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі*).

Змест навучання беларускай мове ў X класе ўключае наступныя раздзелы: «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства», «Маўленне», «Тэкст», «Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення», «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення», «Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Культура маўлення», «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення»; у XI класе: «Агульныя звесткі аб мове», «Маўленне», «Стылістыка», «Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення».

Асноўнай задачай навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (базавы ўзровень) становіцца практычнае засваенне ўсіх асноўных норм беларускай мовы (арфаэпічных, акцэнталагічных, лексічных, фразеалагічных, словаўтваральных, марфалагічных, сінтаксічных, арфаграфічных і пунктуацыйных). Валоданне нормамі сучаснай беларускай мовы павінна стаць арганічнай часткай агульнай маўленчай культуры, асноўным паказчыкам якой з'яўляецца правільнае маўленне.

Рэалізацыя гэтай задачы адбываецца праз шырокае выкарыстанне актыўных метадаў навучання (лекцыі, лекцыі-гутаркі, практыкумы, сюжэтна-тэматычныя ўрокі, прымяненне лінгвістычнага эксперымента); самастойную работу вучняў па аналізе тэкстаў; падрыхтоўку рэфератаў, паведамленняў, дакладаў, публічных выступленняў розных відаў; працу з даведачнай літаратурай; выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Асноўная частка праграмы складаецца з трох кампанентаў: ведавага (тэарэтычны матэрыял), аперацыйнага (спосабы дзейнасці) і практычнага (уменні і навыкі), што ў сукупнасці і складае змест навучання.

(35 гадзін на год, 1 гадзіна на тыдзень;
з іх 9 гадзін – на пісьмовыя работы)

Агульныя звесткі аб мове
(1 гадзіна)

Маўленне
(2 гадзіны)

Асноўныя якасці культуры маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце і выразнасць маўлення.

Правілы маўленчых паводзін. Маўленчы этыкет. Падрыхтоўка віншавальнага прывітання.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення; правілы маўленчых паводзін у пэўных сітуацыях маўлення, формулы маўленчага этыкету.

Ужываць згодна з маўленчай сітуацыяй і зместам камунікацыі моўныя сродкі для наладжвання неканфліктных, добразычлівых і паспяховых узаемаадносін; захоўваць і ўдасканальваць культуру маўленчых паводзін; дарэчы карыстацца нацыянальным маўленчым этыкетам.

Стылістыка
(3 гадзіны, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Функцыянальныя стылі маўлення (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы), стылеўтваральныя моўныя сродкі.

Кантрольны дыктант.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць асноўны прыметы, па якіх характарызуецца кожны стыль маўлення.

Распазнаваць тэксты розных стыляў маўлення; абгрунтоўваць прыналежнасць тэкстаў да пэўнага стылю, выяўляць асаблівасці ўжывання моўных сродкаў у тэкстах

розных стыляў і жанраў; удасканальваць тэксты рознай стылістычнай прыналежнасці з мэтай захавання стылявога адзінства.

Ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення

(28 гадзін, з іх 8 гадзін – на пісьмовыя работы)

Словазлучэнне; віды, спосабы і сродкі сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні.

Сінтаксічныя нормы: асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

Пісьмовая творчая работа.

Сказ, асноўныя функцыі сказа. Сінтаксічныя прыметы двухсастаўных і аднасастаўных сказаў, няпоўных сказаў, сказаў з аднароднымі і адасобленымі членамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, звароткамі; ужыванне, знакі прыпынку.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Сінтаксічныя нормы: ужыванне аднародных і адасобленых членаў сказа, парадак слоў, сувязь дзейніка і выказніка ў сказе, правілы ўжывання дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў.

Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі, адасобленымі членамі, параўнальнымі зваротамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, звароткамі.

Кантрольны дыктант.

Сінтаксічныя прыметы складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказаў і сказаў з рознымі відамі сувязі частак; ужыванне, знакі прыпынку.

Пісьмовая творчая работа.

Канструкцыі з чужой мовай, ужыванне, знакі прыпынку.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Сінтаксічныя нормы: ужыванне складаных сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў складаных сказах, канструкцыях з чужой мовай.

Кантрольная тэставая работа.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць адметныя асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

Вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы сказаў розных відаў; ведаць пунктуацыйныя нормы пры пісьмовым афармленні сказаў; вызначаць сэнсава-стылістычную ролю словазлучэнняў і сказаў рознай будовы і прызначэння; абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Захоўваць літаратурныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні. Знаходзіць і выпраўляць маўленчыя недахопы і парушэнні норм літаратурнай мовы ў чужым і ва ўласным маўленні, устанаўлівасць прычыны парушэння нормаў.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага

(1 гадзіна)

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура»
для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацаваны ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Вучэбныя праграмы грунтуюцца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, арыентуюць на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, эстэтычны і творчы характар навучання беларускай літаратуры, улічваюць ўзростава-інтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

Беларуская літаратура – дысцыпліна культуралагічнага цыкла, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі – сродак эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных норм і вартасцей. Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Вывучэнне літаратуры дапамагае вучням убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры – гэта найперш працэс жыццеспазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Змест літаратурнай адукацыі ў X–XI класах пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе працягнуць знаёмства вучняў, распачатае ў IX класе, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і спрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання ў вучняў інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў

праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. На III ступені навучання паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

Навучанне літаратуры ў X–XI класах можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях. Базавы ўзровень прадугледжвае знаёмства вучняў з агульнымі тэарэтычнымі асновамі курса, асноўнымі заканамернасцямі і асаблівасцямі развіцця беларускай літаратуры ў пэўны гістарычны перыяд, асэнсаванне знакавых твораў найбольш яркіх прадстаўнікоў мастацтва слова.

На заключным этапе літаратурнай адукацыі актуалізуюцца, паглыбляюцца і сістэматызуюцца веды і ўменні, атрыманыя ў папярэдніх класах, што вядзе да сінтэтычнага асэнсавання літаратуры і яе канкрэтных з'яў на светапоглядным, філасофскім, культуралагічным узроўнях, да ўсведамлення вучнем сябе як асобы і маральнага самавызначэння. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных формаў урока, шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г. д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад, пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем да ўсіх метадаў навучання з'яўляецца зарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў. Дзеля рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу да навучання літаратуры вучням з аналітычным тыпам мыслення мэтазгодна часцей прапаноўваць заданні творчага характару; вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей даваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэктаваць першапачатковае суб'ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і інш.

З мэтай развіцця пазнавальных інтарэсаў, выхавання мастацка-эстэтычнага густу і фарміравання цэласнага светапогляду вучняў пры навучанні беларускай літаратуры мэтазгодна прадугледжваць рэалізацыю міжпрадметных сувязей перш за ўсё з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Беларуская мова», «Руская літаратура», «Гісторыя Беларусі». Міжпрадметныя сувязі актуалізуюцца на ўсіх этапах навучання, іх рэалізацыя ў адукацыйным працэсе ўзбагачае дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (жывапіс, музыка, фотамастацтва, кіно, тэатр і інш.), эфектыўна ўздзейнічае на маральна-этычнае, інтэлектуальнае, эмацыянальнае, эстэтычнае развіццё асобы.

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з вучэбным дапаможнікам – усе гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейнасны характар, дыялагічнасць.

У адукацыйнай практыцы могуць выкарыстоўвацца як традыцыйныя, так і электронныя сродкі навучання, якія павінны быць скіраваны на дасягненне мэт і задач літаратурнай адукацыі.

Літаратуры ў працэсе адукацыі належыць асаблівая культуратворчая роля: яна здольная пераўтвараць унутраны свет асобы і ўплываць на духоўнае ўзбагачэнне жыцця, рабіць яго па-сапраўднаму цікавым, змястоўным, насычаным.3 гэтай прычыны неабходна імкнуцца ўключыць вучняў у працэс пазакласнай работы і выхавання.

Факультатыўныя заняткі, праца літаратурных гурткоў, сістэматычны выпуск насценных і радыёгазет, бюлетэняў, часопісаў і альбомаў; падрыхтоўка спецыяльных літаратурных стэндаў, тэматычных выставак, аглядаў сучаснай літаратуры; правядзенне літаратурных ранішнікаў, вечароў, віктарын, алімпіяд і святаў, сустрэч з пісьменнікамі, дзеячамі культуры і мастацтва – усё гэта спрыяе стварэнню ў класе атмасферы творчасці, духоўнасці, павагі да кнігі, да мастацкага слова.

Для арганізацыі факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры ў X–XI класах распрацавана адпаведнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне: вучэбныя праграмы, дапаможнікі для вучняў і настаўнікаў.

На вывучэнне літаратуры ў X–XI класах на базавым ўзроўні адводзіцца 53 гадзіны, з іх 48 гадзін – на вывучэнне твораў, 1 гадзіна – на ўрок па творах для дадатковага чытання, 4 гадзіны – на творчыя работы.

Прапанаваныя праграмай анатацыі да аглядавых і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік засяроджвае ўвагу на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, вывучэнне якіх ён лічыць больш дарэчным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе[16].

задавальненне адукацыйных запытаў асобы з улікам яе індывідуальна-ўзроставых асаблівасцей і магчымасцей праз максімальнае набліжэнне зместу вучэбнага прадмета да патрэб і інтарэсаў вучняў; развіццё ўменняў самааналізу, самаацэнкі; заахвочванне да самаўдасканалення, павышэння агульнакультурнага ўзроўню;

развіццё маральнай, палітычнай, прававой, эканамічнай культуры асобы ў адзінстве кампанентаў: веды, паводзіны і эмацыянальна-каштоўнаснае стаўленне; выхаванне грамадзянскасці, сацыяльнай адказнасці, прававой самасвядомасці, прыхільнасці да каштоўнасцей, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Месца вучэбнага прадмета ў вучэбным плане

На вывучэнне вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў IX–XI класах на базавым узроўні адводзіцца па 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень).

Пры планаванні адукацыйнага працэсу настаўнік можа змяняць паслядоўнасць вывучэння асобных тэм унутры раздзела.

Асабасныя, метапрадметныя і прадметныя вынікі засваення зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства».

Асабаснымі вынікамі вучняў пры засваенні зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» з’яўляюцца:

каштоўнасныя арыенціры, заснаваныя на стаўленні да жыцця чалавека, яго правоў і свабодаў як найвышэйшай каштоўнасці; на ідэях патрыятызму, любові і павагі да

Айчыны; на імкненні да ўмацавання суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці беларускай дзяржавы; на ўсведамленні сваёй адказнасці за будучыню краіны;

гатоўнасць і здольнасць да адукацыі, у тым ліку да самаадукацыі на працягу ўсяго жыцця, як умовы паспяховай дзейнасці ў розных сферах жыцця грамадства;

усвядомлены выбар будучай прафесіі і магчымасцей рэалізацыі ўласных жыццёвых планаў, стаўленне да прафесійнай дзейнасці як магчымасці ўдзелу ў вырашэнні асабістых, грамадскіх, дзяржаўных, агульнанацыянальных праблем;

гатоўнасць паважліва ставіцца да іншых людзей, весці дыялог, дасягаць ўзаемаразумення і знаходзіць агульныя мэты, працаваць разам дзеля іх дасягнення;

адказнае стаўленне да стварэння сям'і на аснове ўсвядомленага прыняцця каштоўнасцей сямейнага жыцця.

Метапрадметныя вынікі вывучэння грамадазнаўства праяўляюцца ва ўменнях вучняў:

свядома арганізоўваць сваю пазнавальную дзейнасць;

прадуктыўна камунікаваць і ўзаемадзейнічаць з равеснікамі і дарослымі ў адукацыйнай, грамадска карыснай, вучэбна-даследчай, праектнай дзейнасці;

атрымліваць з разнастайных крыніц і крытычна асэнсоўваць інфармацыю, сістэматызаваць, аналізаваць, інтэрпрэтаваць атрыманыя даныя; выкарыстоўваць іх пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач;

адрозніваць факты, аргументы, ацэначныя меркаванні, аддзяляць асноўную інфармацыю ад другараднай, перадаваць змест інфармацыі адэкватна пастаўленай мэце (сціснута, поўна, выбарачна); здабываць з крыніц, створаных у розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, графік, дыяграма і інш.), інфармацыю, пераўтвараць яе і выкарыстоўваць пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач (падрыхтоўкі паведамленняў, эсэ, канкрэтызацыі тэарэтычных высноў прыкладамі і інш.);

выкарыстоўваць сродкі інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій у вырашэнні кагнітыўных, камунікатыўных і арганізацыйных задач з захаваннем прававых і этычных нормаў, нормаў інфармацыйнай бяспекі;

выкарыстоўваць розныя віды публічных выступленняў (выказванне, маналог, дыскусія); прытрымлівацца этычных нормаў і правілаў удзелу ў дыялогу;

ажыццяўляць пазнавальную рэфлексію – усведамляць: вучэбныя дзеянні, якія выконваюцца, працэсы мыслення і іх вынікі, межы сваіх ведаў і недасведчанасці, новыя пазнавальныя задачы і сродкі іх дасягнення.

Прадметныя вынікі засваення вучнямі зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» на базавым узроўні арыентаваны на забеспячэнне пераважна агульнаадукацыйнай і агульнакультурнай падрыхтоўкі.

Прадметнымі вынікамі вучняў **IX** класа, якія фарміруюцца пры засваенні зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства», з'яўляюцца:

уяўленні аб грамадскай сутнасці чалавека, асобасных характарыстыках чалавека, узаемасувязі чалавека і грамадства, ролі культуры ў жыцці чалавека і грамадства, духоўна-маральных каштоўнасцях, міжасобасных зносінах;

уменні характарызаваць, тлумачыць вывучаныя з'явы і працэсы, іх прычыны, узаемасувязь; выкарыстоўваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры характарыстыцы вывучаемых з'яў і працэсаў;

здольнасць і гатоўнасць прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Прадметныя вынікі засваення вучнямі X–XI класаў зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» вызначаюцца на базавым і павышаным узроўнях. Прадметнымі вынікамі вучняў X класа, якія фарміруюцца пры засваенні зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» на базавым узроўні, з'яўляюцца:

уяўленні аб грамадстве як цэласнай сістэме, што развіваецца ў адзінстве і ўзаемадзеянні асноўных сфер і інстытутаў;

уяўленні аб асноўных тэндэнцыях развіцця сучаснага грамадства;

уменне тлумачыць вывучаныя сацыяльныя з'явы, іх прычыны, узаемасувязь;

здольнасць і гатоўнасць прымяняць засвоеныя веды і ўменні для вырашэння пазнавальных і практычных праблем.

Прадметнымі вынікамі навучэнцаў XI класа, якія фарміруюцца пры засваенні зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» на базавым узроўні, з'яўляюцца:

веданне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, асноў права Рэспублікі Беларусь, прававой сістэмы, унутранай і знешняй палітыкі;

уяўленні аб асноўных напрамках палітыкі беларускай дзяржавы, тэндэнцыях і перспектывах развіцця сучаснага беларускага грамадства, месцы і ролі Беларусі ў цывілізацыйным працэсе;

уменні характарызаваць, тлумачыць вывучаныя з'явы і працэсы; выкарыстоўваць раней засвоеныя веды, у тым ліку па іншых вучэбных прадметах, пры характарыстыцы вывучаемых з'яў і працэсаў;

здольнасць і гатоўнасць прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Запланаваныя вынікі засваення вучнямі зместу адукацыі па вучэбным прадмеце з'яўляюцца крытэрыяльна асновай для ацэнкі вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Варта мець на ўвазе, што асобасныя вынікі засваення зместу вучэбнай праграмы, звязаныя з асобаснымі рысамі і светапоглядnымі ўстаноўкамі вучняў, вызначаныя як прагназуемыя і не падлягаюць прамежкавай і выніковай праверцы.

Рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання.

Дасягненне пастаўленых мэт, паспяховае засваенне зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» прадугледжвае выкарыстанне разнастайных сродкаў і метадаў навучання.

Рэкамендуецца выкарыстоўваць метады, якія дапамагаюць раскрыць і канкрэтызаваць тэарэтычны матэрыял, ілюстраваць яго прыкладамі з сацыяльнага, эканамічнага, палітычнага і духоўнага жыцця беларускага грамадства; звязаць вывучаемы матэрыял з асабістым сацыяльным вопытам, уласнымі назіраннямі вучняў і іх уяўленнямі аб сацыяльным жыцці і паводзінах людзей у грамадстве.

Рэалізацыі практыка арыентаванага падыходу да навучання будзе спрыяць правядзенне ўрокаў, на якіх рэкамендуецца арганізаваць рашэнне вучэбна-пазнавальных і практычных задач з выкарыстаннем розных крыніц сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі. Акрамя вучэбнага дапаможніка па грамадазнаўстве прапануецца выкарыстоўваць нарматыўныя прававыя акты беларускай дзяржавы, навукова-папулярную і публіцыстычную літаратуру, матэрыялы электронных і друкаваных СМІ.

Асаблівай увагі патрабуе выкарыстанне ў адукацыйным працэсе інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і праектных методык, пры гэтым важна разумець іх адукацыйныя магчымасці і выразна ўсведамляць межы іх прымянення, умець арганічна спалучаць гэтыя тэхналогіі з традыцыйнымі методыкамі.

Пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» неабходна абапірацца на веды вучняў па іншых вучэбных прадметах: «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя», «Геаграфія», «Беларуская літаратура», «Руская літаратура» і інш. Рэкамендуецца канкрэтызаваць вывучаемыя сацыяльныя аб'екты гістарычнымі фактамі, літаратурнымі вобразамі, статыстычнымі данымі і г. д. Рэалізацыі міжпрадметных сувязей будуць садзейнічаць таксама арганізацыя праектнай дзейнасці вучняў, рашэнне вучэбна-пазнавальных і практычных задач, якія патрабуюць прымянення ведаў па розных вучэбных прадметах.

Вучэбна-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу.

У працэсе навучання грамадазнаўству рэкамендуецца выкарыстоўваць увесь пералік кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу па вучэбным прадмеце, рэкамендаваных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У вучэбным кабінеце грамадазнаўства мэтазгодна мець тэксты Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, найважнейшых міжнародных прававых дакументаў, заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь; тэматычныя табліцы і іншыя сродкі нагляднасці.

У адукацыйным працэсе рэкамендуецца выкарыстоўваць таксама створаныя ў Нацыянальным інстытуце адукацыі электронныя адукацыйныя рэсурсы па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства» (гл. adu.by/ Электроннае навучанне).

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
Грамадазнаўства XI клас
БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАВА

(35 гадзін, рэзервовы час – 1 гадзіна)

Уводзіны (1 гадзіна)

Змест і асаблівасці вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў XI класе. Асноўныя крыніцы інфармацыі пра сучаснае беларускае грамадства і дзяржаву.

Раздзел 1 Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (7 гадзін)

Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя і яе месца ў нацыянальнай прававой сістэме. Рэспубліка Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Суверэнітэт.

Асоба, грамадства, дзяржава. Правы і свабоды чалавека ў Рэспубліцы Беларусь. Абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Выбары і рэферэндумы. Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь. Рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь.

Выбарчы працэс у Рэспубліцы Беларусь. Асноўныя прынцыпы і стадыі выбарчага працэсу. Умовы рэалізацыі правоў выбіраць і быць выбраным у Рэспубліцы Беларусь.

Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Урад – Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Судовая ўлада. Мясцовае кіраванне і самакіраванне.

Мясцовае кіраванне і самакіраванне. Органы мясцовага кіравання і самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь. Кампетэнцыя, парадак стварэння і дзейнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

Падагульненне па раздзеле 1.

ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ:

У выніку засваення зместу раздзела «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь» вучні XI класа будуць

ведаць:

азначэнні паняццяў выбары, грамадзянін, канстытуцыя, мясцовае кіраванне, мясцовае самакіраванне, Нацыянальны сход, Палата прадстаўнікоў, Прэзідэнт, рэферэндум, Савет Рэспублікі, Савет Міністраў, суверэнітэт, судовая ўлада;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык і называць канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь; канстытуцыйныя абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь;

характарызаваць: месца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у нацыянальнай прававой сістэме; змены, унесеныя ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь па выніках рэспубліканскіх рэферэндумаў 1995, 1996, 2004 гадоў; умовы рэалізацыі правоў выбіраць і быць выбраным у Рэспубліцы Беларусь; прынцыпы і асноўныя стадыі выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь; парадак фарміравання і паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь; парадак фарміравання і паўнамоцтвы органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

тлумачыць: сутнасць характарыстык беларускай дзяржавы (суверэнная, унітарная, дэмакратычная, сацыяльная, прававая); узаемасувязь правоў і абавязкаў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

фармуляваць і аргументаваць свой пункт гледжання па вывучаемых пытаннях;

прымяняць:

выпрацоўваць мадэль правамерных паводзін, заснаваных на павазе да закона і правапарадку, прыхільнасці да каштоўнасцей, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Раздзел 2. Асновы права Рэспублікі Беларусь (8 гадзін)

Асновы грамадзянскага права. Сфера прымянення грамадзянскага права. Суб'екты грамадзянска-прававых адносін. Грамадзянская праваздольнасць і дзеяздольнасць.

Асновы працоўнага права. Прававы механізм працаўладкавання. Парадак спынення працоўнага дагавора. Правы і абавязкі наймальніка і работніка.

Асновы сямейнага права. Заключэнне і скасаванне шлюбу. Правы і абавязкі мужа і жонкі. Правы і абавязкі бацькоў і дзяцей.

Дагавор як спосаб рэгулявання адносін. Маёмасныя адносіны. Аўтарскія правы. Працоўныя адносіны. Сямейныя адносіны.

Асновы адміністрацыйнага права. Сфера прымянення адміністрацыйнага права. Суб'екты адміністрацыйна-прававых адносін. Правамерныя паводзіны і адміністрацыйнае правапарушэнне (правіннасць).

Асновы крымінальнага права. Сфера прымянення крымінальнага права. Пакаранне, яго мэта і віды. Абставіны, якія выключаюць і якія абцяжарваюць крымінальную адказнасць.

Праваахоўныя органы ў Рэспубліцы Беларусь, іх задачы і паўнамоцтвы: суд, пракуратура, органы ўнутраных спраў, органы юстыцыі, органы дзяржаўнага кантролю, органы дзяржаўнай бяспекі.

Падагульненне па раздзеле 2.

ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ:

У выніку засваення зместу раздзела «Асновы права Рэспублікі Беларусь» вучні XI класа будуць

ведаць:

азначэнні паняццяў: адміністрацыйнае права, грамадзянскае права, дзеяздольнасць, пакаранне, права, правапарушэнне, праваздольнасць, сямейнае права, працоўнае права, працоўны дагавор, крымінальнае права;

умець:

характарызаваць: нормы працоўнага права, якія рэгулююць працоўны час, час водпуску, аплату працы работніка; прававы механізм працаўладкавання і спынення працоўнага дагавора; правы і абавязкі работнікаў і наймальнікаў; прававы механізм заключэння і скасавання шлюбу; правы і абавязкі бацькоў і дзяцей; прыметы адміністрацыйнага правапарушэння; абставіны, якія абцяжарваюць і выключаюць крымінальную адказнасць; асноўныя задачы праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь;

фармуляваць і аргументаваць свой пункт гледжання па вывучаемых пытаннях;

прымяняць:

засвоеныя веды для вызначэння праваахоўнага органа, у які трэба звярнуцца для вырашэння той ці іншай прававой сітуацыі;

выпрацоўваць мадэль правамерных паводзін, заснаваных на павазе да закона і правапарадку.

Раздзел 3. Асноўныя напрамкі палітыкі беларускай дзяржавы (8 гадзін)

Сацыяльны партрэт Беларусі. Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва. Дэмаграфічная палітыка беларускай дзяржавы.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Якасць, узровень жыцця і сацыяльная абарона насельніцтва.

Інавацыйнае развіццё краіны. Навуковы патэнцыял краіны. Асноўныя напрамкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Высокія тэхналогіі.

Асноўныя мэты і задачы развіцця рэгіёнаў. Рэгіянальная палітыка дзяржавы. Развіццё малых і сярэдніх гарадоў. Мэты і рэалізацыя дзяржаўных праграм ўстойлівага развіцця вёскі.

Нацыянальная і канфесійная палітыка. Нацыянальная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь. Свабода сумлення і веравызнання ў Рэспубліцы Беларусь. Беларусь – краіна міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды.

Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі. Палітыка беларускай дзяржавы ў галіне культуры. Развіццё аховы здароўя. Фізічная культура і спорт.

Маладзёжная палітыка. Прыярытэты маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы: Прафарыентацыя, адукацыя, працаўладкаванне моладзі. Дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі.

Падагульненне па раздзеле 3.

ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ:

У выніку засваення зместу раздзела «Асноўныя напрамкі палітыкі беларускай дзяржавы» вучні XI класа будуць

ведаць:

азначэнні асноўных паняццяў: дэмаграфічная бяспека, інавацыя, свабода сумлення, свабода веравызнанняў, сацыяльная абарона, сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка, сацыяльныя стандарты;

умець:

характарызаваць: асноўныя напрамкі дэмаграфічнай, рэгіянальнай, нацыянальнай, канфесійнай, маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы; палітыкі ў сферы культуры і аховы здароўя; прыярытэтныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе (у XXI стагоддзі); асноўныя напрамкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь; дасягнення сацыяльнага, эканамічнага, навуковага, культурнага развіцця Беларусі ў XXI стагоддзі;

фармуляваць і аргументаваць свой пункт гледжання па вывучаемых пытаннях;

прымяняць:

статыстычныя даныя для характарыстыкі развіцця сучаснага беларускага грамадства, унутранай палітыкі беларускай дзяржавы;

раней засвоеныя веды, у тым ліку па іншых вучэбных прадметах, пры характарыстыцы ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы.

Раздзел 4. Беларусь у сучасным свеце (8 гадзін)

Аблічча сучаснага свету. Фактары разнастайнасці сучаснага свету. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь.

Сістэма міжнародных адносін. Рэспубліка Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін. Нацыянальная бяспека і нацыянальныя інтарэсы беларускай дзяржавы.

Узаемадзеянне краін і народаў ва ўмовах глабалізацыі. Паняцце глабалізацыі. Беларусь у сістэме глабалізацыйных працэсаў.

Удзел Рэспублікі Беларусь у вырашэнні глабальных праблем. Роля Беларусі ў рэалізацыі мэт ўстойлівага развіцця. Удзел Беларусі ў рэалізацыі міжнародных праектаў.

Гарызонты інфармацыйнага грамадства. Паняцце інфармацыйнага грамадства. Сацыяльная, эканамічная, палітычная і духоўная сферы жыцця інфармацыйнага грамадства.

Перспектывы развіцця Беларусі ва ўмовах інфармацыйнага грамадства. Забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі краіны. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій з мэтай умацавання эканомікі, павышэння ўзроўню жыцця людзей.

Будучыня чалавецтва. Сучасныя цывілізацыі і перспектывы іх развіцця. Футуралагічнага прагнозы. Задачы гуманізацыі грамадскага жыцця

Падагульненне па раздзеле 4.

ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ:

У выніку засваення зместу раздзела «Беларусь у сучасным свеце» вучні XI класа будуць

ведаць:

азначэнні асноўных паняццяў: глабалізацыя, геапалітыка, інфармацыйнае грамадства, інфармацыйная бяспека, міжнародныя адносіны, нацыянальная бяспека, цывілізацыя;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык і называць: міждзяржаўныя аб'яднанні, у якія ўваходзіць Рэспубліка Беларусь;

канкрэтызаваць прыкладамі вывады аб шматвектарнай знешняй палітыцы беларускай дзяржавы;

характарызаваць: геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь; прынцыпы і напрамкі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь; нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь; перспектывы развіцця Беларусі ва ўмовах інфармацыйнага грамадства на прыкладзе розных сфер грамадства; дасягненні суверэннай Беларусі;

тлумачыць: супярэчлівы характар глабалізацыйных працэсаў і месца ў іх Беларусі;

фармуляваць і аргументаваць свой пункт гледжання па вывучаемых пытаннях;

прымяняць:

статыстычныя даныя для характарыстыкі знешняй палітыкі беларускай дзяржавы;

раней засвоеныя веды, у тым ліку па іншых вучэбных прадметах пры характарыстыцы месца і ролі Беларусі ў сучасным свеце.

Выніковае падагульненне (1 г).

Заключэнне (1 г).

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 93

Учебная программа по учебному предмету
«География»
для XI класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания
(базовый уровень)

ГЕОГРАФИЯ

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Цель учебного предмета «География» – формировать у учащихся географическую культуру и систему знаний о природных и социально-экономических процессах в мире, отдельных регионах, странах, Республике Беларусь; научить их применять географические знания в повседневной жизни; развивать компетенции учащихся: учебно-познавательную, приоритета географической информации, ценностно-смысловую, географических действий, пространственного ориентирования и коммуникативную.

Задачи обучения учебному предмету «География»:

– формирование у учащихся знаний о географической оболочке Земли, территориальной организации экономической жизни общества, взаимодействии между человеческим обществом и природной средой (учебно-познавательная компетенция);

– формирование умений характеризовать физико-географические особенности природы материков и океанов, выделять общие и отличительные территориальные особенности, экономико-географические показатели отдельных стран, особенности географического и геополитического положения территорий, стратегии устойчивого развития человечества и Республики Беларусь (компетенция приоритета географической информации);

– развитие способностей учащихся видеть и понимать географическую картину мира, осознавать свою роль и предназначение в мире, уметь выбирать целевые и смысловые установки для своих действий и поступков, принимать решения (ценностно-смысловая компетенция);

– формирование умений работать с картографическими источниками информации: овладение практическими приемами работы с картой, осмысление содержания карты, развитие пространственного представления; использование информации о географических процессах и явлениях (графической, статистической, справочной, краеведческой) и осуществление пространственно-территориальной привязки (компетенция пространственного ориентирования);

– развитие способностей учащихся к коммуникативной деятельности: умения географически аргументировать результаты наблюдений процессов, происходящих в природе и обществе, выражать их различными способами; умения использовать межличностные формы взаимодействия и общения в процессе обучения (коммуникативная компетенция).

В настоящее время приоритетными **направлениями**, имеющими принципиальное теоретическое и практическое значение, являются следующие: естественно-научное, аксиологическое, пространственно-ориентационное, прикладное.

Оптимальными и эффективными **подходами**, определяющими теоретическую и методическую базу изучения учебного предмета «География», являются комплексный географический подход, системно-деятельностный, детерминистский, профессионально-компетентностный, культурологический, исследовательский и ценностный.

Базовый комплексный географический подход предполагает логическую взаимосвязь и взаимозависимость природных явлений, социальных структур, экономических и политических процессов.

Системно-деятельностный подход определяет необходимость последовательного представления содержания учебного материала и учебных задач и предполагает организацию учебного сотрудничества различных уровней (учитель – учащийся, учащийся – учащийся, учащийся – группа).

Профессионально-компетентностный подход направлен на формирование у учащихся основных географических знаний и развитие умений и навыков, имеющих практическую и прикладную значимость в их жизни и будущей профессиональной деятельности.

Культурологический подход позволяет рассмотреть географическую среду через призму достижений общечеловеческой культуры и направлен на развитие духовности, морали и гуманистических качеств личности учащегося.

В основу **детерминистского подхода** положено однозначное соответствие причины и следствия природных явлений и процессов.

Исследовательский подход подразумевает поиск, исследование и творчество на учебных занятиях.

В основе **ценностного подхода** лежит ориентация на комплекс ценностей, которые представлены общечеловеческими ценностями, а также понятиями: Человек (абсолютная ценность), Знание, Отечество, Земля, Мир.

Компетентностный подход интегрирует названные подходы и обеспечивает комплексное овладение учащимися предметными и метапредметными знаниями и умениями. Каждая из компетенций характеризуется своим учебным содержанием (теоретическим и практическим), а также основными видами деятельности:

учебно-познавательная компетенция предусматривает владение знаниями об объектах изучения физической и социально-экономической географии и соответствующими умениями, навыками и способами деятельности;

компетенция приоритета географической информации предполагает формирование умений характеризовать физико-географические особенности природы материков и океанов, выделять общие и отличительные территориальные особенности, экономико-географические показатели отдельных стран, особенности географического и геополитического положения территорий, стратегии устойчивого развития человечества и Республики Беларусь;

ценностно-смысловая компетенция предполагает развитие умений выбирать целевые и смысловые установки для своих действий и поступков, принимать решения; способностей учащихся видеть и понимать окружающий мир, осознавать свою роль и предназначение;

компетенция географических действий обеспечивает формирование опыта деятельности по применению географических знаний и умений в жизненных ситуациях;

компетенция пространственного ориентирования обеспечивает формирование умений работать с картографическими источниками информации, использовать информацию о географических процессах и явлениях и осуществлять пространственно-территориальную привязку;

коммуникативная компетенция реализуется посредством развития способностей учащихся к коммуникативной деятельности: географически аргументировать результаты наблюдений процессов, происходящих в природе и обществе, выражать их различными способами; умения использовать межличностные формы взаимодействия и общения в процессе обучения.

Принципами отбора содержания обучения являются:

– принцип развития естественно-научного мышления;

– принцип целостного представления о мире;

– принцип связи теории с практикой и реализации через практическую деятельность;

– принцип минимизации теоретических сведений с учетом их значимости в повседневной жизни;

– принцип взаимосвязи чувственного и логического, рационального и иррационального в процессе познания мира.

Содержание учебного материала для обобщающего повторения планирует учитель на основе учета усвоенных в течение года знаний, умений и навыков и систематизированного теоретического и практического материала, изложенного в рубрике «Основные требования к результатам учебной деятельности».

Практические работы без звездочки являются обучающими. Итоговые практические работы отмечены звездочкой и могут быть выполнены в рамках тематического контроля.

XI класс
СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА
(1 ч в неделю, всего 35 ч)

ВВЕДЕНИЕ (1 ч)

Мировое хозяйство как основа развития человеческой цивилизации. Роль географии в решении глобальных проблем человечества.

Раздел I. ГЕОГРАФИЯ МИРОВОГО ХОЗЯЙСТВА (15 ч)

Тема 1. Факторы развития мирового хозяйства (6 ч)

Мировое хозяйство как глобальная географическая система. Современная структура мирового хозяйства. Тенденции развития мирового хозяйства в XXI веке.

Международное географическое разделение труда (МГРТ): факторы и условия становления. Основные формы разделения труда: специализация и кооперирование. Международная специализация стран мира.

Интернационализация и транснационализация мирового хозяйства. Транснационализация мирового хозяйства. Транснациональные компании (ТНК).

Международная экономическая интеграция. Стадии международной экономической интеграции. Роль интеграционных объединений в развитии современного мирового хозяйства и стран мира.

НТР как движущая сила развития мирового хозяйства. Основные направления НТР. Влияние НТР на современную отраслевую и территориальную структуру мирового хозяйства.

Международные экономические отношения и глобализация мирового хозяйства. Формы международных экономических отношений. Мировая торговля. Глобализация мирового хозяйства и ее основные формы. Глобальные города.

Практическая работа

1. Сравнительная характеристика крупнейших ТНК мира (на примере двух компаний по выбору).

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

знать:

основные этапы развития географии мирового хозяйства;

предпосылки процесса интернационализации, факторы транснационализации, ведущие ТНК мира;

стадии международной экономической интеграции;

сходства и различия понятий «научно-техническая революция» и «научно-технический прогресс», основные направления развития научно-технической революции;

формы международных экономических отношений, особенности отраслевой структуры мирового экспорта и импорта, признаки глобализации;

основные понятия: *отраслевая структура мирового хозяйства, международное географическое разделение труда, специализация, кооперирование, интернационализация, транснационализация, транснациональная компания (ТНК), международная экономическая интеграция, научно-технический прогресс, научно-техническая революция, мировая торговля, глобализация мирового хозяйства, глобальный город;*

уметь:

характеризовать структуру мирового хозяйства, ТНК;

показывать на карте: страны НАФТА, МЕРКОСУР; государства – лидеры по объемам: экспорта товаров и доле в мировом экспорте товаров (Китай, США, Германия); импорта товаров и доле в мировом импорте товаров (США, Китай, Япония); экспорта услуг и доле в мировом экспорте услуг (США, Великобритания, Германия); импорта услуг и доле в мировом импорте услуг (США, Германия, Великобритания); глобальные города (Нью-Йорк, Лондон, Париж);

давать сравнительную характеристику ТНК мира.

Т е м а 2. География секторов мирового хозяйства (8 ч)

География сельского хозяйства мира. Общая характеристика мирового сельского хозяйства. Роль природных и социально-экономических условий в размещении сельскохозяйственного производства. География растениеводства. География животноводства. Географические типы сельского хозяйства.

География промышленности мира. Закономерности размещения промышленности. Роль современной промышленности мира.

География энергетики мира. Динамика структуры топливно-энергетического баланса мира. География нефтяной, газовой, угольной промышленности. География электроэнергетики и альтернативной энергетики.

География металлургии мира. Отраслевая структура черной металлургии. Факторы размещения и география сырьевой базы. География производства чугуна и стали. Цветная металлургия мира и ее роль в мировом хозяйстве. Отраслевая структура цветной металлургии. География важнейших отраслей цветной металлургии: алюминиевой, медной, цинковой. Крупнейшие ТНК металлургии.

География машиностроения мира. Факторы размещения отраслей машиностроения. Структурные и территориальные сдвиги в машиностроении. География основных отраслей машиностроения: транспортное машиностроение (морское судостроение, автомобилестроение, авиаракетно-космическая промышленность), электронная и электротехническая промышленность, станкостроение. Крупнейшие ТНК автомобилестроения.

География химической промышленности мира. Факторы размещения и география сырьевой базы химических производств. География производства: основной химии, минеральных удобрений, продуктов неорганической химии и органического синтеза. География фармацевтической промышленности. Крупнейшие ТНК отрасли.

Легкая и пищевая промышленность мира. Отраслевая структура легкой и пищевой промышленности. География текстильной и швейной промышленности. География пищевой промышленности.

География сферы услуг. Структура и место сферы услуг в мировом хозяйстве. География транспорта. Транспортная система мира. География мирового туризма.

Практическая работа

2*. Сравнительная характеристика географии альтернативной энергетики мира.

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

знать:

структуру и основные географические особенности сельского хозяйства мира;

динамику топливно-энергетического баланса мира, особенности географии нефтяной, газовой и угольной промышленности, электроэнергетики, альтернативной энергетики мира;

сырьевую базу и отраслевую структуру черной и цветной металлургии, географические особенности металлургии, крупнейшие ТНК металлургии;

географические особенности машиностроения, крупнейшие ТНК автомобилестроения;

факторы размещения химических производств;

географию сырьевой базы химической промышленности; регионы химической промышленности мира;

факторы и географические особенности размещения легкой промышленности, факторы и географические особенности размещения пищевой промышленности;

место сферы услуг в мировом хозяйстве;

географические особенности транспортного комплекса мира; особенности географии видов транспорта (железнодорожного, автомобильного, водного, воздушного, трубопроводного); особенности транспортной сети мира, географию международного туризма;

основные понятия: *альтернативная энергетика; транспортная система мира*;

уметь:

характеризовать современную промышленность мира; географию нефтяной, газовой и угольной промышленности мира; электроэнергетики мира; альтернативной энергетики мира; черной металлургии мира, цветной металлургии мира; машиностроения мира; химической промышленности мира; легкой промышленности мира; пищевой промышленности мира; видов транспорта (железнодорожного, автомобильного, водного, воздушного, трубопроводного); международного туризма;

показывать на карте:

– три ведущие страны: по доле сельскохозяйственной продукции в мировом валовом продукте (Китай, Индия, США); объемам валового сбора пшеницы (Китай, Индия, США); объемам валового сбора кукурузы (США, Китай, Бразилия); объемам валового сбора риса (Китай, Индия, Индонезия); поголовью крупного рогатого скота (Бразилия, Индия, Китай); поголовью свиней (Китай, США, Бразилия); поголовью овец (Китай, Австралия, Индия);

– три ведущие: нефтедобывающие страны (Саудовская Аравия, Россия, США); газодобывающие страны (США, Россия, Катар); угледобывающие страны (Китай, США, Индия); три крупнейшие: ГЭС мира (Санься, Итайпу, Силоду); АЭС мира (Касивадзаки-Карива, Брюс, Запорожская);

– три главные страны-производителя: электроэнергии (США, Китай, Индия); солнечной электроэнергии (Германия, Испания, Япония); ветровой электроэнергии (США, Германия, Испания); геотермальной электроэнергии (США, Филиппины, Индонезия); три ведущие страны по объемам производства: чугуна (Китай, Япония, Индия); стали (Китай, Япония, США); бокситов (Австралия, Китай, Бразилия); первичного алюминия (Китай, Россия, Канада); рафинированной меди (Китай, Чили, Япония); рафинированного цинка (Китай, Канада, Республика Корея); рафинированного свинца (Китай, ФРГ, США);

– три ведущие страны-производителя: морских судов (Республика Корея, Япония, Китай); легковых автомобилей (Китай, США, Япония); станков (Китай, Япония, Германия); калийных удобрений (Канада, Россия, Беларусь); азотных удобрений (Китай, Индия, США); фосфорных удобрений (Китай, США, Индия); химических волокон (Китай, Индия, Тайвань); фармацевтической продукции (США, ФРГ, Япония); швейной продукции (Китай, США, Республика Корея); три ведущих морских порта мира (Шанхай, Сингапур, Пусан); три ведущие страны по количеству туристских прибытий (Франция, США, Испания); владеть навыками сравнительной характеристики географии альтернативной энергетики мира.

Обобщающее повторение (1 ч).

Раздел II. ГЛОБАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ЧЕЛОВЕЧЕСТВА (17 ч)

Тема 3. Геоэкологические проблемы географической оболочки (8 ч)

Глобальные проблемы человечества. Геоэкологические проблемы литосферы. Геоэкологические особенности литосферы, ее значение для жизни людей. Роль человека и его хозяйственной деятельности в большом (геологическом) круговороте веществ.

Влияние деятельности человека на литосферу. Геоэкологические изменения окружающей среды при ведении горных работ, разведке, добыче, транспортировке и использовании полезных ископаемых. Рекультивация.

Геоэкологические проблемы атмосферы. Геоэкологические особенности атмосферы и ее значение для жизни людей. Влияние деятельности человека на атмосферу, климат и погоду. Климатические условия и ресурсы.

Возможные изменения климата и их влияние на хозяйственную деятельность и здоровье человека.

Геоэкологические проблемы гидросферы. Геоэкологические особенности гидросферы, ее значение для жизни людей. Воздействие деятельности человека на гидросферу.

Проблема дефицита пресной воды. Основные направления повышения эффективности использования, охраны водных ресурсов суши и Мирового океана.

Геоэкологические проблемы биосферы. Геоэкологические особенности биосферы и ее значение для жизни людей. Влияние деятельности человека на биосферу. Деградация земель, опустынивание и обезлесение как комплексные природно-антропогенные процессы.

Роль растений и животных как элементов биосферы, их значение для хозяйственной деятельности человека. Природное разнообразие Земли и проблема его сохранения.

Практические работы

3. Оценка климатических условий своей местности, их влияние на человека и его хозяйственную деятельность.

4. Характеристика геоэкологического состояния природы своей местности и меры по ее охране.

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

знать:

геоэкологические особенности литосферы и ее основные функции; большой (геологический) круговорот веществ; основные геоэкологические последствия влияния человека на литосферу;

геоэкологические особенности атмосферы; роль климатических и погодных условий в жизни человека и его хозяйственной деятельности; антропогенное загрязнение атмосферы; современные тенденции и геоэкологические последствия изменения климата;

геоэкологические особенности гидросферы; современное геоэкологическое состояние элементов гидросферы; влияние различных видов хозяйственной деятельности на водные ресурсы; антропогенное загрязнение гидросферы; основные направления повышения эффективности использования и охраны водных ресурсов суши и Мирового океана;

геоэкологические особенности биосферы; значение биосферы для человека и его хозяйственной деятельности; геоэкологические последствия антропогенного воздействия на биосферу; особенности процессов опустынивания, обезлесения; основные направления рационального использования земельных ресурсов, охраны естественных ландшафтов и биологического разнообразия Земли;

основные понятия: глобальные проблемы человечества, геоэкологические последствия, б*ольшой (геологический) круговорот веществ; биота, климатические ресурсы, парниковый эффект, изменение климата, водное хозяйство, водообеспеченность, природное разнообразие, рекультивация*;

уметь:

определять значение элементов литосферы для различных видов хозяйственной деятельности;

анализировать последствия антропогенного воздействия на литосферу;

определять значение климатических и погодных условий для различных видов хозяйственной деятельности;

анализировать причины и последствия антропогенного воздействия на состояние атмосферы и климат;

определять значение элементов гидросферы для различных видов хозяйственной деятельности;

анализировать причины и последствия антропогенного воздействия на гидросферу;

анализировать причины и последствия антропогенного воздействия на состояние природной среды;

определять состояние природной среды своей местности и предлагать возможные пути ее улучшения;

владеть:

навыками определения взаимосвязи изучаемых явлений на различном территориальном уровне;

основами анализа и обобщения информации из различных источников: о климатических условиях своей местности, их влиянии на человека и его хозяйственную деятельность, геоэкологическом состоянии природной среды на различном территориальном уровне и мерах по ее охране.

Тема 4. Социально-экономические глобальные проблемы (6 ч)

Демографическая проблема. Взаимосвязь роста населения и социально-экономического развития. Демографический взрыв и депопуляция. Демографическая политика и ее особенности в различных регионах и странах мира.

Продовольственная проблема. Факторы и причины обострения продовольственной проблемы в мире. Продовольственное обеспечение населения стран мира. Пути решения продовольственной проблемы.

Минерально-ресурсная проблема. Ресурсообеспеченность стран и регионов мира основными видами минеральных ресурсов. Группы стран по степени обеспеченности запасами полезных ископаемых.

Энергетическая проблема. Динамика производства и потребление топливно-энергетических ресурсов в мире. Энергетическая безопасность. Проблемы использования альтернативных и возобновляемых источников энергии.

Политическая география и геополитика. Динамика государственного, территориального устройства регионов и политической карты мира.

Современные геополитические проблемы и региональные конфликты.

Практические работы

5. Анализ динамики численности населения Земли в XX веке.

6. Определение ресурсообеспеченности стран мира основными видами минеральных ресурсов.

7*. Характеристика политико-географического положения страны мира (по выбору).

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

знать:

причины возникновения, особенности проявления и последствия глобальных демографической, продовольственной, минерально-ресурсной, энергетической и геополитических проблем;

причины изменения государственного и территориального устройства стран и регионов, современные геополитические проблемы и региональные конфликты;

основные понятия: *демографическая проблема, продовольственная безопасность, энергетическая безопасность, политическая география, геополитика, политико-географическое положение;*

уметь:

анализировать карты, графики и диаграммы, отражающие закономерности структуры и размещения населения на планете Земля;

выявлять и анализировать причины, факторы и последствия проявления глобальной продовольственной проблемы в странах различного социально-экономического типа;

объяснять глобальность и относительность минерально-ресурсной проблемы, пути ее решения;

обосновывать рациональность использования альтернативных и возобновляемых источников энергии в странах и регионах мира;

характеризовать причины и географические аспекты проявления геополитических проблем регионального и глобального характера;

показывать на карте регионы и зоны проявления современных геополитических конфликтов;

владеть: навыками обобщения информации о глобальных социально-экологических проблемах человечества; расчета показателей темпа роста и прироста населения, ресурсообеспеченности; характеристики политико-географического положения стран и регионов мира, геополитических конфликтов.

Тема 5. Пути решения глобальных проблем человечества (2 ч)

Рациональное природопользование и стратегия устойчивого развития человечества. Геоэкологические принципы, правила, законы природопользования и охраны окружающей среды.

Географические аспекты стратегии устойчивого развития человечества и Республики Беларусь.

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащимся необходимо:

знать:

основные геоэкологические принципы, правила, законы природопользования и охраны окружающей среды;

роль человека и его хозяйственной деятельности в изменении природных процессов;

основные глобальные проблемы человечества, причины возникновения, возможные последствия и пути решения;

главные положения концепции устойчивого развития человечества;

основные понятия: *природопользование, охрана окружающей среды, гуманитарно-экологический подход, стратегия устойчивого развития;*

уметь:

определять взаимосвязи естественных и общественных явлений и процессов;

обосновывать использование природных ресурсов в зависимости от величины их запасов, хозяйственной значимости, потребности и целесообразности освоения;

анализировать пути совершенствования природопользования;

владеть:

основами анализа и обобщения информации из различных источников о глобальных проблемах человечества, возможных направлениях и вариантах решения;

навыками определения взаимосвязи изучаемых явлений на различном территориальном уровне.

Обобщающее повторение (1 ч).

ЗАКЛЮЧЕНИЕ (1 ч)

География в современном мире и перспективы ее развития. Международное сотрудничество – основа сохранения среды обитания человечества и решения его глобальных проблем.

Резервное время (1 ч).

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Геаграфія»
для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання
(базавы ўзровень)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета «Геаграфія» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні.

Сусветная гаспадарка і глабальныя праблемы чалавецтва (XI клас) – заключны абагульняльны раздзел геаграфічнага зместу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, які інтэгруе веды геаграфічных навук для аналізу ўзаемадзеяння і ўзаемаабумоўленасці прыроднага асяроддзя, чалавека і грамадства, прасторава-часавых заканамернасцей іх дынамікі і эвалюцыі, пазнання законаў тэрытарыяльнай арганізацыі прыроды і чалавечага грамадства.

Геаграфічная навука выйшла на якасна новы ўзровень свайго развіцця, абумоўлены ўзрослым значэннем геаграфіі ў разуменні складаных прыродных, сацыяльна-эканамічных і дэмаграфічных працэсаў, якія адбываюцца на нашай планеце, у аптымізацыі выкарыстання яе прасторы і засваенні рэсурсаў, асэнсаванні будучыні Зямлі і магчымасці развіцця чалавечага грамадства з яго запытамі, якія пастаянна павялічваюцца.

Мэта вучэбнага прадмета заключаецца ў фарміраванні ведаў пра геаграфічныя аспекты глабальных праблем чалавецтва і магчымыя шляхі іх пераадолення на аснове разумення дынамікі развіцця сусветнай гаспадаркі на розных прасторавых узроўнях. Вывучэнне геаграфіі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі павышанага ўзроўню заклікана фарміраваць у вучняў веды: пра сусветную гаспадарку і фактары яе развіцця; сутнасць і наступствы глабалізацыі, змяненні на палітычнай карце свету; сучасныя тэндэнцыі развіцця геаграфічнай абалонкі; найбольш актуальныя геаэкалагічныя і сацыяльна-эканамічныя праблемы, якія ўзнікаюць у геаграфічнай прасторы; сутнасць праблем прыродакарыстання і ўстойлівага развіцця як асновы гарманічнага існавання грамадства і прыроды.

Асноўныя **задачы** – фарміраванне ў вучняў з дапамогай геаграфічных ведаў:

разумення фактараў развіцця сусветнай гаспадаркі, умення тлумачыць іх уплыў на геаграфію галін і відаў эканамічнай дзейнасці;

умення характарызаваць сучасную структуру, дынаміку развіцця сусветнай гаспадаркі і заканамернасці геаграфіі сельскай гаспадаркі, прамысловасці і сферы паслуг;

умення вызначаць значэнне і магчымасці геаграфіі ў вырашэнні глабальных праблем чалавецтва;

разумення сутнасці геаэкалагічных праблем геаграфічнай абалонкі, заканамернасцей іх праяўлення і магчымых шляхоў вырашэння на глабальным, рэгіянальным і лакальным узроўнях;

уменняў вызначаць заканамернасці фарміравання, тэндэнцыі развіцця і магчымыя напрамкі вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем чалавецтва на розным тэрытарыяльным узроўні;

разумення важнасці і значнасці комплекснага геаграфічнага падыходу да вывучаемых з’яў, базавых геаэкалагічных прынцыпаў, правіл, законаў прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя;

уменняў вылучаць геаграфічныя аспекты глабальных мадэлей развіцця свету, стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь.

Павышаны ўзровень вывучэння геаграфіі прадугледжвае засваенне вучнямі абавязковага зместу праграмы ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па вучэбным прадмеце «Геаграфія» да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў. Павышаны ўзровень забяспечвае развіццё асобы вучня сродкамі геаграфіі, спрыяе фарміраванню геаграфічнага светапогляду, каштоўнасна-сэнсавых установак, гатоўнасці і здольнасці да самаразвіцця, асобаснага і прафесійнага самавызначэння.

Ключавыя падыходы пабудовы зместу:

комплексны геаграфічны, які спалучае пры вывучэнні тэрыторыі (малога арэала і населенага пункта, раёна, краіны, аб'яднання краін, кантынента, тэрытарыяльнай сістэмы) наступныя патрабаванні: улік прасторы, часу і агульных індывідуальных асаблівасцей; абагульненне ведаў пра сучасную структуру, дынаміку развіцця сусветнай гаспадаркі і заканамернасці геаграфіі сельскай гаспадаркі, прамысловасці і сферы паслуг, асноўныя фактары развіцця сусветнай гаспадаркі, іх уплыў на геаграфію галін і відаў эканамічнай дзейнасці; вызначэнне заканамернасцей фарміравання, тэндэнцый развіцця і магчымых напрамкаў вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем чалавецтва на розным тэрытарыяльным узроўні;

культуралагічны, які дазваляе разгледзець геаграфічнае асяроддзе праз прызму культуры, вызначыць уплыў чалавека на прыроду, развіваць духоўнасць і гуманістычныя якасці асобы вучня;

гуманітарна-экалагічны падыход, што дазваляе пазнаць сукупнасць поглядаў і дзеянняў, якія выяўляюцца ў павазе годнасці і правоў чалавека, яго каштоўнасці як асобы, клопаце пра дабро людзей, усебаковае развіццё, стварэнні спрыяльных для чалавека ўмоў жыццядзейнасці з улікам экалагічных абмежаванняў;

кампетэнтнасны, які арыентуе вучняў на вынік навучання, фарміраванне здольнасцей вучня для выкарыстання ведаў, уменняў і прымянення вопыту дзейнасці ў розных сітуацыях.

Вучэбная праграма ўключае 2 раздзелы і 15 тэм. Вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу з выкананнем практычных работ разлічана на 105 вучэбных гадзін (3 гадзіны на тыдзень). Выніковыя практычныя работы пазначаны зорачкай. У праграме прадугледжаны рэзерв часу. Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў прадстаўлены з улікам іх змястоўнай вобласці і ўзроставых фізіялагічных асаблівасцей. Навыкі вызначаны на аснове дзейнаснага падыходу і выяўляюць гатоўнасць да пэўнага віду дзейнасці, у працэсе якога вучні павінны будуць прымяніць засвоеныя веды і ўменні.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў складаюцца з трох кампанентаў:

ведавага (веды);

практычнага (уменні);

аперацыйнага (навыкі).

Фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў забяспечвае павышаны ўзровень засваення абавязковага зместу і мае на ўвазе магчымасць працягу адукацыі, а таксама здольнасць самаарганізацыі з мэтай рашэння вучэбных і практычных задач. Вучэбная праграма грунтуецца на выкарыстанні геаграфічнай наменклатуры, якая засвоена вучнямі ў VI–X класах. У раздзеле I – «Геаграфія сусветнай гаспадаркі» – вывучэнне геаграфічнай наменклатуры праходзіць на аснове міжнароднай статыстыкі вядучых галіновых арганізацый і ТНК за 2010–2014 гг. у разрэзе вядучых краін па асобных галінах і відах эканамічнай дзейнасці. У раздзеле II – «Глабальныя праблемы чалавецтва» – разглядаюцца геаэкалагічныя праблемы геаграфічнай абалонкі Зямлі і магчымасці геаграфіі ў іх вырашэнні. Вывучэнне глабальных сацыяльна-эканамічных праблем чалавецтва грунтуецца на навуковых асновах стратэгіі ўстойлівага развіцця.

XI клас (базавы ўзровень)

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Сусветная гаспадарка як аснова развіцця чалавечай цывілізацыі. Роля геаграфіі ў вырашэнні глабальных праблем чалавецтва.

Раздзел I
ГЕАГРАФІЯ СУСВЕТНАЙ ГАСПАДАРКІ (15 гадзін)

для мышцаў сцягна: частковыя прысяданні (практыкаванне выконваецца на чвэрць, палавіну або тры чвэрці амплітуды).

Практыкаванні, комплексы і гульні для развіцця каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцяў вучняў

Кросавы бег працягласцю ад 15–20 да 30–40 мін з частатой пульсу 120–140 уд./мін; пераменны, паўторны бег; гульня ў футбол, баскетбол, гандбол.

Агульнаразвіццёвыя практыкаванні з абцяжараннем вагой уласнага цела, з пераадоленнем супраціўлення пругкіх уласцівасцяў прадметаў (экспандары). Практыкаванні на гімнастычных снарадах, трэнажорах, з інвентаром, якія выконваюцца ў комплексах кругавой трэніроўкі і ўключаюць да 8–12 станцый.

Выпады ўперад са штангай на плячах у паўпрыседзе. Прысяданні са штангай на грудзях. Прысяданні з апорай на падстаўку за спінай, тулава адхілена назад, пад пяткі падкладзены брусок. Падыманне на наскі ў становішчы седзячы са штангай на каленях. Цяга штангі да грудзей шырокім хопам у нахіле, у становішчы «лежачы», падцягванне на перакладзіне шырокім хопам. Нахілы ўперад са штангай за галавой. Жым штангі на гарызантальнай і нахіленай лаўцы. Жым штангі вузкім хопам. Жым гантэлей у становішчы «седзячы». Цяга блока адной рукой. Згінанне і разгінанне рук з гантэлямі, са штангай у локцевых суставах. Разгінанне рук у локцевых суставах з гантэлямі, са штангай з-за галавы. Падыманне каленяў да грудзей у становішчы «седзячы». Нахілы тулава ў бакі. Цяга блока ўніз у становішчы «стоячы на каленях». Частковыя прысяданні ў становішчы стоячы са штангай на плячах, ногі на шырыні плячэй, пад пяткі падкладсці брусок вышынёй 3–5 см. Развядзенне рук з гантэлямі ў становішчы лежачы на лаўцы. Развядзенне прамых рук з гантэлямі ў становішчы «лежачы тварам уніз на нахіленай лаўцы» да 45°. Пад'ём гантэлі адной рукой у становішчы «лежачы бокам на гарызантальнай лаўцы хопам зверху». Выпрамленне рук з гантэлямі ў становішчы «нахіл ўперад». Разгінанне рук у локцевых суставах з гантэлямі ў становішчы «лежачы на лаўцы».

Баскетбол

Скачкі штуршком адной і дзвюма нагамі. Спыненне крокам і скачком. Павароты ў становішчы стоячы на месцы, развароты.

Перадачы мяча дзвюма рукамі ад грудзей, дзвюма рукамі зверху, адной рукой ад пляча ў становішчы «стоячы на месцы» і ў руху.

Лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей, адной і дзвюма рукамі пры паралельным і сустрэчным руху, у скачку. Лоўля мяча ў спалучэнні са спыненнямі і паваротамі.

Спалучэнне прыёмаў «лоўля – перадача – паварот».

Вядзенне мяча са змяненнем вышыні адскоку і напрамку, з абвядзеннем перашкод, па крузе; са спыненнем, паваротамі, перадачамі па сігнале.

Кідкі мяча па кальцы дзвюма рукамі ад грудзей, адной ад пляча, з адскокам і без адскоку ад шчыта, пад вуглом да шчыта ў руху, пасля вядзення і двух крокаў, штрафныя кідкі.

Спалучэнне прыёмаў «перадача – лоўля – вядзенне – кідок».

Захоп мяча – вырыванне. Вырыванне і выбіванне мяча ў гульца, які спыніўся пасля вядзення. Накрыванне мяча. Перахопліванне мяча ў становішчы стоячы збоку, з-за спіны пры перадачы, выкананай упоперак поля. Перахопліванне перадачы, выкананай уздоўж пляцоўкі.

Тактычныя дзеянні гульца без мяча: выхад на свабоднае месца для атрымання мяча насустрач партнёру з мячом, убок ад партнёра з мячом.

Вызначэнне гульнявой сітуацыі, мэтазгоднай для прымянення вядзення, перадачы, кідка па кальцы. Выбар спосабу вядзення мяча і кідка па кальцы.

Індывідуальныя дзеянні пры нападзенні: кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку і спосабу перадачы з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці суперніка, выбар і прымяненне падманных дзеянняў супраць абаронцы; узаемадзеянне гульцоў нападзення і абароны паміж сабой для завяршэння атакі. Камандныя дзеянні: нападзенне з выхадам у адрыў. Зонная абарона.

Прымяненне спалучэнняў вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў баскетбол.

Валейбол

Перамяшчэнне прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад, з выскокваннем і прызямленнем на абедзве нагі. Скачок уверх штуршком адной і дзвюма нагамі. Падзенне ў правы і левы бок на сцягно і тулава з месца і з кроку. Падзенне назад з перакатам на спіну.

Шматразовыя перадачы мяча зверху і знізу дзвюма рукамі над сабой, з адскокам ад сценкі, у парах і тройках, з пераменай месцаў, праз сетку ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем уздоўж сеткі. Перадача мяча дзвюма рукамі зверху ў скачку.

Прыём мяча знізу дзвюма рукамі пасля падачы, знізу ў падзенні ўправа і ўлева, знізу адной рукой у падзенні ўперад з апорай на другую руку. Прыём мяча, які адскочыў ад сеткі. Гульня нагой і іншымі часткамі цела.

Атакавальны ўдар у скачку штуршком адной і дзвюма нагамі з другой, трэцяй і чацвёртай зоны, атакавальны ўдар з другой лініі. Падманны атакавальны ўдар. Блакіраванне атакавальнага ўдару.

Ніжняя і верхняя прамая падача з пападаннем у 1, 5 і 6-ю зоны.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, падманныя перадачы і ўдары, выбар напрамку перадачы і атакавальнага ўдару з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці супернікаў, выбар і прымяненне падманных дзеянняў супраць канкрэтнага абаронцы; узаемадзеянне гульцоў першай і другой лініі паміж сабой для завяршэння атакі.

Тактыка абароны: блакіраванне атакавальнага ўдару, узаемастрахоўка свабодных зон, атака «іншым тэмпам», выкарыстанне ў гульні «лібера».

Выкарыстанне развучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў валейбол.

Гандбол

Перамяшчэнне скрыжаваным, прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад. Спыненне адной і дзвюма нагамі. Бег з паскарэннем на кароткіх адрэзках, бег з выскокваннем і прызямленнем на адну і абедзве нагі. Скачок убок штуршком адной нагі. Падзенне на рукі, на сцягно і тулава з месца і з разбегу.

Лоўля мяча дзвюма рукамі збоку (без павароту тулава) у становішчы «стоячы на месцы», у руху, у скачку. Лоўля мяча адной рукой з захопам і без захопу. Лоўля мяча на вялікай хуткасці перамяшчэння, у скачку пры непасрэднай блізкасці абаронцы.

Перадачы мяча адной рукой (хлёстам, штуршком, кісцевая) на кароткую адлегласць ва ўсіх напрамках з месца, з разбегу ў адзін, два і тры крокі, у скачку, пасля спынення, пасля лоўлі мяча з паўадскоку, пасля лоўлі ў непасрэднай блізкасці абаронцы, у барацьбе з абаронцам. Перадача мяча адной і дзвюма рукамі «ў адзін дотык». Перадача мяча на далёкасць адной рукой хлёстам партнёру ў руху.

Вядзенне мяча аднаўдарнае без зрокавага кантролю, шматударнае на высокай хуткасці перамяшчэння з пераследам. Вядзенне на вялікай хуткасці, з рэзкім спыненнем і змяненнем напрамку руху, з паваротам кругом.

Кідкі мяча па варотах адной рукой хлёстам зверху і збоку, з нахілам тулава ўлева і ўправа, у апорным становішчы, у скачку ў вышыню і ў даўжыню, з рознымі спосабамі бегу, рознай траекторыяй (гарызантальнай, зыходзячай, узыходзячай, навеснай) палёту мяча, з далёкай і блізкай адлегласці. Кідок мяча адной рукой у падзенні з прызямленнем на руку і сцягно.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку кідка з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці варатара, выбар і прымяненне фінта супраць канкрэтнага абаронцы; узаемадзеянне гульцоў другой лініі паміж сабой для завяршэння атакі, узаемадзеянне з лінейным гульцом, крайнім гульцом, узаемадзеянне крайняга гульца з лінейным. Камандныя дзеянні: пазіцыйнае нападзенне па сістэме расстаноўкі 4:2, нападзенне 6:0 з выхадам.

Тактыка абароны: зонная абарона па сістэме расстаноўкі 3:3, абарона ў меншасці 5:6 і 4:6.

Тактыка гульні варатара: выбар пазіцыі ў варотах і ў зоне варатара, стойкі варатара, узаемадзеянне варатара з абаронцамі і нападальнікамі.

Выкарыстанне вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў гандбол.

Футбол

Гульні і эстафеты з футбольным мячом, рухавыя гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гнуткасці, хуткасці. Гульні з вядзеннем мяча, абвядзеннем стоек, прыёмам і затрымкай мяча, з ударамі па варотах, на збліжэнне з суперніка, з двума і трыма нападаючымі на пляцоўцы для міні-футбола, абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара), гульні ў «лабірынт» (з мячом і без мяча), шматпланавыя гульні. Гульня ў футбол па спрошчаных правілах.

Разнастайныя спосабы вядзення мяча, перадачы; удары і прыёмы мяча нагой і галавой, жангліраванне мячом; гульні і эстафеты на развіццё спрыту, трываласці падчас гульні, дакладнасці ўдараў па варотах і перадач мяча, фарміраванне навыкаў тактычных дзеянняў у абароне і нападзенні, спрошчаныя гульні 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 гульцоў, гульні для каманд з 7 чалавек, тэсты на гульнявыя здольнасці, гульні ў футбол камандай з 8 чалавек з улікам раздзялення поля на ўчасткі.

Удары правай і левай нагой па нерухомым мячы, па мячы, які коціцца, сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском, удары па мячы, які ляціць. Практыкаванні ў парах, тройках, чацвёрках з выкарыстаннем тэхніка-тактычных звязак: вядзенне – перадача, прыём – перадача, прыём – вядзенне – перадача і да т.п.

Удары на далёкасць і дакладнасць, абвядзенне – адбіранне мяча, абвядзенне – адбіранне – удар па варотах, перахопліванне мяча, гульня галавой, камбінацыі ў тройках з мячом, дзеянні без мяча (адкрыванне, адцягванне ўвагі, стварэнне колькаснай перавагі), узаемадзеянне двух нападальнікаў супраць аднаго абаронцы, двух абаронцаў супраць аднаго нападальніка, гульнявыя практыкаванні ў крузе, квадраце, прамавугольніку і да т.п.

Практыкаванні з мячом і без мяча, накіраваныя на развіццё каардынацыйных здольнасцяў, хуткасці, спрытнасці, дакладнасці рухаў, гульні з бегам, скачкамі, перадачамі і лоўляй мяча.

Практыкаванні пераменнай інтэнсіўнасці для развіцця гульнявой трываласці (бег з вядзеннем мяча на дыстанцыі да 1 км з паскарэннем, рыўкамі, скачкамі і іншымі практыкаваннямі, набліжанымі па сваім характары да гульні ў футбол), хуткасна-сілавых якасцяў, сілы (практыкаванні з нязначнымі абцяжараннямі).

Выкарыстанне развучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у вучэбнай гульні.

Тэніс настольны

Бег 10, 30, 60 м, бег з паскарэннем, чаўночны бег 4 х 9 м, 6 х 20 м, 10 х 5 м. Чаўночны бег з вар'іраваннем звычайнага бегу з бегам спінай уперад. Бег з максімальнай хуткасцю 5 х 30 м, 10 х 30 м з інтэрваламі адпачынку да 1 мін.

Скачкі трайныя і пяцярныя з месца штуршком дзвюма нагамі. Выскокванне ўверх з нізкага прыседу. Прысяданні па чарзе на правай і левай назе. Скачкі на адной назе з паваротамі на 180°. Паскарэнне пасля скачкоў з паваротамі на 180° і 360°. Скачкі з боку ў бок са спружыністымі прысяданнямі. Пераскокванне праз гімнастычную лаўку правым і левым бокам. Выскокванне ўверх з высокім падыманнем сцёгнаў.

Выкруты рук назад з гімнастычнай палкай з паступовым памяншэннем шырыні хопу.

Набіванне тэніснага мяча на ракетцы ў гульнявой стойцы і ў перамяшчэнні высока-нізка, па чарзе тыльным і далоневым бокам, рабром ракеткі, ручкай ракеткі, аб сценку, аб сценку з паваротам на 360° (з прысяданнем, перакладваннем ракеткі ў другую руку) у момант адскоку мяча.

Імітацыя ўдараў з ракеткай і без ракеткі з уцяжарвальнікам у руцэ. Імітацыя адзіночных, серыйных удараў, удараў з перамяшчэннем управа і ўлева, наперад і назад. Імітацыя падач з падманным рухам корпуса і рукі з ракеткай. Імітацыя ўдараў у розным тэмпе перад люстэркам. Імітацыя ўдараў у зададзеным тэмпе з вар'іраваннем ад павольнага да максімальнага ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем.

Кідкі мяча ў сценку і лоўля рознымі спосабамі (правай, левай рукой, з дадатковымі скачкамі, прысяданнямі, паваротамі).

Кіданне тэніснага мяча на далёкасць і ў цэль адной кісцю, кісцю і перадплеччам, усёй рукой і корпусам.

Гульня дзвюма ракеткамі, гульня «негульнявой» рукой. Гульня двума мячамі. Гульня аднаго супраць двух чалавек.

Падача з элементамі вывучанага ўдару. Удар на стале па дыяганалі. Змена напрамку палёту мяча па шырыні стала. Змена траекторыі і вышыні палёту мяча над сеткай. Змяненне даўжыні палёту мяча. Удар па зменным прыходным кручэнні.

Змена тэмпу гульні. Спаборніцтва ў працяглым утрыманні мяча ў гульні. Гульня «трохвугольнікам» з аднаго пункта ў два пункты процілеглага боку. Гульня вывучаемым ударам з двух пунктаў, трох пунктаў, з адной трэці стала, з паловы стала, дзвюх трацей стала.

Гульня вывучаным ударам па кароткім і доўгім прыходных мячах. Гульня і спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў абазначаныя на стале зоны. Гульня «васьмёркай» па чарзе па прамой і па дыяганалі.

Удар па мячы штуршком злева ў перамяшчэнні ўправа-ўлева, наперад-назад. Гульня штуршком злева доўга-каротка. Гульня па ўзыходзячым, сыходзячым мячы, у вышэйшым пункце адскоку мяча.

Падача штуршком злева ў абазначаныя на стале зоны.

Удар накатам справа. Перамяшчэнне пры ўдары накатам справа. Хуткая падача накатам справа ў абазначаныя на стале зоны.

Спалучэнне накату справа і штуршка злева. Перамяшчэнне ў левай стойцы пры накаце злева. Павароты пры ўдарах накатамі справа і злева.

Падрэзка злева. Падача зрэзкай злева. Спалучэнне зрэзкі злева і накату.

Зрэзка справа. Падача зрэзкай управа ў абазначаныя на стале зоны. Спалучэнне зрэзкі справа і зрэзкі злева, зрэзкі і накату.

Падача плоская і з нязначным кручэннем. Прыём падачы.

Прымяненне вывучаных тэхнічных і тактычных элементаў у вучэбнай гульні.

Лёгкая атлетыка

Паўторны бег з паскарэннем 60–80 м, з ходу на адрэзках 20–60 м, з высокага і нізкага старту на адрэзках 20–80 м.

Прабяганне адрэзкаў 20–60 м з зададзенай інтэнсіўнасцю, адрэзкаў 80–300 м – з фіксаваным часам адпачынку.

Выбяганне па камандзе з розных зыходных становішчаў 10х20 м.

Бег на адрэзках 80–150 м па віражы і па прамой.

Бег на адрэзках 100 + 150 + 200 + 100 м.

Скачок у даўжыню: 1) адштурхоўванне ў спалучэнні з палётам у кроку; 2) тэхніка прызямлення; 3) пераход ад разбегу да штуршка і рытм апошніх крокаў; 4) дакладнае трапленне на брусок з поўнага разбегу; 5) палётная фаза адным са спосабаў скачка.

Скачкі ў даўжыню з няпоўнага разбегу з прымяненнем розных дапаможных сродкаў (мосціка, бар'ераў і інш.).

Скачок у вышыню: 1) тэхніка адштурхоўвання; 2) дугападобны і хуткі разбег; 3) пераход праз планку.

Скачкі ў вышыню з прамога і дугападобнага разбегу з прымяненнем дапаможных сродкаў. Скачкі з няпоўнага і поўнага разбегу з прымяненнем мосціка для адштурхоўвання.

Кіданне і штурханне набіўнога мяча рознымі спосабамі адной і дзвюма рукамі.

Кіданне мяча вагой 150 г з поўнага разбегу.

Кіданне гранаты вагой 700 г з разбегу па калідоры 10 м.

Эстафеты і рухавыя гульні з бегам, скачкамі, кіданнем.

Прыкладныя дамашнія заданні для вучняў X–XI класаў

Комплексы ранішняй гімнастыкі з 12–14 практыкаванняў з гімнастычнай палкай, скакалкай, гантэлямі, эспандарамі. Падцягванні ў вісе са становішча «стоячы» на нізкай перакладзіне (дз.). Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры седзячы ззаду і ва ўпоры лежачы. Падыманне тулава са становішча «лежачы на спіне, рукі за галавой». Падыманне і апусканне прамых ног са становішча «лежачы на спіне» з дакрананнем да падлогі за галавой. Падыманне і апусканне, развядзенне і звядзенне рук з гантэлямі 1–3 кг. З зыходнага становішча «стоячы» ўпор прысеўшы, упор лежачы, упор прысеўшы, устаць у зыходнае становішча. Пачарговыя прысяданні на правай і левай назе з гантэлямі ў руках. Глыбокія прысяданні з выскокваннем уверх. Раўнавага на адной назе (стойка «Фламінга»).

Раўнамерны бег да 3 км (дз.) і да 5 км (юн.). Паўторны бег з высокім падыманнем сцягна і максімальнай частатой рухаў. Скачкі праз кароткую скакалку.

Язда на веласіпедзе да 8–10 км.

Хадзьба на лыжах да 3–5 км.

Падрыхтоўка і ўдзел у фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах і спартыўных спаборніцтвах.

Дадатак 1

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ»

Перечень и нормы обеспечения спортивным инвентарем и оборудованием, необходимыми для организации физического воспитания обучающихся при получении ими общего среднего, специального, профессионально-технического и среднего специального образования, проведения с ними физкультурно-оздоровительных и спортивно-массовых мероприятий[30]

Спортивный инвентарь и оборудование для гимнастики, акробатики, аэробики и атлетической гимнастики							
№ п/п	**Наименование**	**Единица измерения**	**Количество в учреждении образования с числом учащихся (чел.):**				**Примечания**
			до 220	**до 440**	**до 880**	**свыше 880**	
1	Аптечка	штука	1 штука в каждом спортивном зале и помещении, приспособленном для занятий физической культурой и спортом				–
2	Бревно гимнастическое	штука	–	1	1	1	–
3	Брусья гимнастические универсальные	штука	1	1	1	2	–
4	Гантели переменной массы (0,5–5 кг)	пара	10	20	40	40	–
5	Гриф для штанги	штука	1	1	2	2	масса до 10 кг
6	Гиря	штука	2	4	4	6	16 кг, 24 кг
7	Диски для штанги	пара	8	8	16	16	от 1 до 15 кг каждого веса
8	Жерди для гимнастических брусьев	штука	1	2	3	4	–
9	Канат для лазания диаметром 30 мм	штука	1	1	2	3	–
10	Канат для перетягивания	штука	1	1	1	1	–
11	Кегли	штука	6	8	10	12	–
12	Козел гимнастический	штука	1	1	1	2	–
13	Конь гимнастический	штука	1	1	1	2	–
14	Коврик туристский	штука	12	12	24	24	для занятий спецмедгрупп
15	Мат гимнастический	штука	10	20	30	40	–
16	Мостик гимнастический	штука	2	2	2	4	–
17	Мяч малый резиновый	штука	10	16	16	20	–
18	Обруч гимнастический	штука	15	20	30	40	–
19	Палка гимнастическая	штука	10	20	40	40	–
20	Перекладина гимнастическая	штука	1	1	1	2	–
21	Перекладина навесная	штука	5	10	10	10	–
22	Скакалка гимнастическая	штука	20	20	40	40	–
23	Скакалка гимнастическая	штука	2	2	3	3	длина 5 м
24	Скамейка гимнастическая	штука	6	8	10	15	–
25	Стенка гимнастическая	штука	6	10	10	16	–
26	Флажок	штука	10	15	20	20	–
27	Эспандер	штука	6	10	10	20	–
Легкоатлетический спортивный инвентарь							
28	Брусок деревянный 5 х 5 х 10 см	пара	4	8	10	16	–
29	Канат оградительный с флажками	метр	100	100	100	200	–

30	Колодки стартовые	пара	2	4	6	8	–
31	Комплект нагрудных номеров	комплект	1	1	1	2	от 1 до 100
32	Комплект указателей метража	комплект	1	1	1	2	от 10 до 60 м
33	Мяч:						
33.1	набивной медбол 1 кг	штука	5	10	15	20	–
33.2	набивной медбол 2 кг	штука	5	10	15	20	–
33.3	набивной медбол 3 кг	штука	5	8	10	15	–
33.4	набивной медбол 5 кг	штука	5	8	8	10	–
33.5	для метания (150 г)	штука	12	15	20	30	–
34	Планка:						
34.1	для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
34.2	измерительная для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
35	Рулетка измерительная	штука	1	1	2	4	–
36	Секундомер	штука	2	3	5	10	–
37	Стойки для прыжков в высоту	пара	1	1	2	3	–
38	Транспарант «Старт», «Финиш»	штука	1	1	2	2	–
39	Туфли беговые с шипами	пара	10	20	30	60	–
40	Эстафетная палочка	штука	8	10	16	20	–
Спортивный инвентарь для зимних видов спорта							
41	Ботинки лыжные	пара	30	60	100	150	–
42	Коньки	пара	10	20	30	50	разных размеров
43	Клюшка хоккейная	штука	12	20	30	50	–
44	Лыжи беговые	пара	30	60	100	150	–
45	Лыжные крепления	пара	30	60	100	150	–
46	Мазь лыжная	комплект	–	–	–	–	приобретается по мере необходимости
47	Палки лыжные	пара	30	60	100	150	–
48	Санки	штука	10	10	10	10	–
49	Шайба хоккейная	штука	8	12	12	18	–
Инвентарь для спортивных, подвижных и народных игр							
50	Бита для городков	штука	4	4	8	8	–
51	Волан	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
52	Ворота:						
52.1	гандбольные	пара	1	1	1	2	–
52.2	футбольные	пара	1	1	1	2	–
53	Городки	комплект	2	3	4	6	–
54	Кольцо баскетбольное	пара	4	6	8	14	–
55	Комплект для настольного тенниса	комплект	2	4	6	6	–
56	Мяч:						
56.1	баскетбольный	штука	10	20	30	60	–
56.2	волейбольный	штука	10	20	30	60	–
56.3	гандбольный	штука	4	6	10	20	–
56.4	малый резиновый	штука	10	20	30	60	–
56.5	настольного тенниса	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.6	теннисный	штука	–	–	–		приобретаются по мере необходимости
56.7	футбольный	штука	5	10	15	30	–
57	Насос	штука	1	2	2	4	–
58	Ракетка:						
58.1	бадминтонная	пара	10	15	20	30	–
58.2	настольного тенниса	пара	6	12	18	24	–

58.3	теннисная	пара	5	10	15	20	–
59	Свисток судейский	штука	2	3	4	6	–
60	Сетка:						
60.1	для бадминтона	штука	1	1	2	3	–
60.2	для баскетбольных колец	пара	6	10	15	30	–
60.3	волейбольная	пара	1	2	3	4	–
60.4	для гандбольных ворот	пара	1	1	1	2	–
60.5	теннисная	штука	2	2	3	4	–
60.6	футбольная	пара	1	1	1	2	–
61	Стойки:						
61.1	баскетбольные	пара	1	1	2	3	–
61.2	волейбольные	пара	1	1	2	3	–
61.3	для обводки	штука	8	10	15	20	–
62	Стол для настольного тенниса	штука	2	3	4	6	–
63	Флажок судейский	штука	6	6	8	8	–
64	Часы шахматные	штука	2	4	4	6	–
65	Шашки	комплект	6	8	12	20	–
66	Шахматы	комплект	6	8	12	20	–
67	Щит баскетбольный	пара	2	4	6	10	–
Спортивный туристский инвентарь							
68	Аптечка походная	штука	2	2	4	4	–
69	Карабин туристский	штука	10	15	20	30	–
70	Компас	штука	6	8	12	20	–
71	Коврик туристский	штука	20	30	40	60	–
72	Комплект:						
72.1	костровых принадлежностей	штука	2	4	6	10	–
72.2	посуды для приготовления пищи	штука	2	4	6	10	–
73	Мешок спальный	штука	20	30	40	60	–
74	Палатка туристская	штука	6	10	10	20	–
75	Рюкзак туристский	штука	20	30	40	60	–
76	Топорик туристский	штука	2	4	6	10	–
77	Фал капроновый:						
77.1	диаметром 8–10 мм	метр	40	80	100	150	–
77.2	диаметром 12–14 мм	метр	40	40	50	50	–
Спортивный инвентарь для многоборий Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь							
85	Винтовка пневматическая	штука	2	4	6	10	
86	Патроны для винтовки пневматической	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
Дополнительный спортивный инвентарь и оборудование, приобретаемый за счет средств приносящей доходы деятельности, безвозмездной (спонсорской) помощи юридических лиц, индивидуальных предпринимателей							
Технические средства обучения							
87	Видеокамера	штука	1	1	1	1	–
88	Компьютер	штука	1	1	1	1	–
89	Мегафон	штука	1	1	2	3	–
90	Микрофон	штука	1	1	1	2	–
91	Музыкальный центр	штука	1	1	1	1	–
92	Проектор мультимедийный	штука	1	1	1	1	–
93	Телевизор	штука	1	1	1	1	–
94	Усилитель с колонками	штука	1	1	1	1	–
95	Шнур (удлинитель) электрический	штука	1	1	1	1	до 50 м
96	Экран переносной	штука	1	1	1	1	–
Спортивный гимнастический инвентарь и оборудование							
97	Веревочка с грузом	штука	2	3	4	6	до 5 м
98	Тренажер (операционный или многофункциональный)	штука	2	4	4	6	–
99	Штанга	штука	1	2	2	3	–

100	Эспандер	штука	6	8	10	15	–
101	Гантели разборные	пара	4	8	10	12	до 10 кг
Спортивная экипировка для сборных команд учреждения образования							
102	Костюм спортивный	штука	10	18	20	20	–
103	Майка, полурукавка, футболка спортивная	штука	10	18	20	20	–
104	Трусы спортивные	штука	10	18	20	20	–
105	Кроссовки спортивные	пара	10	18	20	30	–

[30] К постановлению Министерства образования Республики Беларусь от 14.07.2014 № 105.

Дадатак 2

УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

Бег 1000, 1500 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Старт групавы. Вучням, якія парушылі правілы спаборніцтваў па бегу, а таксама тым, хто не фінішаваў, у пратакол выканання кантрольных практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

Хадзьба 2000, 3000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна. Рэкамендуецца выконваць тэставае практыкаванне асобна сярод юнакоў і дзяўчат. Пры невялікай напаўняльнасці класа дапускаецца выкананне практыкавання адначасова ўсімі вучнямі. Група юнакоў (дзяўчат) стартуе адначасова. Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на бег, чаргаваць бег з хадзьбой, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Час пераадолення дыстанцыі вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

6-хвілінны бег выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне размячаецца на кожныя 10 або 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод юнакоў і дзяўчат. Група юнакоў (дзяўчат) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па сканчэнні шасці мінут настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, дзе іх застаў сігнал. Потым настаўнік кожнаму вучню індывідуальна вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе вучань перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 метраў.

Падцягванне ў вісе на высокай перакладзіне выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча віс хватам

зверху. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца згінанні тулава і ног у каленных суставах, развядзенне, скрыжаванне і іншыя рухі нагамі, рыўкі, махі і разгойданне, перахопліванні рук. Падцягванне залічваецца, калі падбароддзе вучня знаходзіцца вышэй за ўзровень перакладзіны, а пры апусканні рукі поўнасцю выпрамляюцца ў локцевых суставах.

Падыманне тулава за 1 хвіліну выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча «лежачы на спіне, рукі скрыжаваныя перад грудзьмі, далоні на локцевых суставах, стопы ног зафіксаваныя». Вугал у каленным суставе павінен складаць 90°.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дакрананні

локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дакрананнем лапаткамі да гімнастычнага мата.

Падыманне і апусканне прамых ног за 1 хвіліну выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі за галавой, прамыя ногі разам. Настаўнік ці другі вучань размяшчаецца з боку галавы тэсціруемага і ўтрымлівае яго за локцевыя суставы. Па сігнале настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) вучань падымае прамыя ногі да вугла 90° да моманту дакранання галёнкай да гімнастычнай палкі, якую загадзя замацавалі ў нерухомым становішчы або якую ўтрымлівае настаўнік. Затым падыспытны апускае ногі, дакранаецца пяткамі да гімнастычнага мата. Залічваецца колькасць поўных цыклаў (падыманне і апусканне) на працягу 1 мінуты.

Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на брусах. Вучань скачком прымае зыходнае становішча «ўпор на паралельных брусах, рукі выпрамленыя ў локцевых суставах, ногі паралельныя». Захоўваючы прамое становішча тулава і ног, вучань згінае рукі ў локцевых суставах да вугла, не меншага за 90°, і, выпрамляючы рукі, вяртаецца ў зыходнае становішча. Не дапускаецца згінаць ногі і тулава, скрыжоўваць ногі, а таксама выконваць рыўковыя рухі. Залічваецца колькасць згінанняў і разгінанняў рук без парушэння ўказаных патрабаванняў.

Бег 30 метраў праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага або нізкага старту.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў па бегу (фальстарт), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Скачкі праз кароткую скакалку за 1 хвіліну выконваюцца на цвёрдым пакрыцці (у спартыўнай зале, на гульнявой пляцоўцы або бегавой дарожцы стадыёна). Кручэнне скакалкі выконваецца толькі наперад. Скачкі выконваюцца з абавязковай апорай на абедзве нагі адначасова. Дапускаецца выкарыстоўваць любыя скакалкі прамысловай вытворчасці або самаробныя (напрыклад, з турысцкага фала). Забараняецца выкарыстоўваць на скакалцы ўстаўкі-ўцяжарвальнікі. Пры памылцы ў час выканання скачкоў секундамер не спыняецца, а вучань працягвае выконваць скачкі. Залічваецца сумарная колькасць скачкоў на працягу 30 секунд або 1 мінуты.

Чаўночны бег 4 х 9 метраў выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу не большая за 2 чалавекі. Кожнаму вучню даецца 2 спробы запар. Па камандзе «Падрыхтавацца!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі) і прымаюць становішча высокага старту ў напрамку пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага вучня ляжаць два брускі 50 х 50 х 100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго.



Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, дзе кожны бярэ адзін брусок (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш»,

кладуць на яе (ці за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся на лініі. Падбегшы да лініі, бяруць свой другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы скорасці, перасякаюць яе з бруском у руках.

Час выканання чаўночнага бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 секунды. Залічваецца лепшы вынік з дзвюх спроб.

Скачок у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі выконваецца на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Не дапускаецца выконваць скачкі ў яму з пяском. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Трайны скачок у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі выконваецца на падлозе спартыўнай залы або на дарожцы стадыёна з прызямленнем пасля трэцяга скачка ў скачковую яму. Скачкі выконваюцца штуршком дзвюма нагамі злітна без затрымак і спыненняў. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі выконваецца ў спартыўнай зале з зыходнага становішча «седзячы, ногі паасобку, пяткі на кантрольнай лініі». Выкарыстоўваецца мяч вагой 1 кг. Вучань утрымлівае мяч дзвюма рукамі над галавой, затым згінае рукі ў локцевых суставах, апускае мяч за галаву і рэзкім рухам кідае яго ўперад-уверх. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Нахіл уперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе».

Вучань садзіцца на падлогу з боку знака «–» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі «ОВ» упіраюцца ва ўпоры для ног, стопы вертыкальна. Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі ў каленных суставах.

Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД.На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнёныых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.



Нахіл уперад з зыходнага становішча «стоячы на гімнастычнай лаўцы». Для ацэнкі выніку выкарыстоўваецца вымяральная лінейка, прымацаваная вертыкальна да гімнастычнай лаўкі. Вучань прымае зыходнае становішча, «пяткі і наскі ног разам». Наскі не выходзяць за край гімнастычнай лаўкі. Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Не дапускаецца згінанне ног у каленных суставах. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнёных (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.

Дадатак 3

ГАДЗІНА ЗДАРОЎЯ І СПОРТУ
X–XI класы
(по 35 учебных часов)

Баскетбол

Інвентар для гульні ў баскетбол, яго захоўванне і догляд. Абсталяванне месцаў заняткаў баскетболам у спартыўнай зале і на адкрытай пляцоўцы.

Правілы гульні. Правы і абавязкі гульцоў. Памеры пляцоўкі для гульні і баскетбольнага мяча. Гульнявы час. Пачатак гульні. Спрэчны мяч. Укідванне мяча з-за бакавой і пярэдняй ліній. Парушэнні правіл: прабежка, двайное вядзенне.

Стойка баскетбаліста – высокая, сярэдняя, нізкая. Хадзьба, бег, перамяшчаючыся тварам наперад. Перамяшчэнні прыстаўнымі крокамі тварам, правым, левым бокам наперад, спінай наперад. Бег па перыметры пляцоўкі з паскарэннямі і запавольваннямі, чаўночны бег. Скачкі з кароткага разбегу штуршком дзвюма нагамі, штуршком адной нагой. Спыненне скачком. Спыненне двума крокамі. Павароты стоячы на месцы наперад і назад. Павароты ў спалучэнні з рухамі і спыненнямі.

Стойка абаронцы з выстаўленай нагой наперад, з размяшчэннем ступняў ног на адной лініі. Рознае становішча рук падчас перамяшчэння тварам наперад, спінай наперад. Перамяшчэнні прыстаўнымі крокамі ў бакі, назад, наперад. Спалучэнне спосабаў перамяшчэння са спыненнямі і паваротамі. Перамяшчэнні ў абароннай стойцы па сігналах.

Перадачы мяча дзвюма рукамі. Лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей. Лоўля мяча дзвюма рукамі і адной рукой пры сустрэчным руху. Лоўля мяча, які коціцца, дзвюма і адной рукой. Лоўля мяча, які ляціць нізка. Лоўля мяча ў скачку. Лоўля мяча ў спалучэнні са спыненнямі, паваротамі.

Перадачы мяча дзвюма рукамі зверху, адной рукой ад пляча з месца і ў руху. Спалучэнне прыёмаў «лоўля – перадача – паварот», «паварот – лоўля – перадача».

Вядзенне мяча з высокім адскокам на месцы, у руху са змяненнем напрамку і вышыні адскоку. Вядзенне мяча з абводкай перашкод. Вядзенне мяча ў спалучэнні са спыненнямі і паваротамі, кідком мяча ў карзіну. Эстафеты з вядзеннем мяча.

Захоп мяча. Вырыванне і выбіванне мяча ў гульца, які спыніўся пасля вядзення і стаіць на месцы. Супрацьдзеянне вядзенню. Накрыванне мяча. Перахопліванне мяча, стоячы з боку, з-за спіны пры перадачы, выкананай упоперак поля або ўздоўж пляцоўкі.

Кідкі мяча па кальцы дзвюма рукамі ад грудзей. Кідок мяча адной рукой ад пляча. Кідкі мяча па кальцы з блізкай адлегласці. Кідкі мяча пад вуглом да шчыта з адскокам ад шчыта, у руху. Кідкі мяча з наступным рухам за кідком. Штрафныя кідкі. Спалучэнне прыёмаў «перадача – вядзенне – кідок».

Тактыка нападзення – дзеянні гульцоў без мяча і з мячом.

Выбар спосабу, напрамку і хуткасці перамяшчэння. Спалучэнне вывучаных спосабаў перамяшчэння з мэтай вызвалення ад апекі абаронцы. Выхад на свабоднае месца для атрымання мяча насустрач партнёру з мячом, убок ад партнёра з мячом.

Прымяненне паваротаў з мэтай прыкрывання мяча ад праціўніка.

Выкарыстанне вывучаных спосабаў перадачы мяча ў залежнасці ад адлегласці і напрамку, становішча абаронцы. Мэтазгоднасць вядзення мяча, выбар напрамку вядзення мяча.

Выбар спосабу выканання кідка мяча па кальцы з ліку вывучаных кідкоў у залежнасці ад гульнявой сітуацыі.

Прымяненне вывучаных спосабаў абароннай стойкі ў залежнасці ад месца становішча нападальніка, які валодае мячом і без мяча.

Супрацьдзеянне выхаду на свабоднае месца для атрымання мяча.

Выбар моманту і прымяненне вырывання і выбівання мяча з рук гульца для перахоплівання мяча. Дзеянні аднаго абаронцы супраць двух нападальнікаў. Дзеянні абаронцаў пры абароне зоннай 2:1:2. Пераход ад асабістай абароны да зоннай.

Абарона пры ўвядзенні мяча з-за бакавой, пярэдняй ліній, пры спрэчным. Расстаноўка і групавыя дзеянні пры выкананні штрафнога кідка.

Шматразовае паўтарэнне вывучаных тактычных дзеянняў (індывідуальных, групавых, камандных) у абароне і нападзенні без супраціўлення і з супраціўленнем.

Эстафеты з выкананнем асобных тэхнічных баскетбольных прыёмаў у розных спалучэннях. Гульні, якія падводзяць да баскетбола, – «Мяч капітану», «Барацьба за мяч».

Выкарыстанне спалучэнняў вывучаных прыёмаў тэхнікі ў гульнявых сітуацыях. Вучэбныя гульні па правілах міні-баскетбола.

Валейбол

Агульная фізічная падрыхтаванасць – фундамент спартыўнага майстэрства. Узроставыя асаблівасці выхавання фізічных якасцяў. Паказанні і проціпаказанні да заняткаў валейболам.

Значэнне фізічнай падрыхтоўкі валейбалістаў для развіцця спецыяльных фізічных якасцяў. Агульныя паняцці пра рухальнае ўменне і рухальны навык, ступень гатоўнасці да авалодання тэхнічным прыёмам. Паняцце пра спартыўную трэніроўку і спартыўную форму. Паняцце пра стомленасць і ператамленне. Меры папярэджання ператрэніраванасці.

Правілы гульні. Правы і абавязкі гульцоў і суддзяў. Пачатак гульні, колькасць партый, правіла трох дотыкаў, лік гульні. Пераможца і пераможаны.

Папярэдняя падрыхтоўка, накіраваная на выхаванне «адчування мяча»: практыкаванні, рухавыя гульні і эстафеты з кідкамі, перадачамі, лоўляй, перакочваннем, жангліраваннем мяча з рознага зыходнага становішча, на месцы і ў руху.

Перамяшчэнні гульца ў высокай, сярэдняй, нізкай стойках: прыстаўныя крокі, двайны крок, скачок, бег, скачкі, спыненні пасля перамяшчэнняў. Перамяшчэнні па арыенцірах, па гукавым сігнале, спалучэнне перамяшчэнняў са спыненнямі.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху на месцы: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі; у пары з адскокам ад падлогі, у пары, над сабой.

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу на месцы: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі; у пары (з адскокам ад падлогі і без адскоку), над сабой (з адскокам ад падлогі і без адскоку).

Падача ніжняя прамая: у сцяну, у пары, праз сетку на 3–6 метраў ад яе, паступова павялічваючы адлегласць, праз сетку на 8 метраў ад яе, з месца падачы. Верхняя прамая перадача на сілу і дакладнасць у зоны 1, 6, 5 пляцоўкі. Падача ў скачку.

Прамы нападны ўдар з розных зон пярэдняй лініі з перадач, розных па вышыні і хуткасці. Нападныя ўдары з пераводам направа з паваротам і без павароту тулава. Удары больш слабай рукой. Кісцевыя і падманныя ўдары.

Блакаванне нападнага ўдару: адзіночнае, групавое, зоннае. Страхоўка і самастрахоўка дзвюма і адной рукой.

Прыём падач і нападных удараў знізу дзвюма рукамі. Прыём мяча знізу адной рукой, накіраваны ў зону размяшчэння «злучнага» гульца. Прыём падманных нападных удараў і мячоў, якія адскочылі ад сеткі.

Эстафеты і спаборніцкія заданні з выкананнем тэхнічных валейбольных прыёмаў у розных спалучэннях.

Выкарыстанне спалучэнняў вывучаных прыёмаў тэхнікі ў гульнявых сітуацыях і ў вучэбнай гульні.

Гандбол

Зараджэнне гандбола як спартыўнай гульні. Правілы гульні ў гандбол. Жэсты суддзяў у гульні. Гісторыя беларускага гандбола. Гандбол у праграме Алімпійскіх гульняў. Рэспубліканскія і міжнародныя спаборніцтвы па гандболе. Пляцоўка і мяч для гульні ў гандбол і міні-гандбол. Прафілактыка траўматызму: размінка, выкананне патрабаванняў да месцаў правядзення заняткаў, інвентару, адзення і абутку.

Бег са змяненнем хуткасці перамяшчэння, па прамой і зігзагам з выскокваннем на адной назе; бег зігзагам з рэзкім змяненнем напрамку руху (выпадам убок); пераход ад бегу спінай наперад да бегу тварам наперад і наадварот.

Скачкі ў правы і левы бок (у вышыню і даўжыню) штуршком адной і дзвюма нагамі. Падзенне на рукі і грудзі, падзенне на сцягно з перакатам на спіну.

Вядзенне мяча штуршком, ударам, падкідваннем адной рукой, папераменна правай і левай рукой пры руху па прамой, змейкай, васьмёркай, чаўнаком. Вядзенне адначасова двух мячоў. Вядзенне з пераследам. Увядзенне мяча ў гульню перадачай адной рукой з-за бакавой лініі.

Жангліраванне двума мячамі. Спыненне мяча, які коціцца, правай і левай рукой.

Перадачы мяча правай і левай рукой пры паралельным і сустрэчным руху. Перадача мяча адной рукой хлёстам зверху, збоку з месца і з разбегу, у апорным становішчы і ў скачку партнёру, які рухаецца ў адным напрамку, у процілеглым напрамку. Перадача мяча з пераадоленнем перашкод (стойкі, шырмы, абаронца актыўны і пасіўны).

Лоўля мяча, які ляціць на розным узроўні і з розных напрамкаў, адной і дзвюма рукамі ў руху, скачку. Лоўля мяча адной рукой без захопу пальцамі (выцягнуць руку, перасякаючы напрамак палёту мяча).

Кідкі мяча па варотах левай і правай рукой з апорнага становішча і ў скачку. Кідок адной рукой хлёстам зверху з адбітым адскокам; кідок хлёстам збоку са слізгальным адскокам у апорным становішчы. Кідок у скачку хлёстам зверху, штурхаючыся рознаіменнай нагой, з прамога разбегу і пад вуглом у адносінах да варот. Кідок у падзенні з прызямленнем на рукі. Сяміметровы штрафны кідок у апорным становішчы.

Супрацьдзеянні: выбіванне мяча адной рукой пры шматударным вядзенні праціўніка на месцы, перамяшчаючыся крокам, бегам; блакіраванне мяча дзвюма рукамі зверху, збоку, знізу на месцы, з разбегу, у скачку.

Гульня варатара: перамяшчэнні прыстаўным крокам у плошчы варот, стойка на сагнутых і прамых (пры кідку з краю) нагах, адбіванне мяча дзвюма рукамі знізу і зверху, адной рукой збоку, адной нагой (выпад). Выбар пазіцыі ў варотах адносна напрамку кідка.

Тактыка нападзення. Скрыты адыход ад абаронцы без мяча і выбар месца для ўзаемадзеяння з партнёрам. Падманныя дзеянні перамяшчэннем і адкрыты адыход з мячом і без мяча. Паралельныя ўзаемадзеянні двух і больш нападальнікаў «на сцяжку» і «без сцяжкі» абаронцаў. Унутранае крыжовае ўзаемадзеянне.

Камандныя дзеянні ў нападзенні: узаемадзеянне пры вуглавым, бакавым, вольным кідках; імклівае нападзенне «адрыў»; пазіцыйнае нападзенне з пачатковай расстаноўкай 1: 5.

Тактыка абароны. Апека гульцоў без мяча: выбар адлегласці да нападальніка адносна хуткасці яго перамяшчэння і становішча гульца з мячом; асабістая абарона па ўсім полі. Пераключэнне на апеку іншага гульца змяненнем паміж двума абаронцамі падапечных нападальнікаў.

Эстафеты і спаборніцкія заданні з выкананнем вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у розных спалучэннях.

Выкарыстанне спалучэнняў вывучаных прыёмаў тэхнікі ў гульнявых сітуацыях і ў вучэбнай гульні.

Футбол

Узнікненне і развіццё гульні ў футбол у Рэспубліцы Беларусь (1906–1941 гг.). Пасляваенны футбол у рэспубліцы: стварэнне спартыўных школ, удзел ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх спаборніцтвах (ад «Скуранога мяча» да чэмпіянату Рэспублікі Беларусь у 1982 г.) дзяцей, юнакоў, дарослых (1945–1991). Сучасны стан футбола ў Рэспубліцы Беларусь. Фактары развіцця самай папулярнай гульні ў Беларусі, Еўропе і іншых рэгіёнах свету. Асноўныя рэспубліканскія і міжнародныя спаборніцтвы.

Прычыны, якія прыводзяць да футбольнага траўматызму. Найбольш тыповыя траўмы футбалістаў. Прафілактыка траўматызму: патрабаванні да месцаў правядзення заняткаў, інвентару, адзення і абутку.

Правілы гульні ў футбол. Гульнявое поле (памеры, гульнявая паверхня, лініі на полі, зоны і месцы). Памеры футбольных і міні-футбольных варот. Памеры, вага, стандарты футбольных мячоў. Удзельнікі гульні (састаў каманды, асноўны састаў, запасныя гульцы, капітан каманды, суддзі). Гульнявая форма. Замена гульцоў. Гульнявы час. Перапынкі і затрымкі. Паводзіны гульцоў (сумленная гульня, парушэнні і санкцыі). Пераможца і пераможаны ў гульні, нічыйны вынік.

Вядзенне мяча адной нагой рознымі часткамі і бокам ступні з рознай хуткасцю, у розных напрамках.

Вядзенне мяча папераменна правай і левай нагой па прамой, змейкай, васьмёркай, чаўнаком.

Вядзенне адначасова двух мячоў.

Перадачы, удары і спыненні мяча правай і левай нагой.

Спыненне мяча, які ляціць, нагой, грудзямі.

Падманныя дзеянні і адбор мяча выбіваннем, блакаваннем ступні, штуршком у плячо.

Удары па нерухомым мячы сярэдзінай пад’ёму, унутраным бокам ступні, наскам з пападаннем у вароты.

Жангліраванне мячом адной нагой, папераменна правай і левай нагой, нагамі і галавой.

Гульня варатара: лоўля мячоў, якія коцяцца і ляцяць насустрач, лоўля і адбіванне мяча рукамі, стоячы на месцы і ў руху, лоўля мяча рукамі ў падзенні, увядзенне мяча ў гульню кідком адной рукой, ударам нагой па нерухомым мячы і пасля накідвання.

Эстафеты і рухавыя гульні з вядзеннем і перадачамі мяча.

Дзеянні з мячом (вядзенне, перадачы, спыненні, прыём мяча і інш.) у спалучэнні з выкананнем заданняў па зрокавым сігнале; перадачы мяча ў парах, тройках у руху; гульнявыя практыкаванні ў розных нераўналікіх саставах на пляцоўках розных памераў і канфігурацый з рознымі задачамі атакавальнага або абарончага плана; азнаямленне з фазамі гульні (пачатак, развіццё і завяршэнне атакі; дзеянні пасля зрыву атакі і метады арганізацыі абароны); удзел у спаборніцкіх гульнях у малых саставах, на паменшаных палях.

Гульня ў футбол і міні-футбол па спрошчаных правілах 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 гульцоў.

Тэніс настольны.

Асноўныя напрамкі і этапы развіцця настольнага тэніса ў Беларусь Кароткія звесткі пра стан настольнага тэніса за мяжой. Настольны тэніс у праграме Алімпійскіх гульняў. Міжнародная федэрацыя настольнага тэніса (ITTF), федэрацыя настольнага тэніса (ETTU). Дасягненні беларускіх спартсменаў.

Правілы гульні. Удасканаленне інвентару. Відазмяненне тэхнікі настольнага тэніса. Віды спаборніцтваў: асабістыя, камандныя, асабіста-камандныя першынствы, розыгрыш кубкаў, чэмпіянаты. Сістэмы розыгрышу: з выбываннем, кругавая, змешаная. Правілы

бяспекі на занятках настольным тэнісам. Рацыянальная тэхніка – неабходная ўмова дасягнення высокіх спартыўных вынікаў у настольным тэнісе.

Абсталяванне спартыўнай залы для гульні ў настольны тэніс. Тэнісныя стол, сетка, ракеткі, мячы. Тэхнічныя сродкі (прыстасаванні і трэнажоры).

Стылі гульні. Хуткая, стабільная, актыўная, разнастайная, дакладная гульня – аснова майстэрства ў настольным тэнісе.

Набіванне тэніснага мяча на ракетцы высока-нізка; па чарзе тыльным альбо далоневым бокам і кантам ракеткі; аб сцяну з паваротам на 360° у момант адскоку мяча, з прысяданнем, з перакладваннем ракеткі ў іншую руку.

Кідкі мяча ў сцяну і лоўля рознымі спосабамі (правай, левай рукой, з дадатковымі скачкамі, прысяданнямі, паваротамі).

Тэхнічная падрыхтоўка гульца: стойкі, захопы ракеткі, аднакрокавы спосаб перамяшчэння і паваротаў, размеркаванне цэнтра цяжару пры выкананні ўдараў. Зыходнае становішча рук, ног, тулава, ракеткі пры выкананні пэўных тэхнічных прыёмаў. Месца ўдару мяча на ракетцы. Замах. Рухі кісці, перадплечча, пляча, тулава, рух ракеткі. Выхад з удару.

Падрэзка справа і злева (падрэзка накату і топ-спіна). Пачатковае становішча рук, ног, тулава, ракеткі. Месца ўдару мяча на ракетцы. Замах. Рухі кісці, перадплечча, пляча, тулава, ракеткі.

Топ-спін справа і злева. Адрозненні ад накату справа і злева. Пачатковае становішча рук, ног, тулава, ракеткі. Замах. Месца ўдару мяча на ракетцы. Рухі кісці, перадплечча, пляча, тулава пры топ-спіне.

Топ-спин-удар. Востры ўдар. Адрозненні ў выкананні ўдараў па дыяганалі, па прамой, у цэнтр стала. Адрозненні ў выкананні ўдараў у вышэйшым пункце адскоку, з паўлёту і па мячы, які апускаецца. Адрозненні ў выкананні ўдараў з блізкай, сярэдняй, далёкай зон. Адрозненні ў выкананні ўдараў па падрэзцы, накаце, топ-спіне.

Падачы. Кароткія, доўгія.3 верхнім, ніжнім, бакавым кручэннямі. Падачы з высокім падкідваннем мяча. Правілы і тэхніка падкідвання. Правіла адкрытай падачы. Імітацыя складаных падач з падманным рухам корпуса і рукі з ракеткай.

Імітацыя ўдараў з ракеткай і без ракеткі з абцяжараннем у руцэ.

Імітацыя адзіночных удараў, серыйных удараў, удараў з перамяшчэннем направа-налева, наперад-назад, удараў у розным тэмпе, стоячы перад люстэркам, удараў у зададзеным тэмпе з вар'іраваннем ад павольнага да максімальнага на месцы і ў руху.

Асновы тэхнікі штуршка злева. Выкананне штуршка злева ў перамяшчэнні направа-налева, наперад-назад. Гульня штуршком злева доўга-каротка. Гульня па мячы, які ўзыходзіць, апускаецца, у вышэйшым пункце адскоку мяча.

Падача штуршком злева ў абазначаныя на стале зоны (па шырыні і даўжыні стала). Імітацыя штуршка злева ля стала з ракеткай у руцэ. Паэтапнае выкананне ўдару: замах, момант удару, выхад з удару, вяртанне ў зыходнае становішча.

Асновы тэхнікі накату справа. Віды перамяшчэнняў у правай стойцы пры накатах справа. Хуткая падача накатам справа, падача накатам у абазначаныя на стале зоны.

Спалучэнне накату справа і штуршка злева.

Асновы тэхнікі накату злева. Перамяшчэнні ў левай стойцы пры накаце злева. Павароты пры ўдарах накатамі справа і злева. Спалучэнне накатаў справа і злева.

Асновы тэхнікі зрэзкі (падрэзкі) злева. Падача зрэзкай злева направа ў абазначаныя на стале зоны. Спалучэнне зрэзкі злева і накату.

Накат справа па кручэнні, якое змяняецца (накат па штуршку, па накаце і па зрэзцы).

Гульня ў «млын» у адзін бок, у другі. Гульня дзвюма ракеткамі, гульня «негульнявой» рукой. Гульня на двух сталах па чарзе, гульня адначасова двума мячамі. Гульня аднаго супраць двух, трох чалавек. Гульня ударам, які вывучаецца, «трохвугольнікам» з аднаго пункта ў два пункты процілеглага боку (напрыклад, з правага вугла направа і налева); з двух пунктаў, трох пунктаў, з адной трэці стала, з паловы стала, з дзвюх трацей стала; па кароткім і доўгім прыходзячых мячах.

Гульня і спаборніцтвы на дакладнасць пападання ў абазначаныя на стале зоны. Гульня «васьмёркай» па чарзе па прамой і па дыяганалі.

Эстафеты і гульні з элементамі гульні ў настольны тэніс.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 93

Учебная программа по учебному предмету
«Допризывная и медицинская подготовка»
для XI класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания

ДОПРИЗЫВНАЯ ПОДГОТОВКА

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Допризывная подготовка организуется и проводится на основании Закона Республики Беларусь «О воинской обязанности и воинской службе» в учреждениях общего среднего, профессионально-технического и среднего специального образования.

Целью учебного предмета является патриотическое воспитание учащихся, формирование у обучаемых знаний и умений, необходимых для защиты суверенитета Республики Беларусь, а также морально-психологической готовности юношей к военной службе.

Задачами изучения допризывной подготовки являются:

образовательная – получение основных общих и специальных знаний, включающих в себя основы военного дела, знание конституционной обязанности граждан по защите Республики Беларусь, ознакомление с историей и современным состоянием Вооруженных Сил Республики Беларусь, формирование представления о героизме и мужестве белорусского народа в деле защиты Отечества, знание основ оказания первой помощи;

развивающая – развитие дисциплинированности, ответственности, стойкости, познавательных интересов учащихся;

воспитательная – воспитание у учащихся патриотизма, нравственности, духовности, гуманности, коллективизма, взаимопомощи и взаимоуважения, чувства личной ответственности за выполнение конституционного долга по защите Республики Беларусь.

Содержание обучения направлено на формирование у обучаемых высоких морально-психологических качеств, подготовку учащихся к выполнению долга по защите Отечества, развитие у них навыков поведения и действий в соответствии с требованиями общевоинских уставов.

Содержание предмета реализовано на основе деятельностного, личностно ориентированного, культурологического и компетентностного подходов.

Асаблівую ўвагу неабходна спыніць на выкарыстанні разнастайных відаў дзейнасці: праца з рознымі крыніцамі інфармацыі (праца з вучэбнымі дапаможнікамі, табліцамі і інструкцыямі, электроннымі сродкамі навучання), сумеснае выкананне заданняў настаўніка, удзел у дыскусіі па праблемных сітуацыях, выкананне практычнай работы, рашэнне сітуацыйных задач, аналіз экстрэмальных сітуацый, адпрацоўка практычных уменняў і навыкаў па аказанні першай дапамогі з выкарыстаннем: манекена, накладкі на руку (для адпрацоўкі навыкаў падскураных і ўнутрымышачных ін’екцый), разнастайных відаў бінтоў, лейкапластыраў, тэрмометра, аднаразовага шпрыца.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

Назва раздзела	Колькасць гадзін			
	усяго	у тым ліку		
		X клас	медыцынская практыка	XI клас
Мэты і задачы медыцынскай падрыхтоўкі	1	1		
Першая дапамога пры траўмах і няшчасных выпадках	47	23	24	
Лекавыя прэпараты і расліны	6	4	2	
Медыка-біялагічныя аспекты палавога выхаваня	7	7		
Агульны догляд за хворымі і пацярпелымі	17		4	13
Першая дапамога пры захворваннях і атручэнні	11			11
Інфекцыйныя захворванні	11			11
Усяго гадзін	100	35	30	35

XI клас

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 36 гадзін)

Агульны догляд за хворымі і паражонымі (13 гадзін)

Догляд за хворымі і паражонымі. Асаблівасці догляду за хворымі і паражонымі ў працэсе іх лячэння. Асноўныя прадметы догляду за хворымі: паільнік, мочапрыёмнік, судно падкладное, гумавы круг, піпетка, грэлка гумавая, кружка Эсмарха.

Тэрмометр. Вымярэнне тэмпературы цела.

Падлік частаты пульса. Назіранне за дыханнем хворага і падлік дыхальных рухаў.

Практычная работа № 1

Вымярэнне тэмпературы цела. Падлік частаты пульса, частаты дыхання.
Паняцце аб артэрыяльным ціску. Тэхніка вымярэння артэрыяльнага ціску.

Практычная работа № 2

Вывучэнне тэхнікі вымярэння артэрыяльнага ціску.

Асноўныя механізмы рэфлекторнага ўздзеяння на крывазварот – цеплавыя і холадавыя працэдуры. Паказанні і супрацьпаказанні. Тэхніка пастаноўкі кампрэсаў, гарчычнікаў, грэлак. Прымяненне холаду: пузыр з лёдам, прымочкі.

Практычная работа № 3

Вывучэнне тэхнікі накладання гарчычнікаў, кампрэсаў, грэлкі, пузыра з лёдам.
Метады і шляхі ўвядзення лекавых рэчываў. Правілы выканання ін'екцый (падскурнай і ўнутрымышачнай.) Магчымыя ўскладненні пры выкананні ін'екцый.

Практычная работа № 4, 5

Вывучэнне будовы аднаразовага шпрыца, яго падрыхтоўка і прымяненне.
Набыццё практычных навыкаў па падскурным і ўнутрымышачным увядзенні лекавых сродкаў.

Асабістая гігіена хворых. Змена нацельнай і пасцельнай бялізны. Догляд за скурай хворага. Мыццё і абціранне цяжкахворых. Гігіена поласці рота, вачэй, вушэй, носа. Пролежні. Прафілактыка пролежняў.
Гігіена зроку. Прафілактычныя меры па працы з камп'ютарам.
Паняцце лячэбнага харчавання. Харчаванне хворых. Харчовы рацыён. Прафілактыка авітамінозу і гіпавітамінозаў.
Псіхалогія паводзін хворага. Узроставыя асаблівасці, фізічны стан. Тыпы рэакцыі чалавека на хваробу. Навыкі зносін з хворымі.

Арганізацыя аказання медыцынскай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь. Міжнародны рух Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. Мэты і задачы, гуманітарная дзейнасць, асноватворныя прынцыпы, эмблема. Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа і яго дзейнасць у развіцці і рэалізацыі гуманітарнага права.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзеёнасці:

Навучэнцы павіны:
ведаць;
метады і шляхі ўвядзення лекавых рэчываў;
магчымыя ўскладненні пра выкананні ін'екцый;
асноўныя механізмы рэфлекторнага ўздзеяння на крывазварот;
асаблівасці харчовага рацыёну хворых пры разнастайныхзахворваннях;
тыпы рэакцыі чалавека на хваробу;
асноватворныя прынцыпы дзейнасці міжнароднага руху Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа;
умець:
называць і вызначаць прызначэнне асноўных прадметаў догляду за хворымі;
тлумачыць неабходнасць прафілактыкі пролежняў, авітамінозу і гіпаавітамінозу;
тлумачць асаблівасці асабістай гігіены хворых, гігіены зроку;

разумець эмоцыі іншых людзей, спачуваць, суперажываць;

карыстацца вучэбным дапаможнікам, дадатковай і даведачнай літаратурай, электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі;

валодаць:

тэхнікай накладання гарчычнікаў, кампрэсаў, грэлкі, пузыра з лёдам;

навыкамі змены нацельнай і пасцельнай бялізны;

навыкамі напаўнення аднаразовага шпрыца;

навыкамі падскурнага і ўнутрымышачнага ўвядзення лекавых сродкаў;

тэхнікамі вымярэння тэмпературы цела, падліку дыхальных рухаў і падліку частаты пульсу;

навыкамі апрацоўкі поласці рота, вачэй, вушэй, носа хворага.

Першая дапамога пры захворваннях (11 гадзін)

Першая дапамога. Мэты і задачы, значэнне. Паняцце аб сімптоме і сіндроме хваробы. Знешнія і ўнутраныя фактары, якія ўплываюць на ўзнікненне і развіццё захворванняў.

Хваробы органаў дыхання. Асноўныя сімптомы захворванняў органаў дыхання. Востры бранхіт, пнеўманія, бранхіяльная астма: прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка захворванняў органаў дыхання.

Хваробы органаў крывазвароту Асноўныя сімптомы захворванняў органаў крывазвароту. Ішэмічная хвароба сэрца (стэнакардыя, інфаркт міякарда), гіпертанічная хвароба, непрытомнасць, інсульт. Прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка сардэчна-сасудзістых парушэнняў.

Хваробы органаў страваванння. Асноўныя сімптомы захворванняў органаў страўнікава-кішэчнага тракту. Востры гастрыт, язвенная хвароба страўніка і дванаццаціперснай кішкі, вострая пячоначная коліка. Прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка.

Хваробы эндакрыннай сістэмы. Цукровы дыябет. Асноўныя сімптомы і прычыны. Акаааанне першай дапамогі пры дыябетычнай коме. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка.

Хваробы органаў мочавыдзяляльнай сістэмы. Асноўныя сімптомы захворванняў мочавыдзяляльнай сістэмы. Востры піеланефрыт, ныркавая коліка, востры цысціт. Прычыны ўзнікнення. Аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду. Прафілактыка.

Радыяцыйныя паражэнні. Радыеактыўнасць. Біялагічнае ўздзеянне іанізаванага выпраменьвання на арганізм чалавека. Вострая прамянёвая хвароба. Асноўныя сімптомы. Аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі.

Анкалагічныя захворванні. Анкалогія. Асноўныя сімптомы і прынцыпы дыягностыкі пухлін. Рак малочнай залозы, лёгкіх, страўніка. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка анкалагічных захворванняў.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзеёнасці:

Навучэнцы павіны:

ведаць;

мэты і задачы першай дапамогі;

асноўныя сімптомы і прычыны ўзнікнення захворванняў органаў: дыхання, крывазвароту, страваванння, эндакрыннай сістэмы**,** мочавыдзяляльнай, сістэмы;

на ўзроўні ўяўлення аб сімптомах вострай прамянёвай хваробы і анкалагічных захворваннях;

умець аказваць першую дапамогу пры: захворваннях органаў дыхання, крывазвароту, страваванння, эндакрыннай сістэмы**,** мочавыдзяляльнай, сістэмы;

радыяцыйным паражэнні;

валодаць навыкамі догляду за хворымі.

Інфекцыйныя захворванні (11 гадзін)

Паняцце аб інфекцыі. Прычыны ўзнікнення і распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў. Шляхі перадачы інфекцыі.

Эпідэмія, пандэмія, эпідэмічны ачаг, эпідэмічны працэс. Сучасныя метады і сродкі барацьбы з інфекцыйнымі захворваннямі.

Імунітэт. Віды імунітэту. Роля вакцын і сываратак у папярэджанні і лячэнні інфекцыйных захворванняў.

Кішэчныя інфекцыі. Брушны тыф, дызентэрыя, вірусны і сываратачны гепатыты: крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка.

Паветрана-капельныя інфекцыі. Вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, грып, ангіна: крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка.

Дзіцячыя інфекцыі. Адзёр, ветраная воспа, шкарлятына, краснуха: крыніцы інфекцыі, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы захворванняў. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка дзіцячых інфекцыйных захворванняў.

Туберкулёз. Формы туберкулёза. Крыніцы і шляхі перадачы захворвання, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка туберкулёза.

Паражэнне скуранога покрыва. Педыкулёз, кароста, мікраспарыя: крыніцы інфекцыі, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка скураных захворванняў.

Крывяныя інфекцыі. Сыпны тыф, клешчавы энцэфаліт, лейшманіёзы: крыніцы заражэння, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Прафілактыка.

Гельмінтозы. Аскарыдоз, энтэрабіёз, трыхацэфалёз: крыніцы інфекцыі, шляхі перадачы, сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі. Прафілактыка.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзеёнасці:

Навучэнцы павіны:

ведаць:

прычыны ўзнікнення і распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў;

прычыны, шляхі перадачы і асноўныя сімптомы: кішэчных, паветрана-капельных, дзіцячых і крывяных інфекцый;

крыніцы, шляхі перадачы і асноўныя сімптомы туберкулёза;

крыніцы, шляхі перадачы і асноўныя сімптомы захворванняў скуры (педыкулёз, кароста, мікраспарыя);

крыніцы, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы аскарыдоза, энтэрабіёза, трыхацэфалёза;

умець тлумачыць:

ролю вакцын і сываратак у папярэджанні і лячэнні інфекцыйных захворванняў;

неабходнасць прафілактыкі інфекцыйных захворванняў;

важнасць прафілактыкі туберкулёза, педыкулёза, каросты, мікраспарыі, аскарыдоза, энтэрабіёза, трыхацэфалёза;

валодаць навыкамі догляду за хворымі.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура»
для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання
(павышаны ўзровень)

Тлумачальная запіска

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацавана ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Вучэбная праграма грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, арыентуецца на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, на эстэтычны і творчы характар навучання беларускай літаратуры, улічвае ўзростава-інтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

Беларуская літаратура – дысцыпліна культуралагічнага цыкла, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі – сродак эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных нормаў і вартасцей. Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, адносіны і стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Вывучэнне літаратуры дапамагае вучням убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры – гэта найперш працэс жыццеспазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Змест літаратурнай адукацыі ў X–XI класах пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе працягнуць знаёмства вучняў, распачатае ў IX класе, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і паспрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з’яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання ў вучняў інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. На III ступені навучання паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

Навучанне літаратуры ў X–XI класах можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях. Павышаны ўзровень навучання літаратуры закліканы садзейнічаць паспяховай падрыхтоўцы вучняў да прафесійнай дзейнасці ў гуманітарнай галіне і накіраваны на авалоданне вучнямі даследчымі і творчымі спосабамі дзейнасці ў межах вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Пры гэтым акцэнт робіцца на фарміраванне агульнай літаратуразнаўчай культуры, уменні аналізаваць мастацкі тэкст з выкарыстаннем ведаў па гісторыі і тэорыі літаратуры, рабіць абагульненні на літаратурна-мастацкім матэрыяле, супастаўляць творы розных эпох, суадносіць асаблівасці развіцця роднай літаратуры з агульнаеўрапейскім літаратурным кантэкстам.

Вывучэнне літаратуры на павышаным узроўні дае больш шырокія магчымасці для рэалізацыі міжпрадметных сувязей, у першую чаргу з вучэбным прадметам «Беларуская мова». Еднасць гэтых дысцыплін грунтуецца на агульным прадмеце вывучэння – слове як адзінцы мовы і маўлення ў яго функцыянальным значэнні – і прадугледжвае спасціжэнне мовы і літаратуры як нацыянальна-культурных каштоўнасцей. Дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (тэатр, кіно, музыка, жывапіс і інш.), будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў уяўленняў пра заканамернасці эстэтычнага і мастацкага асваення свету чалавекам, выпрацоўцы крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі твораў. Разам з гісторыяй і грамадазнаўствам літаратура звяртаецца да праблем, непасрэдна звязаных з грамадскай сутнасцю чалавека, фарміруе гістарызм мыслення, узбагачае культурна-гістарычную памяць вучняў, выхоўвае ў іх актыўныя адносіны да рэчаіснасці, прыроды, усяго навакольнага свету.

На заключным этапе літаратурнай адукацыі актуалізуюцца, паглыбляюцца і сістэматызуюцца веды і ўменні, атрыманыя ў папярэдніх класах, што вядзе да сінтэтычнага асэнсавання літаратуры і яе канкрэтных з'яў на светапоглядным, філасофскім, культуралагічным узроўнях, да ўсведамлення вучнем сябе як асобы і да маральнага самавызначэння. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных формаў урока, шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г. д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем да ўсіх метадаў навучання з'яўляецца зарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў. Дзеля рэалізацыі дыферэнцаванага падыходу да навучання літаратуры вучням з аналітычным тыпам мыслення мэтазгодна часцей прапаноўваць заданні творчага характару; а вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей даваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэктаваць першапачатковае

суб'ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і інш.

З мэтай развіцця пазнавальных інтарэсаў, выхавання мастацка-эстэтычнага густу і фарміравання цэласнага светапогляду вучняў пры навучанні беларускай літаратуры мэтазгодна прадугледжваць рэалізацыю міжпрадметных сувязей перш за ўсё з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Беларуская мова», «Руская літаратура», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)», «Гісторыя Беларусі». Міжпрадметныя сувязі актуалізуюцца на ўсіх этапах навучання, іх рэалізацыя ў адукацыйным працэсе ўзбагачае дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (жывапіс, музыка, фотамастацтва, кіно, тэатр і інш.), эфектыўна ўздзейнічае на маральна-этычнае, інтэлектуальнае, эмацыянальнае, эстэтычнае развіццё асобы.

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з вучэбным дапаможнікам – усе гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейнасны характар, дыялагічнасць.

У адукацыйнай практыцы могуць выкарыстоўвацца як традыцыйныя, так і электронныя сродкі навучання, якія павінны быць скіраваны на дасягненне мэт і задач літаратурнай адукацыі.

Літаратуры ў сістэме адукацыі і выхавання належыць асаблівая культуратворчая роля: яна здольная пераўтвараць унутраны свет асобы і ўплываць на духоўнае ўзбагачэнне жыцця, рабіць яго па-сапраўднаму цікавым, змястоўным, насычаным.3 гэтай прычыны неабходна імкнуцца ўключаць вучняў у працэс пазакласнай работы і выхавання.

Факультатыўныя заняткі, работа літаратурных гурткоў, сістэматычны выпуск насценных і радыёгазет, бюлетэняў, часопісаў і альбомаў; падрыхтоўка спецыяльных літаратурных стэндаў, тэматычных выставак, аглядаў сучаснай літаратуры; правядзенне літаратурных ранішнікаў, вечароў, віктарын, алімпіяд, свят, сустрэч з пісьменнікамі, дзеячамі культуры і мастацтва – усё гэта спрыяе стварэнню ў класе атмасферы творчасці, духоўнасці, павагі да кнігі, да мастацкага слова.

Для арганізацыі факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры ў X–XI класах распрацавана адпаведнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне: вучэбныя праграмы, дапаможнікі для вучняў і дапаможнікі для настаўнікаў.

На вывучэнне літаратуры ў X і XI класах на павышаным узроўні адводзіцца па 105 гадзін. У X класе 93 гадзіны – на вывучэнне твораў, 10 гадзін – на творчыя работы, 2 гадзіны – на ўрокі па творах для дадатковага чытання. У XI класе 89 гадзін – на вывучэнне твораў, 12 гадзін – на творчыя работы, 4 гадзіны – на ўрокі па творах для дадатковага чытання.

Прапанаваныя праграмай анатацыі да аглядавых і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік засяроджвае ўвагу на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, вывучэнне якіх ён лічыць больш дарэчным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе*.

---

* Творы, прапанаваныя ў спісе для дадатковага чытання, можна знайсці ў кнігах серыі «Школьная бібліятэка», якія знаходзяцца ў бібліятэчным фондзе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Рэзерв вучэбнага часу настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарным планам.

XI клас
(105 гадзін)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1960 – ПАЧ. 1990-Х ГАДОЎ (60 ГАДЗІН)

Агляд (*3 гадзіны*). Літаратура ва ўмовах новай грамадскай сітуацыі. Значнасць гісторыка-сацыяльных пераўтварэнняў. Пашырэнне сферы мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры, паглыбленне яе чалавеказнаўчага і гуманістычнага зместу. Узмацненне аналітызму ў даследаванні мінулага і сучаснасці. Антываенны пафас творчасці «шасцідзясятнікаў» і філалагічнага пакалення.

Узбагачэнне светабачання беларускіх паэтаў, іх жанрава-стылёвыя пошукі (Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў, Анатоль Вярцінскі, Яўгенія Янішчыц, Васіль Зуёнак, Раіса Баравікова, Алесь Разанаў, Генадзь Пашкоў, Казімір Камейша, Пятрусь Макаль, Ніна Мацяш і інш.). Грамадзянскасць і маральна-этычная скіраванасць пафасу паэтычнай творчасці. Павышаная цікавасць да філасофскіх праблем, складаных пытанняў чалавечага жыцця.

Тэматыка, праблематыка і жанравая разнастайнасць беларускай прозы (Васіль Быкаў, Іван Мележ, Уладзімір Караткевіч, Іван Навуменка, Міхась Стральцоў, Віктар Казько, Вячаслаў Адамчык, Іван Пташнікаў, Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Іван Шамякін, Віктар Карамазаў, Янка Сіпакоў, Алесь Жук, Генрых Далідовіч, Віктар Гардзей і інш.).

Здабыткі ў жанрах драмы і камедыі (п’есы Андрэя Макаёнка, Уладзіміра Караткевіча, Міколы Матукоўскага, Алеся Петрашкевіча, Аляксея Дударава і інш.). Праблемнасць, канфліктная аснова твораў беларускіх драматургаў.

Літаратура

Бельскі, А. І. Беларуская літаратура XX стагоддзя: гісторыя і сучаснасць / А. І. Бельскі. – Мінск: Аверсэв, 2005.

Бельскі, А. І. Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе / А. І. Бельскі. – Мінск: Аверсэв, 2005.

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. Т. 4: [у 3 кн.], кн. 1: 1966–1985 / С.А.Андраюк [і інш.]; навук. рэд.: У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Мінск: Беларус. навука, 2004.

Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 2001.

І в а н Ш а м я к і н. Аповесць **«Непаўторная вясна»**; раман **«Сэрца на далоні»** *(9 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Непаўторная вясна». Пенталогія «Трывожнае шчасце» – кніга аповесцей пра даваеннае пакаленне моладзі, якое прайшло праз выпрабаванні вайны. Творчая задума кнігі. Аўтабіяграфічныя моманты ў «Трывожным шчасці». Пятро Шапятовіч і Саша Траянава – галоўныя героі пенталогіі. Адлюстраванне даваеннага жыцця моладзі ў аповесці «Непаўторная вясна». Духоўны свет Пятра і Сашы. Паэзія кахання і прыгожых чалавечых пачуццяў. Эмацыянальна-псіхалагічнае раскрыццё характараў герояў. Лірызм аўтарскага пісьма.

«Сэрца на далоні». Праблематыка рамана. Вастрыня канфлікту. Маральна-этычная сутнасць аўтарскай пазіцыі. Рэтраспектыўны зварот да падзей вайны. Сутыкненне праўды і дэмагогіі ў ацэнках дзейнасці падпольшчыкаў. Роля кар’ерыста Гукана, які хавае праўду аб актыўнай падпольнай дзейнасці доктара Савіча. Прынцыповасць і рашучасць Кірылы

Шыковіча ў выкрыцці Гукана. Сутыкненне розных маральных пазіцый. Партызанскае мінулае Яраша. Вобраз Зосі Савіч, яе жыццёвы лёс.

Маладое пакаленне ў рамане. Няўстойлівасць жыццёвай пазіцыі Славіка Шыковіча. Складаны шлях духоўнага станаўлення Тараса. Праблема ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, неабходнасць выхавання маладога пакалення.

Сімволіка назвы твора.

Значэнне творчасці Івана Шамякіна для развіцця беларускай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Пенталогія. Жанр рамана (паглыбленне паняцця).

Мастацтва* Жывапіс: *М. Будавей.* «Партрэт Івана Шамякіна»; *Н. Шчасная.* «Снежныя зімы (партрэт пісьменніка Шамякіна)»; *У. Масленікаў.* «Мае бацькі ў маі 1945 года».

∗ Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца ў першую чаргу з апорай на вядомае і на выбар настаўніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

Тэатральнае мастацтва: спектаклі «Трывожнае шчасце», «Сэрца на далоні», «І змоўклі птушкі» (па творах *І. Шамякіна*).

Кінамастацтва: мастацкія фільмы «Гандлярка і паэт» (рэж. *С. Самсонаў*), «Вазьму твой боль» (рэж. *М. Пташук*).

Літаратура

Іван Шамякін: вядомы і невядомы: успаміны, эсэ, аповесць / уклад. Т. Шамякіна. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011.

Іван Шамякін. Летапісец эпохі: успаміны, інтэрв'ю, эсэ / уклад. А. Шамякінай. – Мінск: Маст. літ., 2010.

Васіль Быкаў. Аповесці **«Сотнікаў», «Абеліск», «Знак бяды»** *(12 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Сотнікаў». Праблематыка аповесці. Чалавек перад знішчальнай сілай абставін. Вобразы Сотнікава і Рыбака ў творы, глыбокі псіхалагізм у іх распрацоўцы. Уменне Сотнікава змагацца да канца ў любых абставінах; вернасць перакананням. Трагічны фінал Сотнікава. Вобраз Рыбака, яго спрытнасць і лоўкасць. Здрадніцтва дзеля захавання свайго жыцця. Духоўная смерць Рыбака. Праблема выбару на вайне: героі ці ахвяры лёсу. Персанажы другога плана ў аповесці (староста, Дзёмчыха, Бася), іх мужнасць. Выкрыццё паліцэйскіх – прыслужнікаў немцаў – у творы (Партноў, Стась Гаманюк, Будзіла). Мастацкая дасканаласць твора. Яго сюжэт і кампазіцыя. Пейзаж у аповесці. Роля мастацкай дэталі ў абмалёўцы герояў і падзей.

«Абеліск». Ідэйна-мастацкае вырашэнне ў аповесці праблемы гераічнага. Вобраз Мароза як увасабленне ідэалу настаўніка і носьбіта духоўных асноў народа. Аўтарскае майстэрства ў раскрыцці псіхалогіі героя. Асаблівасці кампазіцыйнай будовы твора. Сімвалічны сэнс яго назвы. Трагедыйна-аптымістычны пафас аповесці.

«Знак бяды». Актуальнасць маральна-філасофскай праблематыкі аповесці. Вастрыня трагедыйнага канфлікту. Маштабнасць характараў галоўных герояў – Петрака і Сцепаніды. Глыбокі псіхалагізм аповесці. Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця з мэтай больш глыбокага раскрыцця характараў. Выкрыццё жорсткасці, бесчалавечнасці фашызму. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму. Мастацкая сімволіка твора. Экранізацыя аповесці «Знак бяды» (рэжысёр М. Пташук).

Значэнне творчасці Васіля Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў мастацкім творы (паглыбленне паняцця). Аўтарская канцэпцыя жыцця і асобы. Гераічнае і трагічнае ў літаратуры (паглыбленне паняццяў). Вобразы-сімвалы, мастацкія дэталі, іх роля ў тэксце.

Мастацтва. Жывапіс: *М. Будавей.* «Партрэт В. Быкава»; *М. Данцыг.* «Партрэт В. Быкава»; *А. Кашкурэвіч.* Ілюстрацыі да аповесцей В. Быкава «Пайсці і не вярнуцца», «Яго батальён»; *Г. Паплаўскі.* Ілюстрацыі да аповесцей В. Быкава «Дажыць да світання»,

«Сотнікаў»; *У. Тоўсцік.* «Васілю Уладзіміравічу Быкаву прысвячаецца»; «Васілёва зорка»: альбом.

Кінамастацтва: трохсерыйны тэлевізійны фільм «Доўгія вёрсты вайны» (рэж. *А. Карпаў*); фільмы: «Абеліск» (рэж. *Р. Віктараў*), «Дажыць да світання» (рэж. *М. Яршоў, В. Сакалоў*), «Знак бяды» (рэж. *М. Пташук*), «Пастка» (рэж. *Л. Мартынюк*), «Трэцяя ракета» (рэж. *Р. Віктараў*), «Узыходжанне» (рэж. *Л. Шэпіцька*), «У тумане» (рэж. *С. Лазніца*).

Літаратура

Бугаёў, Д. Я. Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе / Д. Я. Бугаёў, М. І. Верціхоўская, В. У. Верціхоўская. – Мінск: Аверсэв, 2005.

Васіль Быкаў: вядомы і невядомы: літаратуразнаўчае эсэ, успаміны / уклад. М. Мінзер. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011.

Локун, В. І. Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В. І. Локун. – Мінск: Тэхнапрынт, 2005.

Эрнэст Хемінгуэй. Аповесць **«Стары і мора»** (*2 гадзіны).*

«Стары і мора» – адзін з найлепшых твораў славутага амерыканскага пісьменніка. Праблемы жыцця і смерці, прыроды і чалавека, пераемнасці пакаленняў. Галоўны герой аповесці рыбак Санцьяга – чалавек, які не здаецца перад цяжкімі выпрабаваннямі жыцця. Яго аптымізм, высокае пачуццё чалавечай годнасці. Лейтматыў твора – словы Санцьяга: «Чалавека можна знішчыць, але яго нельга перамагчы». Падтэкст у творы.

Міхась Стральцоў. Апавяданні **«Сена на асфальце», «На чацвёртым годзе вайны», «Смаленне вепрука»** (*6 гадзін).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Сена на асфальце». Эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты. Вобраз аўтара-апавядальніка, яго «самая патаемная і самая душэўная думка» – прымірыць горад і вёску. Прырода ў творы. Глыбокі лірызм апавядання. Адметнасць кампазіцыі.

«На чацвёртым годзе вайны». Гора і нястачы, прынесеныя ў сялянскую сям'ю вайной, якую кожны з сямейнікаў перажывае па-свойму. Вобразы старой маці, нявесткі Марусі і яе маленькага сына. Заўчаснае сталенне хлопчыка, яго рашучае жаданне дапамагчы маці і бабулі, узяць на сябе адказнасць за лёс сям'і. Глыбокі псіхалагізм у паказе характараў.

«Смаленне вепрука». Адметнасць кампазіцыі апавядання. Роля мастацкай дэталі ў творы. Наватарства аўтарскага індывідуальнага стылю.

Тэорыя літаратуры. Унутраны маналог (паглыбленне паняцця).

Літаратура

Васючэнка, П. В. Міхась Стральцоў / П. В. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры. XX ст. Т. 4. Кн. другая: 1986 – 2000. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – С. 404–425.

Ніл Гілевіч. Вершы **«Край мой беларускі, край…», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...», «Паклон табе, мой беларускі краю!..»**; раман у вершах **«Родныя дзеці»** *(4 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Шырокі тэматычны змест паэзіі. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны, паэтызацыя прыроды. Глыбокі лірызм, песеннасць вершаў, фальклорныя матывы ў творчасці паэта.

«Родныя дзеці». Праблематыка твора. Вобраз галоўнага героя Сцяпана Вячоркі. Другарадныя вобразы і іх роля ў творы. Сюжэтна-кампазіцыйная структура, лірыка-публіцыстычны стыль рамана. Значэнне лірычных адступленняў.

Тэорыя літаратуры. Раман у вершах як жанр.

Мастацтва. Жывапіс: *М. Андруковіч.* «Лагойскі краявід»; *М. Бушчык* «Відная ноч».

Графіка: *А. Лапіцкая.* «Гучаць над Палессем старажытныя песні».

Музыка: *Э. Зарыцкі.* Песня «Палыновая ростань» (сл. Н. Гілевіча); *Л. Захлеўны.* Песня «Сонца ў азерцы» (сл. Н. Гілевіча); *І. Лучанок.* Песня «Я хаджу закаханы» (сл. Н. Гілевіча); *Э. Ханок.* Песня «Вы шуміце, бярозы...» (сл. Н. Гілевіча); «Аксамітавы вечар»: кампакт-дыск; «Нашы песні»: кампакт-дыск (ансамбль «Сябры»).

Літаратура

Люблю цябе, жыццё...: штрыхі да партрэта народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча / склад. Я. Стасевіча. – Мінск: Кнігазбор, 2011.

Узрост вышыні: да 80-годдзя народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча: артыкулы, эсэ, нататкі, вершы, лісты і тэлеграмы / уклад. С. Гілевіч. – Мінск: Канфіда, 2012.

Іван Чыгрынаў. Апавяданні **«Дзівак з Ганчарнай вуліцы», «У ціхім тумане»** *(4 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Памяць мінулай вайны і лёс старога лесніка Дземідзёнка. Зварот да традыцыйных каштоўнасцей, гармонія чалавека з прыродай, людзьмі, самім сабой. Вобраз аўтара-апавядальніка.

«У ціхім тумане». Новыя падыходы да асэнсавання тэмы вайны. Узаемаадносіны ахвяр і здраднікаў. Праблема віны і даравання. Вобразы Рэйдзіхі і Ганны. Гуманістычны пафас апавядання.

Мастацтва. Жывапіс: *В. Грамыка.* «Па-над Прыпяццю. 1941 год»; *А. Малішэўскі.* «Мы вернемся»; *І. Белановіч.* «Сустрэча з недалёкім мінулым».

Літаратура

Марціновіч, А. Іван Чыгрынаў: нарыс жыцця і творчасці / А. Марціновіч. – Мінск, 1998.

Іван Навуменка. Апавяданні **«Сямнаццатай вясной», «Хлопцы самай вялікай вайны»** (*4 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Сямнаццатай вясной». Паказ лёсу моладзі ў гады вайны з фашызмам. Раскрыццё ў творы характараў Цімоха, Стасі і іншых герояў. Эмацыянальнасць зачыну апавядання, лірызм аповеду. Сімвалічнасць вобраза бэзу.

«Хлопцы самай вялікай вайны». Жорсткая праўда жыцця. Адсутнасць у апавяданні элементаў рамантыкі. Унутраная самаацэнка юнакоў; жаночы, мацярынскі погляд на рэаліі вайны. Шматгранны партрэт пакалення. Роля мастацкай дэталі ў творы.

Тэорыя літаратуры. Сюжэт і яго элементы, пазасюжэтныя кампаненты твора (паглыбленне паняццяў).

Літаратура

Піскун, Л. Іван Навуменка / Л. Піскун. – Мазыр, 1997.

Генрых Бёль. Раман **«Дом без гаспадара»** (ва ўрыўках) *(2 гадзіны).*

«Дом без гаспадара» – раман пра цяжкія душэўныя пакуты пасляваеннага пакалення Германіі. Лёс удавы паэта Раймунда Баха Нэлы. Вобразы непераадоленага мінулага ў творы. Праблема бацькоў і дзяцей. Думкі аўтара пра ўсенародную віну за паўтарэнне фашызму. Глыбокае раскрыццё псіхалогіі дзяцей-сірот у рамане (Марцін і Генрых). Вобраз мастака Альберта. Сэнс назвы рамана. Асаблівасці кампазіцыі. Прыёмы аўтарскага маналога пры раскрыцці ўнутранага свету герояў.

Рыгор Барадулін. Вершы: **«Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Заспаная раніца мжыстая…», «Чалавек не ўзнікае так…», «Пакуль жывеш, развітвайся з жыццём…»** (*3 гадзіны*).

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Народнасць і самабытнасць паэзіі Рыгора Барадуліна. Сувязь яго творчасці з традыцыямі фальклору, міфалогіі, класічнай літаратуры. Шчырасць, даверлівасць пачуццяў, тонкі псіхалагізм і экспрэсіўнасць у вершах. Асаблівасці паэтычнага майстэрства Рыгора Барадуліна: арыгінальная метафарычна-асацыятыўная вобразнасць, гукапіс, рытміка, рыфма.

Літаратура

Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск, 2001.

Дуброўскі, А. У. Паэтыка Рыгора Барадуліна: рытмічная арганізацыя верша / А. У. Дуброўскі. – Мінск: Рэйплац, 2006.

Тэорыя літаратуры. Стыль пісьменніка (паглыбленне паняцця).

Яўгенія Янішчыц. Вершы **«Чаму ніколі не баюся я…», «Не воблака, а проста аблачынка…», «Помню, помню праз гады…», «Ты пакліч мяне. Пазаві…», «Любоў мая...»** *(2 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэтэсы.

Тэматычная палітра паэзіі Яўгеніі Янішчыц: малая радзіма, казачная палеская прырода, вясковы і гарадскі побыт, лірыка кахання. Разнастайнасць пафасу ў творах: ад мажорнага, радаснага да сумнага, трывожнага.

Літаратура

Калядка, С. У. Непрыручаная птушка Палесся: творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц / С. У. Калядка. – Мінск: Беларус. навука, 2007.

Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі. У 4 т. Т. 1. / уклад.: С. У. Калядка, Т. П. Аўсяннікава; рэд. Л. Г. Кісялёва. – Мінск: Беларус. навука, 2016.

Георгій Марчук. Навелы **«Канон Маці», «Канон Гарыні», «Канон Базару»** *(3 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Жанрава-стылёвая спецыфіка твораў, іх спавядальнасць. Захапляльнае падарожжа па радзіме пісьменніка, асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый. Мудрасць разумення чалавечага шчасця і іншых духоўных каштоўнасцей.

Мастацтва. Кінамастацтва: фільм «Ліст да Феліні» (рэж. *Д. Зайцаў*).

Літаратура

Іконнікава, Л. У. Мастацкі свет твораў Георгія Марчука: драматургія, проза, казкі / Л. У. Іконнікава; навук. рэд. В. А. Максімовіч. – Мінск: Беларус. рэсп. літ. фонд, 2013.

Аляксей Дудараў. П'еса «Князь Вітаўт» (*3 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Князь Вітаўт». Наватарскі падыход драматурга да ўвасаблення далёкага мінулага. Жанравая адметнасць твора, асаблівасці яго кампазіцыі. Вітаўт і Ягайла як вобразы-тыпы. Маральна-этычнае завастрэнне канфлікту. Праблема асабістага шчасця ў п'есе. Сцвярджэнне ў творы галоўных каштоўнасцей на зямлі: любові, еднасці, згоды і міру.

Тэорыя літаратуры. Гістарычная драма.

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектаклі «Князь Вітаўт» (рэж. *В. Раеўскі, Б. Герлаван*), «Радавыя» (рэж. *В. Раеўскі, Б. Герлаван*), «Чорная панна Нясвіжа» (рэж. *В. Раеўскі, Б. Герлаван*).

Літаратура

Аўдоніна, Т. В. Жыць на зямлі...: філасофія быцця ў драматургіі А. Дударава і класічная традыцыя / Т. В. Аўдоніна. – Гомель: ГДУ, 2005.

Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. – Мінск, 2000.

Алесь Разанаў. «Радзіма…», «На гэтай зямлі», «Кожны народ мае…», «У крузе», «Спадчына», «Барана», «Горад» (*3 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Філасофска-інтэлектуальны кірунак творчасці: суадносіны агульначалавечага (быційнага) і нацыянальна-гістарычнага (асабістага). Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта. Адметнасць творчай індывідуальнасці. Жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі. Асацыятыўная вобразнасць.

Роля Алеся Разанава ў развіцці традыцый філасофскай паэзіі і станаўленні сучаснай беларускай эксперыментальнай паэзіі: вершаказы, версэты, зномы, пункціры.

Літаратура

Івашчанка, А. С. Паэтыка Алеся Разанава: між медытацыяй і рацыяй / А. Івашчанка. – Мінск: БНТУ, 2008.

Ламека, Н. У. Мастацкі ўніверсум творцы / Н. У. Ламека. – Мінск: Рэсп. ін-т выш. школы, 2005.

Штэйнер, І. Ф. Уводзіны ў невымоўнае: філасофія паэзіі Алеся Разанава / І. Ф. Штэйнер. – Мінск: Звязда, 2013.

Тэорыя літаратуры. Вершаказы, версэты, зномы, пункціры.

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

(26 гадзін)

Агляд (*2 гадзіны*). Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе. Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Новая літаратурная сітуацыя. Грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Беларускі постмадэрнізм: творчыя асобы і жанры.

Знаёмства з літаратурнымі часопісамі («Полымя», «Маладосць» і інш.) і публікацыямі ў іх твораў сучасных аўтараў.

Паэзія (4–5 аўтараў на выбар настаўніка) (*7 гадзін*).

Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і індывідуальна-асабовага пачаткаў у творчасці Янкі Сіпакова, Юрася Свіркі, Раісы Баравіковай, Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Мар'яна Дуксы, Уладзіміра Карызны і інш.

Разнастайнасць творчых індывідуальнасцей у сучаснай паэзіі: Алесь Бадак, Міхась Башлакоў, Навум Гальпяровіч, Мікола Мятліцкі, Зоя Падліпская, Мікола Шабовіч, Алесь Пісьмянкоў і інш.

Наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі (Алесь Разанаў, Галіна Булыка, Людміла Рублеўская, Віктар Шніп і інш.).

Проза (4–5 аўтараў на выбар настаўніка) (*11 гадзін*). Разнастайнасць тэматыкі і праблематыкі сучаснай прозы. Асэнсаванне пісьменнікамі стасункаў асобы і грамадства: Алесь Савіцкі «Пісьмо ў рай»; Віктар Карамазаў «Крыж на зямлі і поўня ў небе»; навела Уладзіміра Сцяпана «Адна капейка» і інш.

Далёкая і блізкая гісторыя ў сучаснай прозе: Леанід Дайнека «Меч князя Вячкі»; Алесь Марціновіч ««Гетман-кларнет» на службе ў муз»; Іван Чыгрынаў «Вяртанне да віны»; Іван Навуменка «Вір»; Янка Сіпакоў «Кулак»; Янка Брыль «Муштук і папка»; Святлана Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча» і інш.

Драматургія (2–3 аўтары на выбар настаўніка) (*6 гадзін*).

Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай драматургіі другой паловы 80–90-х гадоў. Традыцыі драматургіі Кандрата Крапівы і Андрэя Макаёнка і іх творчае выкарыстанне маладзейшымі пісьменнікамі.

Надзённасць маральна-этычнай праблематыкі: Мікола Матукоўскі «Мудрамер» і інш. Узмацненне цікавасці да далёкага і блізкага мінулага: Алесь Петрашкевіч «Прарок для Айчыны», «Меч Рагвалода» і інш. Новыя мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай драматургіі: п'есы-рымейкі Сяргея Кавалёва і інш.

Сучасная драматургія і тэатр.

Мастацтва. Жывапіс: *І. Рэй.* «З вогненнай вёскі», «Боль вогненных гадоў. Год 41-ы», «Беларуская восень», «Поры года»; *У. Гоманаў.* «Партрэт А. Петрашкевіча».

Тэатральнае мастацтва і кінамастацтва: спектаклі «Адкуль грэх?» (рэж. *П. Малчанаў*, *А. Краўчук*, па творы А. Петрашкевіча), тэлеспектаклі «Прарок для Айчыны» (па творы А. Петрашкевіча).

Літаратура

Бельскі, А. І. Беларуская літаратура XX стагоддзя: гісторыя і сучаснасць / А. І. Бельскі. – Мінск: Аверсэв, 2005.

Бельскі, А. І. Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе / А. І. Бельскі. – Мінск: Аверсэв, 2005.

Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2000.

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. Т. 4, кн. 3 / І. Л. Шаўлякова-Барзенка [і інш.]; навук. рэд.: У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Мінск: Беларус. навука, 2015.

Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 2001.

Калядка, С. Беларуская сучасная жаночая паэзія: мастацкія канцэпцыі «жаночага шчасця» / С. Калядка. – Мінск: Беларус. навука, 2010.

Кісліцына, Г. М. Культурны градыент: ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стст. / Г. М. Кісліцына. – Мінск: Права і эканоміка, 2015.

Лаўшук, С. С. Гарызонты беларускай драматургіі / С. С. Лаўшук; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2010.

Літаратура пераходнага перыяду: тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М. А. Тычына [і інш.]; навук. рэд. М. А. Тычына. – Мінск: Беларус. навука, 2007.

Саламаха, У. П. Літаратура: застаецца сапраўднае: эсэ, артыкулы, дыялогі / У. П. Саламаха. – Мінск: Звязда, 2014.

Тычына, М. А. Філасофія літаратуры: беларускі варыянт / М. А. Тычына. – Мінск: Беларус. навука, 2014.

Рэзерв вучэбнага часу
(2 гадзіны)

ПАЎТАРЭННЕ І ПАДАГУЛЬНЕННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД
(1 гадзіна)

У с я г о: на вывучэнне твораў – 89 гадзін;
на творчыя работы – 12 гадзін;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 4 гадзіны.

Спіс твораў для завучвання на памяць

Міхась Стральцоў. Урывак з апавядання «Сена на асфальце» (пачынаючы са слоў «О зямля! Ты даеш нам тугу па небе…» і да слоў «…гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога».

Ніл Гілевіч. Верш «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..».

Яўгенія Янішчыц. Верш «Ты пакліч мяне. Пазаві...».

Алесь Разанаў. Верш «У крузе».

Верш з сучаснай беларускай паэзіі (на выбар вучняў).

Спіс твораў для дадатковага чытання

Раіса Баравікова. Зб. «Дрэва для райскай птушкі».

Міхась Башлакоў. Зб. «Нетры».

Навум Гальпяровіч. Зб. «Святло ў акне».

Васіль Зуёнак. Зб. «Лета трывожных дажджоў».

Пятрусь Макаль. Зб. «Лагода».

Мікола Мятліцкі. Зб. «Замкнёны дом».

Ніна Мацяш. Зб. «Душою з небам гаварыць».

Генадзь Пашкоў. Зб. «У далонях свету».

Міхась Пазнякоў. «Час надзеі».

Алесь Пісьмянкоў. Зб. «Я не памру, пакуль люблю».

Алесь Разанаў. Зб. «У горадзе валадарыць Рагвалод».

Людміла Рублеўская. Зб. «Замак месячнага сяйва».
Віктар Шніп. Зб. «Балада камянёў».
Яўгенія Янішчыц. Зб. «Пачынаецца ўсё з любві…».

Проза

Янка Брыль. Зб. «З людзьмі і сам-насам».
Васіль Быкаў. «У тумане».
Алесь Жук. «Душа над чыстым полем».
Віктар Карамазаў. «Зачараваная душа».
Алесь Марціновіч. «Цяпло колішніх вогнішчаў» (2-3 эсэ, гістарычныя аповесці на выбар настаўніка).
Іван Пташнікаў. «Мсціжы».
Іван Чыгрынаў. «Плач перапёлкі».
Іван Шамякін. «Гандлярка і паэт».
«Я з вогненнай вёскі…» (дакументальная кніга Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка).

Драматургія

Аляксей Дудараў. «Радавыя».
Алесь Петрашкевіч. «Напісанае застаецца».
Іван Чыгрынаў. «Следчая справа Вашчылы».

АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ Ў XI КЛАСЕ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне.
Аргументаванне ўласных ацэнак герояў і падзей.
Выразнае чытанне мастацкіх твораў розных жанраў.
Складанне плана ўласнага вуснага і пісьмовага выказвання.
Разгорнутыя і сцісłыя вусныя адказы на праблемныя пытанні, даклады і паведамленні на літаратурную тэму (з выкарыстаннем адной або некалькіх крыніц).
Тэзісы і канспекты літаратурна-крытычных артыкулаў па пытаннях літаратуры.
Сачыненні і рэфераты па праграмных творах.
Рэцэнзіі на самастойна прачытаную кнігу, прагледжаныя кінафільм, тэлеперадачу, спектакль, на твор жывапісу або музыкі.
Напісанне ўласных твораў (вершаў, невялікіх апавяданняў, мастацкіх замалёвак, эсэ і пад.).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ XI КЛАСА

Вучні павінны в е д а ц ь:
асноўныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў;
асноўныя ідэйна-маральныя праблемы вывучаных твораў;
асноўныя жанравыя і стылёвыя асаблівасці праграмных мастацкіх твораў;
спецыфіку літаратуры як мастацтва слова, літаратурныя роды і жанры;
асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці, прадугледжаныя праграмай;
асноўныя перыяды развіцця нацыянальнай літаратуры;
асаблівасці, якія вылучаюць беларускую літаратуру сярод іншых літаратур свету, складаюць яе ўнікальнасць, адметнасць;
асаблівасці рамантычнага, рэалістычнага і мадэрнісцкага тыпаў мастацкай творчасці;

тэксты, рэкамендаваныя праграмай для завучвання на памяць.

Вучні павінны ў м е ц ь:

узнаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам;

аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці і аўтарскай пазіцыі;

вызначаць асноўную праблематыку твора;

выяўляць асноўныя адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка;

характарызаваць героя твора, супастаўляць герояў аднаго або некалькіх твораў;

абгрунтоўваць сваю ацэнку прачытанага твора;

весці дыялог па прачытаных творах, улічваць чужы пункт гледжання на твор і аргументавана адстойваць сваё меркаванне;

адрозніваць высокамастацкую літаратуру ад «масавай»;

пісаць сачыненні на літаратурную тэму;

карыстацца літаратуразнаўчымі крыніцамі і даведачнымі матэрыяламі (энцыклапедыямі, даведнікамі, слоўнікамі літаратуразнаўчых тэрмінаў, інтэрнэт-рэсурсамі і інш.).

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 93

Учебная программа по учебному предмету
«Математика»
для XI класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания
(повышенный уровень)

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Математика занимает одно из центральных мест в образовании как важное средство формирования общей культуры, интеллектуального развития современного человека. Математические знания необходимы для изучения явлений природы, без них невозможно достижение успехов в развитии производства и науки. Знания о количественных отношениях и пространственных формах окружающего мира необходимы практически во всех сферах деятельности человека.

Методы, применяемые в математике, необходимы для специалистов в любой сфере деятельности, особенно в сфере наукоемких технических производств. Поэтому развитие компетенций у учащихся средствами учебного предмета для продолжения образования на уровнях профессионально-технического, среднего специального и высшего образования является особо важным.

Содержание математики как учебного предмета базируется на теоретической основе трех подходов: знаниевого, личностно ориентированного, компетентностного.

Цели и **задачи** изучения учебного предмета на повышенном уровне при освоении содержания образовательной программы среднего образования:

продолжение формирования представлений о математике как части общечеловеческой культуры, ее роли в познании явлений и процессов действительности;

формирование математических знаний и умений, необходимых для изучения естественнонаучных учебных предметов на базовом и повышенном уровнях и для продолжения образования в областях, требующих углубленной математической подготовки;

формирование репродуктивного, репродуктивно-продуктивного и творческого видов деятельности при решении учебных и прикладных задач;

развитие логического мышления, пространственного воображения, алгоритмической культуры и критического мышления на уровне, необходимом в повседневной жизни и будущей профессиональной деятельности;

формирование мотивации к самостоятельному приобретению математических знаний и умений, развитию компетенций, востребованных в условиях непрерывного образования и профессиональной деятельности;

воспитание культуры личности и личностных качеств (целеустремленность, самостоятельность, ответственность, самоконтроль и др.).

формирование мотивации к самостоятельному приобретению математических знаний и умений, развитию компетенций, востребованных в условиях непрерывного образования и профессиональной деятельности;

Содержание алгебраического компонента в X классе предусматривает изучение тригонометрических и степенных функций, их свойств, уравнений, неравенств и элементов комбинаторики, а содержание геометрического компонента – изучение взаимного расположения прямых и плоскостей в пространстве, свойства прямых и плоскостей в пространстве, метрические соотношения, свойства многогранников.

Содержание алгебраического компонента в XI классе предусматривает изучение показательных и логарифмических функций, их свойств, показательных и логарифмических уравнений, неравенств, и элементов теории вероятности, рассматривается понятие производной функции и ее применение при исследовании функции и решении практических задач, а содержанием геометрического компонента является изучение многогранников и их свойств, объемов и площадей их поверхностей; тел вращения и их свойств, объемов и площадей их поверхностей.

Усилены требования к результатам учебной деятельности учащихся, обусловленные расширением содержания учебного предмета, способов деятельности учащихся, обобщением и систематизацией теоретических знаний и их применением при выполнении различных заданий.

ОРГАНИЗАЦИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

Образовательный процесс осуществляется с учетом возрастных особенностей учащихся, специфики учебного предмета, его места и роли в системе общего среднего образования.

Организация образовательного процесса должна быть направлена на достижение учащимися результатов, определенных настоящей учебной программой. Вместе с тем образовательный процесс должен быть поставлен так, чтобы у учащихся была возможность реализовать свои образовательные запросы. При этом необходимо, чтобы учащиеся не только усвоили определенные теоретические знания, но и научились использовать их при решении учебных задач и задач прикладного характера.

– объяснять взаимодействие и взаимосвязь компонентов экосистемы;

– характеризовать продуктивность экосистем;

– составлять цепи и сети питания, экологические пирамиды и анализировать их;

– сравнивать естественные и искусственные экосистемы;

– решать экологические задачи;

– использовать приобретенные знания об экосистемах для: создания и поддержания устойчивости искусственных экосистем: аквариума, сада, сквера, парка, огорода и т. д.; обоснования мер по охране естественных экосистем; выращивания экологически чистой сельскохозяйственной продукции;

владеть: навыками решения экологических задач.

ЭВОЛЮЦИЯ ОРГАНИЧЕСКОГО МИРА (24 ч)

Гипотезы происхождения жизни. Основные гипотезы происхождения жизни.

Биологическая эволюция. Понятие биологической эволюции. Развитие эволюционных взглядов. Общая характеристика теории эволюции Ч.Дарвина. Теория искусственного отбора. Движущие силы и основные результаты эволюции по Ч.Дарвину.

Синтетическая теория эволюции. Общая характеристика синтетической теории эволюции. Популяция – элементарная единица эволюции. Элементарное эволюционное явление. Предпосылки (элементарные факторы) эволюции. Генетическое разнообразие в популяциях. Роль мутационной и комбинативной изменчивости. Миграции (поток генов). Эволюционная роль модификаций. Волны жизни, дрейф генов, изоляция.

Движущие силы эволюции. Борьба за существование. Формы борьбы за существование. Естественный отбор (движущий и стабилизирующий).

Результаты эволюции. Приспособления – основной результат эволюции. Видообразование. Факторы видообразования. Способы видообразования (аллопатрическое и симпатрическое видообразование). Основные положения синтетической теории эволюции.

Макроэволюция и ее доказательства. Понятие макроэволюции. Палеонтологические, эмбриологические, сравнительно-анатомические, молекулярно-генетические доказательства эволюции.

Главные направления эволюции. Прогресс и регресс в эволюции. Пути достижения биологического прогресса: арогенез, аллогенез, катагенез. Способы осуществления эволюционного процесса (дивергенция, конвергенция).

Многообразие современного органического мира как результат эволюции. Классификация организмов. Принципы систематики. Современная биологическая система.

Неклеточные формы жизни – вирусы. Строение вирусов. Проникновение вирусов в клетку-хозяина. Размножение вирусов. Вироиды. Бактериофаги. Вирулентные фаги, умеренные фаги.

Демонстрации: модели палеонтологических находок; коллекции «Формы сохранности ископаемых видов растений и животных», «Гомология плечевого и тазового поясов конечностей», «Гомология строения конечностей наземных позвоночных», «Рудиментарные органы позвоночных»; таблицы, видеоролики, иллюстрирующие строение вирусов, проникновение их в клетку, размножение и формирование вирусных частиц.

Лабораторные работы

4. Изучение гомологичных органов, рудиментов и атавизмов как доказательств эволюции.

5. Выявление ароморфозов и алломорфозов у растений.

6. Выявление ароморфозов и алломорфозов у животных.

Практические работы

14. Сравнительная характеристика естественного и искусственного отбора.

15. Сравнение движущего и стабилизирующего отбора.

16. Сравнение аллопатрического и симпатрического видообразования.

Экскурсия

2. Результаты естественного отбора (проводить в удобное время).

Требования к результатам учебной деятельности

Учащиеся должны:

знать:

– основные гипотезы происхождения жизни на Земле;

– основные положения эволюционной теории Ч. Дарвина и синтетической теории эволюции;

– предпосылки, движущие силы и результаты эволюции;

– формы борьбы за существование;

– способы достижения гетерогенности популяций;

– формы естественного отбора и механизм их действия;

– способы видообразования;

– пути и способы достижения биологического прогресса;

– доказательства эволюции;

– основные таксономические единицы, используемые в систематике;

– принципы классификации видов живых организмов и современную биологическую систему;

– особенности строения вирусов, способы проникновения в живые организмы, размножение, вирусные заболевания, методы их профилактики и лечения;

понимать сущность:

– эволюционной теории Ч.Дарвина;

– синтетической теории эволюции;

– эволюционного процесса;

уметь*:*

– характеризовать эволюционный процесс, предпосылки, движущие силы и результаты эволюции;

– характеризовать биологический и морфофизиологический прогресс и регресс, их роль в эволюции, способы и пути достижения прогресса и регресса группами организмов;

– распознавать рудименты и атавизмы;

– соблюдать меры по профилактике вирусных болезней;

– решать биологические задачи;

– анализировать тексты, готовить по ним краткие сообщения, составлять аннотации;

– использовать приобретенные знания и умения для критического анализа публикаций в средствах массовой информации об эволюции; объяснения процессов формирования адаптаций у организмов разных видов, видообразования, многообразия видов живых организмов; профилактики вирусной инфекции;

владеть: понятийным аппаратом для описания процессов биологической эволюции.

ПРОИСХОЖДЕНИЕ И ЭВОЛЮЦИЯ ЧЕЛОВЕКА (8 ч)

Формирование представлений об эволюции человека. Место человека в зоологической системе.

Этапы и направления эволюции человека. Предшественники человека. Австралопитеки. Древнейшие люди. Человек умелый. Человек прямоходящий. Древние и ископаемые люди современного типа.

Движущие силы антропогенеза и их специфика. Предпосылки антропогенеза. Биологические и социальные факторы. Роль труда в формировании человека. Общественный образ жизни как фактор эволюции. Ведущая роль социальных факторов в истории развития человека. Качественные отличия человека.

Человеческие расы, их происхождение и единство. Расизм. Особенности эволюции человека на современном этапе.

Демонстрации: скелеты человека и позвоночных животных; модели ископаемых останков человека и его материальной культуры.

Требования к результатам учебной деятельности

Учащиеся должны:

знать:

– положение человека в зоологической системе, предпосылки и движущие силы эволюции человека;

– качественные отличия человека от животных;

– расы человека и их отличительные черты;

– особенности эволюции человека на современном этапе;

понимать сущность: процесса эволюции человека.

уметь:

– обосновывать место человека в зоологической системе;

– характеризовать этапы антропогенеза, роль биологических и социальных факторов в эволюции человека;

– доказывать единство человеческих рас;

– находить в биологических словарях и справочниках значение терминов, связанных с проблемой эволюции человека, в различных источниках (в том числе интернет) необходимую информацию по эволюции человека;

– проводить сравнение строения и функционирования организма человека и животных;

– использовать приобретенные знания для: критического анализа публикаций в средствах массовой информации по эволюции человека;

владеть:

– основными терминами и понятиями по эволюции человека;

– навыками анализа текстов, выделения главного, написания аннотаций, кратких сообщений, выступления с сообщениями, ведения дискуссии.

ПОВЕДЕНИЕ КАК РЕЗУЛЬТАТ ЭВОЛЮЦИИ (4 ч)

Поведение как форма адаптации живого организма. Уровни поведения и эволюция. Формы поведения: врожденные (таксисы, рефлексы, инстинкты) и индивидуально приобретенные (научение, рассудочная деятельность). Инстинктивное поведение беспозвоночных и позвоночных животных.

Общественное поведение животных: групповой образ жизни, социальная иерархия особей.

Поведение человека как социобиологического вида, основанное на особенностях его потребностей.

Человек в социальной среде. Суррогатное поведение. Человек и природная среда.

Требования к результатам учебной деятельности

Учащиеся должны:

знать:

– формы поведения (врожденные и приобретенные) животных и человека;

понимать сущность: поведение как адаптация живого организма; суррогатного поведения;

уметь*:*

– характеризовать врожденные и индивидуально приобретенные формы поведения;

– различать проявление в природе разных форм поведения;

– характеризовать особенности поведения человека как биосоциального существа;

– проводить наблюдения за животными в природе;

– использовать приобретенные знания и умения для обоснования и соблюдения норм поведения человека в обществе;

владеть: основными терминами и понятиями при описании поведения человека и животных.

БИОСФЕРА – ЖИВАЯ ОБОЛОЧКА ПЛАНЕТЫ (12 ч)

Структура биосферы. Понятие биосферы. Границы биосферы. Компоненты биосферы: живое и биогенное вещество, видовой состав; биокосное и косное вещество. Биомасса поверхности суши, Мирового океана, почвы. Биогеохимические функции живого вещества: энергетическая, газовая, окислительно-восстановительная, концентрационная.

Круговорот веществ в биосфере. Круговорот воды, кислорода, углерода и азота.

Эволюция биосферы. Основные этапы развития биосферы. Влияние хозяйственной деятельности человека на биосферу. Основные нарушения в биосфере, вызванные деятельностью человека (загрязнение окружающей среды, истощение природных ресурсов, опустынивание). Масштабы нарушений (локальные, региональные, глобальные). Угроза экологических катастроф и их предупреждение.

Охрана природы. Рациональное природопользование, восстановление природных ресурсов и окружающей среды. Создание малоотходных технологий. Заповедное дело. Особо охраняемые природные территории. Сохранение генофонда.

Демонстрации: схемы протяженности биосферы, влияния хозяйственной деятельности человека на природу.

Практические работы

17. Составление схем круговоротов веществ.

18. Прогнозирование и моделирование изменений в экосистеме под действием антропогенных факторов.

Требования к результатам учебной деятельности

Учащиеся должны:

знать:

– границы биосферы, компоненты биосферы, биогеохимические функции живого вещества;

– основные нарушения в биосфере, вызванные деятельностью человека;

– основные загрязнители окружающей среды, причины и последствия загрязнения биосферы, обеднения ресурсов;

– заповедники и национальные парки Республики Беларусь;

– влияние человека на биосферу;

– глобальные и региональные экологические проблемы;

– основные этапы эволюции биосферы;

понимать сущность: учения о биосфере;

уметь*:*

– обосновывать необходимость охраны биосферы, сохранения генофонда и видового разнообразия органического мира;

– составлять схемы круговоротов веществ в биосфере;

– решать экологические задачи;

– использовать приобретенные знания для: обоснования мер по охране окружающей среды, редких и исчезающих видов живых организмов; уменьшения загрязнения окружающей среды бытовыми отходами, экономного расходования воды, электроэнергии, тепла и т. д.;

владеть: навыками анализа текстов, выделения главного, написания аннотаций, кратких сообщений, выступления с сообщениями, ведения дискуссии по проблемам биосферы, роли человека в биосфере.

ОБОБЩАЮЩЕЕ ПОВТОРЕНИЕ (28 ч)

Молекулярный и клеточный уровни организации жизни (6 ч).

Строение молекул белков, липидов, углеводов, нуклеиновых кислот и их биологическая роль. Особенности строения и функционирования ферментов. Хранение наследственной информации. Биологически активные вещества.

Особенности строения клетки как наименьшей живой системы. Процессы, происходящие на уровне клетки: поступление веществ в клетку и выведение из нее, преобразование веществ, синтез АТФ, нуклеиновых кислот, белков, углеводов (фотосинтез). Воспроизведение клетки, передача наследственной информации, гены и хромосомы.

Организменный уровень организации жизни (8 ч).

Одноклеточные, колониальные и многоклеточные организмы. Ткани, органы и системы органов. Признаки живых организмов, их проявление у бактерий, протистов, грибов, растений и животных. Регуляция функций в живых организмах. Защита организма от чужеродных тел. Способы размножения организмов. Образование и развитие половых клеток. Индивидуальное развитие организмов, в том числе организма человека. Закономерности наследственности и изменчивости организмов, в том числе организма человека. Взаимосвязь организмов с окружающей средой, адаптации организмов к среде обитания.

Популяционно-видовой уровень (2 ч).

Виды живых организмов, критерии вида. Популяция, свойства и структура популяции, динамика численности популяции и ее регуляция.

Экосистемный уровень организации жизни (4 ч).

Структура экосисистем. Функции организмов в экосистеме. Связи организмов разных видов в экосистеме. Пищевые связи. Поток вещества и энергии в экосистеме. Условия существования экосистем – приток солнечной энергии и круговорот веществ. Продуктивность экосистем. Динамика экосистем. Агроэкосистемы.

Эволюция видов живых организмов (8 ч).

Концепции и теории эволюции. Предпосылки, механизмы и результаты эволюции с позиций синтетической теории эволюции. Способы видообразования. Макроэволюция и ее закономерности. Особенности эволюции человека.

Многообразие жизни – результат эволюции. Современная биологическая система. Сравнительная характеристика основных таксонов живых организмов (царств, типов, отделов, классов цветковых растений, классов хордовых животных).

Требования к результатам учебной деятельности

Учащиеся должны:

знать:

– уровни организации жизни и их элементарные единицы;

– особенности структуры живых систем на каждом уровне организации;

– основные процессы и явления, характерные для живых систем каждого уровня организации;

– основные биологические теории и законы (клеточная, хромосомная, теория эволюции, законы Менделя, биогенетический закон и др.);

понимать сущность:

– структурной организации жизни на Земле;

– взаимосвязи живых систем разных уровней;

уметь:

– анализировать и обобщать материал учебников (учебных пособий), научных и научно-популярных изданий, интернет-источников и т. д.;

– сопоставлять изученные понятия, искать новые связи и отношения между ними, прослеживать развитие понятий в их иерархических зависимостях, т. е. устанавливать подчиненность в случае сопоставления понятий;

– классифицировать знания, приводить их в систему;

– вычленять ведущие идеи и систематизировать материал вокруг основных понятий;

– выявлять взаимосвязь строения и функций;

– находить общие признаки в строении и жизнедеятельности разных биологических систем;

– выявлять связь между биологическими системами и подсистемами (между органоидами, клетками, органами и системами органов, организмами в экосистемах, разными экосистемами);

– обнаруживать черты усложнения организмов разных систематических групп;

– сравнивать объекты и оформлять материал сравнения в таблицы;

– составлять аналитические, сравнительные и обобщающие таблицы;

– переводить табличный материал в диаграммы и графики;

владеть:

– способами ориентации в интернет-источниках информации (журналы, сайты, образовательные порталы и т. д.);

– различными средствами коммуникации;

– основным понятийным аппаратом.

КОНТРОЛЬНЫЕ РАБОТЫ:

№ 1. Первое полугодие – в течение декабря по темам: «Организм и среда», «Вид и популяция», «Экосистемы».

№ 2. Второе полугодие – в течение марта–апреля по темам: «Эволюция органического мира», «Происхождение и эволюция человека», «Поведение как результат эволюции». «Биосфера – живая оболочка планеты».

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.07.2017 № 93

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Біялогія»
для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання
(павышаны ўзровень)

БІЯЛОГІЯ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэта вывучэння біялогіі – фарміраванне ў вучняў сучаснага навуковага светапогляду, неабходнага для разумення з’яў і працэсаў, якія адбываюцца ў прыродзе, у жыццядзейнасці ўласнага арганізма, у розных галінах народнай гаспадаркі, для працягу адукацыі, будучай прафесійнай дзейнасці; развіццё ўменняў вызначаць, характарызаваць, параўноўваць і абагульняць вывучаемыя аб’екты і з’явы; стварэнне ўмоў для магчымасці

ўсвядомленага выбару індывідуальнай адукацыйнай траекторыі, якая спрыяе наступнаму прафесійнаму самавызначэнню, у адпаведнасці з індывідуальнымі інтарэсамі вучня.

Задачы вучэбнага прадмета «Біялогія»:

авалоданне сістэмай ведаў пра малекулярныя і структурна-функцыянальныя асновы жыцця, размнажэнне і развіццё арганізмаў асноўных царстваў, экасістэм, біяразнастайнасць, эвалюцыю, што неабходна для ўсведамлення каштоўнасці ўсяго жывога на Зямлі;

фарміраванне на базе ведаў пра жывую прыроду навуковай карціны свету;

фарміраванне экалагічнай граматнасці людзей, якія ведаюць біялагічныя заканамернасці, сувязі паміж жывымі арганізмамі, іх эвалюцыю, прычыны і каштоўнасць відавой разнастайнасці;

усталяванне гарманічных адносін з прыродай, самім сабой, фарміраванне норм і правіл экалагічнай этыкі, адказных адносін да жывой прыроды як асновы экалагічнага выхавання;

фарміраванне генетычнай граматнасці як асновы здаровага ладу жыцця, захавання псіхічнага, фізічнага, маральнага здароўя чалавека;

азнаямленне з фундаментальнымі законамі і прынцыпамі існавання жывой прыроды, супольнасцей, арганізмаў;

фарміраванне ведаў пра будову: бактэрый, пратыстаў, грыбоў, лішайнікаў, споравых і пакрытанасенных раслін, жывёл, чалавека;

фарміраванне інфармацыйнай кампетэнцыі, умення працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі;

развіццё асобы вучня, імкнення прымяніць біялагічныя веды на практыцы, удзельнічаць у практычнай дзейнасці ў галіне медыцыны, сельскай гаспадаркі, біятэхналогіі, рацыянальнага прыродакарыстання і аховы прыроды.

Біялагічная адукацыя заклікана фарміраваць у падрастаючага пакалення разуменне жыцця ў любой яго праяве як найвышэйшай каштоўнасці. Біялогія ўваходзіць у лік прыродазнаўчых навук, якія вывучаюць прыроду, а таксама шляхі пазнання чалавекам прыроды. Акрамя светапогляднага значэння, у яе аснове ляжаць мерапрыемствы па падтрыманні здароўя чалавека, яго бяспекі і вытворчай дзейнасці ў любой галіне народнай гаспадаркі.

У цяперашні час прыярытэтныя напрамкі, якія маюць прынцыповае тэарэтычнае і практычнае значэнне, наступныя:

эколага-прыродаахоўны (роля біялогіі ў захаванні біясферы, біялагічнай разнастайнасці, у прадухіленні экалагічных бедстваў);

эвалюцыйны (паходжанне і эвалюцыя жывых арганізмаў);

захаванне асабістага здароўя і здароўя чалавека, здароўезберагальнае асяроддзе жыцця.

У адборы зместу вучэбнага матэрыялу былі выкарыстаны наступныя падыходы:

культуралагічны падыход дазваляе ў поўнай меры захаваць фундаментальныя крытэрыі біялагічных ведаў, іх цэльнасць і пераемнасць. Сэнс культуралагічнага падыходу ў выкладанні вучэбнага прадмета «Біялогія» заключаецца ў падрыхтоўцы інфармаванага, кампетэнтнага выпускніка, які ўсведамляе сябе ў агульнакультурным кантэксце, гатовага працягнуць адукацыю, жыць і працаваць у новых сацыяльна-эканамічных умовах;

асобасна арыентаваны падыход прадугледжвае напаўненне праграм вучэбным зместам, значным для кожнага вучня ў паўсядзённым жыцці, важным для фарміравання адэкватных паводзін чалавека ў навакольным асяроддзі;

дзейнасны падыход рэалізуецца на аснове максімальнага ўключэння ў адукацыйны працэс практычнага кампанента вучэбнага зместу – лабараторных і практычных работ, дэманстрацыйных і лабараторных доследаў, экскурсій.

З пункта гледжання патрабаванняў навучання вучняў у адукацыйным працэсе выкарыстоўваюцца наступныя віды кампетэнцый:

вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя – гатоўнасць вучня да самастойнай пазнавальнай дзейнасці: пастаноўкі мэты, планавання, аналізу, рэфлексіі, самаацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; уменне адрозніваць факты ад здагадак, валоданне вымяральнымі навыкамі, выкарыстанне верагоднасных, статыстычных і іншых метадаў пазнання;

даследчая кампетэнцыя – сукупнасць ведаў, уменняў, спосабаў дзейнасці, якія дазваляюць вучню быць у пазіцыі даследчыка ў адносінах да навакольнага свету, якая выяўляецца праз успрымальнасць да навакольнага свету, уменне распазнаць і вырашыць праблемную сітуацыю з любым прыродным аб'ектам або з'явай, выкарыстоўваючы для гэтага розныя крыніцы інфармацыі. У аснове даследчай кампетэнтнасці ляжыць паняцце «ўменя» як гатоўнасці асобы да пэўных дзеянняў і аперацый у адпаведнасці з пастаўленай мэтай, на аснове наяўных ведаў і навыкаў;

інфармацыйная кампетэнцыя – гатоўнасць вучня самастойна працаваць з біялагічнай інфармацыяй з розных крыніц, шукаць, аналізаваць і адбіраць неабходную інфармацыю, арганізоўваць, пераўтвараць, захоўваць і перадаваць яе. Яна забяспечвае навыкі дзейнасці вучняў у адносінах да інфармацыі, якая змяшчаецца ў вучэбным прадмеце «Біялогія», а таксама ў навакольным свеце;

прадметныя кампетэнцыі:

экалагічная кампетэнтнасць – здольнасць экалагічна думаць; прымяняць экалагічныя веды, уменні і навыкі, вопыт практычнай экалагічнай дзейнасці для вырашэння розных сітуацый экалагічнага характару; захаванне норм і правіл паводзін у прыродзе;

прыродазнаўчая кампетэнцыя – здольнасць фарміравання станоўчых пачуццяў да жывых арганізмаў, якія, у сваю чаргу, будуць матываваць гуманныя паводзіны вучняў у навакольным асяроддзі і набыццё вопыту экалагічнай дзейнасці;

здароўезберагальная кампетэнцыя – каштоўнаснае стаўленне да здароўя, як асновы ўсёй жыццядзейнасці чалавека, здольнасць да засваення здароўезберагальных ведаў, уменняў і навыкаў, гатоўнасць да праяўлення вопыту здароўезбераження ў паўсядзённай дзейнасці;

прыродазнаўчанавуковая кампетэнцыя ўключае адпаведныя біялагічныя веды, уменні, навыкі, вопыт творчай пераўтваральнай дзейнасці ў галіне «прырода – чалавек – прырода».

Асноватворнымі падчас адбору зместу і канструявання вучэбнага прадмета «Біялогія» з'яўляюцца наступныя прынцыпы:

прынцып навуковасці – адпаведнасць зместу вучэбнага матэрыялу ўзроўню сучаснага развіцця біялагічных навук; дакладнасць выкладу фактаў, законаў, прынцыпаў і тэорый;

глыбіня навуковай інтэрпрэтацыі біялагічных фактаў і з'яў абмяжоўваецца *прынцыпам даступнасці*. Даступнасць зместу выяўляецца наяўнасцю лагічных сувязей паміж элементамі ведаў;

прынцып сістэмнасці і сістэматычнасці – стройная лагічная паслядоўнасць выкладання навуковых гіпотэз, тэорый і фактаў; наяўнасць іх аналізу і абагульнення выкарыстання розных форм лагічнага мыслення;

прынцып гістарызму –прадугледжвае наяўнасць у змесце вучэбнага прадмета матэрыялаў, што знаёмяць вучняў з роляй біялагічных навук у сістэме навук, якія раскрываюць іх дасягненні;

прынцып рэалізацыі ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей – раскрыццё ў змесце вучэбнай праграмы ўзаемасувязі з іншымі прадметнымі ведамі, уменнямі і навыкамі;

прынцып сувязі навучання з жыццём паказвае практычную ролю біялагічных ведаў у жыцці чалавека. Дзякуючы ажыццяўленню гэтага прынцыпу, вучні ўсведамляюць каштоўнасць і карыснасць біялагічнай адукацыі. Гэты прынцып патрабуе раскрыцця прыкладнога значэння біялагічных ведаў.

Ва ўстановах адукацыі на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжана вывучэнне наступных сістэматычных курсаў вучэбнага прадмета «Біялогія»:

I. Біялогія (Уводзіны ў біялогію) –VI клас.

II. Біялогія (Жывыя арганізмы ў асяроддзі свайго пасялення. Бактэрыі. Пратысты. Грыбы. Лішайнікі. Расліны) – VII клас.

III. Біялогія (Жывыя арганізмы ў асяроддзі свайго пасялення. Жывёлы) – VIII клас.

IV. Біялогія (Чалавек і яго здароўе) – IX клас.

V. Біялогія (Агульныя біялагічныя заканамернасці) – X і XI класы.

Раздзел «Жывыя арганізмы ў асяроддзі свайго пражывання. Бактэрыі. Пратысты. Грыбы. Лішайнікі. Расліны» ўключае звесткі пра адметныя прыметы жывых арганізмаў, іх разнастайнасць, сістэму арганічнага свету, бактэрыі, пратысты, грыбы, лішайнікі, расліны. Змест раздзела прадстаўлены на аснове эколага-эвалюцыйнага і функцыянальнага падыходаў, у адпаведнасці з якімі акцэнты ў вывучэнні арганізмаў пераносяцца з асаблівасцей будовы асобных прадстаўнікоў на раскрыццё працэсаў іх жыццядзейнасці, прыстасаванасці да асяроддзя пражывання, ускладнення ў ходзе гістарычнага развіцця, ролі ў экасістэмах і жыцці чалавека.

Змест вучэбных заняткаў і выкарыстоўваемыя формы і метады навучання павінны быць накіраваны на засваенне вучнямі ведавага і дзейнаснага кампанентаў, развіццё асобы вучня і рэалізацыю выхаваўчага патэнцыяла біялогіі.

Важным аспектам навучання з'яўляецца арганізацыя і стымуляванне настаўнікам актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў. У ходзе вучэбных заняткаў рэкамендуецца ствараць сітуацыі, у якіх вучні будуць не толькі засвойваць веды, але і спрабаваць прымяняць іх пры вырашэнні розных жыццёвых сітуацый. Як адзін са спосабаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў добра зарэкамендавала сябе навучанне на аснове стварэння праблемных сітуацый, пастаноўкі праблемных задач. Развіццю біялагічнага мыслення вучняў садзейнічае таксама ўключэнне на рэгулярнай аснове ў працэс навучання рашэння пазнавальных задач.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на выкарыстанне ў адукацыйным працэсе розных відаў дзейнасці: работа з рознымі крыніцамі інфармацыі (работа з вучэбнымі дапаможнікамі, табліцамі і інструкцыямі, электроннымі сродкамі навучання), сумеснае выкананне заданняў настаўніка, удзел у дыскусіі па праблемных сітуацыях, выкананне лабараторных і практычных работ. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на фарміраванне ў вучняў уменняў назіраць, апісваць біялагічныя аб'екты, планаваць і праводзіць простыя доследы і эксперыменты, рашаць біялагічныя задачы розных тыпаў складанасці і зместу, раскрываць і ўстанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, працаваць з вызначальнікамі.

Вялікім патэнцыялам у засваенні паняццяў, развіцці вобразных уяўленняў вучняў валодае выкарыстанне ўсіх відаў нагляднасці на ўроках: табліц, малюнкаў, аплікацый, схем, мадэлей, муляжоў, аудыя- і відэаматэрыялаў, гербарыя, вільготных прэпаратаў, натуральных аб'ектаў.

Інтэнсіфікацыі працэсу навучання і павышэнню яго эфектыўнасці будзе садзейнічаць выкарыстанне камп'ютарнай і мультымедыйнай тэхнікі, інтэрактыўных дошак і электронных сродкаў навучання.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(4 гадзіны на тыдзень; усяго 140 гадзін, з іх 5 гадзін – рэзервовы час)

Арганізм і асяроддзе (22 гадзіны)

Узроўні арганізацыі жыцця. Экалогія як навука.

Экалагічныя фактары. Паняцце пра фактары асяроддзя (экалагічныя фактары). Класіфікацыя экалагічных фактараў. Заканамернасці ўздзеяння фактараў асяроддзя на

арганізм. Межы трываласці (талерантнасці). Паняцце пра стэнабіёнты і эўрыбіёнты. Узаемадзеянне экалагічных фактараў. Паняцце пра лімітуючыя фактары.

Святло ў жыцці арганізмаў. Фотаперыяд і фотаперыядызм. Экалагічныя групы раслін у адносінах да светлавога рэжыму.

Тэмпература як экалагічны фактар. Пайкілатэрмныя і гамаятэрмныя арганізмы. Адаптацыі раслін і жывёл да розных тэмпературных умоў.

Вільготнасць як экалагічны фактар. Экалагічныя групы раслін у адносінах да вільгаці. Адаптацыі раслін і жывёл да рознага воднага рэжыму.

Прыстасаванні жывых арганізмаў да сезонных рытмаў умоў пражывання.

Асяроддзі жыцця і адаптацыі да іх арганізмаў. Паняцце пра асяроддзе пражывання і ўмовы існавання арганізмаў. Воднае асяроддзе. Тэмпературны, светлавы, газавы і салявы рэжымы гідрасферы. Адаптацыі арганізма да жыцця ў вадзе. Наземна-паветранае і глебавае асяроддзі пражывання. Адаптацыі арганізма да жыцця ў наземна-паветраным асяроддзі і глебе. Жывы арганізм як асяроддзе пражывання. Асаблівасці экалагічных умоў унутранага асяроддзя гаспадара. Адаптацыі да жыцця ў іншым арганізме – паразітызм.

Дэманстрацыі: схемы ўздзеяння экалагічных фактараў на арганізмы; табліцы з выявамі раслін і жывёл розных экалагічных груп.

Лабараторныя работы

1. Вывучэнне асаблівасцей будовы раслін розных экалагічных груп.

Практычныя работы

1. Рашэнне задач па тэме «Экалагічныя фактары».
2. Вывучэнне прыстасаванасці жывёл да воднага асяроддзя пражывання.
3. Вывучэнне прыстасаванасці насякомых да наземна-паветранага асяроддзя пражывання.
4. Вывучэнне прыстасаванасці раслін да апылення, распаўсюджвання пладоў і насення.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Арганізм і асяроддзе

Вучань павінен:

ведаць:

узроўні арганізацыі жыцця;

класіфікацыю экалагічных фактараў;

заканамернасці ўздзеяння экалагічных фактараў на арганізмы, узаемадзеяння экалагічных фактараў;

ролю святла, тэмпературы, вады ў жыцці жывых арганізмаў;

адаптацыі жывых арганізмаў да асяроддзя пражывання;

экалагічныя групы жывёл і раслін у адносінах да пэўнага фактару асяроддзя;

мець уяўленне:

пра межы трываласці арганізмаў;

стэнабіёнты і эўрыбіёнты;

пайкілатэрмных і гамаятэрмных жывёл;

разумець сутнасць узаемасувязі арганізмаў і навакольнага асяроддзя;

умець:

праводзіць назіранні за жывымі арганізмамі з мэтай высвятлення іх прыстасаванасці да асяроддзя пражывання;

характарызаваць узроўні арганізацыі жыцця, асяроддзі жыцця, адаптацыі жывых арганізмаў розных відаў да асяроддзя пражывання;

рашаць экалагічныя задачы;

складаць кароткі канспект прачытанага тэксту, вылучаць галоўнае, ставіць пытанні да тэксту, складаць кароткія рэфераты;

будаваць схемы, табліцы, дыяграмы, графікі на аснове пэўных даных;

знаходзіць неабходную інфармацыю ў розных крыніцах і выкарыстоўваць яе для вырашэння праблем, якія ўзнікаюць;

валодаць асноўнымі тэрмінамі і паняццямі пры апісанні заканамернасцей уздзеяння экалагічных фактараў на жывыя арганізмы і іх адаптацыі да асяроддзя жыцця;

выкарыстоўваць набытыя веды:

для стварэння аптымальных умоў пры вырошчванні культурных і пакаёвых раслін, утрыманні свойскіх жывёл;

прадухілення неспрыяльных уздзеянняў фактараў асяроддзя на арганізм чалавека.

Від і папуляцыя (10 гадзін)

Від – біялагічная сістэма. Паняцце віду. Від як таксанамічная катэгорыя. Крытэрыі віду. Арэал віду. Паняцце пра эндэмікі і касмапаліты.

Папуляцыя – адзінка віду. Характарыстыка папуляцыі. Уласцівасці папуляцыі: колькасць, шчыльнасць, нараджальнасць, смяротнасць. Структура папуляцыі: прасторавая, палавая, узроставая, эталагічная (паводзінская).

Дынаміка колькасці папуляцый і яе рэгуляцыя. Прычыны дынамікі колькасці папуляцыі. Незалежныя і залежныя ад шчыльнасці папуляцыі фактары рэгуляцыі колькасці.

Дэманстрацыі: схемы, якія ілюструюць крытэрыі віду, дынаміку колькасці папуляцый.

Лабараторныя работы

2. Марфалагічны крытэрый віду.

3. Генетычны крытэрый віду.

Практычныя работы

5. Выяўленне зменлівасці ў асобін аднаго віду.

6. Рашэнне задач па тэме «Від. Папуляцыя».

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць:

крытэрыі віду;

асноўныя ўласцівасці папуляцыі, структуру папуляцыі;

прычыны дынамікі колькасці папуляцый і механізмы яе рэгуляцыі;

мець уяўленне:

пра касмапаліты і эндэмікі;

абсалютную і ўдзельную нараджальнасць і смяротнасць;

размеркаванне асобін у папуляцыі;

ёмістасць асяроддзя;

разумець сутнасць:

папуляцыйна-відавога ўзроўню арганізацыі жыцця;

працэсаў, якія адбываюцца на ўзроўні віду і папуляцыі;

умець:

праводзіць параўнанне розных відаў арганізмаў;

адрозніваць віды па марфалагічным крытэрыі;

вызначаць віды па вызначальніку або вызначальных картках, складаць ключы для вызначэння відаў;

праводзіць назіранні за арганізмамі відаў раслін і жывёл;

рашаць экалагічныя задачы;

валодаць асноўнымі тэрмінамі і паняццямі пры апісанні відаў і папуляцый;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:
для вызначэння відавой разнастайнасці;
абгрунтавання мер па іх ахове і асабістым удзеле ў ахоўных мерапрыемствах;
правядзення назіранняў за арганізмамі розных відаў у прыродзе.

Экасістэмы (27 гадзін)

Экасістэма як адзінства біятопа і біяцэнозу. Паняцце біяцэнозу і біятопа. склад біяцэнозу. сувязі арганізмаў у біяцэнозах: трафічныя, тапічныя, фарычныя, фабрычныя.

Відавая структура біяцэнозу. Прасторавая структура біяцэнозу: вертыкальная (яруснасць) і гарызантальная (мазаічнасць).

Экасістэма. Структура экасістэмы. Прадуцэнты, кансументы, рэдуцэнты. Ланцугі і сеткі харчавання. Пашавыя і дэтрытныя ланцугі. Трафічныя ўзроўні. Экалагічныя піраміды (піраміда лікаў, піраміда біямас, піраміда энергіі).

Прадукцыйнасць экасістэм. Біямаса і прадукцыйнасць. Першасная і другасная прадукцыя.

Узаемаадносіны арганізмаў у экасістэмах. Канкурэнцыя, драпежніцтва, сімбіёз.

Дынаміка экасістэм. Сезонная дынаміка. Паняцце экалагічнай сукцэсіі.

Аграэкасістэмы. Склад і структура аграэкасістэмы. Адрозненне аграэкасістэм ад прыродных экасістэм.

Дэманстрацыі: схемы структуры біяцэнозу і экасістэмы, яруснага размеркавання арганізмаў, ланцугоў і сетак харчавання, экалагічных пірамід, сувязей арганізмаў у экасістэмах; прыклады сімбіёзу, сезонных змяненняў экасістэм і сукцэсіі, аграэкасістэм.

Практычныя работы

7. Складанне ланцугоў харчавання і рашэнне задач па тэме «Ланцугі харчавання».

8. Складанне сетак харчавання ў розных экасістэмах і рашэнне задач па тэме «Сеткі харчавання».

9. Рашэнне задач па тэме «Экалагічныя піраміды, правіла 10 %».

10. Рашэнне задач па тэме «Балансавая роўнасць».

11. Рашэнне задач па тэме «Прадукцыйнасць экасістэм».

12. Рашэнне задач па тэме «Змяненне экасістэм».

13. Параўнальная характарыстыка прыродных экасістэм і аграэкасістэм.

Экскурсіі

1. Вывучэнне экасістэм сваёй мясцовасці (відавая і прасторавая структура, сезонныя змяненні, наяўнасць антрапагенных змяненняў; праводзіць у зручны час).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен: ведаць:
структуру біяцэнозу, экасістэмы;
сувязі арганізмаў у экасістэмах;
функцыі жывых арганізмаў у экасістэме;
віды змянення экасістэм;
асноўныя аграэкасістэмы і іх адрозненні ад натуральных экасістэм;
мець уяўленне:
пра відавое багацце і відавую насычанасць біяцэнозу;
дамінанты і эдыфікатары;
разумець сутнасць кругавароту рэчываў і пераўтварэння энергіі ў экасістэмах;
умець:
тлумачыць узаемадзеянне і ўзаемасувязь кампанентаў экасістэмы;
характарызаваць прадукцыйнасць экасістэм;
складаць ланцугі і сеткі харчавання, экалагічныя піраміды і аналізаваць іх;
параўноўваць натуральныя і штучныя экасістэмы;
рашаць экалагічныя задачы;

валодаць навыкамі рашэння экалагічных задач;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:

для стварэння і падтрымання ўстойлівасці штучных экасістэм: акварыума, саду, сквера, парку, агарода і г. д.;

абгрунтавання мер па ахове прыродных экасістэм;

вырошчвання экалагічна чыстай сельскагаспадарчай прадукцыі.

Эвалюцыя арганічнага свету (24 гадзіны)

Гіпотэзы паходжання жыцця. Асноўныя гіпотэзы паходжання жыцця.

Біялагічная эвалюцыя. Паняцце біялагічнай эвалюцыі. Развіццё эвалюцыйных поглядаў. Агульная характарыстыка тэорыі эвалюцыі Ч.Дарвіна. Тэорыя штучнага адбору. Рухаючыя сілы і асноўныя вынікі эвалюцыі паводле Ч.Дарвіна.

Сінтэтычная тэорыя эвалюцыі. Агульная характарыстыка сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі. Папуляцыя – элементарная адзінка эвалюцыі. Элементарная эвалюцыйная з'ява. Перадумовы (элементарныя фактары) эвалюцыі. Генетычная разнастайнасць у папуляцыях. Роля мутацыйнай і камбінацыйнай зменлівасці. Міграцыі (паток генаў). Эвалюцыйная роля мадыфікацый. Хвалі жыцця, дрэйф генаў, ізаляцыя.

Рухаючыя сілы эвалюцыі. Барацьба за існаванне. Формы барацьбы за існаванне. Натуральны адбор (рухаючы і стабілізуючы).

Вынікі эвалюцыі. Прыстасаванні – асноўны вынік эвалюцыі. Відаўтварэнне. Фактары відаўтварэння. Спосабы відаўтварэння (алапатрычнае і сімпатрычнае відаўтварэнне). Асноўныя палажэнні сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі.

Макраэвалюцыя і яе доказы. Паняцце макраэвалюцыі. Палеанталагічныя, эмбрыялагічныя, параўнальна-анатамічныя, малекулярна-генетычныя доказы эвалюцыі.

Галоўныя напрамкі эвалюцыі. Прагрэс і рэгрэс у эвалюцыі. Шляхі дасягнення біялагічнага прагрэсу: арагенез, алагенез, катагенез. спосабы ажыццяўлення эвалюцыйнага прагрэсу (дывергенцыя, канвергенцыя).

Разнастайнасць сучаснага арганічнага свету як вынік эвалюцыі. Класіфікацыя арганізмаў. Прынцыпы сістэматыкі. Сучасная біялагічная сістэма.

Няклетачныя формы жыцця – вірусы. Будова вірусаў. Пранікненне вірусаў у клетку-гаспадара. Размнажэнне вірусаў. Віроіды. Бактэрыяфагі. Вірулентныя фагі, умераныя фагі.

Дэманстрацыі: мадэлі палеанталагічных знаходак; калекцыі «Формы захаванасці выкапнёвых відаў раслін і жывёл», «Гамалогія плечавога і тазавага паясоў канечнасцей», «Гамалогія будовы канечнасцей наземных пазваночных», «Рудыментарныя органы пазваночных»; табліцы, відэаролікі, якія ілюструюць будову вірусаў, пранікненне іх у клетку, размнажэнне і фарміраванне вірусных часціц.

Лабараторныя работы

4. Вывучэнне гамалагічных органаў, рудыментаў і атавізмаў як доказаў эвалюцыі.

5. Выяўленне арамарфозаў і аламарфозаў у раслін.

6. Выяўленне арамарфозаў і аламарфозаў у жывёл.

Практычныя работы

14. Параўнальная характарыстыка натуральнага і штучнага адбору.

15. Параўнанне рухаючага і стабілізуючага адбору.

16. Параўнанне алапатрычнага і сімпатрычнага відаўтварэння.

Экскурсіі

2. Вынікі натуральнага адбору (праводзіць у зручны час).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць:

асноўныя гіпотэзы паходжання жыцця на Зямлі;

асноўныя палажэнні эвалюцыйнай тэорыі Ч.Дарвіна і сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі;

перадумовы, рухаючыя сілы і вынікі эвалюцыі;

формы барацьбы за існаванне;

спосабы дасягнення гетэрагеннасці папуляцый;

формы натуральнага адбору і механізм іх дзеяння;

спосабы відаўтварэння;

шляхі і спосабы дасягнення біялагічнага прагрэсу;

доказы эвалюцыі;

асноўныя таксанамічныя адзінкі, якія выкарыстоўваюцца ў сістэматыцы;

прынцыпы класіфікацыі відаў жывых арганізмаў і сучасную біялагічную сістэму;

асаблівасці будовы вірусаў, спосабы пранікнення ў жывыя арганізмы, размнажэнне, вірусныя захворванні, метады іх прафілактыкі і лячэння;

разумець сутнасць:

эвалюцыйнай тэорыі Ч.Дарвіна;

сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі;

эвалюцыйнага працэсу;

умець:

характарызаваць эвалюцыйны працэс, перадумовы, рухаючыя сілы і вынікі эвалюцыі;

характарызаваць біялагічны і морфафізіялагічны прагрэс і рэгрэс, іх ролю ў эвалюцыі, спосабы і шляхі дасягнення прагрэсу і рэгрэсу групамі арганізмаў;

распазнаваць рудыменты і атавізмы;

выконваць меры па прафілактыцы вірусных хвароб;

рашаць біялагічныя задачы;

аналізаваць тэксты, рыхтаваць па іх кароткія паведамленні, складаць анатацыі;

валодаць паняційным апаратам для апісання працэсаў біялагічнай эвалюцыі;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:

для крытычнага аналізу публікацый у сродках масавай інфармацыі пра эвалюцыю;

тлумачэння працэсаў фарміравання адаптацый у арганізмаў розных відаў, відаўтварэння, разнастайнасці відаў жывых арганізмаў;

прафілактыкі віруснай інфекцыі.

Паходжанне і эвалюцыя чалавека (8 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў пра эвалюцыю чалавека. Месца чалавека ў заалагічнай сістэме.

Этапы і напрамкі эвалюцыі чалавека. Папярэднікі чалавека. Аўстралапітэкі. Старажытнейшыя людзі. Чалавек умелы. Чалавек прамахадзячы. старажытныя і выкапнёвыя людзі сучаснага тыпу.

Рухаючыя сілы антрапагенезу і іх спецыфіка. Перадумовы антрапагенезу. Біялагічныя і сацыяльныя фактары. Роля працы ў фарміраванні чалавека. Грамадскі спосаб жыцця як фактар эвалюцыі. Вядучая роля сацыяльных фактараў у гісторыі развіцця чалавека. Якасныя адрозненні чалавека.

Чалавечыя расы, іх паходжанне і адзінства. Расізм. Асаблівасці эвалюцыі чалавека на сучасным этапе.

Дэманстрацыі: шкілеты чалавека і пазваночных жывёл; мадэлі выкапнёвых рэштак чалавека і яго матэрыяльнай культуры.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць:

становішча чалавека ў заалагічнай сістэме, перадумовы і рухаючыя сілы эвалюцыі чалавека;

якасныя адрозненні чалавека ад жывёл;

расы чалавека і іх адметныя рысы;

асаблівасці эвалюцыі чалавека на сучасным этапе;

разумець сутнасць працэсу эвалюцыі чалавека;

умець:

абгрунтоўваць месца чалавека ў заалагічнай сістэме;

характарызаваць этапы антрапагенезу, ролю біялагічных і сацыяльных фактараў у эвалюцыі чалавека;

даказваць адзінства чалавечых рас;

знаходзіць у біялагічных слоўніках і даведніках значэнне тэрмінаў, звязаных з праблемай эвалюцыі чалавека, у розных крыніцах (у тым ліку і ў інтэрнэце) неабходную інфармацыю па эвалюцыі чалавека;

праводзіць параўнанне будовы і функцыянавання арганізма чалавека і жывёл;

валодаць:

асноўнымі тэрмінамі і паняццямі па эвалюцыі чалавека;

навыкамі аналізу тэкстаў, вылучэння галоўнага, напісання анатацый, кароткіх паведамленняў, выступлення з паведамленнямі, вядзення дыскусіі;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні для крытычнага аналізу публікацый у сродках масавай інфармацыі па эвалюцыі чалавека.

Паводзіны як вынік эвалюцыі (4 гадзіны)

Паводзіны як форма адаптацыі жывога арганізма. Узроўні паводзін і эвалюцыя. Формы паводзін: прыроджаныя (таксісы, рэфлексы, інстынкты) і індывідуальна набытыя (навучанне, разумовая дзейнасць). Інстынктыўныя паводзіны беспазваночных і пазваночных жывёл.

Грамадскія паводзіны жывёл: групавы спосаб жыцця, сацыяльная іерархія асобін.

Паводзіны чалавека як сацыябіялагічнага віду, заснаваныя на асаблівасцях яго патрэбнасцей.

Чалавек у сацыяльным асяроддзі. Сурагатныя адносіны. Чалавек і прыроднае асяроддзе.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць формы паводзін (прыроджаныя і набытыя) жывёл і чалавека;

разумець сутнасць паводзін як адаптацыі жывога арганізма, сурагатных адносін;

умець:

характарызаваць прыроджаныя і індывідуальна набытыя формы паводзін;

адрозніваць праяўленні ў прыродзе розных форм паводзін;

характарызаваць асаблівасці паводзін чалавека як біясацыяльнай істоты;

праводзіць назіранні за жывёламі ў прыродзе;

валодаць асноўнымі тэрмінамі і паняццямі пры апісанні паводзін чалавека і жывёл;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні для абгрунтавання і захавання норм паводзін чалавека ў грамадстве.

Біясфера – жывая абалонка планеты (12 гадзін)

Структура біясферы. Паняцце біясферы. Межы біясферы. Кампаненты біясферы: жывое і біягеннае рэчыва, відавы склад; біякоснае і коснае рэчыва. Біямаса паверхні сушы, сусветнага акіяна, глебы. Біягеахімічныя функцыі жывога рэчыва: энергетычная, газавая, акісляльна-аднаўленчая, канцэнтрацыйная.

Кругаварот рэчываў у біясферы. Кругаварот вады, кісларoду, вугляроду і азоту.

Эвалюцыя біясферы. Асноўныя этапы развіцця біясферы. Уплыў гаспадарчай дзейнасці чалавека на біясферу. Асноўныя парушэнні ў біясферы, выкліканыя дзейнасцю чалавека (забруджванне навакольнага асяроддзя, вычарпанне прыродных рэсурсаў, апустыньванне). Маштабы парушэнняў (лакальныя, рэгіянальныя, глабальныя). Пагроза экалагічных катастроф і іх папярэджванне.

Ахова прыроды. Рацыянальнае прыродакарыстанне, аднаўленне прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя. стварэнне малаадходных тэхналогій. Запаведная справа. Ахоўныя прыродныя тэрыторыі. Захаванне генафонду.

Дэманстрацыі: схемы працягласці біясферы, уплыву гаспадарчай дзейнасці чалавека на прыроду; карты прыродаахоўных тэрыторый Рэспублікі Беларусь.

Практычныя работы

17. Складанне схем кругавароту рэчываў.

18. Прагназаванне і мадэліраванне змяненняў у экасістэме пад дзеяннем антрапагенных фактараў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен: в е д а ц ь:

межы біясферы, кампаненты біясферы, біягеахімічныя функцыі жывога рэчыва;

асноўныя парушэнні ў біясферы, выкліканыя дзейнасцю чалавека;

асноўныя забруджвальнікі навакольнага асяроддзя, прычыны і вынікі забруджвання біясферы, абяднення рэсурсаў;

запаведнікі і нацыянальныя паркі Рэспублікі Беларусь;

уплыў чалавека на біясферу;

глабальныя і рэгіянальныя экалагічныя праблемы;

асноўныя этапы эвалюцыі біясферы;

р а з у м е ц ь с у т н а с ц ь вучэння пра біясферу;

у м е ц ь:

абгрунтоўваць неабходнасць аховы біясферы, захавання генафонду і відавой разнастайнасці арганічнага свету;

складаць схемы кругавароту рэчываў у біясферы;

рашаць экалагічныя задачы;

в а л о д а ц ь навыкамі аналізу тэкстаў, вылучэння галоўнага, напісання анатацый, кароткіх паведамленняў, выступлення з паведамленнямі, вядзення дыскусіі па праблемах біясферы, ролі чалавека ў біясферы;

в ы к а р ы с т о ў в а ц ь набытыя веды і ўменні:

для абгрунтавання мер па ахове навакольнага асяроддзя, рэдкіх відаў і відаў, якія знікаюць, жывых арганізмаў;

памяншэння забруджвання навакольнага асяроддзя бытавымі адходамі, эканомнага расходавання вады, электраэнергіі, цяпла і г.д.

Падагульняльнае паўтарэнне (28 гадзін)

Малекулярны і клетачны ўзроўні
арганізацыі жыцця (6 гадзін)

Будова малекул бялкоў, ліпідаў, вугляводаў, нуклеінавых кіслот і іх біялагічная роля. Асаблівасці будовы і функцыянавання ферментаў. Захоўванне спадчыннай інфармацыі. Біялагічна актыўныя рэчывы.

Асаблівасці будовы клеткі як найменшай жывой сістэмы. Працэсы, якія адбываюцца на ўзроўні клеткі: паступленне рэчываў у клетку і вывядзенне з яе, пераўтварэнне рэчываў, сінтэз АТФ, нуклеінавых кіслот, бялкоў, вугляводаў (фотасінтэз). Узнаўленне клеткі, перадача спадчыннай інфармацыі, гены і храмасомы.

Арганізменны ўзровень арганізацыі жыцця (8 гадзін)

Аднаклетачныя, каланіяльныя і мнагаклетачныя арганізмы. тканкі, органы і сістэмы органаў. Прыкметы жывых арганізмаў, іх праяўленні ў бактэрый, пратыстаў, грыбоў, раслін і жывёл. Рэгуляцыя функцый у жывых арганізмах. Абарона арганізма ад чужародных цел. Спосабы размнажэння арганізмаў. Утварэнне і развіццё палавых клетак. Індывідуальнае развіццё арганізмаў, у тым ліку арганізма чалавека. Заканамернасці спадчыннасці і зменлівасці арганізмаў, у тым ліку арганізма чалавека. Узаемасувязь арганізмаў з навакольным асяроддзем, адаптацыі арганізма да асяроддзя пражывання.

Папуляцыйна-відавы ўзровень (2 гадзіны)

Віды жывых арганізмаў, крытэрыі віду. Папуляцыя, уласцівасці і структура папуляцыі, дынаміка колькасці папуляцыі і яе рэгуляцыя.

Экасістэмны ўзровень арганізацыі жыцця (4 гадзіны)

Структура экасістэм. Функцыі арганізмаў у экасістэме. Сувязі арганізмаў розных відаў у экасістэме. Харчовыя сувязі. Паток рэчыва і энергіі ў экасістэме. Умовы існавання экасістэм – прыток сонечнай энергіі і кругаварот рэчываў. Прадукцыйнасць экасістэм. Дынаміка экасістэм. Аграэкасістэмы.

Эвалюцыя відаў жывых арганізмаў (8 гадзін)

Канцэпцыі і тэорыі эвалюцыі. Перадумовы, механізмы і вынікі эвалюцыі з пазіцый сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі. Спосабы відаўтварэння. Макраэвалюцыя і яе заканамернасці. Асаблівасці эвалюцыі чалавека.

Разнастайнасць жыцця – вынік эвалюцыі. Сучасная біялагічная сістэма. Параўнальная характарыстыка асноўных таксонаў жывых арганізмаў (царстваў, тыпаў, аддзелаў, класаў кветкавых раслін, класаў хордавых жывёл).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць:

узроўні арганізацыі жыцця і іх элементарныя адзінкі;

асаблівасці структуры жывых сістэм на кожным узроўні арганізацыі;

асноўныя працэсы і з’явы, характэрныя для жывых сістэм кожнага ўзроўню арганізацыі;

асноўныя біялагічныя тэорыі і законы (клетачная, храмасомная, тэорыя эвалюцыі, законы Мендэля, біягенетычны закон і інш.);

разумець сутнасць:

структурнай арганізацыі жыцця на Зямлі;

узаемасувязі жывых сістэм розных узроўняў;

умець:

аналізаваць і абагульняць матэрыял падручнікаў (вучэбных дапаможнікаў), навуковых і навукова-папулярных выданняў, інтэрнэт-крыніц і г.д.;

супастаўляць вывучаныя паняцці, шукаць новыя сувязі і адносіны паміж імі, прасочваць развіццё паняццяў у іх іерархічнай залежнасці, г. зн. вызначаць падпарадкаванасць ў выпадку супастаўлення паняццяў;

класіфікаваць веды, прыводзіць іх у сістэму;

вычляняць галоўныя ідэі і сістэматызаваць матэрыял вакол асноўных паняццяў;

выяўляць узаемасувязь будовы і функцый;

знаходзіць агульныя прыметы ў будове і жыццядзейнасці розных біялагічных сістэм;

выяўляць сувязь паміж біялагічнымі сістэмамі і падсістэмамі (паміж арганоідамі, клеткамі, органамі і сістэмамі органаў, арганізмамі ў экасістэмах, рознымі экасістэмамі);

знаходзіць рысы ўскладнення ў арганізмаў розных сістэматычных груп;

параўноўваць аб'екты і афармляць матэрыял параўнання ў табліцы;

складаць аналітычныя, параўнальныя і абагульняльныя табліцы;

пераводзіць таблічны матэрыял у дыяграмы і графікі;

валодаць:

спосабамі арыентацыі ў інтэрнэт-крыніцах інфармацыі (часопісы, сайты, адукацыйныя парталы і г. д.);

рознымі сродкамі камунікацыі;

асноўным паняційным апаратам.

КАНТРОЛЬНЫЯ РАБОТЫ:

№ 1. Першае паўгоддзе – на працягу снежня па тэмах: «Арганізм і асяроддзе», «Від і папуляцыя», «Экасістэмы».

№ 2. Другое паўгоддзе – на працягу сакавіка–красавіка па тэмах: «Эвалюцыя арганічнага свету», «Паходжанне і эвалюцыя чалавека», «Паводзіны як вынік эвалюцыі». «Біясфера – жывая абалонка планеты».

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 93

Учебная программа по учебному предмету
«Физика»
для XI класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания
(повышенный уровень)

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Общая характеристика учебного предмета «Физика»

Учебный предмет «Физика», базирующийся на физике как науке о наиболее общих законах природы, является системообразующим для изучения учебных предметов: физической географии, биологии, химии, астрономии и вносит существенный вклад в систему знаний об окружающем мире.

Дидактическая модель учебного предмета «Физика» предусматривает содержательный и процессуальный компоненты.

Источником наполнения содержательного компонента являются:

физические знания (научные факты, понятия, законы, теории, физическая картина мира);

методологические знания (знания о процессах и методах познания).

Источником наполнения процессуального компонента являются:

